МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ
І ХАРЧАВАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
АГРАРНЫ ТЭХНІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

**К. А. Шумскі**

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ У XIX ст. – ПАЧАТКУ XXI ст.

**Манаграфія**

МІНСК
БДАТУ
2011

УДК 39:574

**Шумскі, К. А.** Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX ст. – пачатку XXI ст. : манаграфія / К. А. Шумскі. – Мінск : БДАТУ, 2011. – 192 с.
ISBN 978-985-519-432-4.

Упершыню ў айчыннай гістарычнай і этналагічнай навуках праведзена ўсебаковае даследаванне традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў: вызначаны месца і роля ведаў аб навакольнай прыродзе ў культуры беларускага этнасу, яго традыцыйным светапоглядзе, абгрунтаваны экалагічная значнасць і мэтазгоднасць практычнага выкарыстання рацыянальнай часткі народных ведаў аб прыродзе на сучасным этапе.

Для шырокага кола спецыялістаў у вобласці гуманітарных навук, экалагічнай адукацыі і экалагічнага выхавання, аграэкатурызму, выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.

Бібліягр.: 358 назв.

Рэкамендавана да друку навукова-тэхнічным саветам
Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт».
Пратакол № 1 ад 19 лютага 2010 г.

Навуковы рэдактар – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт» *І. Г. Падпорын*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, дацэнт, вучоны сакратар
ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі» *А. В. Гурко*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры філасофскіх вучэнняў
Установы адукацыі «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт»
*І. П. Корзун*

**ISBN 978-985-519-432-4**

© БДАТУ, 2011

Репозиторий БГАТУ

## ЗМЕСТ


Уводзіны ... 4

**1. Экалагічныя веды як феномен традыцыйнай культуры** ... 12

1.1. Спецыфіка пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры ... 12

1.2. Экалагічныя веды ў сістэме традыцыйных народных ведаў ... 22

**2. Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінным свеце** ... 36

2.1. Народныя веды аб культурных раслінах і іх прымяненне ў традыцыйным земляробстве ... 36

2.2. Веды аб дзікарослых раслінах у народнай культуры ... 52

**3. Традыцыйныя веды беларусаў аб жывёльным свеце** ... 63

3.1. Народныя веды аб свойскіх жывёлах і іх прымяненне ў традыцыйнай жывёлагадоўлі ... 63

3.2. Уяўленні аб дзікіх жывёлах і іх месца і роля ў народным светапоглядзе ... 73

**4. Традыцыйныя веды беларусаў аб сродках прадказання мясцовага надвор'я** ... 83

4.1. Спосабы прагназавання надвор'я на кароткія прамежкі часу ... 83

4.2. Спробы прадказання надвор'я на працяглыя прамежкі часу ... 92

4.3. Вызначэнне ўплыву ўмоў надвор'я на будучы ўраджай ... 102

**Заключэнне** ... 110

**Літаратура** ... 114

**Дадатак** ... 141




## УВОДЗІНЫ

У нашыя дні, калі адной з характэрных рысаў навуковага прагрэсу з'яўляецца збліжэнне прыродазнаўчых і гуманітарных навук, усё болей праяўляецца імкненне даследчыкаў выявіць некаторыя агульныя заканамернасці ўзаемадзеяння прыродных і сацыяльных фактараў у гістарычным працэсе. Адной з важнейшых асаблівасцяў развіцця этналогіі ў другой палове XX ст. было фарміраванне ў ёй асобнага навуковага накірунку, які атрымаў назву «этнічная экалогія» (у замежнай навуковай традыцыі ёй адпавядае такая этналагічная субдысцыпліна, як «экалагічная антрапалогія»).

Этнічная экалогія сфарміравалася на мяжы этналогіі і экалогіі чалавека (сацыяльнай экалогіі) і мае зоны перакрыжавання з этнагеаграфіяй, этнічнай дэмаграфіяй і этнічнай антрапалогіяй. Ставячы ў цэнтр сваёй увагі вывучэнне ўзаемадзеяння жывых арганізмаў і асяроддзя, этнічная экалогія, як і ўся сацыяльная экалогія, улічвае асаблівасці чалавека як сацыяльна-біялагічнай істоты, перш за ўсё, вядучую ролю сацыяльных фактараў у фарміраванні этнапапуляцыйных груп; спецыфіку культуры, якая з'яўляецца асноўным сродкам пазабіялагічнай адаптацыі да асяроддзя пражывання; вялізнае значэнне гаспадарчай дзейнасці ў жыццезабеспячэнні чалавечых калектываў і ва ўсё ўзрастаючым пераўтваральным уплыве іх на прыроду. На сучасным этапе ў задачы этнічнай экалогіі ўключаецца комплекснае вывучэнне асаблівасцей традыцыйных сістэм жыццезабеспячэння этнічных супольнасцей у прыродных і сацыяльна-культурных умовах іх існавання, а таксама ўплыву гістарычна сфарміраваных экалагічных узаемасувязей на здароўе людзей; вывучэнне выкарыстання этнасамі прыроднага асяроддзя і іх уздзеяння на гэтае асяроддзе, на заканамернасці фарміравання і функцыянавання экасістэм [337, с. 92–94]. Да таго ж, этнічная экалогія займаецца вывучэннем умоў і шляхоў гарманізацыі адносінаў этнасу з асяроддзем пражывання, як прыродным, так і сацыяльным.

У аснове тэарэтычных поглядаў прадстаўнікоў этнічнай экалогіі на праблему сувязей грамадства і прыроднага асяроддзя ляжыць палажэнне аб іх двухбаковай накіраванасці, г. зн. прызнаецца уплыў як культуры на асяроддзе, так і асяроддзя на культуру. Узаемадзеянне гэтых феноменаў разглядаецца ў рамках адзінага, сістэмна арганізаванага цэлага і раскрываецца праз паняцце культурнай адаптацыі, у якім культура інтэрпрэтуецца як спецыфічны адапцыйны механізм чалавечай дзейнасці.



Репозиторий БГАТУ

Этнічнай экалогіі папярэднічалі наступныя тэорыі аб сувязі грамадства (культуры) і навакольнага асяроддзя:

– геаграфічны дэтэрмінізм, які прызнаваў прамы аднабаковы ўплыў асяроддзя на культуру;

– пасібілізм, прадстаўнікі якога лічылі развіццё культуры вольным ад канкрэтнай спецыфікі навакольнага асяроддзя і прызнавалі толькі ролю лімітуючых прыродных фактараў – фактараў, што робяць немагчымым фарміраванне пэўных з'яў культуры (напрыклад, недахоп вільгаці ў пустынях ці цяпла ў Арктыцы для развіцця земляробства). Іншымі словамі, да ўзнікнення этнічнай экалогіі пытанне аб узаемаўплыве грамадства і геаграфічнага асяроддзя па сутнасці і не ставілася [340, с. 89, 90].

У сярэдзіне 50-х – пачатку 60-х гг. XX ст. у рамках амерыканскай экалагічнай антрапалогіі сфарміравалася школа этнаэкалогіі, прадстаўнікі якой прэтэндавалі на стварэнне прынцыпова новай тэарэтыка-метадалагічнай базы этналогіі і бачылі асаблівасць свайго падыходу ў тым, каб даследаваць не грамадскія інстытуты і з'явы ў іх узаемасувязі з навакольным асяроддзем, а ўяўленні і веды аб гэтым асяроддзі прадстаўнікоў вывучаемай культуры, а таксама тое, як гэтыя веды арганізаваны лексічна [340, с. 99]. Па сутнасці, этнаэкалогія, ці этнанавука, замяняе даследаванне аб'ектыўнай рэчаіснасці вывучэннем уяўленняў аб гэтай рэчаіснасці, адлюстраваных у слоўнікавым запасе насельніцтва, г. зн. мае суб'ектыўны характар. На думку прыхільнікаў дадзенай школы, этнолаг не можа задаволіцца толькі фіксацыяй кампанентаў культурнай экасістэмы ў катэгорыях сучаснай навукі, бо прадстаўнікі традыцыйнай культуры ўзаемадзейнічаюць з навакольным асяроддзем на аснове не навуковых, а сваіх традыцыйных уяўленняў, экафільных ці экафобных установак. Таму мэта этнаэкалагічнага даследавання заключаецца ў тым, каб лепей зразумець, якім чынам прадстаўнікі вывучаемай культуры ўспрымаюць сваё прыроднае асяроддзе, а пры яго апісанні прымяняць паняцці, якія выкарыстоўваюць гэтыя людзі [Там жа. С. 100].

Дадзеныя, якія атрымліваюць этнаэколагі, маюць вялікае навуковае значэнне, бо дазваляюць скласці ўражанне аб асаблівасцях успрыняцця навакольнага асяроддзя і асэнсаванні свайго месца ў прыродзе людзьмі, якія належаць да розных культур і дасягнулі рознага ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця. Аднак прадстаўнікі этнаэкалогіі добра валодаюць і развіваюць



далей толькі метады збору і класіфікацыі інфармацыі аб успрымаемым (кагнітыўным) навакольным асяроддзі і асэнсаваных узаемаадносінах з ім у паняццях, г. зн. у слоўнікавым запасе прадстаўнікоў дадзенай культуры. У той жа час рэальнае прыроднае асяроддзе і сапраўдныя гаспадарчыя ўзаемадзеянні з ім вывучаемага грамадства застаюцца па-за іх увагай. Таму большасць работ па праблеме ўзаемадзеяння грамадства і навакольнага асяроддзя зводзіцца да даследавання традыцыйных класіфікацый розных прыродных аб'ектаў (у першую чаргу раслін, жывёл).

Школа этнічнай экалогіі, якая пачала фарміравацца ў савецкай этналагічнай навуцы ў 80-я гг. XX ст., разумее прадмет свайго даследавання значна шырэй. Пры вывучэнні асаблівасцей жыццезабеспячэння этнасу выдзяляюцца яго «фізічны» і «псіхічны» (духоўны) бакі. Да першага адносяцца фізічная (біялагічная) адаптацыя людзей да прыроднага асяроддзя і сацыяльна-культурная адаптацыя, якая звязана з іх гаспадарчай дзейнасцю і адлюстроўваецца ў асаблівасцях матэрыяльнай культуры (харчаванні, адзенні), а таксама ў народнай медыцыне. Да другога боку адносяцца, галоўным чынам, псіхалагічная адаптацыя людзей да навакольнага прыроднага і сацыяльна-культурнага асяроддзя, традыцыйныя метады прадухілення ці паслаблення стрэсавых сітуацый, а таксама традыцыйныя веды аб акаляючай прыродзе. Вывучэнне адносінаў прадстаўнікоў пэўнага этнасу да навакольнага асяроддзя, якое таксама ўваходзіць у пералік задач этнічнай экалогіі, выдзяляе экафільныя і экафобныя тэндэнцыі і традыцыі з выкарыстаннем атрыманага матэрыялу для экалагічнага выхавання [334, с. 8, 9].

Яшчэ ў XIX ст. – пачатку XX ст. беларускімі, рускімі і польскімі вучонымі-збіральнікамі быў назапашаны багаты фактычны этнаграфічны матэрыял па традыцыйных экалагічных ведах беларусаў. Найбольшую каштоўнасць на гэтым этапе ўяўляюць работы Я. П. Тышкевіча [357], М. А. Дзмітрыева [102], І. А. Бермана [59, 60], Ю. Ф. Крачкоўскага [158], М. Я. Нікіфароўскага [211–213], Е. Р. Раманава [235–239], П. В. Шэйна [292–294], У. М. Дабравольскага [103–107], Дз. Г. Булгакоўскага [70], М. Федароўскага [348]. У 20–30-я гг. XX ст. з'явіўся шэраг значных прац, у якіх знайшлі адлюстраванне народныя веды беларусаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор'і XIX ст., а таксама паказаны змены, якія адбыліся ў іх у пачатку XX ст. Перш за ўсё тут трэба прыгадаць работы А. К. Сержпутоўскага [249–251], А. А. Шлюбскага [296], К. Машынскага [353, 354], Ч. Пяткевіча



Репозиторий БГАТУ

[232]. У адрозненне ад папярэдняга этапу, істотна ўзрасла колькасць публікацый даследчага характару: у работах Я. Ф. Карскага [138], М. М. Нікольскага [214, 215], К. Машынскага [351, 352], Дз. К. Зяленіна [123–125] робяцца значныя крокі па абагульненню і навуковаму аналізу сабраных матэрыялаў. У другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст. асобныя аспекты традыцыйных ведаў і ўяўленняў аб прыродзе знайшлі адлюстраванне ў працах беларускіх этнолагаў і фалькларыстаў Л. І. Мінько [185–195], І. П. Корзуна [148–152], У. А. Лобача [169–172], А. М. Ненадаўца [203–209], А. С. Ліса [167], К. П. Кабашнікава [51], В. М. Шарай [285, 286], У. А. Васілевіча [77–80], Т. В. Валодзінай [75, 76] і інш. У той жа час неабходна падкрэсліць, што цэласнаму вывучэнню традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў не было дагэтуль прысвечана ніводнага спецыяльнага этналагічнага даследавання. Не прыніжаючы каштоўнасці адзначаных вышэй прац, агульны стан вывучанасці традыцыйных ведаў беларусаў аб акаляючай прыродзе ў айчыннай навуцы можна ахарактарызаваць як недастаткова поўны. Частка работ мае выключна апісальны характар: у іх змяшчаецца велізарны аб'ём фактычнага этнаграфічнага матэрыялу, аднак адсутнічае яго тэарэтычнае асэнсаванне.

*Мэта дадзенага даследавання* – усебаковае вывучэнне экалагічных ведаў як феномена традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў ХІХ – пачатку ХХІ ст., выяўленне сутнасных і адметных рысаў іх структурных кампанентаў.

Для дасягнення гэтай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– выявіць спецыфіку пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры, вызначыць месца экалагічных ведаў у сістэме традыцыйных ведаў, высвятліць узаемасувязь рацыянальнай і нерацыянальнай частак народных ведаў аб прыродзе;

– правесці сістэмны аналіз народных ведаў беларусаў аб культурных раслінах і свойскіх жывёлах, аб дзікарослых раслінах і дзікіх жывёлах, аб спосабах вызначэння надвор'я і прагназавання будучага ўраджаю, даследаваць сферы іх прымянення ў гаспадарчай дзейнасці і штодзённым жыцці, а таксама іх адлюстраванне ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў;

– вывучыць адносіны прадстаўнікоў беларускага этнасу да навакольнай прыроды, прааналізаваўшы экафільныя і экафобныя традыцыі духоўнай культуры;



– абгрунтаваць экалагічную значнасць і мэтазгоднасць практычнага выкарыстання рацыянальнай часткі традыцыйных ведаў беларусаў аб прыродзе на сучасным этапе.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларускі этнас ХІХ – пачатку ХХІ ст., прадметам – традыцыйныя экалагічныя веды і ўяўленні, характэрныя для беларускай этнічнай супольнасці азначанага перыяду.

У манаграфіі выкарыстана значная колькасць крыніц, якія можна падзяліць на тры асноўныя групы.

Першую групу крыніц складаюць фальклорна-этнаграфічныя зборнікі і артыкулы беларускіх, рускіх і польскіх вучоных-збіральнікаў ХІХ – першай трэці ХХ ст. Найбольшую каштоўнасць для нашай работы ўяўляюць зафіксаваныя ў іх народныя прыкметы, вераванні і павер'і, правілы, забароны, рэкамендацыі, казкі, паданні і інш. Ахопліваючы практычна ўсе бакі жыццядзейнасці прадстаўніка традыцыйнай культуры, яны з'яўляюцца непасрэдным адлюстраваннем асаблівасцей яго светапогляду ў працэсе разумення і вытлумачэння разнастайных прыродных з'яў. Дадзеную групу крыніц адрозніваюць несканцэнтраванасць (запісы прыкметаў, павер'яў, вераванняў знаходзяцца ў самых розных частках фальклорна-этнаграфічных прац) і нявылучанасць матэрыялу (так, напрыклад, прыкметы і павер'і часта прадстаўлены ў іншых жанрах фальклору). Вялікае значэнне маюць і этнаграфічныя апісанні ХІХ – пачатку ХХ ст., у якіх утрымліваюцца каштоўныя фактычныя звесткі пра каляндарную абраднасць, каляндарна-абрадавы фальклор, ушанаванне беларусамі прыродных стыхій і аб'ектаў, пра народныя магічныя практыкі (чарадзейства, знахарства, варажба). Пазначаныя вышэй крыніцы істотным чынам дапаўняюцца за кошт малых жанраў фальклору (прыказкі, прымаўкі, замовы, зычанні, праклёны і інш.), якія сцісла і трапна адлюстроўваюць традыцыйныя светапоглядныя ўяўленні. Параўнанне ўсіх гэтых матэрыялаў, зафіксаваных у розныя часы і ў розных рэгіёнах этнічнай тэрыторыі беларусаў, паказвае, што многія народныя веды і ўяўленні аб навакольнай прыродзе шмат у чым з'яўляюцца універсальнымі і архетыповымі.

У якасці другой групы крыніц выступаюць палявыя матэрыялы, сабраныя супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы АН БССР падчас этнаграфічных экспедыцый, якія праводзіліся ў 50–80-я гг. ХХ ст. Найбольш грунтоўныя звесткі ўтрымліваюцца ў палявых сшытках М. Я. Грынблата,



Репозиторий БГАТУ

Л. А. Малчанавай, Л. І. Мінько, якія зараз захоўваюцца ў архіве ІМЭФ НАН Беларусі [6–26]. Навуковая каштоўнасць гэтых матэрыялаў заключаецца ў тым, што былі апытаны інфарматары, якія нарадзіліся і жылі ў канцы XIX – першай палове XX ст. – у час шырокага распаўсюджання і функцыянавання традыцыйных ведаў аб прыродзе. Таму тут зафіксаваны найбольш старажытныя светапоглядныя ўяўленні беларусаў, тыя элементы народных ведаў, якія на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. былі амаль поўнасцю выцеснены ведамі навуковымі і сцёрліся з памяці людзей. У той жа час неабходна падкрэсліць, што спецыяльных палявых этнаграфічных даследванняў, прысвечаных традыцыйным ведам аб прыродзе (за выключэннем народнай медыцыны і, часткова, ведаў аб надвор'і) не праводзілася. Звесткі пра народныя экалагічныя веды фіксаваліся ў комплексе з апісаннем іншых элементаў культуры – прыладаў працы, каляндарнай абраднасці, сельскагаспадарчай магіі і г. д. Да многіх народных уяўленняў, якія ў той час адносіліся да «забабонаў», «рэлігійных перажыткаў», ставіліся крытычна, таму яны прадстаўлены толькі фрагментарна. Акрамя таго, у гэтых матэрыялах не поўнасцю адлюстраваны змены, якія адбываліся ў сістэме традыцыйных ведаў беларусаў аб прыродзе на працягу другой паловы XX ст., недастаткова поўна зафіксаваны тыя элементы народных ведаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор'і, якія знаходзяць практычнае прымяненне на сучасным этапе.

Трэцюю групу крыніц складаюць матэрыялы па традыцыйных экалагічных ведах беларусаў, сабраныя аўтарам падчас уласных палявых этнаграфічных даследаванняў у 2002–2006 гг. (усяго праведзена 14 экспедыцый, маршруты якіх праляглі праз 83 населеныя пункты нашай краіны). Палявымі этнаграфічнымі даследаваннямі былі ахоплены ўсе гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі, у т. л. і раёны, пацярпелыя ў выніку аварыі на ЧАЭС. Пасля адсялення людзей з гістарычных мясцін шмат якія элементы народных ведаў пачалі забывацца, а таму ўнікальныя матэрыялы могуць быць незваротна страчаны. Каб гэтага не здарылася, неаднаразова наладжваліся паездкі з мэтай збору этнаграфічнага матэрыялу ў Магілёўскую і Гомельскую вобласці. Пры вывучэнні традыцыйных ведаў беларусаў у палявых умовах выкарыстоўваўся экспедыцыйны метад. У экспедыцыйнай рабоце прымяняліся асабістыя назіранні і апытанне інфарматараў метадам іх анкетавання. Аўтарам былі распрацаваны апытальнікі па ўсіх галінах народных ведаў аб прыродзе.



Пытанні задаваліся вусна, адказы на іх фіксаваліся аўтарам, у рэдкіх выпадках інфарматар запаўняў апытальнік самастойна. Дзякуючы гэтаму за адносна невялікі прамежак часу ўдалося сабраць разнастайныя матэрыялы па традыцыйных ведах беларусаў аб культурных раслінах і хатніх жывёлах, аб дзікарослых раслінах і дзікіх жывёлах, аб спосабах вызначэння надвор'я і прагназавання будучага ўраджаю (больш падрабязна з гэтымі матэрыяламі можна азнаёміцца ў дадатку да манаграфіі).

У метадалагічным плане выдзяленню традыцыйных экалагічных ведаў у якасці самастойнага аб'екта этналагічнага даследавання дастаткова поўна адпавядае ўяўленне аб этнасе як цэласнай этнаэкалагічнай сістэме, якая ўяўляе сабой дынамічнае адзінства фактараў этнакультурнага парадку і лакальных прыродна-кліматычных умоў [161]. Такое ўяўленне і абумоўлены ім комплексны падыход да вывучэння ўзаемасувязі этнакультурных працэсаў з навакольным асяроддзем знаходзяць усё больш прыхільнікаў сярод сучасных этнолагаў. Мэтазгоднасць яго выкарыстання вызначаецца як практычнымі патрэбамі, так і новымі магчымасцямі для поўнавартаснага навуковага сінтэзу. Гэты падыход дазваляе наблізіцца да новых рубяжоў у пазнанні аб'ектыўнай рэчаіснасці, што не толькі адпавядае ўнутранай логіцы развіцця этналогіі і экалогіі чалавека, але і адлюстроўвае агульную тэндэнцыю да сінтэзу розных абласцей навуковых ведаў.

Вывучэнне ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды скрозь прызму культуры становіцца ўсё больш і больш запатрабаваным і ў сувязі з вастрынёй экалагічных праблем, з якімі сутыкнулася сусветная супольнасць у цэлым і Рэспубліка Беларусь у прыватнасці. Зафіксаваныя ў традыцыйнай культуры прынцыпы адносінаў да навакольнага асяроддзя могуць дапамагчы выявіць прычыны ўзнікнення экалагічных праблем, а таксама знайсці спосабы іх вырашэння. Даследаванні, у якіх выяўляюцца і прапагандуюцца традыцыі рацыянальнага прыродакарыстання, высвятляюцца культурна абумоўленыя прычыны прыродапарушальнай дзейнасці чалавека і магчымыя шляхі яе карэкцыі, уздымаюць айчынную навуку на новы ўзровень, бо дазваляюць больш шчыльна звязваць тэарэтычныя напрацоўкі з актуальнымі праблемамі сучаснасці і пошукам шляхоў гарманізацыі адносінаў у сістэме «чалавек–прырода–грамадства».

Урадам Беларусі распрацавана «Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гады» (зацверджана Ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 150 ад 25 сакавіка 2005 года) [93], у цэнтр



Репозиторий БГАТУ

практычнай рэалізацыі якой павінен быць пастаўлены чалавек, яго духоўная культура. Адным з прыярытэтных накірункаў праграмных мерапрыемстваў з'яўляецца захаванне, узбагачэнне, развіццё і папулярызацыя традыцыйнай культуры беларускай вёскі [Там жа. С. 33, 34]. Усё гэта немагчыма зрабіць без адраджэння і вяртання ў культуру вясковых жыхароў (а таксама і гараджан) традыцыйных ведаў, маральна-этычных уяўленняў, нормаў і прынцыпаў паводзінаў у адносінах да навакольнай прыроды.

Як вядома, 2009 год быў аб'яўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Годам роднай зямлі. У сувязі з гэтым надзвычай перспектыўным уяўляецца выкарыстанне здабыткаў рацыянальных традыцыйных ведаў беларусаў аб прыродзе ў экалагічнай адукацыі і экалагічным выхаванні: станаўленне беражлівых адносінаў чалавека да навакольнага асяроддзя, да роднай зямлі павінна грунтавацца на лепшых традыцыях народнай культуры.

У сукупнасці гэтыя факты прадвызначаюць актуальнасць і мэтазгоднасць комплекснага міждысцыплінарнага вывучэння здабыткаў традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў, якія ўвабралі ў сябе шматвяковы вопыт узаемадзеяння чалавека і прыроды.



# 1. ЭКАЛАГІЧНЫЯ ВЕДЫ ЯК ФЕНОМЕН ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

## 1.1. Спецыфіка пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры

Пазнанне – гэта сукупнасць тых працэсаў, пры дапамозе якіх чалавек атрымоўвае, перапрацоўвае і прымяняе інфармацыю аб навакольным свеце. У гісторыі этналагічнай навукі існуюць два супрацьлеглыя адказы на пытанне аб тым, ці існуюць у пазнавальных працэсах адрозненні, абумоўленыя культурай. Прыхільнікі адной плыні сцвярджаюць, што пазнавальная дзейнасць прадстаўнікоў традыцыйнай культуры мае якасныя асаблівасці, якія адрозніваюць яе ад мыслення сучаснага чалавека. Прадстаўнікі другой лічаць, што пры вывучэнні пазнавальных асаблівасцей людзей, якія жывуць ва ўмовах розных культур, трэба зыходзіць з той аксіёмы, што асноўныя лагічныя аперацыі на розных этапах гістарычнага развіцця застаюцца аднымі і тымі ж.

Вучоныя звярнуліся да рашэння гэтага прынцыпова важнага пытання яшчэ ў другой палове XIX ст., а найбольш акрэслена дадзеная альтэрнатыва выявілася ў этналагічных працах Э. Тайлара і Дж. Фрэзера. Па Э. Тайлару, мысленне стваральнікаў касмаганічных і касмалагічных міфаў у аснове сваёй было гэткім жа, як і ў сучасных людзей: «першабытная» і сучасная астраномія адрозніваюцца толькі ў колькасных адносінах (г. зн. па колькасці паведамляемых імі звестак), але гэта прыступкі адной эвалюцыйнай лесвіцы развіцця навукі. Па Дж. Фрэзеру, тут існуе глыбокае якаснае адрозненне: міфы павінны былі ствараццa зусім іншым, «магічным», ладам мыслення, якое прынцыпова адрозніваецца ад навуковага, бо генэзіс культуры, на яго думку, ішоў па накірунку магія–рэлігія–навука [265; 275].

Асноўнае слабае месца канцэпцыі Э. Тайлара заключаецца ў тым, што ў яго «дзікун-філосаф» з'яўляецца «рабінзонам без сацыяльнага кантэксту» [163, с. 9]. Канцэпцыя Дж. Фрэзера канчаткова не пазбавілася ад гэтага недахопу, бо звярталася толькі да аднаго – культавага – аспекта сацыяльнага кантэксту традыцыйнай культуры.

У поўнай меры гэты «сацыяльны вакуум» быў запоўнены ў працах французскага сацыёлага Э. Дзюркгейма і яго паслядоўнікаў. Э. Дзюркгейм адным з першых стаў аналізаваць грамадства як



Репозиторий БГАТУ

узаемазвязанае цэлае; ён падкрэсліваў, што культура – гэта прадукт супольнай працы людзей, а не намаганняў асобных індывідаў [92, с. 37; 174, с. 8].

Э. Дзюркгейм з'яўляецца аўтарам канцэпцыі калектыўных уяўленняў (les representations collectives), упершыню выкладзенай у артыкуле «Індывідуальныя і калектыўныя ўяўленні» (1898). Калектыўным уяўленням, згодна Э. Дзюркгейму, уласцівы асноўныя прыкметы любога сацыяльнага факта: яны, па-першае, існуюць па-за асобнымі індывідуальнымі ўяўленнямі, па-другое, навязваюцца індывіду, носяць абавязковы для яго характар. Каб абгрунтаваць аўтаномію калектыўных уяўленняў і немагчымасць звесці іх да ўяўленняў індывідуальных, даследчык ужывае аналогію з апошнімі. Індывідуальныя ўяўленні немагчыма звесці да нараджаючага іх матэрыяльнага субстрата, яны не залежаць пастаянна ад сваёй фізіка-біялагічнай асновы, а наадварот, аднойчы ўзнікнуўшы, атрымліваюць адносную самастойнасць, уздзейнічаюць адно на другое, уступаюць паміж сабой у розныя камбінацыі і г. д. Гэтаксама і калектыўныя ўяўленні, якія з'яўляюцца вынікам дзейнасці пэўным чынам асацыяваных індывідаў і ўзаемадзеяння індывідуальных уяўленняў, ствараюць уласную рэальнасць і ў значнай ступені развіваюцца па сваіх уласных законах.

Калектыўныя ўяўленні выступаюць у форме звычаяў, моўных правілаў, рэлігійных вераванняў, маральных і прававых патрабаванняў, навуковых паняццяў і г. д. У цэлым паняцце «калектыўных уяўленняў» (у разуменні Э. Дзюркгейма і яго паслядоўнікаў) адлюстроўвае тры аспекты сацыякультурнай рэальнасці: сацыяльныя і групавыя нормы, сацыяльныя і групавыя каштоўнасці, катэгорыі пазнання (якія, аднак, таксама выступаюць як свайго роду сацыяльныя і групавыя каштоўнасці і нормы). Адпаведна гэтаму калектыўныя ўяўленні, на думку прадстаўнікоў Французскай сацыялагічнай школы, маюць траістую функцыю: нарматыўную, каштоўнасную і кагнітыўную [197, с. 293].

Пад уплывам канцэпцыі Э. Дзюркгейма аб калектыўных уяўленнях знаходзіўся таксама і французскі этнолаг Л. Леві-Бруль, аўтар шэрагу прац па духоўнаму жыццю, менталітэту прадстаўнікоў традыцыйнай культуры. Пад калектыўнымі ўяўленнямі ён разумеў такія ўяўленні, якія, па-першае, незалежны ад індывідуальнай псіхалогіі, па-другое, навязваюцца асобе з самага ранняга ўзросту,



па-трэцяе, перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Такімі калектыўнымі ўяўленнямі ён лічыў вераванні, звычаі і мову [163, с. 5].

Л. Леві-Бруль з'яўляецца аўтарам канцэпцыі «пралагічнага мышлення» – мышлення, характэрнага для прадстаўнікоў традыцыйнай культуры. Пралагічнае мышленне, на думку Л. Леві-Бруля, «інакш арыентавана». Яно не імкнецца пазбягаць супярэчнасці, як гэта робіць мышленне сучаснага чалавека [163, с. 49], бо калектыўныя ўяўленні ў традыцыйнай культуры, якімі гэтае мышленне аперыруе, «уяўляюць сабой зусім іншую рэч, чым нашыя паняцці» [Там жа. С. 50]. Яны не з'яўляюцца прадуктам інтэлектуальнай апрацоўкі ў прамым сэнсе слова, бо ўключаюць у якасці складовых частак эмацыянальныя і маторныя элементы і, што асабліва важна, замест лагічных адносінаў выкарыстоўваюць больш ці менш дакладна вызначаныя, звычайна жыва адчуваемыя, партыцыпацыі: «Мышленне першабытных людзей непазбежна вытлумачвае зусім інакш тое, што мы называем прыродай і вопытам. Яно паўсюль бачыць самыя разнастайныя формы перадачы якасцей на адлегласць шляхам пераносу, судатыкнення, заражэння, авалодання. У калектыўных уяўленнях першабытнага мышлення прадметы, істоты, з'явы могуць быць незразумелым для нас чынам адначасова і самімі сабой і нечым іншым» [Там жа. С. 48, 65].

Гэтую асаблівасць традыцыйнага мышлення Л. Леві-Бруль назваў законам партыцыпацыі. Згодна дадзенаму закону, ва ўсялякай рэчы такое мышленне цікавіцца не аб'ектыўнымі прыкметамі і ўласцівасцямі, а містычнай сілай, правадніком якой з'яўляецца дадзеная рэч. Таму свядомасць прадстаўніка традыцыйнай культуры лічыцца не з рэальнымі ўласцівасцямі рэчаў, а з містычнымі сіламі, якія ўтрымліваюцца, актыўна дзейнічаюць у іх і з'яўляюцца адзінымі сапраўдна магчымымі прычынамі той ці іншай з'явы.

У той жа час Л. Леві-Бруль прызнае суіснаванне закона партыцыпацыі з законам супярэчнасці і нават сцвярджае, што «і тое, і другое мышленне ўзаемна пранікаюць адно ў другое» [163, с. 71]. У прадмове да рускага выдання сваёй працы ён адмаўляў спробы надаць яго тэрміну сэнс супрацьлегласці лагічнаму мышленню. Ён папярэджваў чытачоў, каб яны не разумелі тэрмін «пралагічнае мышленне» у сэнсе «алагічнае» (г. зн. «нелагічнае»), падкрэсліваючы, што ў чалавецтва не існавала і не існуе двух адасобленых формаў мышлення, адной нелагічнай, а другой лагічнай; гаворка ідзе пра дзве розныя пазнавальныя структуры,



Репозиторий БГАТУ

якія суіснуюць у адным і тым жа грамадстве і часта (а, можа быць, і заўсёды), у адной і той жа свядомасці [Там жа. С. 4].

Аднак тлумачэнне з'яў рэчаіснасці не з'яўляецца, па Л. Леві-Брулю, асноўнай мэтай такога пазнання: чалавек традыцыйнай культуры рэчаіснасць асвойвае, але такое асваенне не прымае форму асэнсавання і тлумачэння. Акрамя таго, традыцыйнае мышленне аказваецца неўспрымальным да вопыту. На думку даследчыка, вопыт у традыцыйным мышленні амаль ніколі не выступае ў якасці крытэрыя ісціны. Наогул традыцыйная культура, па Л. Леві-Брулю, нават маючы ў якасці прадуктаў «выключную каштоўнасць некаторых сваіх здабыткаў і прыёмаў», з пункту гледжання працэсаў іх стварэння «можа не карыстацца аналітычнай дзейнасцю розуму ці валоданнем ведамі, здольнымі ўжываць аналіз і абагульненне». Прадстаўнікі традыцыйных культур замест разважанняў «кіруюцца свайго роду нюхам; вопыт развівае ці патанчае гэты нюх, ён можа зрабіцца беспамылковым, не маючы, аднак, нічога агульнага з інтэлектуальнымі аперацыямі ва ўласным сэнсе гэтага слова» [163, с. 298–300].

Палажэнні Л. Леві-Бруля, які адзначаў якасныя асаблівасці традыцыйнага мышлення і першы разглядаў лагічныя працэсы як прадукт гістарычнага развіцця, безумоўна, мелі вялікую навуковую каштоўнасць і унеслі значны ўклад у распрацоўку праблемы духоўнага жыцця, менталітэту прадстаўнікоў традыцыйных культур. Мышленне ўпершыню стала разглядацца не толькі як аналітычная здольнасць чалавека, але і як сукупнасць спосабаў і прыёмаў пазнання і асэнсавання навакольнага свету [222, с. 278]. Трэба адзначыць, што Л. Леві-Бруль асобна не разглядаў пытанне аб вызначэнні мышлення. Толькі з кантэксту яго работ можна выявіць, што мышленне ў яго развітым выглядзе выступае, перш за ўсё, як уменне правільна, у адпаведнасці з законамі логікі, будаваць сістэму ўяўленняў аб навакольным свеце з улікам толькі прыродна-фізічных, а не звышнатуральных сіл. Тыпы культуры, якія не валодалі такім узроўнем мышлення, разглядаліся Л. Леві-Брулем як этапы на шляху да развітога стану мышлення [Там жа. С. 279, 280].

Блізкія ідэі выказваў таксама швейцарскі псіхолаг Ж. Піажэ. На яго думку, асноўнай прычынай міжкультурных адрозненняў у пазнавальнай дзейнасці з'яўляецца няздольнасць чалавека традыцыйнай культуры да абстрактнага мышлення. Гэты тэзіс грунтаваўся на выніках эмпірычных даследаванняў культуры маўлення. У прыватнасці, Ж. Піажэ адзначаў, што слабая



здольнасць да абстрактнага лагічнага мышлення праяўляецца ў тым, што большасць паняццяў прадстаўнікоў традыцыйных культур маюць канкрэтны, а не абстрактна-абагульнены характар. Так, у мове эскімосаў няма паняцця «снег наогул», а існуюць паняцці «снег, па якому рухаюцца нарты», «мокры снег» і г. д. [222, с. 280, 281].

Аднак ідэі Л. Леві-Бруля выклікалі таксама хвалю абгрунтаванай і пераканаўчай крытыкі. Л. Леві-Бруль шырока выкарыстоўваў канцэпцыю «калектыўных уяўленняў» Э. Дзюркгейма, а асноўная яго ідэя аб прынцыповым адрозненні традыцыйнага («пралагічнага») і сучаснага мышлення, безумоўна, таксама сфарміравалася пад уплывам Французскай сацыялагічнай школы. Але для Э. Дзюркгейма і яго паслядоўнікаў сувязь між тыпам культуры і тыпам мышлення, знойдзеная Л. Леві-Брулем, мела залішне абстрактны характар, а галоўнае, была неадэкватна апісана. Л. Леві-Бруля папракалі за няўвагу да канкрэтных традыцыйных культур, за ігнараванне разнастайных адрозненняў паміж імі, з аднаго боку, і за адмаўленне факта існавання пераемнасці ў мышленні «дзікуна» і «цывілізаванага» чалавека – з другога. Прадстаўнікі Французскай сацыялагічнай школы, адвяргаючы наяўнасць асаблівага «пралагічнага» мышлення, наадварот, даказвалі, што сучаснае мышленне сваімі каранямі ўваходзіць у мышленне прадстаўнікоў традыцыйных культур, гістарычна вырастае з яго [197, с. 298].

Супраць асноўных палажэнняў Л. Леві-Бруля ўжо ў 20-я гады мінулага стагоддзя выступілі некаторыя псіхолагі (Р. Гурнвальд, Ч. Рыверс, О. Леруа), якія часткова абапіраліся на дадзеныя, атрыманыя пры эксперыментальна-псіхалагічных даследаваннях, часткова звязвалі крытыку з дадзенымі сучаснай ім этналогіі і лінгвістыкі. Яны падверглі сумненню факты, апісаныя Л. Леві-Брулем, і лічылі, што інтэлектуальныя асаблівасці чалавека традыцыйнай культуры не маюць фундаментальных адрозненняў ад асаблівасцей псіхічнага жыцця сучаснага чалавека. Яны выказалі меркаванне, што прааналізаваныя Л. Леві-Брулем звесткі гавораць хутчэй аб тым, што ўсё чалавецтва мысліць па адных і тых жа лагічных законах. Асаблівасці пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры заключаюцца ў тым, што яны «абагульняюць факты знешняга свету ў іншыя катэгорыі, чым тыя, якімі прызвычаіліся карыстацца мы». Гэтыя асаблівасці традыцыйнага мышлення не з'яўляюцца ні вынікам яго непаўнавартасці, ні прадуктам вераванняў і перакананняў яго



Репозиторий БГАТУ

носьбітаў; іх можна зразумець толькі зыходзячы з тых рэальных умоў, у якіх жывуць людзі, і той мовы, якой яны карыстаюцца [174, с. 10]. Дадзеная выснова падмацоўваецца і сучасным «дзейнасным» вызначэннем інтелекту, што разглядае яго як здольнасць дзейнічаць *мэтазгодна* і паводзіць сябе *ў адпаведнасці* з сітуацыяй (курсіў мой. – *К. Ш.*). У большасці выпадкаў простыя тэставыя заданні не вырашаюцца чалавекам традыцыйнай культуры толькі таму, што ён прызвычаіўся вырашаць інтэлектуальныя задачы не ізалявана, а ў працэсе практычнай дзейнасці [222, с. 288].

У канцы 20-х гадоў XX ст. убачылі свет першыя працы амерыканскага этнолага і культуролага М. Мід, якая лічыла, што магічны тып мыслення не з'яўляецца цалкам пануючым у традыцыйнай культуры. На падставе ўласных шматгадовых палявых даследаванняў М. Мід пераканаўча даказала, што так званы магічны тып мыслення абумоўлены не асаблівасцямі самога мыслення, а асаблівасцямі выхавання, гэта значыць – культурай традыцыйнага грамадства [222, с. 284].

Крытыка канцэпцыі «пралагічнага мышлення» ўтрымліваецца ў працах выдатнага французскага этнолага і філосафа К. Леві-Строса, творы якога выклікаюць шырокі рэзананс і цікавасць далёка за межамі таго навуковага накірунку, у рэчышчы якога яны былі створаны. Дэталёваму аналізу пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры прысвечана спецыяльная праца К. Леві-Строса «Непрыручаная думка» (1962), аднак некаторыя важныя моманты канцэпцыі вучонага прысутнічаюць і ў яго ранейшай рабоце «Структурная антрапалогія» (1958).

К. Леві-Строс лічыць, што прага да аб'ектыўнага пазнання стварае адзін з найменш улічваемых аспектаў мышлення прадстаўнікоў традыцыйнай культуры. Нягледзячы на тое, што гэтае мышленне рэдка накіроўваецца да рэальнасцей таго ж узроўню, да якіх прывязана сучасная навука, яно ўсё ж мае на ўвазе амаль аднолькавыя інтэлектуальныя дзеянні і метады назірання. У абодвух выпадках навакольны свет з'яўляецца аб'ектам думкі хаця б настолькі, наколькі і сродкам задавальнення гаспадарчых патрэб [165, с. 114, 115].

Міфалагічная логіка брыкалажу (фр. *bricoler* – гуляць з дапамогай адскоку, г. зн. карыстацца абходнымі шляхамі для дасягнення пастаўленай мэты) выступае ў сістэме традыцыйных уяўленняў як асноўная стратэгія адносінаў чалавека з прыродай. Мэта гэтай стратэгіі – асэнсаваць хаця бы частку навакольнага



свету шляхам арганізацыі, упарадкавання яго з далейшым пераразмеркаваннем паміж сферамі прыроды і культуры ў накірунку да апошняй. Адзін з галоўных сродкаў для гэтага – стварэнне ўмоў, пры якіх прыродныя аб'екты пачынаюць уваходзіць у якасці элементаў у знакавыя сістэмы [271, с. 20]. Паміж прыродай і міфам, такім чынам, знаходзяцца яшчэ два звяны: прагматычная цікавасць чалавека да многіх аспектаў знешняга свету і яго патрэба ў кампенсацыі з дапамогай міфалогіі недахопу рацыянальнага і эмпірычнага кантролю над яго з'явамі [180, с. 141].

Міфалагічны брыкалаж, інтуіцыя складалі асноўныя сродкі пазнання ў сістэме традыцыйнага мышлення і, хаця і лічылі сваёй задачай вырашэнне менавіта практычных пытанняў, адначасова задавальнялі інтэлектуальныя патрэбы чалавечага існавання, дасягаючы бліскучых і непрадбачаных вынікаў [165, с. 126]. К. Леві-Строс лічыў, што міфалагічнае мышленне, нават калі яно прывязана да вобразаў, ужо можа быць абагульняючым і дзейнічаць пры дапамозе аналогій і супастаўленняў, нават калі яго канструкцыі зводзяцца да новага ўпарадкавання ўжо існуючых элементаў [Там жа. С. 129].

Блізкія ідэі выказваў таксама заснавальнік школы функцыяналізму ў этналогіі Б. Маліноўскі. Ён лічыў, што магія (у дадзеным выпадку тут маецца на ўвазе тып мышлення прадстаўнікоў традыцыйнай культуры) і навука (як тып мышлення прадстаўнікоў сучаснай культуры) маюць паміж сабой шмат агульных рысаў. Як магія, так і навука зыходзяць з «прэзумпцыі даверу» да навакольнага свету і прынцыповай магчымасці яго пераўтварэння: «Магія, заснаваная на ўпэўненасці чалавека ў тым, што ён зможа ўладарыць над прыродай, калі будзе ведаць кіруючыя ёй магічныя законы, у гэтым аспекце падобна на навуку: навука засноўваецца на перакананні, што вопыт і логіка дзейсныя, а магія – на веры ў тое, што надзея не можа не збыцца, а жаданне – не можа падмануць» [180, с. 21, 86].

Замест таго, каб супрацьпастаўляць магію і навуку (як гэта рабіў, напрыклад, Дж. Фрэзер), трэба размясціць іх паралельна, як два спосабы пазнання, няроўныя па тэарэтычных і практычных выніках (нельга не пагадзіцца з тым, што навука дасягае большых за магію поспехаў, дык і магія ў шэрагу выпадкаў дабіваецца поспехаў), але не па прыродзе ментальных аперацый, якімі абедзве



Репозиторий БГАТУ

яны валодаюць і якія адрозніваюцца не столькі па сваім характары, колькі па тыпу з’яў, да якіх яны прыкладаюцца [165, с. 123, 124].

З такімі высновамі пагаджаўся і савецкі культуролаг Я. М. Меляцінскі: «Відавочная небездапаможнасць міфалагічнага мышлення, якое вырашае практычныя задачы груваскімі і часткова вакольнымі шляхамі, але ўсё ж такі вырашае, вымушае перагледзець тэзіс аб ягонай непрактычнасці і прымітыўнасці» [183, с. 167]. Мышленне тоеснасцю і паўтарэннем, якое грунтуецца на ўпэўненасці ў глабальнай узаемазвянасці ўсіх з’яў навакольнага свету, на думцы аб тым, што пэўная падзея, сказанае слова, знойдзены прадмет, убачаны сон ёсць адлюстраванне іншых падзей, цяперашніх ці будучых, аналагічных назіраемым, з’яўляецца галоўнай перадумовай існавання і шырокага распаўсюджання вялікай колькасці прыкмет і павер’яў, заснаваных на мышленні аналогіямі.

К. Леві-Строс адзначаў, што яго папярэднікі – этнолагі і філосафы, якія займаліся праблемай адрозненняў так званага «прымітыўнага мышлення» ад мышлення навуковага, бачылі між імі толькі якасную розніцу, а тое, што ў абодвух выпадках мышленне аналізуе адны і тыя ж з’явы, ніколі не падвяргалася сумненню. Аднак, на думку вучонага, логіка міфалагічнага мышлення мала чым адрозніваецца ад логікі мышлення навуковага. Розніца тут не ў якасці лагічных аперацый, а ў самой прыродзе з’яў, да якіх прымяняецца лагічны аналіз. Так, ужо даўно было заўважана, што жалезная сякера не таму пераўзыходзіць каменную, што яна «лепш зроблена». Зроблены абедзве аднолькава добра, але жалеза – не тое, што камень. Такім чынам, у міфалагічным мышленні працуе тая ж логіка, што і ў мышленні навуковым, і чалавек заўсёды мысліў аднолькава добра. Прагрэс жа адбыўся не ў мышленні, а ў тым свеце, у якім жыло чалавецтва і ў якім яно ў працэсе доўгай гісторыі сутыкалася з усё новымі з’явамі [166, с. 241, 242].

К. Леві-Строс не першы заўважыў аднолькавасць асноўных аперацый традыцыйнага мышлення і мышлення чалавека сучаснай цывілізацыі, але ён быў, бадай, першым, хто здолеў даказаць гэта не шляхам абстрактных разважанняў і здагадак, не падмацаваных канкрэтнымі фактамі, не шляхам эксперыментальна-псіхалагічнага вывучэння індывідаў, а ў рамках самой традыцыйнай культуры. Асноўнае значэнне яго работ для вывучэння ўзаемаадносінаў паміж культурай і пазнавальнымі працэсамі заключаецца ў дэманстрацыі



таго факта, што этналагічныя дадзеныя пра бясконца разнастайныя прадукты розных культур сведчаць, тым не менш, аб існаванні універсальных аперацый чалавечага розуму.

Прадстаўнікі кагнітыўнай этналогіі – накірунку ў этналогіі, што вывучае асаблівасці мышлення і пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў розных этнасаў ва ўмовах розных культур, – на падставе этналагічнага аналізу матэрыялаў псіхалагічных даследаванняў прыйшлі да высновы аб раўнавартасці традыцыйнай і сучаснай стратэгіі атрымання ведаў пра навакольны свет, бо абедзве стратэгіі аднолькава звязаны з упарадкаваннем, класіфікацыяй і сістэматызацыяй інфармацыі, абедзве ствараюць лагічныя, паслядоўна ўзгодненыя сістэмы ўяўленняў [156, с. 39].

Сучасныя даследаванні помнікаў традыцыйнага мастацтва і звязаных з імі вусна-паэтычных сюжэтаў прыводзяць да вынікаў, аднолькавых з дадзенымі эксперыментальнай псіхалогіі і псіхафізіялогіі ў вобласці вывучэння фундаментальных уласцівасцей чалавечай псіхікі, якія выяўляюцца ў розных формах паводзінаў, у творчай дзейнасці. Тым самым канкрэтызуецца і развіваецца вядомае агульнае палажэнне сучаснай фізічнай антрапалогіі аб тым, што фундаментальныя ўласцівасці фізіялогіі і псіхікі сучаснага чалавека ў прынцыпе тыя ж, як і ва ўсе папярэднія перыяды гісторыі чалавека сучаснага тыпу (Homo sapiens), пачынаючы з верхняга палеаліту [273, с. 54]. Малаверагодна таксама, што існуюць міжкультурныя адрозненні ў асобных асноўных пазнавальных працэсах. Ніводнае сучаснае псіхалагічнае даследаванне не выявіла дадзеных аб адсутнасці ў нейкай культурнай групе якога-небудзь важнага пазнавальнага працэсу – абстракцыі, высновы, катэгарызацыі і інш. [156, с. 236].

Яскравым пацверджаннем гэтага з’яўляюцца вынікі этналагічнага вывучэння традыцыйных класіфікацый аб’ектаў навакольнага прыроднага свету (жывёл, раслін, мінералаў і інш). Бясспрэчны той факт, што класіфікацыі, якія складаюць і якімі карыстаюцца прадстаўнікі традыцыйнай культуры, істотным чынам адрозніваюцца ад навуковых. Нягледзячы на тое, што ў народных уяўленнях аб’екты надзяляюцца пэўнымі найменнямі і прыкметамі ў адпаведнасці з успрыманнем чалавекам рэальных аб’ектаў, з якімі ён сустракаецца ў прыродзе, такое ўспрыманне падпарадкавана ўнутранай логіцы міфалагічнай свядомасці, якая часам істотна адрозніваецца ад логікі свядомасці сучаснага чалавека, а яна, у сваю чаргу, далёка не супадае са строгай логікай навуковага



Репозиторий БГАТУ

аналізу, у адпаведнасці з якой будуецца несупярэчлівая класіфікацыя тых ці іншых прыродных аб’ектаў [99, с. 18, 19]. Сутнаснае адрозненне заключаецца ў тым, што традыцыйнае пазнанне ў якасці класіфікацыйных прыкмет звычайна выкарыстоўвае знешнія, наглядныя ўласцівасці аб’ектаў, а навуковае пазнанне – унутраныя, скрытыя [318, с. 334; 320, с. 156].

Але, адначасова, традыцыйныя класіфікацыі валодаюць многімі характэрнымі рысамі класіфікацый навуковых. Па-першае, яны ўяўляюць сабой сістэмы іерархізаваных паняццяў: аб’екты ў іх не проста размеркаваны ізаляванымі групамі – гэтыя групы падтрымліваюць паміж сабой пэўныя адносіны, а іх сукупнасць стварае адзінае цэлае. Па-другое, гэтыя класіфікацыі, гэтаксама як і класіфікацыі навуковыя, маюць тэарэтычную мэту – не толькі і не столькі задавальняць практычныя патрэбы, але зрабіць зразумелымі адносіны паміж аб’ектамі, якія ўваходзяць у іх [197, с. 67]. Такім чынам, гэтыя класіфікацыі прызначаны перш за ўсё для таго, каб звязваць аб’екты паміж сабой, аб’ядноўваць вынікі пазнання і накіроўваць дзейнасць.

У складанні такіх класіфікацый задзейнічаны амаль усе асноўныя аперацыі сучаснага мышлення, а менавіта: выяўленне падабенства–адрознення, правядзенне абагульнення і канкрэтызацыі, расчлянення і злучэння [165, с. 11]. Так, напрыклад, класіфікацыя сіу аб’ядноўвае істоты і рэчы ў тры катэгорыі, звязаныя з небам, вадой і цвёрдай зямлёй, і арол звязаны менавіта з апошняй. Такая пазіцыя арла будзе незразумелай, калі не ведаць аб ходзе думкі гэтых людзей, якія асацыіруюць арла з маланкай, маланку – з агнём, агонь – з вуглём, а вугаль – з зямлёй: так, у якасці аднаго з «гаспадароў вуглю» арол з’яўляецца «зямной» жывёлай [Там жа. С. 159]. Як бачым, для гэтай класіфікацыі характэрна абагульненне на аснове рэальна ўспрымаемых якасцей элементаў сістэмы, г. зн. яна заснавана на канкрэтным вопыце прадстаўнікоў дадзенай культуры.

Такім чынам, адрозненні паміж культурамі не з’яўляюцца прамым сведчаннем існавання адрозненняў у саміх пазнавальных працэсах, хутчэй наадварот, – яны адлюстроўваюць разнастайныя выяўленні аднолькавых пазнавальных структур. Сістэмы ўяўленняў аб навакольным свеце, іншыя культурныя ўстаноўкі прадстаўнікоў традыцыйнага грамадства могуць адрозніваецца ад сістэм уяўленняў чалавека сучаснай культуры, аднак яны маюць у сваёй аснове тыя ж самыя лагічныя працэсы і накіраваны на высвятленне сувязей



паміж прычынай і следствам. Аналагічна класіфікацыі і паняцці могуць адрозніваецца аб’ектамі і з’явамі, што аб’ядноўваюцца ў групы, а таксама прыкметамі, якія выкарыстоўваюцца пры групіроўцы, аднак усе класіфікацыі пабудаваны пры дапамозе адных і тых жа працэсаў абстрагавання і абагульнення. Усе прааналізаваныя намі факты сведчаць аб наяўнасці ў мышленні прадстаўнікоў традыцыйнага грамадства пэўных структур, падобных на лагічную рацыянальнасць, чым і тлумачыцца здольнасць такога мышлення да выканання асноўных разумовых аперацый, якія здзяйсняе чалавек сучаснай цывілізацыі.

## 1.2. Экалагічныя веды ў сістэме традыцыйных народных ведаў

Веды – гэта вынік пазнання чалавекам прадметаў і з’яў рэчаіснасці, законаў прыроды і грамадства. Структура ведаў уключае ў якасці элементаў паняцці, катэгорыі, тэорыі і іншыя формы, увасобленыя ў знаках і знакавых сістэмах мовы і ў іншых сродках адлюстравання свету ў свядомасці людзей. Веды неабходны чалавеку для арыентацыі ў навакольным свеце, для тлумачэння і прадбачання падзей, для планавання і рэалізацыі дзейнасці і выпрацоўкі новых ведаў.

Адной з важнейшых частак гэтай сістэмы ведаў з’яўляюцца традыцыйныя народныя веды, якія на працягу доўгіх часоў забяспечвалі паспяховае вядзенне чалавечай дзейнасці і паспяховае функцыянаванне культуры. Разнастайныя па сваім характары, яны ахопліваюць усе бакі дзейнасці чалавека традыцыйнай культуры: спосабы вядзення гаспадаркі, веды аб навакольным прыродным асяроддзі і яго асаблівасцях, спосабы лячэння хвароб і г. д.

Усю суму ведаў, у нейкай ступені непаўторных, якія і адрозніваюць дадзеную этнічную супольнасць ад іншых, В. П. Аляксееў прапанаваў назваць «інфармацыйным полем» этнасу [30, с. 19]. У кнізе «Станаўленне чалавецтва» даследчык патлумачыў сваё разуменне «інфармацыйнага поля», расклаўшы яго на тры ўзроўні. Першы з іх – этнічны ўзровень, г. зн. той запас культурных каштоўнасцей, традыцый, рэлігійна-магічных уяўленняў, якія ўваходзяць у этнічную самасвядомасць і прадвызначаюць уключэнне ў склад менавіта гэтага этнасу і ніякага іншага. Другі ўзровень складаюць тыя веды і ўяўленні, якія звязаны з адносінамі



Рэпазіторый БГАТУ

дадзенага этнасу з іншымі, г. зн. тое, што ўваходзіць у сферу абмену і кантактаў. Трэці ўзровень – тыя канкрэтныя веды, якія складаюць вузкалакальную спецыфіку этнасу (агратэхнічныя навыкі і назіранні, атрыманыя ў працэсе вядзення земляробчай гаспадаркі менавіта на дадзеных глебах, навыкі выбару лепшай пашы для свойскай жывёлы ва ўмовах менавіта гэтага ландшафту і г. д.) і даюць найбольш поўнае ўяўленне аб асяроддзі яго існавання [31, с. 370, 371].

Даследчык адзначаў, што «біясфера – не толькі крыніца жыцця для чалавека ў прамым, самым непасрэдным сэнсе слова, але і вялікі стымул самага таямнічага, што ёсць у чалавеку – яго творчай энергіі, яго вобразна-пазнавальнай дзейнасці» [31, с. 452]. Больш таго, прыродзе чалавека (як асобнага індывідума, так і грамадства ў цэлым) уласціва імкненне да паляпшэння свайго жыццёвага асяроддзя, якое не абмяжоўваецца рамкамі матэрыяльнага абмену, а вызначаецца рэалізацыяй патрэбаў у творчым удасканаленні і росце, у развіцці духоўнага ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем [334, с. 71].

Гісторыя цывілізацыі – гэта гісторыя асваення чалавекам прыроднага асяроддзя, якой нязменна спадарожнічала змена ўяўленняў аб ім. Чалавецтва ў цэлым і кожны народ паасобку стварылі пэўную сістэму ўяўленняў аб свеце (карціну свету), зыходзячы са сваіх назіранняў і рэальных патрэбаў у яго асваенні. На самых ранніх этапах гісторыі назіранняў чалавека за прыродай, навакольным светам былі закладзены асновы ўяўленняў аб іх, якія паслужылі базай для станаўлення культуры, мастацтва, навукі. У гісторыка-псіхалагічным плане станаўленне і развіццё народных ведаў звязана з эвалюцыяй кагнітыўных асаблівасцей чалавечага мышлення.

Гістарычна ўласцівыя чалавечаму грамадству традыцыйныя веды ўваходзяць у склад духоўнай культуры этнасу, аднак яны ў той жа час цесна звязаны з матэрыяльнай і сацыяльнай сферамі культуры. Таму даследаванне народных ведаў цягне за сабой больш глыбокае асэнсаванне этнакультурных працэсаў, дае ўяўленне аб развіцці матэрыяльнай, сацыяльнай і духоўнай культуры этнасу, дазваляе зразумець прычыны ўзнікнення многіх вераванняў і рэлігійных уяўленняў, а таксама прасачыць вытокі навуковай думкі.

Сёння, у пачатку XXI стагоддзя, мы з'яўляемся сведкамі значных зменаў ва ўяўленнях аб Сусвеце, аб складаных сістэмах



узаемасувязей і ўзаемазалежнасцей у ім, зменаў, якія адбываюцца ў навуках, што вывучаюць чалавека, прыроду і грамадства. Разам з удакладненнем уяўленняў аб прыродзе, аб сістэмных сувязях у навакольным свеце, прыходзіць і новае разуменне значэння вопыту, назапашанага ў традыцыйнай культуры этнасаў. Вывучэнне матэрыялу традыцыйнай народнай культуры, унікальнага народнага вопыту ў вобласці жыццезабеспячэння, адкрывае магчымасці для ўкаранення ў практыку гаспадарчай дзейнасці традыцыйных метадаў, якімі нашы продкі паспяхова карысталіся на працягу стагоддзяў. Зварот да народнага вопыту садзейнічае таксама ўдакладненню ўжо існуючых ўяўленняў аб карціне свету, з'яўленню новых навуковых накірункаў (напрыклад, біялакацыі).

У найбольш агульным плане гістарычнае развіццё традыцыйных ведаў можна прадставіць наступным чынам. На пачатковым этапе гісторыі чалавека, калі ён толькі вылучыўся з жывёльнага свету, біялагічны пачатак адыгрываў у яго жыцці вядучую ролю; доўгі час чалавек заставаўся проста неад'емнай часткай прыроды. Аднак ужо на ранніх стадыях антрапагенезу, на стадыі піцекантрапаў і неандэртальцаў, сфарміраваліся такія сферы свядомасці, як сферы эмпірычнага вопыту і абагульнення яго вынікаў [31, с. 247]. Гэта зрабіла магчымым назапашванне канкрэтных ведаў, якія правяраліся вопытам многіх пакаленняў. Так узнікла сістэма эмпірычных ведаў, і з дадзенага перыяду можна разглядаць веды як важны элемент культуры.

Гаспадарчая дзейнасць першабытных людзей (пабудова і абсталяванне жытлаў, шыццё цёплага адзення, нарыхтоўка доўгатэрміновых запасаў ежы) патрабавала актыўнай, сістэматычнай і рознабаковай арыентацыі ва ўласцівасцях навакольнага свету. Першапачатковыя астранамічныя, біялагічныя, матэматычныя веды, адпаведнасць якіх рэальным з'явам навакольнага свету не выклікае сумненняў, былі звязаны логікай іх практычнай арыентацыі на задавальненне патрэб чалавечых калектываў [273, с. 56]. У гэтай сістэме ведаў мы не знаходзім элементаў, якія б не ўзыходзілі да рэальнай практыкі арыентацыі гаспадарчых калектываў у прасторы, у часе, у колькасных і якасных суадносінах навакольнага свету. Такім чынам, спецыфіка першапачатковых форм народных ведаў заключаецца перш за ўсё ў іх непасрэднай залежнасці ад практычных патрэб калектываў паляўнічых, рыбаловаў і збіральнікаў. Можна таксама гаварыць аб



Репозиторий БГАТУ

складаным сінкрэтызме, глыбокай узаемаабумоўленасці першапачатковых формаў народных ведаў [274, с. 156, 169].

На больш позніх стадыях антрапагенезу, звязаных з фарміраваннем чалавека сучаснага тыпу (*Homo sapiens*), узнікае ў поўным сэнсе абстрактная свядомасць [31, с. 246]. На гэтай падставе адбываецца далейшае развіццё ўзроўню назапашаных ведаў, колькаснае і якаснае паглыбленне і пашырэнне ўсёй сістэмы ведаў: эмпірычныя веды пераплятаюцца з міфалагічнымі, рэлігійнымі ўяўленнямі, абстрактнымі ведамі аб навакольным свеце, з мастацтвам і інш. У чалавека адбываецца страта блізкіх і непасрэдных адносінаў з прыродай, на некаторыя рацыянальныя веды накладаецца налёт містыкі. У гэты ж час сфарміраваліся асноўныя метады пазнання: метад абагульнення, метад абстрагавання і пераходу ад абстрактнага да канкрэтнага, індуктыўны і дедуктыўны, метад аналогіі, якія істотна дапаўняліся інтуіцыяй. Гэтая сістэма ведаў была зразумела і даступна амаль усім членам калектыву, а яе прымяненне дыферэнцыявана індывідуальным узроўнем інтэлекту, узростам, полам чалавека, яго становішчам у сацыяльнай групе і інш. Адрозненне ведаў у прасторы вызначалася перш за ўсё адрозненнем рэгіянальных культур.

Аднак далейшае развіццё культуры, назапашванне вопыту і павелічэнне патрабаванняў практыкі, развіццё абстрактных уяўленняў аб Сусвеце, ускладненне рэлігійных культаў і сацыяльнай структуры грамадства прывяло да вылучэння людзей, якія прафесійна спецыялізаваліся на назапашванні і прымяненні ведаў (знахары, шаманы, жрацы і г. д.). Ідэя «спецыялізацыі» ў справе захавання і выкарыстання ведаў, што перадаваліся з пакалення ў пакаленне, была вельмі развіта: прадстаўнікі традыцыйнай культуры прызнавалі прыярытэт «спецыялістаў» па многіх пытаннях веры і абраднасці [180, с. 235].

Такім чынам, традыцыйныя народныя веды – гэта сукупнасць ведаў, назапашаных этнасам на працягу ўсяго гістарычнага развіцця, акумуляваных гаспадарчай дзейнасцю, эмпірычным вопытам, міфалогіяй, рэлігійнымі ўяўленнямі, мастацтвам, элементамі матэрыяльнай культуры. Гістарычнае назапашванне, пашырэнне, паглыбленне традыцыйных народных ведаў ішло пастаянна, у прасторы і ў часе. Эвалюцыя традыцыйных народных ведаў у напрамку іх прагрэсіўнага развіцця вызначалася перш за ўсё патрэбамі канкрэтнага грамадства, дынамікай яго культуры, магчымасцямі абмену ведамі з іншымі рэгіёнамі, унутранай логікай



развіцця пазнавальных здольнасцей чалавека. Рэгрэс сістэмы ведаў у тых ці іншых раёнах айкумены быў адкланеннем ад агульнага накірунку яе развіцця і адбываўся з прычыны сацыяльных, эканамічных, палітычных крызісаў, разбуральных войнаў, пагаршэння прыроднага асяроддзя і, тым больш, экалагічных катастроф. Падчас іх назіралася парушэнне дынамічнай раўнавагі зваротных сувязей у сістэме «навакольнае асяроддзе–грамадства–культура» і, як вынік, – крызіс складаючых элементаў гэтай сістэмы, а ў крайнім выпадку – і ўсёй сістэмы.

Паступова, у т. л. і на падставе народных ведаў, узніклі веды навуковыя, якія з’яўляюцца ўпарадкаванымі сістэмамі паняццяў, суджэнняў, доказаў, тэорый і іншых элементаў лагічнай структуры. Яны імкнуцца раскрыць сутнасць з’яў, аб’ектыўныя законы іх развіцця, патрабуюць строгай доказнасці сваіх палажэнняў і вывадаў [82, с. 12]. На сучасным этапе ў большасці рэгіёнаў планеты сістэма ведаў уяўляе сабой сукупнасць навуковых і штодзённых ведаў. Традыцыйныя народныя веды ўваходзяць у склад штодзённых і з’яўляюцца перыферыйнай іх часткай, у той час як аснову штодзённых ведаў складаюць навуковыя і псеўданавуковыя веды.

Пры даследаванні дадзенай праблематыкі неабходна дакладна высвятліць узаемасувязь рацыянальнай і нерацыянальнай частак народных ведаў аб прыродзе. У этналагічнай навуцы доўгі час існаваў і нават пераважаў падыход (яго ўплыў, дарэчы, бачны і зараз у айчыннай этналогіі) падзяляць традыцыйныя народныя веды на «рацыянальныя» веды, навыкі, што адносяцца да прыроды, гаспадаркі, тэхналогіі, яўна ці няяўна супрацьпастаўляючы іх сферы «ірацыянальнага», г. зн. рознага роду забабонам, магіі, анімістычным поглядам, міфалогіі і г. д. Назапашаны фактычны матэрыял дазваляў даследчыкам гаварыць аб тым, што фонд «дакладных», «рацыянальных» ведаў аб прыродзе і чалавеку ў грамадствах з пераважаннем данавуковай свядомасці характарызуецца значным багаццем, дэталёвай прапрацоўкай асобных кампанентаў, але тут жа падкрэслівалася яго абмежаванасць, існаванне няправільнага асэнсавання прыродных і грамадскіх працэсаў і памылковых высноў, заснаваных на забабонах і прымхах [201, с. 45]. Таму адной з самых важных праблем лічылася высвятленне ўзаемаадносін «станоўчых», «дакладных», «рацыянальных» ведаў і таго кола з’яў духоўнай культуры, якое не можа быць аднесена да іх.



Репозиторий БГАТУ

Доўгі час у этналогіі быў распаўсюджаны пункт погляду, згодна якому ў «традыцыйнай грамадскай свядомасці» існуюць дзве плыні ўяўленняў: адна «адносна адэкватная акаляючай рэчаіснасці» і другая – «ірацыянальная» [127, с. 24]. Пры такім разуменні праблемы на першы план выходзіла пытанне: як узаемадзейнічалі гэтыя дзве плыні ў рэальнай жыццядзейнасці прадстаўніка традыцыйнай культуры: ці былі яны дакладна размежаваны між сабой, ствараючы дзве замкненыя сферы ідэй, ці, наадварот, цесна перапляталіся, ствараючы пэўную цэласнасць. Перавагу тут атрымалі прыхільнікі другога меркавання. Неаднаразова адзначалася, што і тая і другая плыні прыкладаліся да адных і тых жа прадметаў і дзеянняў, функцыянавалі раўнапраўна. Так, напрыклад, нябесныя свяцілы служылі надзейным сродкам вырашэння праблемы арыентацыі ў прасторы і часе, але да іх жа звярталіся за дапамогай пры хваробах жывёлы, да іх адрасавалі многія рытуалы. На думку воіна, вастрыё яго зброі змазваецца не рэчывам, якое мае прыродныя таксічныя ўласцівасці, добра вядомыя гэтаму чалавеку, а субстанцыяй, якая пасля правядзення пэўных магічных дзеянняў становіцца носьбітам злаякасных пачаткаў [Там жа. С. 25].

Існуе погляд, згодна якому «ірацыянальны пачатак» падключаўся, калі «рацыянальны» выяўляў сваю недастатковасць для атрымання жадаемага выніку. Пры гэтым «першае не супярэчыла другому, не выключала яго, а дапаўняла і працягвала» [127, с. 24]. Менавіта гэтага пункту погляду прытрымліваўся ў прыватнасці Б. Маліноўскі: прызнаючы той факт, што кожная традыцыйная культура валодае значным запасам ведаў, заснаваных на вопыце і сістэматызаваных розумам, не адмаўляючы існаванне сферы практычнай дзейнасці і рацыянальнага светапогляду, ён, аднак, падкрэсліваў, што, калі чалавек традыцыйнай культуры бачыць недастатковасць сваіх ведаў і свайго рацыянальнага падыходу, ён звяртаецца да магіі [180, с. 28, 34, 37]. Так, напрыклад, у свядомасці прадстаўніка традыцыйнай культуры існуе дакладнае размежаванне: з аднаго боку, маецца набор добра вядомых умоў, натуральны працэс росту свойскай жывёлы, а таксама хваробы і нябеспекі, з якімі неабходна змагацца з дапамогай звычайных прафілактычных і лячэбных сродкаў. З другога боку, маецца сфера дзеяння невытлумачальных і непрадказальных неспрыяльных з'яваў. І калі праблемы першага



парадку спрабуюць вырашаць з дапамогай ведаў і працы, то праблемы другога – пасрэдніцтвам магіі [Там жа. С. 30, 31].

Магія не зыходзіць з назіранняў за прыродай ці ведання яе законаў, а лічыцца спрадвечным здабыткам чалавека, які перадаецца толькі праз традыцыю і сцвярджае аўтаномную здольнасць чалавека дасягаць жадаемых мэтаў [180, с. 76]. Магія дае чалавеку традыцыйнай культуры цвёрдае перакананне ў тым, што ён здольны быць паспяховым і тым самым дасягнуць сваёй мэты; яна таксама забяспечвае яго асаблівымі ментальнымі і матэрыяльнымі тэхнікамі там, дзе звычайныя веды і навыкі не дапамагаюць. Такім чынам, яна дае чалавеку магчымасць з упэўненасцю вырашаць яго жыццёва важныя задачы, захоўваючы самавалоданне і псіхічную цэласнасць у абставінах, якія, калі б не было магіі, поўнасцю дэмаралізавалі б яго (напрыклад, у выпадку павальнай хваробы хатняй жывёлы) [Там жа. С. 136]. На думку Б. Маліноўскага, у жыццядзейнасці прадстаўніка традыцыйнай культуры яскрава прасочваецца свайго роду «прынцып дапаўняльнасці» – рацыянальныя дзеянні і прыёмы суправаджаюцца дзеяннямі рытуальнымі, пры гэтым «не назіраецца спробы звядзення іх у несупярэчлівую сістэму» [201, с. 7].

У этналагічных работах апошняга часу ўсё больш акрэслена развіваецца ідэя непадзельнасці «практычных», «рацыянальных» ведаў і міфалогіі, рытуала, «ірацыянальных» уяўленняў. Яна асноўваецца на разуменні ўнутранай прыроды грамадства той стадыі развіцця, калі «вытворчасць рэчаў, промыслы, любая стваральная дзейнасць санкцыянавалася не толькі рэальнымі патрэбамі, але і рытуалам» і калі рэгламентацыя, рытуалізацыя і сакралізацыя насілі ўсеагульны характар [201, с. 8]. Другая агульная аснова непадзельнасці сферы традыцыйных ведаў заключаецца ў адзінстве ўяўленняў аб Сусвеце (мадэлі Сусвету), якое складваецца ў першабытным грамадстве і яшчэ доўгі час праяўляе сябе ў грамадствах, што даўно перажылі стадыю першабытнасці. Гэтае адзінства вызначаецца праз паняцце «міфапаэтычнай» ці «касмалагічнай» эпохі [271, с. 9, 10]. Асноўны спосаб разумення Сусвету і вырашэння яго супярэчнасцей тут забяспечваецца міфам, міфалогіяй, якую можна акрэсліць не толькі як набор (ці нават сістэму) міфаў, а – галоўнае – і як асаблівы тып мышлення, што мала чым адрозніваецца ад тыпу мышлення сучаснага чалавека (мае не якасныя, а толькі колькасныя адрозненні).



Репозиторий БГАТУ

На гэтай падставе некаторыя даследчыкі робяць выснову аб немэтазгоднасці нашага супрацьпастаўлення «міфалагічных адносінаў да Сусвету» і «станоўчых ведаў» аб ім. Нават комплексы ідэй, якія раней называліся забабонамі, таксама нараджаліся са спробаў прадстаўнікоў традыцыйнай культуры растлумачыць з’явы навакольнага асяроддзя, а таму з’яўляюцца важнай і неад’емнай часткай народных ведаў. Істотным аргументам на карысць гэтай думкі з’яўляецца характэрная асаблівасць пазнавальнага працэсу: падзел на «натуральнае» і «звышнатуральнае» ў мышленні прадстаўніка традыцыйнай культуры адсутнічае, паколькі Сусвет тут уяўляецца выключна на ўзроўні рэальнасці, у ім усё натуральна. У такой мадэлі правілы, законы разумны, бо разумна сама мадэль Сусвету, што забяспечвае дабрабыт яе носьбітам [279, с. 173].

У такой сітуацыі падзел на рацыянальнае і нерацыянальнае падаецца дастаткова штучным утварэннем. Англійскі этнолаг Р. Хортан вельмі трапна выказаўся на гэтую тэму: «Сказаць аб чалавеку традыцыйнай культуры, што ён цікавіцца хутчэй звышнатуральнымі, чым прыроднымі прычынамі пэўнай з’явы, мае нямногім болей сэнсу, чым гаварыць аб фізіку, што ён цікавіцца больш атамнымі і малекулярнымі, чым, напрыклад, гравітацыйнымі прычынамі працякання тых ці іншых працэсаў. На самой справе, абодва яны выкарыстоўваюць тэорыю толькі для таго, каб пераадолець уласцівае індывідуальнаму чалавечаму мышленню вузкае бачанне прыродных прычын, каб унесці адзінства ў разнастайнасць, прастату ў складанасць, парадак у беспарадак і рэгулярнасць у анамалію» [127, с. 17]. Больш таго, зараз можна казаць аб адноснасці саміх навуковых ведаў аб прыродзе, з якімі праводзіцца параўнанне народных ведаў: тое, што яшчэ ўчора не выклікала ніякіх сумненняў, сёння ставіцца пад пытанне.

Акрамя таго, і містычная думка прыносіла практычную карысць. Так, напрыклад, К. Леві-Строс звярнуў увагу на вялікую сілу ўздзеяння шаманскіх магічных абрадаў, якія дапамагалі вылечваць нават цяжкія ўнутраныя хваробы. Такая дзейснасць магіі, на яго думку, тлумачыцца верай у яе, верай, якая паўстае ў трох відах, дапаўняльных у адносінах адзін да аднаго:

1) вера шамана ў дзейснасць сваіх прыёмаў;

2) вера хворага ва ўласнае выздараўленне;

3) вера грамадства, псіхалагічная настроенасць, якая дасягаецца калектыўным удзелам у адпаведных абрадах.



Усё гэта стварае разам нешта накшталт «гравітацыйнага поля», у межах якога складваюцца ўзаемаадносіны шамана і тых, каго ён лечыць [166, с. 172, 173].

У той жа час нельга цалкам пагадзіцца з тым, што падзел традыцыйных ведаў на рацыянальную і нерацыянальную часткі і супрацьпастаўленне іх на гэтай падставе карысны толькі для прадстаўнікоў дакладных навук, якія маюць прыкладную цікавасць да народных ведаў. Нягледзячы на тое, што асноўнымі задачамі этнолага з’яўляюцца вывучэнне народных ведаў як феномена традыцыйнай культуры, выяўленне спецыфікі пазнавальнай дзейнасці ў розных культурах і інш., ніхто не здымаў з яго абавязак абгрунтавання практычнага выкарыстання народных ведаў (і найперш, традыцыйных ведаў аб прыродзе. – *К. Ш.*) на карысць грамадства, а таму нельга канчаткова адмаўляцца ад іх падзелу на рацыянальныя і нерацыянальныя (хаця неабходна прызнаць, што такі падзел дастаткова ўмоўны).

У сувязі з гэтым, этналагічны тэрмін «традыцыйныя народныя веды» павінен ахопліваць усю сукупнасць гаспадарчай дзейнасці, побытавай практыкі, адносінаў у грамадстве, сям’і, сферы светапоглядных уяўленняў, абраднасці, фальклору, паводзінаў, маралі, якія фарміруюць асобную вобласць традыцый [201, с. 6, 7]. Тым самым перад этналогіяй ставіцца задача вывучэння не толькі тых ці іншых абласцей традыцыйнай культуры, але і ведаў у гэтых абласцях.

З улікам усяго вышэйсказанага, выдзяленне сферы традыцыйных народных ведаў у якасці спецыяльнага аб’екту этналагічнага аналізу цалкам абгрунтавана і неабходна, падобна аналагічнаму выдзяленню шэрагу іншых феноменаў традыцыйнай культуры, але яно павінна засноўвацца на трывалым разуменні адзінства, непадзельнасці сувязей – семантычных, светапоглядных, генетычных, функцыянальных, – якія і ствараюць цэласную сістэму традыцыйных народных ведаў, што вызначаюць механізм фарміравання і функцыянавання матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры. У той жа час карысныя структурная дыферэнцыяцыя і класіфікацыя, бо менавіта яны садзейнічаюць найбольш поўнаму выяўленню прадметнага складу сферы народных ведаў і засяроджанню ўвагі на кожным яе раздзеле; у прыватнасці, адной з важнейшых задач этналогіі з’яўляецца зварот да такога слаба вывучанага раздзелу, як традыцыйныя экалагічныя веды.



Репозиторий БГАТУ

Сярод жывых істот чалавек займае асаблівае месца. Наяўнасць розуму, маўлення, здольнасці ствараць і ўдасканальваць прылады працы і іншыя асаблівасці чалавека забяспечылі яго хуткае развіццё і ва многім вызначылі спецыфіку ўзаемаадносінаў з прыродай. У адрозненне ад іншых істот чалавек прыстасоўваецца ці адаптуецца да прыроднага асяроддзя свайго пражывання не толькі і не столькі біялагічным шляхам, г. зн. шляхам змянення фізіялагічных, марфалагічных і іншых параметраў, колькі шляхам змянення сваёй гаспадарчай дзейнасці і звязанай з ёй культуры, якая з’яўляецца асноўным механізмам жыццязабеспячэння і адаптацыі чалавека да прыроднага асяроддзя [334, с. 3, 4]. Другой асаблівасцю экалогіі чалавека з’яўляецца яго ўсё ўзрастаючая здольнасць змяняць прыроднае асяроддзе свайго пражывання, прыстасоўваючы яго не толькі для біялагічна неабходнай адаптацыі, але і для ўсё болей featured разнабаковага жыццезабеспячэння. Чалавек – істота калектыўная, і людзі ўзаемадзейнічаюць з прыродай не паасобку: яны аб’ядноўваюцца ў пэўныя групы ці супольнасці, народы ці этнасы.

Традыцыйныя экалагічныя веды вывучае шэраг этналагічных субдысцыплін і накірункаў, якія ў айчыннай і замежнай навуковай традыцыі маюць розныя назвы, аднак прыкладна аднолькавы тэарэтычны змест: народная батаніка (этнабатаніка), народная заалогія і ветэрынарыя (этназаалогія) і народная метэаралогія (этнаметэаралогія).

Этнабатаніка – галіна навукі на мяжы этналогіі і батанікі, прадметам якой з’яўляецца комплекс узаемазвязаных праблем, якія разглядаюцца з пункту гледжання адносін этнасу з раслінңай часткай экасістэмы. Сюды адносяцца праблемы этнічных адрозненняў у гістарычна асвоеных экасістэмах, падтрымання калектывам экалагічнай раўнавагі, адаптацыі расліннага свету ў сферах матэрыяльнага і духоўнага жыцця ў адпаведнасці з традыцыямі і інавацыямі і адлюстравання гэтай адаптацыі ў мове, сімволіцы, вераваннях, уяўленнях і ў этнапсіхалагічных асаблівасцях успрыняцця свету. У цяперашні час у замежнай этналогіі, асабліва ў ЗША, назіраецца тэндэнцыя весці этнабатанічныя даследванні ў рэчышчы «этнанавукі», г. зн. увага акцэнтуецца на этнічных класіфікацыйных і пазнавальных сістэмах у дачыненні да расліннага свету. Больш шырока этнабатаніка разумеецца ў Францыі, дзе яна набыла асаблівую папулярнасць – там створаны спецыяльныя лабараторыі і чытаюцца адпаведныя курсы ва ўніверсітэтах. На міжнародных этналагічных і батанічных



канферэнцыях і кангрэсах часта арганізуюцца асобныя секцыі этнабатанікі. Даследаванні ў вобласці этнабатанікі за апошнія гады атрымалі значнае развіццё ў Польшчы, дзе ў рамках міжнароднага саюза антрапалагічных і этналагічных навук створана інтэрнацыянальная група для вывучэння праблем этнабатанікі [337, с. 84, 85].

Этназаалогія – навуковая дысцыпліна, якая ўзнікла на мяжы этналогіі і заалогіі і вывучае своеасаблівасці ўзаемаадносін асобных этнічных груп з жывёльным светам. Этназаалогія разглядае гэтыя ўзаемаадносіны ў двух планах: як яны складваюцца практычна і як яны адлюстроўваюцца ў духоўным свеце людзей. Першы аспект звязаны са спецыфікай гаспадарчых сістэм (паляванне, рыбалоўства, жывёлагадоўля і інш.) і гадавога гаспадарчага цыкла, якія ў сваю чаргу ў некаторай ступені вызначаюць своеасаблівасць сацыяльных адносінаў, цырымоній і рытуалаў, а таксама з выкарыстаннем прадуктаў, атрыманых ад жывёл, у гаспадарцы, сацыяльным жыцці, народнай медыцыне, рытуалах і г. д. Этназаалогія вывучае таксама змены фаўны і яе геаграфічнага распаўсюджання ў выніку дзейнасці чалавека. Другі накірунак вывучае ўяўленні аб жывёльным свеце, якія з’яўляюцца важнай часткай светапогляду. Сюды, ў прыватнасці, ўваходзяць мясцовыя сістэмы класіфікацыі, якія часта зыходзяць з іншых крытэрыяў, чым навуковыя. Сюды ж уваходзіць і вывучэнне мясцовых назваў жывёл, а таксама сімволікі, выкліканай тымі ці іншымі ўяўленнямі аб жывёлах і іх узаемаадносінах з людзьмі [337, с. 88, 89].

Этнічная метэаралогія – накірунак навукі, які вывучае этнакультурныя аспекты традыцыйных уяўленняў народаў свету, звязаныя з прадказаннем надвор’я ў кантэксце сучасных прыродазнаўчых уяўленняў аб карціне свету. Арганічна звязаны з культурнымі традыцыямі пэўнай этнічнай супольнасці гэты матэрыял у той жа час строга прымеркаваны да рэгіянальных прыродна-кліматычных асаблівасцей і ўяўляе сабой прыклад арыгінальнага бачання акаляючага свету [272, с. 103].

На падставе аналізу гістарыяграфіі праблемы магчыма прапанаваць вызначэнне традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў у якасці комплексу назапашаных на працягу многіх стагоддзяў вынікаў эмпірычных назіранняў за прыроднымі працэсамі і з’явамі і зробленых на гэтай падставе высноў, якія выкарыстоўваліся нашымі продкамі ў іх штодзённай практычнай дзейнасці і былі замацаваны ў традыцыі, перадаючыся з пакалення



Репозиторий БГАТУ

ў пакаленне пераважна непісьмовым чынам (шляхам вуснай трансмісіі і паўтору дзеянняў).

Экалагічныя веды і ўяўленні існуюць у выглядзе колькасна згрупаваных прадуктаў пазнавальнай дзейнасці, часам, аднак, супярэчлівых, у якіх спалучаюцца рацыянальныя і нерацыянальныя элементы. Паміж імі няма дакладнага размежавання, і яны ўспрымаюцца як адзінае цэлае. Структурныя кампаненты сістэмы традыцыйных экалагічных ведаў знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі і актыўным узаемадзеянні: традыцыйная метэаралогія беларусаў мае зоны перакрыцця з народнай батанікай і заалогіяй праз вялікую колькасць прыкмет, што ўзніклі ў выніку працяглых назіранняў за раслінамі і прадстаўнікамі жывёльнага свету. У сваю чаргу, матывы надвор'я прысутнічаюць у народнай батаніцы: у беларусаў вядомы расліны (напрыклад, каліна), у якія нібыта не б'е гром; на Палессі асвечаную вярбу палілі у печы ці выкідалі на двор для спынення дажджу ці адгона хмары; вядомы таксама этымалагічныя і міфалагічныя сувязі дуба з громам і Пярунам і інш. У народнай заалогіі сувязь з надвор'ем маюць некаторыя прадстаўнікі жывёльнага свету: змеі валадарац вадою, ветрам і навальніцай; забойства змяі, а таксама жабы павінна выклікаць дождж; бусел ахоўвае дом ад маланкі, а нанясенне шкоды гэтай птушцы пагражае, акрамя прамой помсты крыўдзіцелю, засухай, ліўнем, навальніцай, бурай.

Традыцыйныя экалагічныя веды адлюстроўваюць ступень пазнання і практычнага асвойвання законаў прыроды прадстаўнікамі беларускага этнасу, а таму з'яўляюцца важнай этнавызначальнай прыкметай. Акрамя таго, у адрозненне ад іншых частак народных ведаў (народнай матэматыкі, метралогіі і інш.), экалагічныя веды характарызуюцца большай устойлівасцю: яны няспынна развіваюцца, узбагачаюцца, але захоўваюць пры гэтым сваю старажытную аснову і этнічную спецыфіку. Таму даследаванне пытанняў традыцыйных экалагічных ведаў мае вялікае значэнне пры вывучэнні шэрагу спрэчных пытанняў этнічнай гісторыі.

Для вывучэння акаляючай прыроды ў яе традыцыйным народным успрыманні і асэнсаванні выкарыстоўваюцца крыніцы living рознага роду. Пры гэтым кожная са сфер традыцыйнай культуры, кожны фальклорны жанр і лінгвістычны матэрыял маюць сваю спецыфіку і розную каштоўнасць у плане рэканструкцыі ўяўленняў аб навакольным прыродным асяроддзі. Традыцыйныя экалагічныя



веды беларусаў найбольш непасрэдна адлюстраваны ў такіх элементах духоўнай культуры, як прыкметы і павер'і, што ахопліваюць практычна ўсе бакі чалавечай жыццядзейнасці: народны каляндар, штодзённы побыт і гаспадарчую практыку, якая ўключае розныя занятк і промыслы (земляробства, развядзенне і догляд хатніх жывёл і птушак, паляванне, рыбалоўства і інш.). Традыцыйныя экалагічныя веды і ўяўленні выступаюць у якасці матывіровак забаронаў, рытуальна-магічных дзеянняў, нярэдка ў працэсе гістарычнай эвалюцыі іх першапачатковы сэнс змяняецца ці наогул сціраецца (так, напрыклад, магічная функцыя выцясняецца гульнявой і пазбаўляецца міфалагічнага зместу). Яны зафіксаваны таксама ў пісьмовых крыніцах і ў помніках матэрыяльнай культуры (сродкі перамяшчэння, жылыя і гаспадарчыя пабудовы і інш).

Такім чынам, этналагічнае даследаванне спецыфікі пазнавальнай дзейнасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры сведчыць аб адсутнасці ў ёй асаблівага «далагічнага» тыпу мышлення. Чалавек традыцыйнай культуры, як і чалавек культуры сучаснай, шукае шляхоў да аб'ектыўных ведаў, імкнецца падцвердзіць свае перакананні эмпірычным фактам, разумее паняцці «прычына» і «следства», зыходзіць з актыўных гіпотэз, спрабуе ўпарадкаваць свае ўражанні і вопыт у пэўныя лагічныя сістэмы. Аднак, робячы класіфікацыю ўражанняў, ён выбірае іншыя, больш наглядныя і непасрэдна ўспрымаемыя якасці аб'ектаў, а спосабы яго абагульненняў з'яўляюцца вельмі разнастайнымі і няўстойлівымі. Менавіта ў гэтым яго пазнавальная дзейнасць больш за ўсё адрозніваецца ад дзейнасці чалавека сучаснай культуры, які за аснову свайго мышлення прымае ўстойлівыя, адназначныя лагічныя падставы.

Аналіз палявых этнаграфічных матэрыялаў дае падставу сцвярджаць, што ў канцы XX – пачатку XXI ст. носьбітам традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў з'яўляецца сацыяльна-дэмаграфічная група вясковых жыхароў, старэйшых за 60 гадоў, а асноўная сфера іх функцыянавання і прымянення – прыватная падсобная гаспадарка. З кожным годам становіцца ўсё цяжэй вывучаць традыцыйныя экалагічныя веды ў палявых умовах, пры непасрэдным кантакце з інфарматарамі, нават самымі сталымі, бо ў сучасны момант, у час шырокага распаўсюджання навуковых ведаў, у час панавання навуковай карціны бачання свету, сфера існавання народных ведаў усё больш звужаецца. На тэрыторыі



Репозиторий БГАТУ

Беларусі яны захоўваюцца ў тых галінах, дзе навуковыя веды не дабіліся вялікіх поспехаў (напрыклад, у метэаралогіі); імі таксама карыстаюцца тыя індывіды, якія ў выніку розных абставін не маглі ці не хацелі асвойваць навуковыя веды. У многіх выпадках (асабліва ў ветэрынарыі, агранаміі) традыцыйныя экалагічныя веды ўсё больш выцясняюцца навуковымі. Паралельна найстаражытныя сінкрэтычныя светапоглядныя ўяўленні замяняюцца на больш апрацаваныя, рацыянальна асэнсаваныя. У такіх умовах этнолагі павінны актывізаваць працу па фіксацыі традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў, іх асэнсаванні і тэарэтычнай інтэрпрэтацыі.



# 2. ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ АБ РАСЛІННЫМ СВЕЦЕ

## 2.1. Народныя веды аб культурных раслінах і іх прымяненне ў традыцыйным земляробстве

З даўніх часоў галоўным заняткам беларусаў было земляробства. Бясспрэчныя сведчанні яго існавання на тэрыторыі Беларусі ўзыходзяць да эпохі бронзы (першая палова II тыс. да н. э.) [120, с. 95]. Далейшая гісторыя земляробства вызначаецца перш за ўсё прагрэсам сістэм гаспадарання, характарам аграрных адносінаў, магчымасцямі абмену назапашанымі ведамі і навыкамі. У XIX ст. – пачатку XX ст. было найбольш распаўсюджана традыцыйнае земляробства, заснаванае на трохпольным севазвароце, традыцыйных прыладах працы і народных ведах аб культурных раслінах. У 20–30-я гг. XX ст., калі далейшае павышэнне прадуктыўнасці земляробства толькі на традыцыйнай аснове стала немагчымым, яно на Беларусі пачало развівацца на падставе шматпольнага севазвароту, больш дасканалай сельскагаспадарчай тэхнікі і шырэйшага выкарыстання навуковых ведаў у вобласці агранаміі. Паступальнае развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі было перапынена Вялікай Айчыннай вайной, падчас якой назіралася вяртанне да ранейшых спосабаў і прыёмаў гаспадарчай дзейнасці. Для другой паловы XX – пачатку XXI ст. характэрна не толькі канчатковае выцясненне традыцыйнай сістэмы земляробства, а таму і значнае абмежаванне сферы прымянення народных ведаў аб культурных раслінах, але і тое, што земляробства перастала адыгрываць галоўную ролю ў жыццезабеспячэнні беларускага этнасу, вызначаць яго матэрыяльную, духоўную культуру, лад жыцця. Гэтыя тэндэнцыі ў развіцці земляробства характэрны для ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

Найбольш распаўсюджанымі з зернявых культур на тэрыторыі Беларусі з’яўляліся: жыта, ячмень, проса, авёс, грэчка, пшаніца; з бабовых – боб, гарох, фасоля; з многагадовых і аднагадовых траў – канюшына, віка, сырадэля, лубін. З агародных культур найбольш распаўсюджанымі былі капуста, буракі, рэдзька, бручка, агуркі, морква, гарбузы, цыбуля, часнок, сланечнік, кроп, пятрушка і інш. З тэхнічных культур высявалі лён, каноплі. З сярэдзіны XIX ст.



Репозиторий БГАТУ

шырокае распаўсюджанне ў Беларусі атрымала бульба. Яна стала другім хлебам беларускага селяніна. Бульбу спачатку садзілі толькі на агародах, а пазней і ў полі [94, с. 122]. Ужо ў другой палове XIX ст. ураджайнасць зернявых у сялянскіх гаспадарках складала 4–6 ц/га, бульбы 37–46 ц/га, укосных траў на лугах 12–15 ц/га [240, с. 96]. Адрозненні ў паказчыках ураджайнасці па беларускіх губернях вызначаюцца галоўным чынам прыродна-кліматычнымі ўмовамі таго ці іншага рэгіёну, якасцю глебаў, асаблівасцямі аграрных адносінаў, а не лакальнымі варыяцыямі ў прымяненні традыцыйных ведаў аб культурных раслінах.

Традыцыйныя спосабы правядзення асноўных агратэхнічных мерапрыемстваў (узорвання, баранавання, сяўбы і ўборкі, угнаення глебы) грунтаваліся на рацыянальных ведах беларускіх сялян аб уласцівасцях культурных раслін, пад якія рыхтаваліся іх надзелы.

Мэтай апрацоўкі глебы было разрыхленне яе верхняга пласта, каб карэнні раслін маглі браць пажыўныя рэчывы, расці і развівацца. Разам з тым апрацоўка глебы, у першую чаргу цяжкай, гліністай, палягчала доступ у яе паветра і вады, а таксама садзейнічала распаду арганічных рэчываў. Апрача гэтага, пры своечасовай сістэматычнай апрацоўцы глебы змяншалася колькасць пустазелля; нарэшце, пры рыхленні глебы адбывалася яе перамешванне з унесенымі ўгнаеннямі. У залежнасці ад стану глебы, яе структуры, засмечанасці камянямі ўжываліся разнастайныя, больш прыстасаваныя для мясцовых умоў, прылады апрацоўкі зямлі. Так у Паазер'і, дзе было мноства валуноў, камянёў, амаль не карысталіся плеценымі баронамі, цяжкай палескай ці літоўскай сахой [321, с. 25]. Пры апрацоўцы глебы там ужываліся лёгкія сохі-перакладкі, а бароны – больш моцныя, рамныя. Для апрацоўкі ляда скарыстоўвалі вершаліны («сукаваткі»), смыкі. Такая прылада з доўгімі яловымі сукамі лёгка «выпстрыквала», пераскоквала праз карэнні, карчы. Лёгкая ж сошка-перакладка пры апрацоўцы каменістых глебаў была больш зручнай. Яе няцяжка было вынуць з баразны, каб выкінуць камень [196, с. 19].

Глыбіню, час і колькасць узорванняў, а таксама працягласць прамежкаў паміж кожным узорваннем селянін вызначаў у залежнасці ад прыроды тых раслін, пад якія рыхтавалася глеба, ад таўшчыні яе пажыўнага пласту, ад клімату мясцовасці, стану надвор'я, ад вільготнасці ці сухасці глебы ў перыяд яе апрацоўкі, ад ступені засмечанасці яе пустазеллем [27, л. 8, 17; 29, л. 11, 28, 35;



308, с. 193]. Глебу ўзорвалі неглыбока, на 2–3 вяршкі (10–15 см). Глыбей араць сяляне не адважваліся, каб не паднімаць ніжні, падглебавы пласт гліны ці пяску [219, с. 477]. Узорванне на большую глыбіню практыкавалася ў тых выпадках, калі слой пажыўных рэчываў у глебе быў больш значным, дзе лепшую якасць меў падглебавы пласт зямлі [28, л. 19]. Калі ж слой глебы быў тонкім, неглыбокім, а падглебавы пласт складаўся з пяску, жвіру або падзолу, то глыбокае ўзорванне магло прынесці больш шкоды, чым карысці. І, наадварот, больш глыбокае ўзорванне гліністай глебы, таксама як і частае яе рыхленне бараною, прыводзіла да павышэння рыхласці глебы, лепшага пранікнення ў яе вады і паветра, што садзейнічала хутчэйшаму развіццю раслін. Апрацоўка глебы на глыбіню трох і больш вяршкоў сустракалася толькі ў найбольш заможных гаспадарках пры развядзенні карняплодаў ці сеяных траў, там, дзе ўзорванне зямлі праводзілася ў асноўным плугамі [220, с. 830].

Гліністыя і сугліністыя глебы стараліся рыхліць у сухое надвор'е, бо пры іх апрацоўцы ў вільготным стане ўтвараліся буйныя глыбы, якія абцяжарвалі правядзенне далейшых палявых работ [321, с. 25]. Умераная вільготнасць такіх глебаў ва ўсіх адносінах была найбольш падыходзячым станам для яе апрацоўкі, бо ў такім выпадку яе было не толькі лягчэй араць, але і баранаваць. Пры баранаванні ж узаранага поля адразу пасля працяглых, моцных дажджоў глеба не разрыхлялася, а «размазвалася» баронамі і затым высыхала; на яе паверхні ўтваралася так званая «корка», якую прыходзілася зноў разрыхляць баронамі ці драпаком. Таму баранаванне такіх глебаў сяляне стараліся праводзіць у сухое надвор'е: гэтым дасягалася не толькі лепшае рыхленне глебы, але і больш паспяховае знішчэнне пустазелля, выцягнутыя карэнні якога адразу ж высыхалі [220, с. 830; 308, с. 194].

Пераважаючым спосабам вядзення земляробства ў XIX ст. – пачатку XX ст. (нават у памешчыцкіх гаспадарках) было трохполле. Пры гэтай сістэме апрацоўкі глебы адно поле засявалася азімым жытам, другое адводзілася пад яравыя культуры, а трэцяе поле пакідалася пад папар. Значэнне папару – ачышчэнне нівы ад пустазелля, узбагачэнне глебы вільгаццю і пажыўнымі рэчывамі. Поле, якое было пад папарам, апрацоўвалі асабліва старанна, бо на ім у пачатку восені сеялі асноўную культуру беларускага селяніна – азімае жыта. У час летняй апрацоўкі папару першае ўзорванне, ці



Репозиторий БГАТУ

«пад’ём», рабілі вельмі грунтоўна і пасля добрага ўгнойвання нівы. Пад азімае жыта вывозілі гной ад хлявоў, дзе стаялі каровы. Вывезены на поле гной адразу ж заворвалі. Дзякуючы доступу вільгаці, паветра і вады гной пасляваў перапрэць, раскласціся на пажыўныя рэчывы, якія добра засвойваліся карэннямі раслін [220, с. 831]. Другое ўзорванне глебы праводзілі за 1–2 тыдні да пачатку сяўбы жыта, каб зямля ўляглася і не рвала слабыя карэньчыкі ўзыходзячай руні. На лёгкіх пясчаных глебах двайнога ўзорвання было дастаткова [321, с. 25]. На глебах жа гліністых і суглінках зямлю пад азімае жыта нярэдка ўзорвалі тры разы. Палеткі нізкія, забалочаныя, дзе было шмат вільгаці, узорвалі звычайна вузкімі загонамі (каб вада сцякала па барознах). Больш узвышаныя, сушэйшыя нівы (калі дазваляла шырыня палетку) узорвалі шырокімі загонамі [29, л. 62, 64]. У большасці выпадкаў з-за вузкасці сялянскіх надзелаў поле ўзорвалі ў адным і тым жа напрамку – уздоўж. У памешчыцкіх гаспадарках практыкавалася і папярочнае ўзорванне поля, асабліва на схілах узгоркаў, што захоўвала глебу ад размывання, эрозіі, утварэння канаваў [220, с. 833].

Ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі глебу пад яравыя культуры аралі два разы. Першы раз восенню – больш глыбей. Паўторнае ўзорванне глебы пад яравыя праводзілі вясною, калі прасыхала зямля. На поле вывозілі гной, які адразу ж растрасалі і заворвалі, каб пазбегнуць страты найбольш каштоўных азоцістых рэчываў [220, с. 818]. Трэба адзначыць, што ў некаторых сялянскіх гаспадарках гной вясною растрасалі і ў «прысцілку» – пасля сяўбы яравых. У гэтым спосабе выкарыстання гною ёсць як станоўчыя, так і адмоўныя моманты: раўнамерна раскіданы па полі гной ахоўваў пасевы ад вясновых замаразкаў, садзейнічаў захаванню вільгаці ў глебе, што вельмі істотна для яравога хлеба ў час вясновай засухі, аднак у той жа час гной пры доўгім знаходжанні на паверхні глебы траціў многа азоцістых і аміячных рэчываў [308, с. 194]. Узорванне маглі праводзіць і адзін раз, калі, напрыклад, пасля яравых ішоў лён. На залежах лён сеялі па свежых пластах глебы, якія былі ўзараны непасрэдна перад сяўбою [321, с. 26].

Баранаванне поля праводзілася пасля кожнага ўзорвання. Поле звычайна баранавалі ўпоперак, затым уздоўж пластоў узаранай глебы, каб яна лепш разрыхлялася [308, с. 194]. Пасля баранавання поля жанчыны і дзеці збіралі ў кучу карані пустазелля і спальвалі іх, або чакалі, пакуль куча перапрэе, і выкарыстоўвалі яе ў якасці гною [29, л. 11, 36]. Акрамя гэтага, ачышчэнне поля ад пустазелля



вялося з дапамогай высеву такіх культур, як лубін, віка, сэрадэля, канюшына, якія адначасова з’яўляліся цудоўным кормам для хатняй жывёлы, у першую чаргу для коней і валоў. Для выроўнівання поля пры пасевах грэчкі, люцэрны, сэрадэлі, канюшыны і іншых культур ужывалі драўляныя самаробныя каткі.

Сеяць выязджалі звычайна раніцою. Кожны сейбіт імкнуўся выбрацца на ніву і пачаць працу як мага раней, каб «Дай Бог!» гаварылі яму, а не ён. У дзень пачатку сяўбы з дому нічога не пазычалі, асабліва агню, хлеба, а, наадварот, стараліся трошкі зерня ўкрасці, спадзяючыся, што гэта будзе садзейнічаць добраму наліванню збожжа. Дадзеныя дзеянні зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі [293, с. 78]. Забарона пазычаць зерне ў першы дзень сяўбы захавалася да канца ХХ – пачатку ХХІ ст. [28, л. 32; 29, л. 53]. Акрамя магічных дзеянняў, існавалі і вельмі слушныя, рацыянальныя парады і рэкамендацыі, напрыклад: «сеяць самым лепшым насеннем» [27, л. 10]; «мачыць зерне ў вадзе з жалезным купаросам» [251, с. 91]. Апошняе ўжо не што іншае, як пратраўліванне зерня перад сяўбою. Першыя жменькі зерня высявалі з асвячаных у царкве ці касцёле каласкоў, або разбавіўшы жыта ў першым мяшку зернем свянцоным. Іх рассыпалі крыж-накрыж у самым пачатку поля. Апошнюю жменьку зерня сейбіт таксама кідаў крыж-накрыж, толькі ў супрацьлеглым вуглу нівы. На поле селянін выходзіў у чыстай бялізне, з дому нярэдка браў яйка, кавалак хлеба ці сыру і прасфірку, якую ён прывязваў да лубкі-сявенькі. Яйка, сыр і хлеб ляжалі на возе да канца сяўбы. Пасля чаго частку хлеба сейбіт аддаваў каню, трошкі з’ядаў сам, а астатняе прывозіў дамоў. У некаторых месцах яйка закопвалі ў першую баразёнку. Трэба адзначыць, што з другой паловы ХХ ст. гэтыя абрадавыя дзеянні амаль не праводзяцца, але яны паўсюдна захаваліся ў народнай памяці [27, л. 10; 29, л. 8, 23]. Пасля заканчэння сяўбы поле адразу баранавалі [212, с. 443, 444]. Апошні земляробчы прыём з’яўляецца цалкам рацыянальным. Па-першае, свежая, увільготненая глеба была больш прыдатнай для прарастання зерня; па-другое, незабаранаванае зерне маглі з’есці птушкі, пазбіраць мышы.

Беларускі селянін з вялікай увагай ставіўся да будучага ўраджаю зерневых культур, таму існавала шмат прыкмет наконт яго якасці, заснаваных на народных ведах аб гэтых раслінах: «Ляжачы хлеб – не поіць, не корміць»; «Калі жыта красуе спачатку ў верхняй частцы коласа – быць добраму ўраджаю, з сярэдзіны –



Репозиторий БГАТУ

так сабе, а з ніжняй частцы коласа – ураджай нізкі»; «Калі ў ячменя лісцікі пачынаюць зварочвацца ў трубачку, а вусы доўгія, такі ячмень ураджайны»; «Чым лепшы ўраджай парэчак і агрэсту, тым горшы ўраджай зернявых» [236, с. 113].

З канца XIX – пачатку XX ст. на ўсёй тэрыторыі Беларусі вялікае распаўсюджанне атрымала бульба. Глебу пад бульбу звычайна ўзорвалі два разы: першы раз восенню, а другі раз вясною, непасрэдна перад пасадкай. Бульбу садзілі пад саху ці плужок праз адну-дзве баразны, каб не было загушчэння і мелася магчымасць абганяць, асыпаць яе з дапамогай сошкі, асыпачкі ці акучніка. Калі прыкмячалі, што лета будзе вільготным, то бульбу садзілі неглыбока, калі спадзяваліся на сухое лета – глыбей. Для пасадкі адбіралі непашкоджаныя клубні сярэдніх і невялікіх памераў (буйную бульбу разразалі на дзве часткі). Бульбіны саджаліся на адлегласці 30–35 см адна ад другой [27, л. 11]. Ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі бульбу стараліся садзіць у воблачнае надвор’е, каб яна вырасла вялікай [27, л. 5; 28, л. 1, 18; 29, л. 4, 70]. Хутка пасля пасадкі бульбу баранавалі. Найбольш руплівыя гаспадары баранавалі бульбу амаль кожны тыдзень да з’яўлення першых усходаў, пасля чаго пачыналася акучванне бульбы [220, с. 857]. Першае акучванне праводзілі з баранаваннем, другое і трэцяе – ужо без баранавання. Бульбу акучвалі да пачатку яе красавання, пасля чаго яе ўжо не чапалі да самай восені. Капаць бульбу сяляне пачыналі толькі тады, калі на ёй ссох бульбоўнік, г. зн. калі скурка на бульбе становілася больш тоўстай. Клубні бульбы пры гэтым лепш захоўваюцца і больш багатыя крухмалам. Разорвалі бульбу сахою, радзей – плугам, рыдлёўкай. Бульба выварачвалася разам з зямлёю, а затым яе выбіралі рукамі. Пасля выкопвання бульбы поле баранавалі, а потым зноў пераворвалі, што давала магчымасць сабраць яшчэ некаторую колькасць клубняў [Там жа. С. 858].

Шматгадовая практыка вядзення гаспадарчай дзейнасці, веданне мясцовых кліматычных умоў дазволілі беларускім сялянам выявіць залежнасць ураджайнасці культурных раслін ад стану і структуры глебы. Таму на больш нізкіх, урадлівейшых глебах часцей высявалі ячмень, пшаніцу, гарох. На глебах пясчаных, лёгкіх, сушэйшых – авёс, проса [321, с. 26]. Вялікае значэнне надавалася таксама паслядоўнасці высеву тых ці іншых культур. Пасля папару сеялі жыта, потым – ячмень, затым – авёс, грэчку. Лічылася таксама, што ячмень лепш сеяць пасля бульбы, а яе



садзіць пасля жыта ці пшаніцы. Лён – ці на залежах, ці пасля канюшыны, але можна і за ячменем [293, с. 89]. Традыцыйная паслядоўнасць высеву сельскагаспадарчых культур захавалася да пачатку XXI ст. у многіх сялянскіх гаспадарках [28, л. 13; 29, л. 11].

Асноўная плошча сялянскай зямлі знаходзілася ў полі, дзе сеялі яравыя культуры, азімае жыта і садзілі бульбу. Значна меншая частка зямлі адводзілася пад агароды, дзе высяваліся ці высаджваліся агародныя культуры: буракі, капуста, рэдзька, бручка, морква, цыбуля, часнок, гуркі, пастарнак, мак. Там жа (на прысельных землях) высяваліся і каноплі. Кожны год на глебу пад агароды вывозілі самы лепшы (конскі ці авечы) гной [29, л. 11]. Агародныя землі заўсёды атрымлівалі большую долю ўгнаенняў дзякуючы не толькі іх важнасці, але і блізкаму размяшчэнню ад сялянскіх хат і хлявоў.

Калі памеры агарода былі дастаткова вялікімі, то яго ўзорвалі яшчэ з восені. Вясною агародную зямлю ўзорвалі ў другі раз, прычым перад узорваннем добра ўгнойвалі. Прыкладна праз дзесяць дзён пачыналі ганяць «лешкі», г. зн. праводзілі сахою барозны для падрыхтоўкі град пад пасеў агародных культур [212, с. 416]. Калі памеры агарода не дазвалялі выкарыстаць саху і барану, то працавалі з дапамогай рыдлёўкі, матыкі і жалезных грабель. На глебах нізкіх, глiністых і суглiністых грады рабілі больш вузкімі, вышэйшымі; на лёгкіх, пясчаных глебах – невысокімі, шырэйшымі. Усе гаспадарчыя работы па падрыхтоўцы град (за выключэннем узорвання і баранавання), пасеву і пасадцы гародніны былі справай жанчын, якія з дапамогай матыкі і жалезных грабель апрацоўвалі ўсю агародную плошчу. Пры гэтым разбівалася, пераціралася кожная грудка, збіраўся кожны камень [Там жа. С. 415].

На ўсёй тэрыторыі Беларусі для лепшага ўзыходжання насення агародных культур перад высевам яго замочвалі (у першую чаргу насенне буракоў, морквы, рэдзькі, рэпы), а боб, фасоль, гарох «прарошчвалі», г. зн. давалі ім магчымасць набухнуць і нават пусціць першы расток. Найбольш дробнае насенне (мак, моркву, радыску, рэдзьку, буракі) нярэдка змешвалі з зямлёю, попелам, а затым высявалі [27, л. 11]. Гэты прыём палягчаў пасеў насення і рабіў больш раўнамерным яго размеркаванне, да таго ж попел адначасова служыў і добрым угнаеннем. Насенне морквы, буракоў, рэдзькі, рэпы запраўлялі на глыбіню 1–2 см. На градах часта сеялі радочкамі, пад шнур. Цыбулю высаджвалі мочанай з абрэзанай верхняй часткай. Адлегласць паміж радкамі і паміж асобнымі



Репозиторий БГАТУ

цыбулінамі звычайна складала 8–10 см. Гуркі сеялі ў дні посныя і калі не было сонца (пахмурны дзень): лічылася, што ў працілеглым выпадку яны вырастуць «дуплістымі» [27, л. 2, 11; 29, л. 29]. Каб агуркі раслі доўгімі, то лепш, калі іх высяваў мужчына, а яшчэ лепш, каб ён быў без штаноў. На Палессі на грады клалі таўкач і гаварылі: «Каб такія агуркі ляжалі»; клалі ў лапці насенне і цягнулі на агарод («Каб так агуркі па зямлі цягнуліся»); распускалі косы («Каб так агуркі косы распускалі») [24, л. 8]. Калі гуркі красавалі ўлетку пустацветам, то мужчына павінен быў абегчы тры разы грады без штаноў [27, л. 19]. Калі пачыналі высаджваць расаду капусты, то на першую граду клалі камень, каб качаны былі моцныя, а таксама крапіву. У Паазер’і лічылі, што яна ахоўвае капусту ад чарвей [27, л. 19; 29, л. 29], а на Палессі гаварылі: «Як гэта крапіва не паліваная падымалася, каб мая капуста так прынялася» [24, л. 7]. Таксама круцілі расаду капусты каля галавы – «Каб капуста была такая ж» [27, л. 19]; клалі побач з ёй камень – «Каб капуста расла як каменная» [27, л. 2; 28, л. 10; 29, л. 51]. У гэтых дзеяннях яскрава праяўляюцца два асноўныя віды сельскагаспадарчай магіі: імітатыўная і прадуцыруючая.

Пасля пасеву гародніны яе старанна даглядалі: палолі (не менш 3 разоў), палівалі (у засушлівае лета), дзе трэба прарывалі (буракі, моркву, рэпу). Не рэкамендавалася палоць на маладзік, бо лічылася, што хутка вырастуць новыя карэнні пустазелля замест вырваных у гэты час, а выкінутыя карэнні зноў «аджывуць». Гародніну падкормлівалі гноевай жыжай, радзей – курыным памётам, попелам. Шкоднікаў агародных культур збіралі, замочвалі ў газе, спальвалі. Каб ураджай капусты не быў знішчаны вусенямі, капуснай бялянкай, то на градах клалі камень, завёрнуты ў анучку, змочаную ў дзёгці [212, с. 148]. Для барацьбы са шкоднікамі агародных культур на градах (у міжрадкоўях) садзілі цыбулю, часнок, кроп, а таксама каліўы канопляў – «канаплінкі» [Там жа. С. 418]. Для апылення гуркоў выкарыстоўвалі пчол. У час квітнення гуркоў іх прыманьвалі наступным чынам: зрывалі пустацветы, варылі іх разам з мёдам і раскідвалі або распырсквалі гэтае варыва на градках [29, л. 51]. Акрамя таго, паміж гуркоў высаджвалі траву медуніцу.

Найпершае значэнне для атрымання добрага ўраджаю мела ўгнаенне глебы. Сяляне добра разумелі, што з кожным знятым з поля ўраджаем запасы пажыўных рэчываў у глебе змяншаюцца, і іх трэба своечасова папаўняць. Асабліва гэта тычыцца падзолістых,



пясчаных глебаў, бедных фасфатнымі, калійнымі і азоцістымі рэчывамі. Паўсюдна асноўным угнаеннем нівы быў гной ад буйной рагатай жывёлы і коней, менш – ад свіней і авечак. Апошні часцей за ўсё скарыстоўваўся пад агародныя культуры. Гной ад хатняй жывёлы, апрача арганічных злучэнняў, змяшчае ў сабе ўсе неабходныя хімічныя элементы, прычым у самай прыдатнай для жыўлення раслін форме. Акрамя гэтага, арганічнае рэчыва гною паляпшае фізічныя ўласцівасці глебы, яе структуру, садзейнічае працэсу захавання ў глебе патрэбных для культурных раслін хімічных злучэнняў. Стойлавае ўтрыманне жывёлы з восені да позняй вясны садзейнічала не толькі назапашванню вялікай колькасці гною, але і высокай яго якасці: вадкія выдзяленні жывёлы перамешваліся з падсцілам, апошні шчыльна ўтаптываўся і пераправаў. Пры гэтым гной ператвараўся ў аднародную масу, якая, дзякуючы сваёй шчыльнасці, не разбуралася і захоўвала ў сабе ўсе пажыўныя рэчывы азоцістага паходжання, якія ў рыхлым стане маглі выветрыцца. З мінеральных угнаенняў дзе-нідзе сяляне выкарыстоўвалі вапну або мел, хаця ў пачатку XX ст. у продажы з’явіліся і мінеральныя тукі.

На падсціл жывёлы беларускія селяне ўжывалі ў асноўным мятую ці пасечаную жытнюю салому, радзей ячную [29, л. 51]. Салома вельмі добра назапашвала вадкасць, захоўвала пажыўныя элементы і, перапрэўшы, сама давала многа арганічных рэчываў. Калі ж саломы ў гаспадарцы для падсцілу не хапала, то выкарыстоўвалі сухое апаўшае лісце, ржанішча, мох, яловы лапнік [Там жа. Л. 9]. Апошнія дрэнна ўтрымліваюць ваду і доўга не перагніваюць з-за смалістасці, таму гной на іх аснове быў менш прыдатным для выкарыстання. Выкарыстанне торфу на падсціл жывёлы практыкавалася вельмі слаба [28, л. 1], хаця атрыманы гной быў вельмі багаты арганічнымі і мінеральнымі рэчывамі. Нарыхтоўваць і прымяняць гной з прымессю торфу маглі больш заможныя сяляне, якія мелі некалькіх коней і значную колькасць рабочых рук, таму што такое ўгнаенне было дзейсным толькі пры значнай колькасці вывезенага торфу.

Пажыўнасць гною ў пэўнай ступені залежыць не толькі ад якасці падсцілу, але і ад харчавання самой жывёлы, якасці яе ежы. Калі корм для жывёлы багаты азоцістымі рэчывамі, то і гной атрымліваўся добрай якасці са значным утрыманнем азоцістых і мінеральных злучэнняў. Якасць гною залежала і ад прыроды самой хатняй жывёлы. Напрыклад, гной ад коней, авечак менш вадзяністы,



Репозиторий БГАТУ

яго арганічныя рэчывы разлагаюцца больш хутка, таму дзеянне дадзенага гною на расліну менш працяглае, чым дзеянне гною ад буйной рагатай жывёлы [220, с. 836]. Лепшым угнаеннем для пясчаных глебаў лічыўся багаты на азот і фосфар гной ад кормных свіней, для суглiністых – ад кароў, для глiністых, нізкіх, халодных – конскі і авечы [29, л. 11]. Конскі гной з'яўляўся лепшым па сваіх якасцях, аднак беларускія сяляне ведалі, што, калі ён не перапрэе, то захоўвае шмат насення пустазелля [27, л. 9; 29, л. 11].

Гной ад буйной рагатай жывёлы найчасцей вывозілі на папар, пад азімае жыта. Калі ж гною з-пад валоў, кароў і цялят не хапала, тады на ніву вывозілі і гной з-пад свіней, коней. У асноўным жа гной ад гэтых жывёл, як і ад курэй, гусей, качак, трапляў на агароды, канаплянікі [29, л. 51]. Колькасць гною, які вывозіўся на поле, залежала ў першую чаргу ад плошчы зямельнага ўчастка, ад колькасці жывёлы ў хлявах, ад колькасці рабочых рук і коней у гаспадарцы, стану надвор'я, а таксама ад якасці глебы, яе фізічных уласцівасцей, структуры. Так, глебы лёгкія, пясчаныя, супясчаныя ўгнойваліся меншай колькасцю гною, але больш часта. Глебы ж гліністыя, суглiністыя ўгнойваліся радзей, але адразу вялікай колькасцю гною, таму што пажыўныя рэчывы ў такіх глебах маглі захоўвацца больш працяглы час [28, л. 21]. Поле лічылі добра ўгноеным, калі кожны год удавалася ўгнаіць хаця б адну трэць папару [220, с. 838]. Гной раілася вывозіць на ніву ў час маладзіка [27, л. 9; 212, с. 161]. Пры размеркаванні гною на полі звярталі ўвагу як на высяваемую культуру, так і на папярэднюю. У сялянскіх гаспадарках бульбу ў большасці выпадкаў садзілі без угнаення, бо ёй звычайна папярэднічала азімае жыта, высяваемае на ўгноеным папары. З яравых культур стараліся ўгноіць поле пад гарох, пшаніцу, радзей – пад авёс, ячмень. Першыя пасевы на вырабленым «лядзе» праводзілі зусім без гною, нават пасевы жыта ці канопляў [220, с. 837]. Падкормка і ўгнаенне сенакосных угоддзяў таксама назіралася вельмі рэдка: агратэхнічныя мерапрыемствы на лугах, сенакосах зводзіліся ў асноўным да выкарчоўвання пнёў, выкопвання купінаў, высякання хмызнякоў. Дзе-нідзе, у першую чаргу ў больш заможных гаспадарках, угнойвалі толькі сеяныя травы: канюшыну, віку, сэрадэлю, люцэрну, цімафееўку і іншыя [29, л. 11]. Для гэтага ўжывалі гіпс ці сернакіслую вапну [Там жа. Л. 72].

Такім чынам, тэхналогіі ўгнаення глебы, узорвання, баранавання, сяўбы, праполкі гародніны, акучвання і ўборкі



пасеяных і высаджаных раслін, як і сістэма ведаў, на якой яны грунтаваліся, былі адзінымі для ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Яны абапіраліся на агульныя спосабы і прыёмы, якія характарызаваліся прастатой і завершанасцю.

Гаспадарчае жыццё беларускага селяніна поўнасцю залежала ад будучага ўраджаю, таму ён павінен быў дакладна ведаць аптымальныя тэрміны правядзення тых ці іншых агратэхнічных работ. Яны вызначаліся на падставе шматгадовых назіранняў за цыкламі ўзаемазалежнасцей у акаляючай прыродзе, вынікі якіх перадаваліся з пакалення ў пакаленне. На гэтай аснове быў створаны народны земляробчы каляндар – цыкл прымеркаваных да пэўнага часу сельскагаспадарчых работ і звязаных з імі традыцыйных звычаяў, святаў і абрадавых дзеянняў.

Важнейшай датай земляробчага календара былі Каляды. Яны падводзілі вынікі ўсяго папярэдняга году і з'яўляліся пачаткам падрыхтоўкі да новага цыклу сельскагаспадарчых работ. Сэнс абрадавых дзеянняў і павер'яў, прымеркаваных да гэтага перыяду, быў агульным для ўсёй тэрыторыі Беларусі: забяспечыць багаты ўраджай, поспехі ў гаспадарчай дзейнасці. Істотна не адрозніваліся яны і па форме. Сродкамі іх рэалізацыі з'яўляліся магія і гаданні.

З думкамі аб будучым ураджаі звязаны многія калядныя абрады: хаджэнне калядоўшчыкаў з «казою», з «канём», варажба [324, с. 253]. Так, напрыклад, у канцы каляднай вячэры дзеці барабанілі рукамі па стале, што быў засцелены абрусам, пад якім ляжала абмалочаная салома, і па колькасці знойдзеных зярнят, па даўжыні выцягнутых саломін вызначалі будучы ўраджай [238, с. 65]. З Калядамі звязаны і магічныя дзеянні, накіраваныя на атрыманне добрага ўраджаю. Каб засцерагчы пасевы ад веснавых і ранніх летніх замаразкаў, на калядную ці переднавагоднюю вячэру – куццю – запрашалі Мароза: «Мароз, Мароз, ідзі да нас куццю есці. А летам не хадзі, зямлю не марозь, поле не глумі, бо будзем цябе жалезнымі пугамі біць!» [24, л. 12]. Існавалі і больш рацыянальныя звычаі: абвязванне пладовых дрэваў на Каляды ці на галодную куццю бяростай, саломай; абмазванне ствалоў яблынь і груш салам, клеем, дзёгцем, глінай, змешанай з вапнай [212, с. 203]; пасыпанне глебы вакол іх невялікай колькасцю попелу [94, с. 81]. Усё гэта ахоўвала пладовыя дрэвы ад вымярзання, ад шкоднікаў і ад зайцоў, попел жа быў не толькі карысным угнаеннем – увесну ён садзейнічаў ранейшаму таянню снегу вакол дрэваў.



Рэпазіторый БГАТУ

Другой значнай вяхой у земляробчым календары было Благавешчанне – 7 красавіка н. ст. (25 сакавіка ст. ст.). Згодна з народнымі перакананнямі, да гэтага дня нельга было чапаць зямлю, нават убіваць у яе калы ў час папраўкі плоту, каб «не ўбіць у зямлю будучы ўраджай» [21, л. 2; 24, л. 6, 7, 47; 26, л. 56]. Да Благавешчання (у другой палове сакавіка) можна было толькі высяваць расаду капусты у скрынках ці на градках з сонечнага боку. З дня Благавешчання пачыналіся вясновыя палявыя работы – і ў першую чаргу ўзорванне. Пры гэтым заўсёды ўлічвалі кліматычныя ўмовы і асаблівасці глебы: раней узорвалі глебы пясчаныя і супясчаныя, пазней – суглінкі і гліністыя глебы. Пачынаць узорванне рэкамендавалася, калі падсыхала зямля, «калі барозна не блішчыць», г. зн. не мокрая [324, с. 254]. Гэтымі рэкамендацыямі карыстаюцца і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. [29, л. 11]. Па дадзеных апытанняў вясковага насельніцтва Беларусі, у яе паўднёвым – Палескім – рэгіёне палявыя работы пачыналіся адразу пасля Благавешчання, у Паазер'і – на 10–12 дзён пазней (у другой палове красавіка) [27, л. 5, 9; 29, л. 36, 59]. Тэрмін выхаду ў поле вызначалі яшчэ па паводзінах прадстаўнікоў жывёльнага свету: «Жаваранак заспяваў – выходзь на поле»; «Жаба заквакае – выходзь на ніву» [236, с. 93]. Рэкамендавалі таксама пачынаць узорваць глебу пасля першага грому, бо з гэтага часу звычайна ўсталёўвалася цёплае надвор'е. Да таго ж лічылася, што гром адмыкаў зямлю.

Прааналізаваныя асаблівасці земляробчага календара адлюстроўвалі канкрэтныя прыродна-кліматычныя ўзаемазалежнасці і дазвалялі паспяхова рэалізаваць у практыцы гаспадарчай дзейнасці адзін з асноўных прынцыпаў агранаміі – прынцып своечасовай і якаснай апрацоўкі глебы.

Сяўбу яравых рэдка пачыналі раней першай дэкады красавіка [59, с. 41]. Самай ранняй культурай быў авёс. Яго сеялі, як толькі адтае зямля: «Кідай авёс у гразь – то будзеш князь». Пасля аўса сеялі ячмень, яравую пшаніцу. Рана сеялі яшчэ гарох (каля 23 красавіка ст. ст.) [219, с. 478]. Беларускі селянін звязваў тэрміны высявання тых ці іншых зернявых культур са зменамі ў акаляючай яго прыродзе, у раслінным і жывёльным свеце: «Сей авёс, калі камары з'явяцца»; «Калі цвіце каліна – сей ячмень»; «Сей ячмень, як з'явяцца майскія жукі» [158, с. 96]; «Зацвілі суніцы – сей грэчку, зацвіла чаромха – пшаніцу» [293, с. 89]. Гэтыя прыкметы існавалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі, лакальныя прыродна-кліматычныя ўмовы ўносілі толькі нязначныя карэктывы. Сеяць раілі ў ціхае



надвор'е, а калі вецер – то лепш з захаду. Тое, што расце пад зямлёю, стараліся сеяць на маладзік, а што над зямлёю – у поўню [27, л. 11; 212, с. 136]. Некаторыя сельскагаспадарчыя культуры (лён, каноплі, грэчку) рэкамендавалася сеяць, калі наогул не было Месяца – «на мяжах» [354, s. 156].

Вельмі насычаны палявымі работамі быў май. У гэты час высявалі агародныя культуры, садзілі бульбу, грэчку, каноплі. Лён раілі сеяць у дзень Канстанціна і Алены (21 мая ст. ст.) [219, с. 478, 515; 294, с. 230]. Асабліва ўдалым лічыўся пасеў, калі гэты дзень прыходзіўся на панядзелак [236, с. 190]. Агародныя культуры: агуркі, моркву, рэдзьку, гарбузы, цыбулю раілі высяваць на Івана вясновага – 8 мая ст. ст [70, с. 179]. Калі гаспадыня жадала атрымаць горкую цыбулю, яна імкнулася высадзіць яе ў посныя дні тыдня – сераду, пятніцу; калі горыч была непажаданай – у любы дзень, акрамя гэтых двух [158, с. 96]. У цэлым жа найлепшай парою для пасеву агародных культур лічылі час з дня Юрыя вясновага (23 красавіка ст. ст. – 6 мая н. ст.) да дня Міколы вясновага (9 мая ст. ст. – 22 мая н. ст.) [212, с. 416; 324, с. 254]. Такіх жа тэрмінаў прытрымліваюцца і сучасныя агароднікі [29, л. 8, 14, 23]. У XIX ст. – першай палове XX ст. да дня Міколы вясновага пасеў яравых і пасадку бульбы стараліся закончыць [220, с. 857]. У другой палове XX ст., у сувязі са зменамі ў ладзе жыцця і ў спосабах правядзення палявых работ, агульнапрынятымі сталі больш раннія тэрміны пасадкі бульбы [28, л. 10; 29, л. 16, 38]. Такія культуры, як проса, каноплі высявалі і пасля Міколы [182, с. 116]. Грэчку можна было сеяць і ў чэрвені [182, с. 116; 219, с. 478, 516], каб засцерагчы яе ад замаразкаў, якія нярэдка здараліся нават у канцы мая. Для розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі гэтыя тэрміны змяшчаліся, што было выклікана лакальнымі прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі, але паслядоўнасць высеву заставалася аднолькавай. Такая ж паслядоўнасць у асноўным захоўваецца і ў сучаснай сялянскай гаспадарцы Беларусі [27, л. 9, 19; 28, л. 1, 12, 13, 21; 29, л. 1, 51]. Такім чынам, асноўныя вясновыя палявыя работы сяляне стараліся правесці за 5 – 6 тыдняў. Перыяд апрацоўкі папару працягваўся 2–3 месяцы, калі лічыць яго пачаткам заканчэнне яравых пасеваў.

Пачатак жніва звычайна прыпадаў на перыяд з 10 па 15 ліпеня – пасля свята Пятра (12 ліпеня н. ст) [16, спр. 74, л. 25; 22, л. 10; 59, с. 41], а канец – на свята Багача – 21 верасня н. ст. (8 верасня ст. ст.): «Прыйшоў Багач – кідай рагач і з агарода прач»; «Прыйшоў Багач –



Репозиторий БГАТУ

кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку» [238, с. 40, 84; 324, с. 254]. Пасля азімых звычайна жалі яравыя культуры: ранні і позні ячмень, пшаніцу, авёс [27, л. 25; 28, л. 13; 29, л. 40]. З другога Спаса (6 жніўня ст. ст. – 19 жніўня н. ст.) пачыналі збіраць і есці яблыкі, якія ў гэты час дасягалі біялагічнай спеласці. У першай палове жніўня пачыналі выбіраць цыбулю з град, гуркі – па меры іх выспявання. Больш познія, восеньскія, гуркі збіралі ў канцы жніўня – пачатку верасня [28, л. 40, 43; 29, л. 12]. Даследаванні апошніх гадоў сведчаць аб тым, што такія тэрміны адпавядалі біялагічным асаблівасцям развіцця культурных раслін і былі цалкам аптымальнымі. Уборку бульбы пачыналі ў канцы жніўня, калі паспявалі раннія яе гатункі; сярэднія і познія гатункі бульбы ўбіралі на працягу ўсяго верасня да першых замаразкаў. У большасці выпадкаў гаспадары стараліся пазбягаць залішне ранняй уборкі, бо такая бульба дрэнна захоўвалася зімою [220, с. 858]. Тэхналогія ўборкі гародніны і бульбы была аднолькавай на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Пасеў азімага жыта пачыналі пасля Успення («Сплення») – 15 жніўня ст. ст. (28 жніўня н. ст.) [158, с. 153; 181, с. 30; 294, с. 85, 245; 324, с. 254]. Гэты дзень у народзе называлі яшчэ Вялікая ці Першая Прачыстая. Больш ранні пасеў жыта сяляне лічылі немэтазгодным: «каб жыта не высілілася». Дадзеныя ўяўленні не заўсёды прыносілі гаспадарчую карысць, бо позна пасеянае на тонкім малаўрадлівым пласце глебы жыта не магло добра ўкараніцца і пры моцных маразах, калі яно не было яшчэ прыкрыта снегам, нярэдка вымярзала [219, с. 477; 357, s. 201]. У той жа час падзел тэрмінаў севу на ранні, сярэдні і позні дазваляў змяншаць залежнасць ураджаю ад магчымых неспрыяльных умоў надвор'я, а таксама даваў магчымасць больш раўнамерна размяркоўваць палявыя работы. Найбольш прымальным перыядам для пасеву жыта з'яўляўся час ад 15 жніўня ст. ст. (28 жніўня н. ст.) да 8 верасня ст. ст. (21 верасня н. ст.), г. зн. ад Першай да Другой Прачыстай [69, с. 13; 219, с. 519]. Зыходзячы з прыродна-кліматычных умоў розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, жыта часцей за ўсё высявалі ў наступныя тэрміны: у Паазер'і – з 7 да 15 жніўня ст. ст., у Цэнтральнай Беларусі, Падняпроўі і Панямонні – з 16 да 29 жніўня ст. ст., у Палескім рэгіёне – з 1 да 14 верасня ст. ст. [212, с. 442; 219, с. 477; 236, с. 276; 324, с. 254]. Сярэдні час пасеву прыпадаў, такім чынам, на перыяд з 15 па 25 жніўня ст. ст. Тэрмінаў пасадачных работ прытрымліваліся вельмі строга: «Сей жыта хоць у залу, але ў пару» [212, с. 153]. У другой палове XX – пачатку XXI ст., як паказалі апытанні вясковага насельніцтва Беларусі, найбольш аптымальным тэрмінам для севу лічыцца канец жніўня – пачатак верасня [29, л. 26, 65].



Сельскагаспадарчы год на Беларусі заканчваўся на Пакровы (1 кастрычніка ст. ст. – 14 кастрычніка н. ст.), да якіх павінны былі быць завершаны ўсе агратэхнічныя мерапрыемствы, у тым ліку і познія: вырыванне канопляў, копка бульбы, уборка агародных культур [324, с. 255]. У кастрычніку ў сухое надвор'е здымалі познія яблыкі, найперш – антонаўку. Для лепшага захавання іх перакладалі аўсянай і ржаной саломай. Восень у сялян была найбольш падыходзячым часам для пасадкі пладовых дрэваў.

З гадавога цыклу агратэхнічных мерапрыемстваў яскрава вылучаецца пасеў азімага жыта, бо ад яго ўраджаю залежала ўсё гаспадарчае жыццё селяніна, дабрабыт яго сям'і. Сам дзень першага выхаду на сяўбу мог быць розным. У паўднёвай Беларусі, на Палессі, найлепшымі днямі для пасеву лічыліся аўторак, чацвер і субота; пазбягалі панядзелка [158, с. 93; 236, с. 276; 247, с. 37]. У Цэнтральнай Беларусі, Падняпроўі і Панямонні не пачыналі сеяць жыта ў аўторак, серады і чацвер, бо лічылі, што калі ў назве дня ёсць літара «р», то пасевы могуць пацярпець ад чарвей [238, с. 77; 294, с. 245; 357, s. 192]. У Паазер'і нельга было сеяць жыта на Звіжанне – 27 верасня н. ст. (14 верасня ст. ст): дзень лічыўся «свістуном», пустым: хто пасее ў гэты дзень азімыя, той будзе мець пустыя каласкі [212, с. 153]. Пазбягалі таксама сеяць жыта на маладзік, бо ўсё пасеянае будзе дрэнна выспяваць: «застанецца маладжавым» [232, с. 284; 294, с. 228, 242; 354, s. 156]. Пачынаць пасеў збожжа рэкамендавалася пад поўню, бо лічылася, што і каласы будуць поўнымі [24, л. 7]. Гэтыя ўяўленні вядомы і сучасным беларускім сялянам [27, л. 7, 9]. Уплыў Месяца на выспяванне насення навукова не даказаны, аднак рэальныя месяцова-зямныя ўзаемадзеянні застаюцца да нашага часу шмат у чым нявывучанымі, таму да напрацовак народа ў гэтай галіне не трэба ставіцца цалкам скептычна.

На наступны дзень пасля пасеву азімага жыта гаспадар зноў ехаў на ніву (з плугам ці з сахою) і рабіў вакол поля, а на нізкіх месцах і ўпоперак яго, барозны («лёхі») для спуску вады ў перыяд зімовых адліг і вясновага разводдзя [212, с. 444]. Пасля гэтага ніву звычайна наведвалі ў дзень Благавешчання, на Юрыя (вясновага), на Радаўніцу, на Міколу («ці хаваецца варона ў жыце»), на Ушэсце («ці каласуецца жыта»), на Сёмуху («ці ядрана наліваецца») [Там жа. С. 445].



Репозиторий БГАТУ

Праведзеныя аўтарам у пачатку XXI ст. апытанні вясковага насельніцтва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі выявілі прынцыповае адзінства традыцыйных ведаў аб культурных раслінах на разглядаемай тэрыторыі. Гэта ж адлюстравана і ў працах этнографаў XIX – пачатку XX ст., і ў палявых матэрыялах 50–80-х гг. XX ст. Нягледзячы на тое, што прыродна-кліматычныя ўмовы не з'яўляюцца поўнасцю аднастайнымі на ўсёй тэрыторыі Беларусі, ваганні паміж імі аказваюцца неістотнымі для фарміравання якасных, прынцыповых адрозненняў у народных ведах аб культурных раслінах і асаблівасцях іх прымянення ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў. Прыродна-кліматычныя ўмовы непасрэдным чынам уплываюць толькі на тэрміны правядзення сельскагаспадарчых работ, якія вагаюцца ў розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі: найбольшыя адрозненні (у 1–2 тыдні) маюць Паазер'е і Палессе.

Народныя веды беларусаў аб культурных раслінах вартыя глыбокага вывучэння і асэнсавання, бо чым больш развіваецца навука, тым часцей даводзіцца канстатаваць, што яны маюць пад сабой пэўную падставу, з'яўляюцца рацыянальнымі. Так, аснову сістэмы абароны культурных раслін складалі механічныя (ручны збор, праполка) і біялагічныя (пасадка цыбулі, часнака, кропу, каліваў канопляў) сродкі барацьбы са шкоднікамі. Заслугоўваюць увагі і іншыя рацыянальныя здабыткі народных ведаў беларусаў аб культурных раслінах: спосабы захоўвання вільгаці ў глебе, барацьбы з пустазеллем прыроднымі сродкамі, узаемасувязь паміж сутачнымі тэрмінамі сенакашэння і якасцю сена, сувязь квадраў месяца з функцыянаваннем біясістэмы. Матэрыялы дадзенага раздзелу сведчаць аб тым, што некаторыя праблемы айчыннай сельскай гаспадаркі можна паспяхова вырашаць на падставе правераных часам традыцыйных ведаў аб культурных раслінах, з улікам і выкарыстаннем выпрабаваных стагоддзямі народных навыкаў, далучаных да сучасных тэхналогій, навуковых ведаў і прыладаў працы, што без дадатковых затрат магло б садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, асабліва ў фермерскіх і прыватных падсобных гаспадарках, якія працуюць у сферы аграэкатурызму і займаюцца вырошчваннем экалагічна чыстай прадукцыі.



## 2.2. Веды аб дзікарослых раслінах у народнай культуры

Выкарыстанне флоры адыгрывае вядучую ролю ў жыццезабеспячэнні многіх этнасаў, незалежна ад розных прыродных умоў. Спецыфіка ўзаемаадносінаў чалавека і флоры шмат у чым залежыць ад акаляючага асяроддзя, але і тыя народы, што жывуць у аднолькавых прыродных умовах, звычайна выкарыстоўваюць раслінны свет па-рознаму ў адпаведнасці з этнакультурнымі асаблівасцямі іх гаспадаркі, а таксама традыцыйнымі адносінамі да навакольнай прыроды.

Пэўныя батанічныя веды меў ужо першабытны чалавек, бо збіранне і ўжыванне ў ежу раслін давала магчымасць пазнаёміцца са многімі іх уласцівасцямі. З даўніх часоў чалавек навучыўся адрозніваць ядомыя плады, карэнні, травы, грыбы, водарасці ад неядомых, атрутных, атрымаў уяўленні аб дзеянні той ці іншай расліны на арганізм. Жанчыны, якія звычайна збіралі расліны і гатавалі з іх ежу, заўважалі, што адны травы выклікалі растройства страўніку, другія дапамагалі ад кашлю, трэція прыводзілі ва ўзбуджаны стан. Можна меркаваць, што менавіта такім шляхам у выніку вялікай колькасці супастаўленняў і назіранняў адкрывалася лекавая каштоўнасць тых раслін, якія раней лічыліся толькі харчам. Людзі запаміналі гэтыя ўласцівасці і свядома выкарыстоўвалі іх для лячэння розных хвароб. Так паралельна з ведамі аб раслінным свеце ўзнікалі і першыя веды ў галіне медыцыны [317, с. 436].

Раней існавала думка аб прынцыповых адрозненнях у ведах аб раслінным свеце паміж прадстаўнікамі традыцыйнай культуры і сучаснымі людзьмі. Аднак, калі адрозненні ў колькасных адносінах тут сапраўды вялікія, то аб адрозненнях якасных можна гаварыць вельмі ўмоўна. Знаходзячыся на працягу стагоддзяў на адной і той жа тэрыторыі, беларусы высветлілі якасці амаль усіх дзікарослых раслін, якія былі распаўсюджаны ў межах іх рассялення і пражывання [346, с. 179]. Веданне ўласцівасцей раслін давала беларусам магчымасць выкарыстоўваць іх для лячэння практычна ўсіх жыццёва важных органаў і нармалізацыі асноўных фізіялагічных функцый чалавека [317, с. 437]. Звесткамі аб традыцыйных метадах лячэння валодала і карысталася ўсё насельніцтва, аднак існавалі людзі, якія спецыялізаваліся на назапашванні і прымяненні медыцынскіх ведаў: знахары, ведуны, валхвы [188, с. 19]. Этнаграфічныя матэрыялы сведчаць, што на беларускіх землях у XIX ст. – пачатку XX ст. можна было сустрэць



Репозиторий БГАТУ

шмат асобаў, якія ведалі сотні раслін і пры гэтым падрабязна тлумачылі асаблівасці прымянення кожнай з іх для лячэння захворванняў людзей і хатняй жывёлы [348, s. 416].

Вялікая ўвага ў беларусаў надавалася часу збору, спосабам сушкі і захавання раслін. Менавіта ў гэтых сферах народная медыцына мае зоны перакрыжавання з традыцыйнымі ведамі і ўяўленнямі аб раслінным свеце [317, с. 437]. Лакалізацыя лекавых рэчываў у розных частках раслін далёка не аднолькавая: у адных частках яны назапашваюцца ў вялікай колькасці, у другіх сустракаюцца ў малых дозах, у іншых – зусім адсутнічаюць. Адначасова колькасць актыўных рэчываў, якія ўтрымліваюцца ў той ці іншай частцы расліны, залежыць ад фазы яе развіцця. Так, напрыклад, у час квітнення многіх раслін найбольшая канцэнтрацыя лекавых рэчываў утрымліваецца ў іх травяністых частках, у той час як у каранях іх колькасць найменшая. Таму ў народнай медыцыне беларусаў у большасці выпадкаў выкарыстоўвалася не ўся расліна цалкам, а толькі асобныя яе часткі: пупышкі, кветкі, лісце, сцябло («трава»), кара, карэнне, сок.

Час збору лекавых сродкаў залежаў перш за ўсё ад таго, якія часткі расліны выкарыстоўваліся для лячэння. Так, пупышкі сасны збіралі звычайна ў лютым, пупышкі таполі і бярозы – перад іх распусканнем: у сакавіку ці пачатку красавіка [188, с. 38]. Вясною нарыхтоўвалі і кару – у гэты час пачынаўся рух сокаў, і яна лёгка аддзялялася ад драўніны. Для лекавых мэтаў кару здымалі толькі з маладых сцвалоў і галінак. Яе адразу высушвалі на адкрытым паветры ці ў паветцы, потым адкідалі кавалкі кары з драўнінай [29, л. 9]. Час найбольшага квітнення ў многіх раслін супадае са святам Івана Купалы (24 чэрвеня па ст. ст.) Згодна традыцыйным уяўленням беларусаў, зафіксаваных як у XIX ст., так і ў другой палове XX – пачатку XXI ст., напярэдадні Івана Купалы, у перыяд летняга сонцастаяння, прырода надзялялася звышнатуральнай сілай: расліны быццам бы вялі размову паміж сабою [29, л. 54; 61, с. 65; 102, с. 227; 158, с. 124; 331, с. 97; 346, с. 180; 357, s. 373], а травы, сабраныя ў гэты час («купальскія зёлкі»), валодалі надзвычайнымі лекавымі ўласцівасцямі [25, л. 8; 46, с. 74; 109, с. 112; 138, с. 187; 346, с. 180; 348, s. 417]. «Раніцай 23 чэрвеня, – адзначаў Е. Р. Раманаў, – дзяўчаты і маладзіцы цэлымі натоўпамі выпраўляюцца на лугі, у поле, у лясы за Іванаўскімі кветкамі і травамі. У час збору кветак і траў абавязкова спяваць купальскія песні, у праціўным выпадку травы гэтыя не будуць мець лекавай



сілы, нават калі іх асвяцілі ў царкве. Кожная жанчына імкнецца набраць як можна больш кветак і траў, цэлыя снапы, пры гэтым перавага аддаецца травам Іван-да-Мар'я, залататысячнік, падбел, расічка, купальнік, святаяннік, чыстацел, павіліца; збіраюць таксама аер, чарот, божы хмель, багародзіцыны слёзкі, зайчыну капусту, макрыцу. Прынесеныя ў дом травы ставяцца ў халоднае месца да наступнага дня, а затым 24 чэрвеня адносяцца ў царкву і асвячаюцца. Пасля асвячэння яны захоўваюцца ў «бажніцы» і выкарыстоўваюцца на працягу года пры розных захворваннях» [236, с. 211, 212]. Уяўленні аб выключных лекавых уласцівасцях раслін, сабраных у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня, захаваліся да пачатку XXI ст. [29, л. 69]. Такім чынам, лекавыя травы збіралі ў перыяд іх найбольшага квітнення і ў пару, калі ўжо высыхала раса. Тут яскрава прасочваецца назіральнасць і экалагічная мудрасць беларусаў, бо, як паказалі сучасныя навуковыя даследаванні, у зялёных частках раслін у перыяд іх квітнення і пачатку плоданашэння ўтрымліваецца найбольшая колькасць лекава актыўных рэчываў [88, с. 52]; расліны ж, сабраныя пасля дажджу ці пакрытыя расой, хутка чарнеюць і псуюцца [300, с. 140].

На тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны ўяўленні аб тым, што асобныя расліны назапашваюць тэрапеўтычна актыўныя рэчывы ноччу, у перыяд маладзіка [346, с. 180; 348, s. 418; 358, s. 108]. Некаторыя расліны раілі збіраць толькі ў пэўных далёкіх месцах: «далёка ад крыку пеўня» [95, с. 36]. Гэтыя традыцыі не пазбаўлены рацыянальнага сэнсу, бо колькасць лекава актыўных рэчываў у адным і тым жа экземпляры расліны можа быць рознай у залежнасці ад часу яго збірання, уздзеяння прамога сонечнага святла, тэмпературы, тыпу глебы і г. д. [317, с. 437]. Лекавыя расліны ад жаночых хвароб павінны былі збіраць толькі малыя дзеці, дзяўчаты ці старыя жанчыны [236, с. 208; 348, s. 418]. Гэта звязана з уяўленнямі аб тым, што жаночыя хваробы павінна лячыць жанчына «чыстая», у якой яшчэ не пачаліся ці ўжо закончыліся месячныя, у крайнім выпадку – дзяўчына.

Збор лісця пачыналі тады, калі яно разгарнулася і дасягнула свайго нармальнага развіцця. Да збору падыходзілі ашчадна, зрываючы толькі частку лісця на кусту ці дрэве, бо беларускія сяляне ведалі, што збор усіх лісцяў можа прывесці да ўсыхання расліны [29, л. 9]. Плады і насенне нарыхтоўвалі пасля поўнага іх выспявання (толькі насенне кмена збіралі не зусім спелым). Карэнне выкопвалі ў канцы лета ці восенню, радзей – вясной



Рэпазіторый БГАТУ

(карэнне хрэна, валяр'яны) [188, с. 38]. Такія тэрміны нарыхтоўкі былі цалкам аптымальнымі, бо восенню ў карэнні ўтрымліваецца найбольшая колькасць лекава актыўных рэчываў, да таго ж карэнне ў гэты перыяд буйное і важкае. Яго адразу ж ачышчалі ад зямлі, абразалі карнявыя разгалінаванні. Буйное карэнне (напрыклад, валяр'яны) разразалі на часткі і сушылі [300, с. 141].

Сярод прыёмаў сушкі расліннай сыравіны трэба асабліва вылучыць забарону сушыць лекавыя травы (кветкі, лісце, сцябло) на сонцы [188, с. 40]. Іх часцей за ўсё сушылі на гарышчы ці ў паветцы, у свірнах, якія добра праветрываліся. Гэтыя факты пацвярджаюць рацыянальнасць народных ведаў беларусаў аб раслінным свеце, бо, згодна даследаванняў вучоных-фармакагностаў, пад прамым уздзеяннем сонечных прамянёў кветкі, лісце і травы губляюць не толькі сваю афарбоўку, але і лекавыя ўласцівасці [88, с. 55].

Такім чынам, вывучэнне прымянення ведаў аб дзікарослых раслінах у народнай медыцыне беларусаў дазваляе канстатаваць, што тэрміны збору лекавых раслін і прыёмы іх прыгатавання да ўжывання былі цалкам аптымальнымі з пункту гледжання найбольшага назапашвання і найлепшага захавання раслінамі лекавых уласцівасцей [326, с. 505], што сведчыць пра глыбокія веды беларусаў аб раслінным свеце. У 80–90-я гг. XX ст. сярод значнай часткі насельніцтва Беларусі назіраецца ўзмацненне цікавасці да народнай медыцыны. Гэты факт можна патлумачыць тым, што ў параўнанні з сінтэтычнымі лекавымі сродкамі дзеянне раслінных прэпаратаў больш мяккае, не такое таксічнае, а пабочны эфект і супрацьпаказанні зведзены да мінімума. У той жа час неабходна падкрэсліць, што на сучасным этапе далёка не ўсе нарыхтоўшчыкі карыстаюцца традыцыйнымі спосабамі збору расліннай лекавай сыравіны, якія дазвалялі б рацыянальна выкарыстоўваць, захоўваць прыродныя рэсурсы, забяспечваць іх узнаўленне. Таму іх прапагандаванне, выкарыстанне ў экалагічнай адукацыі і экалагічным выхаванні, а затым і ўкараненне ў практыку гаспадарчай дзейнасці, можа прынесці значную карысць мясцовай флоры, калі рост аб'ёмаў нарыхтоўкі лекавай сыравіны расліннага паходжання не шкодзіў бы існуючым экасістэмам.

У сістэме жыццезабеспячэння беларускага этнасу самае шырокае прымяненне знайшлі разнастайныя мясцовыя віды дрэваў. Для будаўніцтва жылых і гаспадарчых пабудоў выкарыстоўвалі ў асноўным хвойныя дрэвы (сасну, елку) [182, с. 97], радзей – асіну, дуб (для падвалінаў, на шулы). Бандарныя вырабы майстравалі



часцей з дубу (бочкі, дзежкі, кадушкі) і ліпы (ліпаўкі для захоўвання мёду). Посуд, хатняе начынне (лыжкі, міскі, макацёры, маслабойкі, ступы), дзіцячыя цацкі выраблялі з ліпы, клёну, бярозы, вольхі [94, с. 123]. Усе матэрыялы нарыхтоўваліся ў пэўныя тэрміны. Так, дрэвы для будаўніцтва дома ссякалі ў асноўным у зімовы час (не ў перыяд сокагону), калі яны маюць большую цвёрдасць, смалістасць, г. зн. доўгую захаванасць драўніны [217, с. 210]. На дровы часцей за ўсё нарыхтоўвалі сухастой, а таксама дрэвы, зламаныя ў час буры ці спаленыя маланкай. Выкарыстоўваць іх для будоўлі жылых і гаспадарчых памяшканняў катэгарычна забаранялася, бо лічылася, што да іх дакранаўся сатана, а таму будыніна згарыць ці яе насельнікі (як людзі, так і хатняя жывёла) хутка памруць [158, с. 202, 203; 232, с. 304; 236, с. 292; 346, с. 181; 350, s. 432]. Не рэкамендавалася будаваць хаты і хлявы і з сухастою, ён прызнаваўся прыдатным толькі для будаўніцтва гумнаў [251, с. 117].

Пэўнае месца ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў займала нарыхтоўка бярозавага і кляновага сокаў, грыбоў, ягад [27, л. 12; 29, л. 8, 23; 301, с. 157]. Бярозавы сок пачыналі пускаць з канца сакавіка, за 5–6 дзён да распускання пупышак. Прыкладна да 80-х гг. XIX ст. дзеля гэтага ў дрэве рабілі сякераю даволі глыбокую шчыліну, куды заганялі пад нахілам клін з цвёрдай драўніны з жалабком пасярэдзіне, даўжынёй 25 см, а шырынёй да 6 см. У канцы XIX – пачатку XX ст. дадзены спосаб нарыхтоўкі соку пачаў замяняцца на менш драпежніцкі: у дрэве свідравалася адтуліна дыяметрам не больш 3 см, куды ўстаўляўся спецыяльны жалабок. На працягу 6–10 дзён ад аднаго дрэва атрымлівалі да 40 вёдраў гэтага каштоўнага напою. Дзеля папярэджання гніення дрэва пасля заканчэння збору соку адтуліну забівалі выструганым калком ці замазвалі глінай [232, с. 306]. Такі ашчадны спосаб збору бярозавага соку быў распаўсюджаны не толькі ў Беларусі, але і ва Украіне, у Польшчы, Чэхіі, Югаславіі, у Балгарыі [351, s. 27]. Беларускія сяляне ведалі перыяды сокагону і іншых дрэваў, здымаючы ў гэты час кару з ліпы, клёну, лазы (для пляцення лапцей, карзін, рагожы), з дубу (для дублення скур) [29, л. 9; 217, с. 210]. Беларусы мелі ўяўленне аб вегетатыўных перыядах развіцця раслін, хуткасці іх росту. Напрыклад, дуб на двары каля дома забаранялася высаджваць жалудом – «той, хто пасадзіць дуб жалудом, памрэ раней, чым дрэва дасягне яго росту» [232, с. 307]. На першы погляд такое тлумачэнне здаецца памылковым, але зараз



Репозиторий БГАТУ

ужо дакладна вядома, што дуб з жалуда расце вельмі павольна, асабліва на пясчаных глебах Беларускага Палесся [311, с. 135].

Многія з распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі відаў дрэваў (перш за ўсё вярба, бяроза, клён, ліпа, дуб) лічыліся сялянамі «добрымі» і нават свяшчэннымі [138, с. 146; 236, с. 292; 251, с. 57]. Іх забаранялася секчы без патрэбы, галінкі вярбы асвячалі на Вербніцу ў цэрквах і касцёлах, галінкамі бярозы, клёну, ліпы на свята Троіцы ўпрыгожвалі хаты, вароты, сцены і дзверы хлява, вуглы, сенцы. Існаванне гэтых абрадаў зафіксавана ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі як вучонымі XIX – першай паловы XX ст., так і палявымі этнаграфічнымі даследаваннямі аўтара [14, спр. 36, л. 31, 32; 14, спр. 42, л. 44; 15, спр. 63, л. 5; 19, спр. 170, л. 33; 25, л. 6, 18, 29, 32; 27, л. 11, 20; 28, л. 4, 11, 14–17, 33; 29, л. 3, 15, 40, 43, 54, 58, 63, 74, 82, 83; 59, с. 15; 61, с. 24; 115, с. 260; 138, с. 168; 158, с. 120; 219, с. 515; 236, с. 203; 311, с. 134; 312, с. 56; 313, с. 305; 354, s. 219]. На тэрыторыі Панямоння на Вербніцу яшчэ ў XIX ст. прыносілі ў царкву на асвячэнне цэлае дрэва вярбы разам з каранямі [60, с. 21]. Лічылася, што каліна ахоўвае ад перуна. Пад ёй дазвалялася сядзець у час навальніцы з мэтаю захавацца ад маланкі. Ягадамі каліны нават упрыгожвалі абразы ў доме і стагі сена дзеля абароны ад перуна [232, с. 307]. Свежымі альховымі галінкамі з лісцем парылі гладышы, каб ніхто не зачараваў малако; клалі кавалачкі вольхі ў вопратку маладых, г. зн. успрымалі гэтае дрэва як абярэг ад хваробаў і няшчасцяў [47, с. 88]. Чырвоны вогненны колер ягад рабіны і яе лісце крыжападобнай формы забяспечылі выкарыстанне і гэтага дрэва ў якасці надзейнага абярэга: ударыўшы рабінавым кіем ваўкалака, можна было, быццам бы, вярнуць яму чалавечае аблічча [Там жа. С. 413]. Усе гэтыя факты з'яўляюцца адлюстраваннем старажытнага культу дрэваў і раслiннасці наогул. У некаторых выпадках ён насіў магічны характар: так, напрыклад, упрыгожванне зелянінай дамоў і людзей (абрад «ваджэнне куста») павінна было садзейнічаць развіццю расліннасці [138, с. 173].

Культ дрэваў з'яўляецца складовай часткай культаў абагаўлення прыроды: «Селянін абагаўляе прыроду і пакланяецца ёй», – падкрэсліваў Е.Р. Раманаў [238, с. 35]. Пацверджаннем гэтага з'яўляюцца беларускія казкі, адна з якіх, напрыклад, распавядае аб тым, як аднойчы селянін хацеў ссячы ў лесе елку, а яна прасіла пакінуць яе, абяцаючы сваю дапамогу; селянін спачатку яе пакінуў, але потым усё ж ссек і адразу ж стаў мядзведзем [215, с. 56]. Як



бачым, асноўная ідэя сюжэта – гнеў пакрыўджанага, валодаючага магутнай сілай дрэва. У іншым паданні, зафіксаваным у канцы XIX ст. у вёсцы Вялікі Лес сучаснага Брэсцкага раёна, гаворыцца аб тым, як нейкі селянін зрубіў для будаўніцтва млына тры сасны, што раслі з аднаго кораня, але будоўлі не скончыў, бо хутка памёр ад невядомай хваробы [112, с. 47].

Важнейшым аспектам міфалогіі дрэва з'яўляецца яго ўстойлівая суаднесенасць з чалавекам. Лічылася, што дрэвы, як і людзі, могуць хадзіць, размаўляць, перажываць перыяды квітнення і завядання, нараджацца і паміраць (тут можна прыгадаць забарону секчы дрэва без вялікай патрэбы, бо яно павінна «памерці сваёй смерцю») [254, с. 134]. Паводле беларускіх павер'яў, у дрэвы часта перасяляліся чалавечыя душы: калі дрэва сякуць, то з яго ідзе кроў, чуваць стогны, а калі дрэва зарыпіць, то гэта прыкмета таго, што дрывасек вымушае душу шукаць сабе іншы прытулак [47, с. 151; 111, с. 57; 125, с. 591–629].

Шанаванне дрэваў, як характэрная рыса славянскага паганства, было своеасаблівым рытуалам маленняў, звернутых да вегетатыўнай сілы прыроды [205, с. 49]. Славяне мелі свяшчэнныя гаі, у якіх пакланяліся старым дрэвам (дубам, ясеням, клёнам, ліпам і інш.) [254, с. 13, 135, 136, 169, 170; 256, с. 141, 142; 345, с. 730]. Падрабязнае апісанне свяшчэннага гаю ў палабскіх славян утрымліваецца ў «Славянскай хроніцы» Гельмольда, які ў 1155 г. прымаў удзел у яго знішчэнні. У гэтым гаі раслі пераважна дубы: «Іх абкружаў дворык, абнесены драўлянай агароджай. Тут былі і жрэц, і свае святы, і розныя абрады ахвярапрынашэнняў. Сюды збіраўся ўвесь народ з князем і жрацом на чале» [89, с. 185, 186]. З прыняццем хрысціянства свяшчэнныя гаі і культавыя дрэвы пачалі знішчацца.

Месцы, што напаміналі свяшчэнныя гаі («прошчы»), а таксама асобныя культавыя дрэвы захаваліся на тэрыторыі Беларусі як у XIX ст. – пачатку XX ст., так і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. [111, с. 58; 313, с. 305]. Сведчаннем культавага прызначэння такіх гаёў сталі іх назвы – Княжая Дуброва паблізу Турава, Каралеўская Дуброва ля вёскі Першамайская Шчучынскага, Дубовы Гай паблізу вёскі Гатава Мінскага, Святы Гай ля вёскі Ніз Слонімскага, Красны Гай ля вёскі Талачманы Свіслацкага раёнаў, Пушча Старына ля вёскі Крывічы на Дзісеншчыне і інш. [47, с. 111]. Гэта былі ўчасткі леса, якія складаліся з вельмі старых дрэваў; часам яны абносіліся агароджай, у межах якой, акрамя дрэваў, знаходзілася якая-небудзь



Репозиторий БГАТУ

святыня: капліца, крыж, абразы, крыніца, што лічылася лекавай. Сюды прыходзілі набіраць ваду, маліцца, тут адбываліся крыжовыя ходы ў царкоўныя святы, асабліва ў дні асвячэння мясцовых капліц [28, л. 18, 35; 29, л. 11]. Культавыя дрэвы, якія згарэлі ці паваліліся ад старасці, пакідалі ў недатыкальнасці. За шкоду, якая наносілася такім дрэвам, чалавек караўся цяжкай хваробай – вар'яцтвам, слепатой, паралічом. Спроба кампенсаваць шкоду, напрыклад, пасадзіць новае дрэва замест знішчанага, змягчала пакаранне, і хвароба магла «адпусціць» [254, с. 135].

Вялікай пашанай у беларусаў карыстаўся дуб, які выступаў у якасці сімвала вечнага жыцця, увасабляючы сілу, моц, мужчынскі пачатак. Пад пагрозай заўчаснай смерці яго забаранялася ламаць, секчы, зразаць. Шырокавядомымі былі дуб ля вёскі Царкавішча Ушацкага раёна, на беразе ракі Мядзёлкі ў Паставах [47, с. 154]. Захаваліся назвы культавых дубоў – Волат, Асілак, Святы Дуб, Добры Дуб, Трохгранны Дуб, Пёруноў Дуб, Стары Дуб і інш. Пра культ дубу яскрава сведчаць знаходкі 1869 года на тэрыторыі Барысаўскага павета: у лесе, у дупле вельмі старога дубу сяляне знайшлі два паганскіх ідалы, адзін з якіх быў выраблены са срэбра, а другі – з бронзы [111, с. 57]. Дуб пад назвай Волат рос ў Мінску на капішчы, якое праіснавала на беразе Свіслачы да пачатку XX ст. Жалуды з гэтага дубу лічыліся святымі [Там жа]. Паблізу вёскі Адэлькавічы (Слонімскі раён) вядомы вялізны дуб каля кurganоў. У канцы XIX ст. там было два дубы, а яшчэ раней іх было чатыры. Дубы лічыліся зачараванымі, і па павер'ях, калі зрубіць такі дуб ці нават узяць з яго галінкі, адарваныя ветрам, то абавязкова здарыцца якое-небудзь няшчасце, – здохне конь, карова ці авечка. Зафіксавана паданне аб тым, што аднойчы арандатар графа Завішы зрэзаў два дубы, і ад гэтага ў яго здохла ўся жывёла. Два дубы, якія засталіся, людзі акраплялі святой вадой, і іх ніхто не чапаў [Там жа. С. 58].

Дзе-нідзе ў Беларусі да пачатку XXI ст. яшчэ захавалася абрадавае «кармленне» культавых дрэваў, асабліва бяроз: ім носяць хлеб-соль, загорнутыя ў палатно, лён, грошы, стужкі тканіны [47, с. 151]. Беларусы верылі, што некаторыя дрэвы (напрыклад, ліпа каля вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна, дуб каля вёскі Царкавішча Ушацкага раёна) валодаюць лекавымі ўласцівасцямі. Хвораму трэба было пралезці праз дзірку ў такім дрэве, пасля чаго ён павінен быў разарваць на сабе тую частку адзення, што дакранала ся да хворага месца. Разарванае адзенне



пакідалі каля дрэва і апраналі новае. Лічылася, што пасля гэтага дрэва можа падараваць здароўе [111, с. 59; 121, с. 47].

У XIX–XX стст. беларусы ахвотна садзілі на сваіх сядзібах бярозы, клёны, ліпы, бо лічылася, што яны прыносяць людзям шчасце [251, с. 57; 312, с. 56]. Ссекчы любое дрэва, што расло паблізу хаты, на двары ці на вуліцы гаспадару дома ці тым больш іншаму чалавеку было вялікім грахом [27, л. 14; 28, л. 8, 10, 25; 232, с. 304; 311, с. 134]. Існавалі і іншыя забароны, звязаныя з дрэвамі. Так, нельга было знішчаць чаромху, «бо пчолам не будзе адкуль браць вясенні мёд» [232, с. 307]; рабіну: «хто зрэжа рабіну, той памрэ цяжкай смерцю» [348, s. 244]; а таксама ясень, бо «з яго нашыя продкі атрымалі свяшчэнны агонь» [232, с. 307]. У паданні, зафіксаваным М. Федароўскім, распавядаецца аб тым, што калі Бог прагнаў Адама і Еву з рая, то ён выгнаў і чорта, які іх спакусіў, і наслаў на яго Пяруна. Чорт схаваўся пад ясень, а Бог запаліў яго пярунам: так Адам атрымаў першы агонь [348, s. 239].

Такое пазітыўнае ў большасці выпадкаў стаўленне да дрэваў, беражлівыя адносіны да іх патрабуюць больш дэталёвага тлумачэння. Дрэвы давалі чалавеку галоўны матэрыял для прылад працы і жытлаў, а таксама ежу. Пасля з'яўлення ў чалавека агню менавіта дрэвы былі крыніцай паліўнага матэрыялу, без якога немагчыма было карыстацца агнем. Важнае гаспадарчае значэнне дрэваў, магчыма, і стала галоўнай перадумовай іх табуацыі. Да таго ж рост дрэва і хуткае развіццё яго вясною, завяданне восенню давалі першабытнаму чалавеку падставы лічыць дрэва жывой істотай, што адчувае боль пры рубцы – раненні [124, с. 142]. Спачатку, відаць, забаранялася секчы ўсе вялікія дрэвы наогул. Усталяванню гэтай забароны найперш садзейнічала тое, што першабытнаму чалавеку было вельмі цяжка, амаль немагчыма зрубіць вялікае дрэва прымітыўнымі прыладамі, што былі ў яго распараджэнні. Адначасова не было і асаблівай неабходнасці секчы растучыя дрэвы, бо заўсёды можна было знайсці паваленыя ствалы. Такім чынам, табу на ссяканне дрэваў магло спачатку ўзнікнуць як простая фіксацыя становішча, што існавала ў глыбокай старажытнасці [Там жа. С. 143]. Па меры развіцця вытворчых сіл узрастала патрэба чалавека ў свежых буйных ствалах дрэваў. Супярэчнасць паміж гаспадарчай неабходнасцю і забаронай на рубку хутчэй за ўсё стала галоўным штуршком для далейшага развіцця культу дрэваў, сляды якога зафіксаваны этнографамі ва ўяўленнях многіх народаў свету, у т. л. і ў беларусаў.



Репозиторий БГАТУ

Негатыўныя ўяўленні былі звязаны са значна меншай колькасцю відаў дрэваў і найперш – з асінай. Паўсюдна на тэрыторыі Беларусі лічылася, што на ёй павесіўся Іуда. Асіну клалі на магілу чараўнікам; асінавымі каламі пратыкалі іх у труне, каб яны «не ўставалі» [70, с. 190; 238, с. 34; 240, с. 163, 170; 348, s. 268; 354, s. 163]; страшным праклёнам былі словы: «Павісні ты на горкай асіне» [236, с. 292]; «Няхай цябе трасца трасе, як асінавы ліст» [354, s. 163]. Асіну садзілі на магілах самазабойцаў [297, с. 18], яе забаранялася выкарыстоўваць у гаспадарцы акрамя будоўлі смалакурань, бо беларусы трапна адзначылі: «Усё адно ад смалы пропасць чарцей, дак і ад асіны не будзе іх больш» [232, с. 309].

Такім чынам, народныя веды аб раслінным свеце паспяхова выкарыстоўваліся ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў, галоўным чынам у земляробстве. Яны найбольш выяўляюцца ў традыцыйных спосабах правядзення агратэхнічных мерапрыемстваў і ў земляробчым календары, дзе знайшла прадметнае адлюстраванне ўся сума ведаў аб акаляючай прыродзе. Традыцыйныя спосабы і тэрміны правядзення ўсіх неабходных агратэхнічных работ (угнаення глебы, узорвання, баранавання, сяўбы, праполкі гародніны, акучвання і ўборкі пасеяных і высаджаных раслін) вызначаліся на падставе ведання ўласцівасцей сельскагаспадарчых культур, вегетатыўных перыядаў іх прарастання, цвіцення і выспявання, а таму былі цалкам аптымальнымі. Комплексная сістэма ведаў аб культурных раслінах у цэлым была адзінай на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Адрозненні найбольш выяўляюцца ў тэрмінах правядзення сельскагаспадарчых работ, што непасрэдна залежаць ад прыродна-кліматычных умоў розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Значныя змены ва ўсіх сферах культуры беларусаў, у сацыяльна-дэмаграфічнай структуры нацыі, якія адбыліся на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст., звузілі сферу прымянення традыцыйных ведаў аб культурных раслінах і разбурылі іх як цэласную сістэму: у практыцы гаспадарчай дзейнасці выкарыстоўваюцца толькі асобныя іх элементы. З прычыны таго, што збожжавыя культуры адыгрываюць нязначную ролю ў падсобнай гаспадарцы, страціла гаспадарчае значэнне сукупнасць ведаў, што прымянялася пры іх вырошчванні. Як паказалі палявыя этнаграфічныя даследаванні, на сучасным этапе выкарыстоўваюцца толькі асобныя прыёмы і прыкметы, звязаныя з угнаеннем глебы і паслядоўнасцю высеву сельскагаспадарчых культур. У той жа час склаліся больш спрыяльныя ўмовы для



захавання ведаў, якія выкарыстоўваліся пры вырошчванні гародніны і бульбы, бо гэтыя культуры займаюць важнае месца ў прыватных падсобных гаспадарках.

У народных ведах беларусаў аб дзікарослых раслінах выяўляюцца беражлівыя адносіны да акаляючай флоры, у першую чаргу да лясных рэсурсаў. Гэта адзначана як назіраннямі этнографаў XIX – першай паловы XX ст., так і дадзенымі апытанняў вясковага насельніцтва, праведзеных аўтарам. Беларускія сяляне ніколі не ссякалі дрэвы без патрэбы, не вынішчалі ягадныя і грыбныя рэсурсы. Так, пры збіранні грыбоў заўсёды імкнуліся захаваць грыбніцу, зразаючы грыб нажом ці асцярожна выкручваючы яго з зямлі [29, л. 37]. Ягады ніколі не збіралі няспелымі і да адной, пры зборы чарніц не выкарыстоўвалі драўляныя грэбні [301, с. 159; 310, с. 253]. Вышэй ужо гаварылася аб ашчадным спосабе збору бярозавага і кляновага сокаў, які амаль не пашкоджваў дрэва. Рацыянальна падыходзілі і да нарыхтоўкі кары, здымаючы яе не з усіх дрэваў на тым ці іншым вучастку, а выбарачна [302, с. 274]. У той жа час, дадзеныя факты не могуць сведчыць пра абсалютна гарманічнае суіснаванне беларускага этнасу з прыродай, бо ўсялякае дзеянне чалавека раўназначна негатыўна для прыроды, бо не можа не парушаць натуральнага яе развіцця (натуральнай прырода можа быць толькі пры поўным неўмяшальніцтве чалавека) [129, с. 139]. Аднак для беларусаў была характэрна павага да багаццяў прыроды, яе прыгажосці, якая прывівалася ім яшчэ ў дзяцінстве і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Мы з поўным правам можам гаварыць аб адсутнасці ў беларусаў драпежніцкіх адносін да прыроды, іх імкненні захоўваць і рацыянальна выкарыстоўваць яе багацці.



Репозиторий БГАТУ

# 3. ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ АБ ЖЫВЁЛЬНЫМ СВЕЦЕ

## 3.1. Народныя веды аб свойскіх жывёлах і іх прымяненне ў традыцыйнай жывёлагадоўлі

У XIX ст. – першай палове XX ст. у сялянскай гаспадарцы беларусаў выключнае значэнне мелі каровы, валы і коні, таму найбольшая колькасць парадаў па догляду звязана менавіта з імі. Веды аб буйной рагатай жывёле і конях адзіны ў сваёй аснове на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Яны адрозніваюцца комплекснасцю і ўсебаковасцю. Забаранялася абражаць карову або праклінаць яе. Карову нельга было біць, асабліва ў нос, бо «нават ад пстрычкі яна можа скінуць цяля» [232, с. 334]. У апошнія тыдні цельнасці карову не ганялі на вадапой. У гэты час у корм ей рэкамендавалася даваць менш сена, буракоў (каб карова «запусцілася», г. зн. каб у яе зменшылася колькасць малака). Гэтае правіла выконваецца і сучасным вясковым насельніцтвам [29, л. 60]. Цялё ў першыя тыдні карміласяа цэльным малаком і знаходзілася пры карове, а потым яго адсаджвалі і пачыналі даваць разведзенае малако, а пазней – пойла [94, с. 124]. Гэтаксама цялят стараюцца карміць і ў сучасных прыватных падсобных гаспадарках на ўсёй тэрыторыі Беларусі [29, л. 16, 56].

У перыяд ацёлу каровы і жараблення кабылы нічога не пазычалі і не прадавалі з хаты [24, л. 10, 49; 119, с. 42; 158, с. 205; 251, с. 77; 294, с. 227]. Гэтая забарона не страціла сваёй актуальнасці і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. [27, л. 10, 11; 28, л. 2, 32; 29, л. 34, 35, 53]. У XIX ст. – першай палове XX ст. яна распаўсюджвалася і на іншыя дні – дзень пачатку сяўбы, першага выгану жывёлы ў поле [293, с. 170; 354, s. 216]; калі ў хаце нарадзілася дзіця. Згодна народным уяўленням, у такія памежныя дні ўзрастала небяспека неспрыяльнага знешняга ўздзеяння, і па нядобрай волі займальніка ці нават насуперак яго волі з пазычанымі рэчамі магло быць забрана шчасце, здароўе, плоднасць жывёлы [305, с. 15]. Калі пазней усё ж давалі каму-небудзь малако, то туды сыпалі трошкі солі, а пра сябе казалі «Соль у вочы», а каб карова ручылася, то яе рэкамендавалі прадаць хаця б за пятак сваім дзецям [94, с. 124]. Паўсюдна на Беларусі існавала забарона паказваць маладняк (асабліва цялят) чужым людзям, нават суседзям, каб яго не сурочылі [19, спр. 172, л. 10; 19, спр. 173, л. 18; 28, л. 2, 29;



219, с. 498]. Матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара паказваюць, што ўяўленні аб уроках хатняй жывёлы захаваліся ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі да пачатку XXI ст. [27, л. 5, 6, 9, 11; 29, л. 11].

Аднак беларускі селянін спадзяваўся не толькі на магічныя дзеянні. Ён разумеў, што добры догляд таксама прыносіць жывёле вялікую карысць: «Як гаспадар каля жывёлы мучыцца, то жывёла ручыцца»; «Як даглядаў, так і бог даў»; «Не вымем карова малако дае, а языком»; «Вала перш накармі, а тады даймі»; «Сам не з'еш, а каню дай»; «Дагледзь каня дома, а ён цябе ў дарозе»; «У дарозе не конь вязе, а авёс»; «Як карміць каня, дык няма каму, а як біць, дык ё» [15, спр. 60, л. 35; 58, с. 455; 250, с. 6]. Матэрыялы апытанняў вясковага насельніцтва сведчаць аб тым, што комплекс народных ведаў па догляду хатняй жывёлы, адзіны для ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, не страціў свайго практычнага значэння і ў канцы XX – пачатку XXI ст. [27, л. 6; 28, л. 21; 29, л. 16]. Існавала шмат уяўленняў, якія грунтаваліся на практычнай дзейнасці сялян, іх шматгадовых назіраннях. Дойнасць каровы вызначалася па шэрагу знешніх прыкмет: доўгаму хвасту, худой шыі, тонкай скуры, тоўстых жылах на жываце, па месцы, якое займае карова ў статку (лічылася, што немалочныя каровы «цягнуцца» ззаду статку) [251, с. 76]. Гэтыя прыкметы дойнасці кароў аднолькавыя для ўсёй тэрыторыі Беларусі [294, с. 308]. Па знешніх прыкметах вызначалі і тлустасць малака ў каровы: «У якой каровы вуха жоўтае, як наготкі, то малако густое, а калі вуха сіняе, як пуп, то і малако сіняе, нібы з вадою» [232, с. 335]. Веды беларусаў распаўсюджваліся і на захаванне малака. Каб малако хутка не скісала, збан выпарвалі адварам альховых галінак, а таксама кідалі соль у даёнку. Усе гэтыя дзеянні не маюць у сабе нічога забабоннага, прымхлівага і ў асноўным з'яўляюцца рацыянальнымі. Яны не страцілі свайго значэння і ў сучаснай прысядзібнай гаспадарцы [29, л. 9, 74].

Акрамя таго, і містычная думка прыносіла практычную карысць: часам не разумеючы механізму дзеяння тых ці іншых лекавых і прафілактычных сродкаў, беларускія сяляне тым не менш маглі з поспехам прымяняць іх. Так, напрыклад, пасля ацёлу сачылі, каб карова не з'ела таго сена ці саломы, дзе толькі што ляжала цялё, – у працілеглым выпадку яе малако на 11 тыдняў быццам бы пераўтваралася ў пену, «у шум» [158, с. 205]. Малако ў каровы, вядома, ад гэтага не знікала, а вось засмечванне страўніка



Репозиторий БГАТУ

паследам – з'ява нярэдкая. У некаторай ступені апраўдваў сябе і зафіксаваны на Усходнім Палессі звычай вешання забітай сарокі ў стайне, дзе стаяў конь, на якім ноччу нібыта ездзіў чорт [29, л. 39; 354, s. 165]. Забітая сарока магла палохаць ласіцу, якая ноччу ўзбіралася на каня, каб адтуль лавіць мышэй. Не выключана, што яна магла сасаць кроў у коней, з-за чаго пасля ночы яны знаходзіліся ва ўзбуджаным стане, што лічылася справай хлеўніка ці чорта.

У XIX ст. пэўнае распаўсюджанне на Беларусі мелі авечкі. Аднак кожная авечка за зіму з'ядала да 20 пудоў сена [357, s. 207] і патрабавала шмат пашы («Дзе пройдзе авечка, там карове і каню рабіць няма чаго»). Таму ў пачатку XX ст. пагалоўе авечак у беларускіх губернях зменшылася на 30 % [91, с. 277]. Аб далейшым змяншэнні колькасці авечак на працягу другой паловы XX ст. сведчаць і апытаныя намі інфарматары [28, л. 38]. Кожны гаспадар трымаў таксама свіней, курэй, а ў прырэчных і прыазёрных вёсках – гусей і качак. Ён меў значныя навыкі па догляду не толькі дарослай хатняй жывёлы, але і маладняку – цялят, жарабят, ягнят, парасят [312, с. 57]. Істотных рэгіянальных адрозненняў у ведах, што выкарыстоўваліся ў доглядзе маладняку, не выяўлена. Гэтымі ведамі карыстаецца і сучаснае вясковае насельніцтва [27, л. 6; 29, л. 16]. Значныя веды былі таксама назапашаны ў галіне элементарных асноў анатоміі і фізіялогіі хатніх жывёл і птушак (гэтыя звесткі атрымлівалі пры «разбіранні» іх туш).

Захворванні хатніх жывёл, іх падзеж з'яўляліся велізарным бедствам для сялян, бо каровы, коні, валы, авечкі, свінні давалі не толькі неабходныя прадукты харчавання (малако, масла, смятану, сыр, мяса, сала і г. д.), але і скуры, воўну, з якіх рабілася верхняе адзенне, шапкі, валёнкі, вупраж, а таксама гной, без якога не маглі радзіць бедныя на спажыўныя рэчывы глебы Беларусі. Таму з ранняга дзяцінства кожны селянін набываў не толькі навыкі па догляду хатняй жывёлы, але і элементарныя веды па аказванню ветэрынарнай дапамогі. У традыцыйных ведах беларусаў аб спосабах лячэння хатніх жывёл можна вылучыць наступныя часткі: прыёмы і абрады, да якіх прыбягалі ў выпадках эпізаотый, павальных хвароб жывёлы; прыёмы і сродкі, якімі карысталіся ў выпадках неінфекцыйных хвароб, для лячэння асобных жывёл.

У XIX ст. – пачатку XX ст. найбольшыя спусташэнні сярод буйной рагатай жывёлы рабілі эпізаотыі чумы і яшчура; сібірскай язвы – у коней; чумы і рожы – у свіней [217, с. 228]. Эпізаотыі



сярод хатніх жывёл узнікалі вельмі часта, таму беларускім сялянам прыходзілася карыстацца традыцыйнымі прафілактычнымі і лекавымі сродкамі [305, с. 15]. На Палессі ў такіх выпадках рабілі сапраўдную каранцінную ізаляцыю здаровай жывёлы: «Як вельмі гавядо падае, то здаровае хутчэй гоняць дзе-небудзь у лес ці на астравок пасярод балота і там трымаюць у кашары часам аж да зімы, пакуль упадак сціхне» [251, с. 296]. Непасрэдна для лячэння чумы выкарыстоўвалі пупышкі сасны: «Пупышкі ў выглядзе адвару, дадаючы лыжку бярозавага дзёгцю, кожны дзень трэба ўліваць у горла хворай жывёле» [232, с. 393]. Важнае значэнне ў прафілактыцы эпізаотый сярод хатняй жывёлы надавалі акурванню яе дымам сасновых ці ядлоўцавых галін: «Перад варотамі дымяць, бо калі жывёла абкурыцца, то не прыстане хвароба ні ў полі, ні ў хляве» [Там жа. С. 394]. З гэтаю ж мэтаю абціралі морды жывёл адварам багуна [311, с. 136]. Адзначым, што акурванне жывёлы дымам з сасновых ці ядлоўцавых галін, зыходзячы з навуковых дадзеных аб лятучых фітанцыдах, з'яўляецца поўнасцю апраўданым прафілактычным сродкам. Багун жа мае антыбактэрыяльныя ўласцівасці, таму ўжыванне яго з мэтай прафілактыкі захворванняў жывёлы ў час эпізаотый таксама было мэтазгодным [305, с. 16].

Існавалі і іншыя сродкі барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі хатняй жывёлы, заснаваныя ўжо на магічных дзеяннях: у часы эпізаотый прыбягалі да буйных формаў калектыўнай абраднасці, у якіх нярэдка ўдзельнічала ўся вёска. Найбольш распаўсюджанымі былі тканне абыдзённага палатна, абходы з малебнамі, абворванне вёскі дзеля выгнання Кароўяй Смерці, абрады са здабываннем з дапамогай трэння так званага «жывога агню», прагон статку праз роў ці спецыяльна прарыты тунэль («земляныя вароты»). Магічнае значэнне надавалася тут сумеснай працы, бо лічылася, што супольныя намаганні могуць супрацьстаяць любой злой сіле. Так, пры з'яўленні «мору жывёлы» усе жанчыны вёскі ўначы напрадалі пражу, у тую ж ноч ткалі з яе вялікае палатнішча (так званы «абыдзёнік») і вывешвалі яго на краі вёскі ці на перакрыжаванні дарог [95, с. 36; 102, с. 264; 158, с. 197, 198; 236, с. 61]. У Панямонні сяляне ўначы на валах-блізнятах (пажадана, каб аратыя таксама былі блізнятамі) абворвалі сахою ўсю вёску [348, s. 294; 350, s. 434]. На Беларускім Палессі старыя мужчыны ішлі ў лес і драўлянай пілой пілавалі сухое дрэва, пажадана крушыну [24, л. 52] ці ясень [250, с. 41]. Здабыты такім



Репозиторий БГАТУ

чынам агонь прыносілі ў вёску і запальвалі вогнішча, праз дым з якога пераганялі ўсю жывёлу [236, с. 316; 250, с. 41]. Пэўныя абрады праводзіліся і ў прафілактычных мэтах (калі эпізаотыя закранула суседнія вёскі, але пакуль не пачалася ў дадзенай). Так, у вёсцы Буда Стара-Руднянскай воласці Рагачоўскага павета ў сярэдзіне XIX ст. у адным з курганоў прарылі траншэю і праз яе праганялі жывёлу з мэтай перасцярогі ад эпізаотыі [112, с. 48]. У некаторых рытуалах, што праводзіліся ў выпадку павальнага мору жывёлы ў XIX – пачатку XX ст., яскрава прасочваюцца сляды больш старажытных крывавых ахвярапрынашэнняў: «Упадак як пачнецца, дак ён ідзе ключом і цягне адно за другім. Каб упадак застанавіць, то трэба парваць гэты ключ, а дзеля гэтага знарок зрабіць які-небудзь упадак, напрыклад, жыўцом закапаць пеўня» [251, с. 299]. Інфарматар А. Мядзведзеў (Чэрыкаўскі раён) адзначае, што яго дзеду, у якога захварэла ўжо дзесятая карова, параілі злавіць жывога зайца і закапаць пад варотамі [29, л. 49].

Адзначым, што ўсходнеславянскія абрады, якія выконваліся ў час эпізаотый буйной рагатай жывёлы ці дзеля іх папярэджання, вельмі часта не маюць вялікіх адрозненняў ад абрадаў у час іншых масавых бедстваў (засуха, неўраджай, градабіццё і асабліва эпідэміі і мор на людзей) [305, с. 16]. Такія формы калектыўнай абраднасці, як абворванне вёскі, тканне палотнішча, здабыванне «новага» агню, а таксама ахвярапрынашэнні (так, па звестках О. Кольберга, сяляне вёскі Любішчыцы Слонімскага павета падчас эпідэміі халеры ў 1831 г. закапалі зажыва жанчыну разам з пеўнем і варонаю) [350, s. 434], шырока прымяняліся ў якасці ачышчальнага сродка пры эпідэмічных захворваннях людзей [46, с. 78, 79; 158, с. 195, 196; 238, с. 79; 348, s. 275, 294].

Аднак часцей за ўсё беларускаму селяніну даводзілася аказваць дапамогу сваёй жывёле пры захворваннях неінфекцыйных: падзяжы на ногі, уздуцці жывата, запаленні вымя ў кароў і інш. Тут шырока выкарыстоўваліся лекавыя сродкі расліннага паходжання. Яны прымяняліся ў якасці ўзвараў, сухога парашку, які дадавалі ў корм ці прысыпалі раны; высушанымі зёлкамі абкурвалі хворую жывёлу [14, спр. 37, л. 12]. Пры расстройствах страўніка ў кароў і цялят іх паілі ўзварамі дубовай кары, груш ці чорных ягад, адварамі ці настоямі з альховых шышак, травы дзьмухаўца ці конскага шчаўя. Калі ж у каровы назіраўся крывавы панос («крываўка»), то ёй давалі адвар крапіўніка, а таксама льняное семя, кветкі ці адвар зерня бобу [348, s. 422]. Вельмі часта каровы (асабліва цяляты),



а таксама коні, авечкі пакутвалі ад запораў. У гэты час ім улівалі ў горла раслінны алей і масіравалі жывот [232, с. 395]. Пры ўздуцці жывата, якое часта назіралася ў кароў, коней, валоў, цялят і жарабят пры ўжыванні свежай канюшыны (асабліва з расой ці пасля дажджу) або нядобраякасных кармоў, жывёле ўлівалі адвар крушыны, канапляны і льняны алей, а таксама агурковы расол, бураковы квас з посным маслам і соллю. У Падняпроўі карову пры ўздуцці жывата вадзілі ці праганялі праз 9 межаў [305, с. 16]. Такі ж прыём лячэння зафіксаваны намі і ў Палескім рэгіёне [29, л. 15]. Тут яскрава бачны сляды лічбавай магіі, аднак эфектыўнасць метаду лячэння (карова не магла стаяць на месцы ці ляжаць, што спрыяла ўзмацненню перыстальтыкі страўніка і кішэчніка) ад гэтага не змяншалася.

Запаленне вымя ў кароў лячылі шляхам яго масажу, націрання разбаўленым спіртам, прыкладання халодных кампрэсаў. У якасці ранагаючых сродкаў – для лячэння гнойных і застарэлых ран, язваў, лішаёў, экзэм – выкарыстоўвалі прыкладанне да іх лісця трыпутніка, дзядоўніка, прамыванне адварамі дубовай ці альховай кары [71, с. 77]. Каросту на нагах у коней лячылі бярозавым дзёгцем, адварам тытуню ў сумесі з адварам травы багуна. У перыяд лячэння стараліся не запрагаць вала ці каня падчас непагадзі, дажджу [311, с. 137]. Пры «замуліванні» – пацёртасці шыі, спіны ад хамута, сядзёлкі – пашкоджаныя месцы змазвалі попелам ад перапаленага рамяня, змешаным са смятанай, і не запрагалі жывёл да іх канчатковага выздараўлення. Пацёртыя месцы змазвалі яшчэ несалёным тлушчам [232, с. 396]. Неабходна адзначыць, што жывёльныя тлушчы займалі значнае месца ў арсенале вонкавых лекавых сродкаў народнай ветэрынарыі. Тлушчам змазвалі не толькі пацёртасці, але і апёкі, прымянялі яго пры вывіхах, а таксама для прыгатавання мазяў. Ад дыхавіцы (удушша) коней лячылі сечанай морквай, сенам, не даючы ім свежай травы [Там жа. С. 397]. Калі ўлічыць, што дыхавіца ў коней магла быць і алергічнага паходжання (бранхіяльная астма і іншыя захворванні, што абумоўлены ўдыханнем пыльцы пэўных раслін у час найбольшага іх красавання), то гэты метад лячэння і прафілактыкі з’яўляўся даволі дзейсным. Палявыя этнаграфічныя даследаванні не выявілі прынцыповых рэгіянальных адрозненняў у гэтых спосабах і прыёмах лячэння неінфекцыйных хвароб. Яны не страцілі свайго практычнага значэння і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. У гэты час асноўнай сферай іх прымянення



Репозиторий БГАТУ

з'яўляецца прыватная падсобная гаспадарка [27, л. 6; 28, л. 25, 31, 33, 37; 29, л. 7, 9, 11, 14, 15, 35, 49, 66].

Народныя сродкі лячэння неінфекцыйных хвароб жывёлы ўключалі ў сабе і магічныя дзеянні. Нярэдка ўжыванне тых ці іншых прыёмаў лячэння падмацоўвалася замовамі, шэптамі, якія ў большасці выпадкаў былі ідэнтычнымі «людскім замовам» – ад укусаў гадзюкі, ад звіху, ад бяльма, ад суроку [305, с. 16]. Магічныя дзеянні, накіраваныя, напрыклад, на выгнанне чарвей з ран, ажыццяўляліся над рознымі растучымі травамі: у беларусаў былі шырока распаўсюджаны замовы, якія вымаўляліся над прыгнутай да зямлі крапівой, дзьмухаўцом; замова звычайна ўтрымлівала пагрозу знішчэння расліны разам з коранем, калі чэрві не знікнуць [255, с. 361]. Лекавыя ўласцівасці прыпісваліся зерню, саломе, якія выкарыстоўваліся ў каляднай абраднасці. У жывёлагадоўчай магіі важныя функцыі надаваліся такім субстанцыям, як святая вада, чацвярговая соль, дзёгаць, воск, мёд, алей, поўсць, ртуць, попел; гаспадарчым прадметам і прыладам працы, найперш, вострым і жалезным (нож, сякера, іголка, барана, качарга); абутку, адзенню ці іх часткам (стары стаптаны лапаць, скураны абутак, мужчынскія штаны, падол), а таксама рэшату, памялу, нітцы, вяроўцы. У традыцыйных спосабах лячэння хатняй жывёлы шырока выкарыстоўваліся хтанічныя істоты (змазванне ран салам вожыка, кармленне хворай жывёлы высушаным мясам змяі, прывешванне жывёле, што пакутуе ад чарвей, жывой жабы ў анучцы і інш.) [Там жа. С. 361, 362]. У другой палове XX – пачатку XXI ст. выкарыстанне магічных дзеянняў у лячэнні жывёл захавалася ў значна меншай ступені, чым прымяненне сродкаў расліннага і жывёльнага паходжання. У асноўным яно абмежавана выкарыстаннем замоў, якое робіцца асобнымі пажылымі людзьмі ў прыватным парадку [28, л. 15, 29; 29, л. 18, 60, 64, 68].

У XIX ст. – першай палове XX ст. селянін даволі часта звяртаўся і да паслуг канавалаў (у першую чаргу ў час лягчання бычкоў, жарэбчыкаў, парсюкоў) [24, л. 19]. На працягу другой паловы XX ст., асабліва апошняй яго чвэрці, колькасць такіх людзей значна скарацілася [28, л. 37; 29, л. 35, 66]. Канавалам былі вядомы элементарныя правілы антысептыкі. Так, інструменты для лягчання – нож, іголкі, нажніцы – яны прамывалі кіпнем ці прапускалі праз агонь, а месцы хірургічных аперацый змазвалі ёдам, прысыпалі сушанай пыльцой дзеразы [305, с. 17]. Канавалы прытрымліваліся традыцыйных павер'яў, многія з якіх сягалі сваімі



каранямі ў глыбокую старажытнасць. Згодна з імі, заўсёды лягчалі маладняк на сходзе Месяца, у апошнюю квадру. У гэты час таксама ўскрывалі нарывы, ачышчалі гнойныя раны, бо лічылася, што на сход Месяца ўсё павінна было сыйсці «на нет», гэта значыць, знікнуць назаўсёды. У дні ж маладзіка не рабілі ніякіх хірургічных аперацый, «бо доўга не зажывуць раны, а то і чэрві завядуцца» [232, с. 284; 251, с. 79]. Дастаткова цікавыя і народныя ўяўленні аб уплыве маладзіка на паводзіны хатніх жывёл. Так, у час маладзіка быццам бы часцей шалеюць сабакі, а чэрві ўзбуджаюцца і больш дакучаюць [232, с. 284; 358, s. 105]. Дадзеныя назіранні не могуць лічыцца пазбаўленымі ўсялякага сэнсу, бо вучоныя-этолагі (эталогія – навука аб паводзінах жывёл) пакуль не знайшлі пераканаўчых доказаў таго, што астранамічныя з'явы (у т. л. і чаргаванне фаз Месяца) не аказваюць ніякага ўплыву на паводзіны прадстаўнікоў жывёльнага свету.

У сялянскай гаспадарцы беларусаў не меншае, калі не больш важнае месца ў параўнанні з уласна лячэннем, займалі меры, накіраваныя на прафілактыку захворванняў хатняй жывёлы. У той жа час неабходна адзначыць, што толькі адносна нешматлікія ўключаемыя сюды прадметныя і акцыянальныя абярэгі валодалі яскравай «ветэрынарнай» спецыфікай – большасці з іх паралельна надаваліся і іншыя семіятычныя функцыі: іх лічылі сродкамі, што садзейнічалі плоднасці жывёлы, ахоўвалі яе ад драпежнікаў, забяспечвалі вяртанне з пашы да свайго падворку і інш.

Існавала вялікая колькасць прадметаў, што аберагалі хатнюю жывёлу ад хвароб і нячыстай сілы. Яны маглі знаходзіцца ў хлявах, на агароджах, іх вешалі жывёлам на шыю ці на рогі. Здольнасць адганяць хваробы і злыя сілы прыпісвалася многім раслінам: крапіве, палыну, маку, чартапалоху, ліпавым галінкам і інш. Ахоўнай сілай валодалі пэўныя рэчывы: крэйдай і дзёгцем малявалі крыжыкі на сценах хлявоў; для адагнання ведзьмаў ад кароў, да якіх яны падпаўзаюць у выглядзе жаб, вужоў, у хлеў прыносілі васковую грамнічную свечку [59, с. 19; 60, с. 44; 158, с. 178], ладан; для прафілактыкі самых розных захворванняў у прасвідраваны рог каровы залівалі ртуць, залепліваючы гэтае месца воскам ад грамнічнай свечкі [236, с. 181; 358, s. 218]. Моцным ахоўным сродкам лічыліся рэшткі некаторых жывёл: забітыя сарока [61, с. 63; 350, s. 430; 354, s. 165, 172], варона, сава, кажан, якіх вешалі ў хляве, конскія і казліныя чарапы на варотах [215, с. 13]; мядзвежыя кіпцюры, уваткнутыя ў сцяну хлява. Калі ў каровы ці свінні



Репозиторий БГАТУ

завяліся чэрві, сяляне Панямоння вешалі ёй на шыю сабачую костку [236, с. 71]. Казёл, якога трымалі ў стайні, таксама разглядаўся як апатрапей, які адганяў нячыстую сілу і хваробы [215, с. 81; 232, с. 334]. Выкарыстанне некаторых абярэгаў (асабліва вешанне свянцонай солі на шыю карове) захавалася і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. [29, л. 64, 66].

Ахоўныя функцыі ўласцівы вялікай колькасці абрадаў і магічных дзеянняў, замацаваных за пэўнымі днямі каляндарнага гаспадарчага цыклу. Значная іх колькасць праводзілася вясною ў час першага выгану жывёлы ў поле, які на ўсёй тэрыторыі Беларусі прыпадаў на свята Юр'я вясновага (23 красавіка ст. ст. – 6 мая н. ст.). Жывёлу выганялі «на Юр'еўскую расу», якая надзялялася цудадзейнымі ўласцівасцямі: павялічвала ўдойнасць каровы [29, л. 3, 17, 76; 236, с. 180; 247, с. 44], абараняла конскі статак ад ведзьмакоў [158, с. 115; 219, с. 514]. Паколькі святы Юрый лічыўся апекуном коней, то ў гэты дзень святар служыў малебен над конскім табуном [153, с. 227]. Акрамя гэтага, на Юр'я рабіліся наступныя абрадава-магічныя дзеянні: жывёлу прымушалі прайсці праз ляжачы на зямлі замкнуты замок ці ніты ад кроснаў («каб так замкнулася пашча ў ваўка»); на парозе хлява клалі яйка, праз якое карова вымушана была пераступіць («каб каровы былі такімі ж круглымі, як яйка») [213, с. 103; 236, с. 180], сякеру («каб яна абараняла быдла ад усялякага зла») [46, с. 72]; хатнюю жывёлу абносілі запаленай свечкай, акурвалі «святаянскімі зёлкамі» [236, с. 212], ядлоўцам [351, s. 270] ці ладанам; акраплялі «святою» (асвечанай на Вадохрышча) вадою [219, с. 514]; сцягалі яе галінкамі вярбы, асвечанымі ў Вербную нядзелю ў царкве ці касцёле [7, л. 4; 19, спр. 171, л. 14; 25, л. 4, 5, 13, 29, 32; 27, л. 2, 3, 10, 11, 16; 28, л. 6, 11, 14, 17, 22, 25, 27; 29, л. 8, 15, 40, 53, 54, 57–59, 63, 64, 74, 78, 83; 61, с. 22; 70, с. 187; 102, с. 221; 138, с. 161; 238, с. 76, 77, 81, 82; 250, с. 39; 294, с. 164; 354, s. 216; 357, s. 393].

Вялікая ўвага ахове жывёлы ад розных злых сіл надавалася напярэдадні і ў час Купальскай ночы. Лічылася, што ў ноч на Івана Купалу ведзьмы прыходзяць адымаць малако ў кароў, ведзьмары «шкодзяць» коням на начлезе [14, спр. 36, л. 14, 33; 14, спр. 37, л. 11, 33; 14, спр. 54, л. 33; 15, спр. 59, л. 16; 27, л. 4, 5; 29, л. 18, 43, 50, 54; 211, с. 56; 331, с. 107]. Для абароны кароў ад ведзьмаў гаспадыні клалі пад парогамі хлявоў дзядоўнік і грамнічную свечку [236, с. 211; 357, s. 374]; над дзвярыма, на бэльках, у розныя шчыліны затыкалі «крапіву-жыгучку» [15, спр. 61, л. 32; 19, спр. 176, л. 21; 24, л. 6; 28,



л. 4, 6, 7, 10, 18, 24; 29, л. 20, 61; 213, с. 248; 238, с. 77; 357, s. 374]; ставілі ля варот бароны, косы, сярпы, пілы, сякеры, нажы; гаспадары ж не пасылалі ў гэтую ноч коней на начлег, а трымалі іх дома [102, с. 227; 158, с. 129; 219, с. 517; 357, s. 375]. Ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі асноўны змест і накіраванасць магічных дзеянняў на Юр'еў дзень і ў Купальскую ноч заставаліся нязменнымі: абараніць хатнюю жывёлу ад знешняга неспрыяльнага ўздзеяння. Нягледзячы на тое, што на працягу другой паловы XX ст. гэты абрадавы комплекс амаль страціў практычнае гаспадарчае значэнне, інфарматары дакладна перадаюць усе яго асноўныя элементы [29, л. 21, 44, 50, 56, 75, 76, 82].

Акрамя Юр'еўскай і Купальскай абраднасці, у XIX ст. – першай палове XX ст. існавала яшчэ вялікая колькасць шырока распаўсюджаных магічных дзеянняў і перасцярогаў, цесна звязаных з жывёлагадоўляй, якія былі прымеркаваны да пэўных каляндарных дат. Так, у Паазер'і ў першы дзень Калядаў гаспадар лавіў у кіпні пузыры і паліваў імі авёс, які раніцай даваў коням: «Каб яны былі такімі ж гладкімі, як пузыры, і каб так жа сама шпарка бегалі» [296, с. 47]. У гэтым жа рэгіёне на куццю, акрамя Мароза, запрашалі і авадня – гаспадар расчыняў акно і казаў: «Строк, а строк! Просім да куцці – толькі маіх коней (ці валоў) не круці!» [213, с. 129]. У розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, у прыватнасці ў Падняпроўі і Панямонні, на працягу ад Калядаў да Вадохрышча ўключна сяляне не зашывалі старога адзення, не пралі, не вілі вяровак, не гнулі абадоў, бо лічылася, што гэтыя работы дрэнна ўплываюць на прыплод жывёлы: маладняк будзе нараджацца з крывымі нагамі, зашытымі ртамі і іншымі недахопамі [102, с. 235; 158, с. 165; 219, с. 509, 510; 237, с. 67; 238, с. 69, 71; 350, s. 432]. На шчодрую куццю палешукі прыкмячалі, у які бок накіраваны рогі каровы: калі на поўнач – ацеліцца ў поўнач, на ўсход – раніцай і г. д. [354, s. 167]. У дні вялікіх святаў (Каляды, Новы год, Вадохрышча, Благавешчанне, Вялікдзень, Троіца і інш.) нічога не пазычалі з хаты, а асабліва агню і вады, бо гэта магло пашкодзіць свойскай жывёле [294, с. 263; 354, s. 154, 161; 357, s. 389].

Як бачым, беларускія сяляне назапасілі вялікую колькасць ведаў, якія прымяняліся імі ў доглядзе свойскай жывёлы, прафілактыцы і лячэнні яе хвароб. Найбольш характэрнай асаблівасцю традыцыйных ведаў беларусаў аб свойскіх жывёлах выступае арганічнае спалучэнне міфалагічна-рэлігійнага ўспрыняцця свету з рацыянальнымі навыкамі, якія грунтаваліся на



Репозиторий БГАТУ

практычнай дзейнасці сялян, іх шматгадовыхназіраннях. Традыцыйныя спосабы і прыёмы догляду хатніх жывёл, прафілактыкі і лячэння іх хвароб уяўляюць сабой сістэму, у якой злучаны ў адзінае цэлае яе вярбальны, акцыянальны (дзейнасны) і прадметны элементы. Да вярбальных элементаў адносяцца замовы, малітвы, матывіроўкі-пажаданні. Вярбальная магія выступала як у самастойным выглядзе, так і ў якасці суправаджэння тых ці іншых акцыянальных сродкаў і прыёмаў. Да найбольш распаўсюджаных акцыянальных элементаў адносяцца абход жывёлы, абкурванне, крапленне, кармленне ці паенне жывёлы лекавай ежай ці пітвом, масаж, расціранні, кровапусканне. Колькасць канкрэтных прадметаў, якія выкарыстоўваліся ў якасці прафілактычных і лячэбных сродкаў, амаль бязмежная, бо практычна любы прадмет і любая маніпуляцыя з ім маглі быць уцягнуты ў сферу жывёлагадоўчай практыкі.

### 3.2. Уяўленні аб дзікіх жывёлах і іх месца і роля ў народным светапоглядзе

Шмат ведаў і ўяўленняў беларусаў датычыліся дзікіх звяроў, птушак, а таксама рыб, паўзуноў, насякомых. Гісторыка-этымалагічны аналіз паказвае, што намінацыя аб'ектаў навакольнага свету ажыццяўлялася людзьмі ў працэсе ўцягнення іх у гаспадарчую дзейнасць з далейшым выкарыстаннем для задавальнення разнастайных патрэбаў, таму зыходным момантам пры фарміраванні пэўных вобразаў прадстаўнікоў жывёльнага свету з'яўляюцца рэальныя, аб'ектыўныя ўласцівасці, якасці абазначаемых жывёл [129, с. 95]. Аднак нельга забываць і аб тым, што ў класіфікацыі жывёл адлюстроўваюцца таксама адносіны людзей да іх якасцей, і гэтыя адносіны ўзнікалі ў працэсе ўзаемадзеяння чалавека з біялагічным асяроддзем, бо, назіраючы за дзікімі жывёламі, чалавек у сваёй свядомасці падраздзяляў іх па ступені карыснасці для сябе і іншых людзей. Таму прыкметы, на якіх заснавана традыцыйная класіфікацыя жывёльнага свету, грунтуюцца ў большай ступені на эмацыянальных, а не інтэлектуальных падставах.

Пласт народных вераванняў, якія адносяцца да жывёльнага свету, неаднародны ў генетычных адносінах: унутраная рэканструкцыя дазваляе выявіць у ім як архаічныя рысы, так і інавацыі, больш глыбінныя і паверхневыя міфалагічныя ўзроўні. Да



самага глыбіннага ўзроўню перш за ўсё трэба аднесці такія абагульняючыя прыкметы, якія больш звязаны з псіхалогіяй падсвядомаснага ўспрыняцця, чым асэнсавання: спосаб перамяшчэння («хадзіць, бегаць» – «поўзаць» – «лётаць» – «плаваць»); месца пастаяннага, звычайнага пражывання («лес, поле» – «зямля, пад зямлёй» – «паветра, неба» – «вада»); адзінкавасць – шматлікасць (дадзеная прыкмета звычайна дапаўняецца іншай: буйны – дробны). Комплекснае ўжыванне ўсіх гэтых прыкмет дазволіла традыцыйнаму мышленню вылучыць сярод дзікіх жывёл чатыры асноўныя класы: звяры, гады (з падгрупай насякомых), птушкі і рыбы [99, с. 18].

Вылучэнне дзікіх звяроў у асобны клас жывёл было зроблена на падставе спосабу іх перамяшчэння (хадзьба, бег) у спалучэнні з месцам іх пастаяннага пражывання (лес, поле). Гэтыя месцы супрацьпастаўляліся прасторы, у якой жыў чалавек, і часта ўспрымаліся як чужыя і небяспечныя. Вобразы звяроў у найбольшай ступені індывідуалізаваны: кожны з іх надзяляўся сваёй асаблівай, спецыфічнай сімволікай, і акрамя названых вышэй прыкмет, у іх амаль не выяўляецца якіх-небудзь другіх агульных функцый і сімвалічных значэнняў, якія аб'ядноўвалі б іх у адзінае цэлае. Агульнасць функцый і сімвалічных прыкмет назіраецца толькі ў падгрупе пушных звяроў, аснову якіх складалі жывёлы сямейства куньіх (куніца, гарнастай, барсук, выдра) на чале з ласіцай як цэнтральным, найбольш міфалагізаваным і сімвалічна шматзначным іх прадстаўніком. Сімволіка, уласцівая ласіцы, у некаторай ступені распаўсюджваецца і на іншых пушных звяроў – на некаторых грызуноў (бабра, вавёрку) і лісу. Пэўныя агульныя рысы можна знайсці таксама ў ваўка і мядзведзя. Некаторым звярам, асабліва крату, ласіцы і іншым куньім уласціва таксама хтанічная сімволіка, што зблiжае іх з гадамі. Уласцівасці гадаў пераважаюць і ў сімволіцы мышэй [99, с. 121, 122].

Гады вылучаюцца ў асобны клас жывёл на падставе спалучэння двух асноўных дыферэнцыяльных прыкмет: месца пражывання і спосабу перамяшчэння (прыкмета адзінкавасці – шматлікасці не з'яўляецца характэрнай для ўсяго гэтага класа ў цэлым). Да гадаў адносяцца ў асноўным паўзуны (перш за ўсё змеі) і земнаводныя, але таксама насякомыя і некаторыя іншыя жывёлы, у тым ліку мышы і змеяпадобныя рыбы (уюны, вугры), чэрві і вусені. Маюцца жывёлы, якія ў той ці іншай ступені спалучаюць уласцівасці гада і звера (асабліва мыш, крот, ласіца), гада і птушкі (кажан, крылатая



Репозиторий БГАТУ

змяя). Насякомыя могуць быць вылучаны ў асобную падгрупу ў межах класа гадаў на падставе прыкметы «дробны», якая дадаткова ўласціва ім у цэлым (неабходна падкрэсліць, што сама па сабе гэтая прыкмета не вылучае насякомых у асобны клас жывых істот, бо прысутнічае і ў жывёл іншых класаў). Для насякомых характэрна таксама сімвалічная суаднесенасць са звярамі (перш за ўсё, з буйной рагатай жывёлай), якая праяўляецца ў розных формах традыцыйнай культуры і жанрах фальклору, але часцей – у лексічных назвах насякомых (божая кароўка, жук-алень і інш.) [99, с. 273, 274].

Гадаў характарызуе шэраг агульных прыкмет. Гэта пераважна хтанічныя жывёлы: яны жывуць у зямлі (і пагэтаму часта сляпыя), у норах, хаваюцца ў зямлю на зіму і вяртаюцца з яе (змеі, чэрві, мышы, многія насякомыя), валодаюць падземнымі скарбамі (асабліва змеі). З зямлёю звязана і паходжанне многіх прадстаўнікоў гэтага класу: так, лічылася, што блохі і вошы ўзніклі са жмені пылу, праху, попелу; жабы – з гразі. У большай частцы гадаў і насякомых у рознай ступені выяўляюцца функцыі хатняга апекуна (у змяі, вужа, жабы, крата, сярчка, павука, мурашак), што збліжае іх з дамавіком. Большасць з іх знаходзіць таксама выкарыстанне ў рытуальна-магічных дзеяннях па выкліканні дажджу: вуж [355, s. 87], гадзюка, жаба [236, с. 204], яшчарка, рак [Там жа. С. 61], павук і інш. У асноўным усе гады (акрамя пчалы, божай кароўкі і некаторых іншых) – нячыстыя, ядавітыя жывёлы; змяя і аса лічыліся нават д'ябальскімі стварэннямі. З гадамі як небяспечнымі і шкоднымі жывёламі звязаны шматлікія забароны, рытуальныя спосабы іх выгнання і абярэгі ад іх; у той жа час самі яны часта надзяляліся ахоўнай функцыяй [99, с. 276, 277; 254, с. 102; 255, с. 491–493].

Птушкі вылучаюцца ў асобную групу на падставе двух дыферэнцыяльных прыкмет – месца пражывання і спосабу перамяшчэння, а прыкмета адзінкавасці–шматлікасці выступае ў адносінах да гэтага класа як інтэгральная. Больш акрэсленай, чым у іншых групах жывёл, у птушак выяўляецца апазіцыя чысты (святы, добры) – нячысты (д'ябальскі, злы), якая ахоплівае большую частку ўсіх птушак і ў асноўным супадае з апазіцыяй бясшкодны – драпежны. Да нячыстых адносяцца розныя птушкі: усе воранавыя (воран, варона, галка, шпак), сарока, каршун, ястраб; начныя драпежнікі (сава, сыч, філін), а таксама кажан [70, с. 189; 263, с. 74]. Да чыстых прылічаны голуб, ластаўка, жаваранак, бусел, лебедзь.



Ступень індывідуалізацыі ў птушак у цэлым меншая, чым у звяроў, але большая, чым у гадаў і асабліва рыб. Найбольш індывідуалізаваны вобразы зязюлі і бусла, якім належыць адно з цэнтральных месцаў у птушынай сімволіцы. Разам з тым вялікая колькасць птушак амаль не знайшла адлюстравання ў міфалагічных уяўленнях беларусаў, і іх роля абмяжоўваецца ў асноўным фальклорнымі тэкстамі [99, с. 527, 528].

Рыбы вылучаюцца ў асобны клас жывёл па прыкмеце пражывання ў вадзе і спосабу перамяшчэння (плаванне). Важнай адметнай рысай рыб з'яўляецца таксама адсутнасць іх гукавых праяў, якая напаўняецца міфалагічна значным зместам. Ніякіх гукаў, якія б улаўліваліся чалавечымі органамі слыху, не ўтвараюць многія жывёлы, напрыклад, матылі, блохі, тараканы, краты, ракі, яшчаркі, павукі і інш. Аднак толькі ў рыб адсутнасць гукавых праяў («нямы як рыба») набывае асаблівую маркіраванасць, знаходзячы адлюстраванне ў народных уяўленнях, на падставе якіх адбываецца супрацьпастаўленне рыб многім іншым жывёлам, перш за ўсё, птушкам. У народнай свядомасці рыбы ў асноўным існуюць сукупна, непадзелена, абагульнена, а таму ў традыцыйных уяўленнях і фальклоры часцей за ўсё яны прадстаўлены дэперсаналізавана. Аднак у той жа час прадстаўнікі некаторых відаў рыб (шчупак, лешч, язь, плотка, ёрш) выдзяляюцца як самастойныя персанажы [99, с. 746–756; 254, с. 417–419].

Трэба адзначыць, што вывучэнне класіфікацыі дзікіх жывёл у традыцыйным светапоглядзе беларусаў магчыма праводзіць галоўным чынам на падставе матэрыялаў, што адносяцца да XIX – першай паловы XX ст. У другой палове XX – пачатку XXI ст. нават найбольш сталыя вясковыя жыхары ўжо не могуць перадаць усю сукупнасць традыцыйных ведаў і ўяўленняў у гэтай галіне: найстаражытныя сінкрэтычныя светапоглядныя ўяўленні замяняюцца на больш апрацаваныя, рацыянальна асэнсаваныя. Адначасова перадача традыцыйных светапоглядных уяўленняў іншым дэмаграфічным і сацыяльным групам значна абцяжарана шырокім распаўсюджаннем і функцыянаваннем навуковых ведаў. Гэтыя тэндэнцыі ў аднолькавай ступені характэрны для ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі [28, л. 4, 5; 29, л. 82].

Такім чынам, традыцыйная класіфікацыя жывёльнага свету, якую можна прасачыць у беларусаў, мае наступныя асаблівасці:

1) меншую колькасць класаў і іншы іх склад (напрыклад, насякомыя не выдзяляюцца як асобная група і ўваходзяць у адзін



Репозиторий БГАТУ

клас з гадамі, дзе таксама знаходзяцца паўзуны, земнаводныя, падобныя на змей рыбы – уюны, вугры і нават некаторыя млекакормячыя – мышы і іншыя грызуны);

2) рухомасць, няцвёрдасць класіфікацыйных рамак. Уласцівасці гадаў у большай ці меншай ступені маюць некаторыя жывёлы іншых класаў, напрыклад, некаторыя млекакормячыя (крот, ласіца, воўк). Магчымы «гібрыдныя» віды, якія спалучаюць у сабе прыкметы розных класаў жывёл: звера і птушкі (ласіца), гада і птушкі (кажан);

3) аб'яднанне розных відаў жывёл у адзін, у прыватнасці ласіцы і гарнастая, змяі і бязногай яшчаркі, змяі, вугра і ўюна, ворана і вароны. Часам такое аб'яднанне двух вобразаў мае жанравую абумоўленасць (напрыклад, заяц-гарнастай у песнях, гусі-лебедзі ў казках). Нават частка цела адной жывёлы можа цалкам атаясамлівацца з іншай жывёлай (напрыклад, хвост яшчаркі са змяёй) ці з часткай цела іншай жывёлы (барсук мае сабачую морду). У той жа час у шэрагу выпадкаў мы бачым тэндэнцыю да раздзялення аднаго віда на два розныя персанажы (качка і качар, курыца і певень, вусень і матылёк, апалонік і жаба, вош і гніда);

4) змяненне, пераўтварэнне адных відаў жывёл у іншыя (зязюлі ў ястраба і арла, сіваваронкі ў дразда, вераб'я ў мыш, мышы ў кажана, ластавак у жаб, чарвякоў у змей, ваўчыцы ў рысь), у тым ліку і ў міфічных жывёл (змяі ў лятаючага змея). Жывёлы могуць ператварацца таксама ў дэманічныя істоты (жаба ў ведзьму), у чалавека (бусел у чалавека) і нават у прадметы (воўк у пень);

5) дадзеная класіфікацыя адчувае істотны ўплыў дэманалагічных уяўленняў, пацверджаннем чаго з'яўляецца наяўнасць фантастычных відаў жывёл, якія рэальна не існуюць у прыродзе (лятаючы змей, ваўкалак і інш.);

6) персанажы ў гэтай сістэме нероўнавартасны па сваёй значнасці: маюцца персанажы ключавыя і перыферыйныя. Так, напрыклад, у вобразе змяі ўвасабляюцца ўсе асноўныя рысы сімволікі «гадаў» у цэлым. Да ключавых персанажаў можна таксама аднесці ваўка, зязюлю і бусла. Такую ж ролю выконваюць і некаторыя асобныя групы жывёл, у прыватнасці, сямейства воранаў.

У большасці традыцыйных ведаў і ўяўленняў беларусаў аб дзікіх жывёлах адлюстроўваюцца беражлівыя, рацыянальныя адносіны да навакольнай прыроды. Катэгарычна забаранялася без нагоды забіваць і нават крыўдзіць звяроў і птушак. Напрыклад,



вялікім грахом лічылася забраць у вавёркі ўсе арэхі, знойдзеныя ў дупле: «гэта ўсё роўна, што адабраць хлеб у чалавека» [251, с. 49]. Шэраг прадстаўнікоў жывёльнага свету (у першую чаргу, ластавак, жаваранкаў, буслоў, вужоў, пчол, мурашак) беларускі селянін лічыў свайго роду свяшчэннымі. На Палессі, перад тым як будаваць хлеў, прыносілі з лесу мурашак і высыпалі іх на абранае месца: «Калі мурашкі распаўзуцца, то нячыстае месца – там нічога не строй» [119, с. 18]. Такім жа чынам назіралі і за паводзінамі павука: калі прынесены павук пачынаў праз ноч «ткаць кросны» на новым месцы, яно лічылася прыдатным для будаўніцтва [311, с. 135; 354, s. 164]. Забаранялася разбураць птушыныя гнёзды, мурашнікі [102, с. 259; 233, с. XVI]. Гэтыя веды зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі [302, с. 275; 305, с. 18; 311, с. 135].

Пчалу лічылі насякомым не толькі карысным, але і разумным, бо «куды яна не паляціць за мёдам, то не заблудзіць» [232, с. 311]. Беларускія замовы XIX ст., сабраныя Е. Р. Раманавым, называюць пчалу «царыцай», «райскай птушкай» [239, с. 5, 10]. Беларусы верылі, што пчала кусае толькі грэшных людзей [102, с. 259]. Смяротным грахом, які не даруецца нават на тым свеце, лічылася разбурэнне ці крадзеж пчалінай борці: «Калі чалавек украдзе ці разбурыць калоду з пчоламі, то яго варта павесіць на гэтай жа сасне»; «Калі хто разбурыць ці ўкрадзе пчолы, то яго варта закапаць жывым у зямлю, спачатку адсекшы руку» [232, с. 310; 348, s. 253, 337, 338; 354, s. 164]. Паводле думкі беларусаў, некаторыя жывёлы, а менавіта голуб і пчала, валодаюць «духам», гэта значыць душой, аднолькавай з душою чалавека, і такім чынам відавочна выдзяляюцца з ліку ўсіх іншых жывёл [106, с. 307; 238, с. 33], таму пра пчолку і голуба нельга сказаць «здохлі», а трэба «памёрлі» [215, с. 45; 354, s. 164]. Тут, зразумела, прасочваюцца перажыткі анімізму і хрысціянскай міфалогіі (якая, як вядома, атаясамлівае Бога-духа, трэці твар Троіцы, з галубкай), але ў шэрагу выпадкаў бачна і любоў да карысных і прыгожых прадстаўнікоў мясцовай фауны [305, с. 18]. Усё гэта выцякала з веры ў роднасць з сіламі прыроды, якія моцна ўплываюць на жыццё і дзейнасць чалавека [313, с. 307].

Калі пад хатай паселіцца вуж, то такое суседства, па перакананнях беларусаў, забяспечвае здароўе жыхароў дому і іх багацце, таму пра мёртвага вужа гаварылі «кончыўся» ці «памёр», але не «здох», каб вуж не пакараў за знявагу [215, с. 9, 14; 305, с. 18]. Лічылася, што той, хто ўбачыць вужа і не заб'е яго, будзе



Репозиторий БГАТУ

назаўсёды абаронены ад укусаў змяі [238, с. 68]. Этнографы канца XIX – пачатку XX ст. зафіксавалі звесткі аб тым, што беларускія сяляне некалі трымалі вужоў у хатах пад печчу ці нават разам з дзецьмі [354, s. 164], а калі наступаў час карміць дзяцей, вуж смела выпаўзаў са свайго сховішча і еў разам з імі. Дзеці часам адпіхвалі яго, білі лыжкай па галаве, аднак вуж не крыўдзіўся і не кусаў іх. Для вужа спецыяльна ставілі ненакрыты збан малака, каб ён мог свабодна падмацавацца, калі хацеў [47, с. 93]. Калі вуж жыў у хляве, то яму дазвалялі частавацца малаком каровы адразу з яе вымені. Вуж быў ахоўнікам гаспадаркі і ў пераносным сэнсе, як магічны сімвал [348, s. 177], і непасрэдна, як знішчальнік дробных грызуноў, што непакоілі жывёлу, маглі знізіць яе прадуктыўнасць, занесці інфекцыйную хваробу. Вуж мог прадказваць гаспадарам бяду, пагрозу стыхіі. У Мядзельскім раёне ў другой палове XX ст. зафіксавана паданне аб тым, як у ясны летні дзень вуж са сваімі дзецьмі выпаўз з хлява і пакінуў падворак. Неўзабаве пачалася страшэнная навальніца, і хлеў згарэў [47, с. 93]. А. В. Гура прыводзіць звесткі, што на Беларускім Палессі вужа і цяпер называюць «дамавіком», стараюцца не крыўдзіць [99, с. 319].

Гэткай жа любоўю і пашанай карыстаўся і бусел. Ён лічыўся ператвораным з чалавека, якому Бог даў мех, куды паклаў усіх гадаў і загадаў іх утапіць; але чалавек быў цікаўным, развязаў мех, каб пабачыць, што ў ім, і такім чынам выпусціў усіх гадаў на волю. Тады Бог пакараў чалавека, ператварыўшы яго ў бусла і загадаўшы яму збіраць жаб і іншых гадаў [70, с. 188; 215, с. 58; 238, с. 79; 354, s. 165]. Падобная легенда зафіксавана намі ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці ў інфарматара С. Харуты [29, л. 33]. Лічылася, што калі вясною бусел зробіць сваё гняздо на даху хаты ці паблізу яе, то гэта прынясе гаспадарам дому шчасце, нараджэнне дзіцяці; хата на ўсё лета будзе абароненай ад маланкі, градабіцця і ўсялякага іншага ліха [26, л. 47; 27, л. 14; 311, с. 136; 348, s. 183, 185]. Таму ў некаторых мясцовасцях сяляне самі рабілі вясною гнёзды для бусла, замацоўваючы на даху кола ад драбін, каб прывабіць гэтую птушку да сябе [215, с. 74]. Да бусла звярталіся жанчыны ў час жніва, калі стаяла вельмі спякотнае надвор’е: «Буська, буська! Зашлі нам трохі ветру, бо не зможам жаці!» [70, с. 189]. Пакрыўджаны бусел (калі нехта разбурыў яго гняздо) мог прынесці на хату ці гумно гарачую галаўню і такім чынам адпомсціць гэтаму чалавеку [29, л. 84; 215, с. 14; 236, с. 312; 238, с. 60; 302, с. 275]. Грэшнай справай лічылася забойства салаўя,



ластаўкі, голуба, жаваранка, сініцы, дзятла [302, с. 275; 305, с. 18]. Нельга было чапаць цецерука, «бо ён нікому не робіць зла» [215, с. 75; 232, с. 320; 354, s. 165].

Існавалі магічныя абрады, якія пры ўдзеле жывёл павінны былі забяспечыць будучы ўраджай. Тут у ролі істот, ад якіх залежыць ураджайнае лета, мы сустракаем галоўным чынам птушак. Гэта – вясновыя птушкі, і на першым месцы – ластаўка, радзей – галка. Вясна ў вобразе ластаўкі «з карабку жыта вытрасла, з лукошак гарошак, з драбеек канапелек», як гаворыцца ў адной з вяснянак; у другой вяснянцы ластаўку просяць прынесці «цёплае лета і буйное жыта» [215, с. 39]. У Панямонні гэтая роля прыпісвалася буслу або дзікай гусі; калі селянін бачыў вясной першы раз бусла або гусь, ён гаварыў наступную замову: «На ціхае лета, буйное жыта, а нам на здароўе». Адначасова можна было завязаць вузел на поясе і захоўваць яго як супрацьліхаманкавы сродак: калі такі чалавек захварэе, то дастаткова развязаць вузел і ліхаманка «адпусціць» [158, с. 193]. У Палескім рэгіёне носьбітам рознага дабра лічыўся журавель: калі ён прыляціць, жанчыне трэба яму сказаць: «Здароў будзь, пан вясёлы» і ён адкажа: «Няхай, штоб ты вясёла была на ўвесь год», а калі проста сказаць: «Вунь журавель ляціць», то ён адкажа: «Няхай, каб ты журылася ўвесь год» [354, s. 166]. Калі журавель кружыўся над пэўнай хатай, у ёй у гэтым годзе чакалі вяселля [348, s. 154].

Найбольш масавае ўжыванне гэтых экафільных уяўленняў, якія зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, прыйшлося на XIX – першую палову XX ст. На працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. сфера іх распаўсюджання і функцыянавання паступова абмежавалася вузкімі сацыяльна-дэмаграфічнымі рамкамі (дэмаграфічная група вясковых жыхароў, старэйшых за 60 гадоў). Іх меркаванні аб паводзінах у адносінах да прадстаўнікоў жывёльнага свету часцей за ўсё пасіўна ўлічваюцца ці не ўлічваюцца наогул іншымі сацыяльнымі і дэмаграфічнымі групамі [29, л. 24, 30, 37]. Акрамя таго, на сучасным этапе нават прадстаўнікі гэтай дэмаграфічнай групы паступова страчваюць унікальныя традыцыйныя веды і ўяўленні аб дзікіх жывёлах (аб гэтым сведчыць тое, што не ўсе інфарматары маглі поўнасцю адказаць на пастаўленыя пытанні ці нават на большую іх частку).

Неабходна адзначыць, што пазітыўнымі былі адносіны не да ўсіх прадстаўнікоў жывёльнага свету. Лічылася, напрыклад, што агародная жаба («варопаўка») нібыта прыносіла засуху, таму яе



Репозиторий БГАТУ

рытуальнае забойства выкарыстоўвалася ў абрадах выклікання дажджу, шырока распаўсюджаных у XIX – першай трэці XX ст. [305, с. 19]. Не менш гаротны лёс напаткаў і кажана. Меркавалі, што ён насылае «шалудзькі» на галаву [213, с. 265; 232, с. 338; 238, с. 63], ад чаго чалавек можа нават памерці [102, с. 261; 236, с. 308]. З гэтай прычыны кажаноў пры магчымасці забівалі, хаця яны прыносілі вялікую карысць, знішчаючы шкодных насякомых. Не любілі таксама саву (з-за яе вялікіх «страшных» вачэй), а таксама зязюлю, бо яна выводзіла птушанятаў у «чужых» гнёздах. Акрамя таго, лічылі, што зязюля не мае самца: многія быццам бы бачылі, як яна падлятала пад пеўня [59, с. 37]. Вынікі апытанняў вясковага насельніцтва не выявілі тут прынцыповых рэгіянальных адрозненняў на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Гэтыя экафобныя ўстаноўкі (асабліва адносіны да жаб і кажаноў) захаваліся і ў другой палове XX – пачатку XXI ст., нягледзячы на пэўнае развіццё экалагічнай адукацыі і экалагічнага выхавання насельніцтва [27, л. 8, 27; 28, л. 8; 29, л. 3, 4, 45, 67, 71].

Такім чынам, у XIX ст. – першай палове XX ст. традыцыйная жывёлагадоўля, як і земляробства, функцыянавала пераважна на падставе народных ведаў. Разгледжаны комплекс ведаў быў адзіным па сваёй сутнасці ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, у яго аснове ляжаў практычны вопыт, які назапашваўся стагоддзямі. Толькі ў памешчыцкіх гаспадарках і гаспадарках найбольш заможных сялян выкарыстоўваліся заатэхнія і ветэрынарыя, заснаваныя на навуковых дасягненнях таго часу (селекцыя, арганізацыя інтэнсіўнага кармлення і інш.). Вынікі палявых этнаграфічных даследаванняў, праведзеных аўтарам, паказалі, што комплекс народных ведаў аб хатніх жывёлах не страціў свайго практычнага значэння і на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст., калі асноўнай сферай яго прымянення стала прыватная падсобная гаспадарка. Гэта ў найбольшай ступені адносіцца да спосабаў і прыёмаў, што выкарыстоўваюцца ў доглядзе хатняй жывёлы ў асабістых, фермерскіх гаспадарках. Акрамя таго, народныя веды аб хатніх жывёлах дапаўняюць ветэрынарнае абслугоўванне, асабліва ў сферы прафілактыкі і лячэння неінфекцыйных хвароб сродкамі расліннага і жывёльнага паходжання. Рацыянальныя веды аб хатніх жывёлах, у першую чаргу ў галіне іх догляду, могуць паспяхова прымяняцца ў сферы аграэкатурызму, якая зараз перажывае бурнае развіццё.



Для класіфікацыі дзікіх жывёл у традыцыйным светапоглядзе беларусаў характэрны наступныя асаблівасці ў параўнанні з сучаснай навуковай класіфікацыяй: меншая колькасць класаў і іншы іх склад, рухомасць класіфікацыйных рамак, аб'яднанне розных відаў у адзін і раздзяленне аднаго віда на два розныя, пераўтварэнне адных відаў жывёл у іншыя, наяўнасць фантастычных відаў, якія рэальна не існуюць у прыродзе.

Вялікая колькасць традыцыйных уяўленняў аб дзікіх жывёлах (забарона забіваць многія іх віды без патрэбы, разбураць гнёзды, мурашнікі, пчаліныя дуплы) працавала больш эфектыўна за цяперашнія прыродаахоўчыя законы і заклікі грамадскасці, таму актуалізацыя іх у масавай свядомасці можа прынесці вялікую экалагічную карысць на сучасным этапе.



Репозиторий БГАТУ

## 4. ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ АБ СРОДКАХ ПРАДКАЗАННЯ МЯСЦОВАГА НАДВОР'Я

Уся жыццядзейнасць этнасу грунтуецца на выкарыстанні прыродных рэсурсаў у канкрэтных геаграфічных умовах. Таму важнейшую ролю ў рэгуляванні ўзаемаадносінаў паміж чалавекам, грамадствам і прыродай адыгрывае сістэма ведаў, якая забяспечвае разуменне бягучага стану надвор'я і яго канкрэтных праяў (дождж, снег, мароз, цяпло), а таксама магчымасць прадказання іх будучага стану і яго ўплыву на гаспадарчую дзейнасць чалавека. Гэтая сістэма ведаў абапіраецца на шматвяковы вопыт продкаў, на асабістыя назіранні самых розных з'яў навакольнага свету і ўменне выявіць іх прычынна-выніковую ўзаемазалежнасць, а таксама на ўлік вынікаў сельскагаспадарчых работ у канкрэтных умовах мінулых гадоў.

Мноства традыцыйных метэаралагічных прыкмет і назіранняў беларусаў, зафіксаваных у XIX ст. – пачатку XXI ст., можна падзяліць на тры вялікія семантычныя групы. Гэта прыкметы, што дазвалялі сялянам прагназаваць надвор'е на кароткі прамежак часу (ад некалькіх гадзін да трох дзён); прыкметы на больш працяглы тэрмін (у межах года ці з аднаго года на наступны); цесна звязаныя з імі метэаралагічныя прыкметы, што фіксавалі ўплыў прыродных умоў пор года на якасць ураджаю [326, с. 504]. Прагнастычнае значэнне кожнай з традыцыйных метэаралагічных прыкмет абмежаванае, але чым больш іх аднолькава сведчыць аб адной і той жа з'яве, тым больш верагодна яе наступленне.

### 4.1. Спосабы прагназавання надвор'я на кароткія прамежкі часу

На ўсёй тэрыторыі Беларусі прызнаным арыенцірам для вызначэння зменаў надвор'я на працягу сутак з'яўлялася назіранне за рознымі астранамічнымі аб'ектамі, у першую чаргу за Сонцам. Кароткатэрміновыя метэаралагічныя прагнозы рабіліся на падставе назіранняў за ўсходам і заходам Сонца, увага звярталася на працягласць ранішняга і вячэрняга золаку, колер Сонца, яго прамянёў, наяўнасць аблокаў.



Калі Сонца заходзіла ў хмару ці «бляднела» пры заходзе, назаўтра чакалі дажджу [26, л. 43; 27, л. 24, 26; 28, л. 21, 34; 29, л. 1, 6, 45, 49, 73, 78, 80, 84; 158, с. 97]; «Калі сонца заходзіць блякла, нібыта плача, то пагоды не будзе» [29, л. 42]; «Сонца нібы вялае – на дождж» [27, л. 26]. І сапраўды, воблачныя масы, за якімі хавалася пры заходзе Сонца, на другі дзень маглі апынуцца ў раёне назірання, таму гэтыя прыкметы часцей за ўсё спраўджваліся. Не выклікаюць сумнення ў сваёй рацыянальнасці і наступныя народныя высновы: «Калі сонца свеціць асабліва ярка, то хутка будзе дождж» [28, л. 18]; «Калі сонца заходзіць хутчэй звычайнага, то ноччу пройдзе дождж» [213, с. 117, 119]. Апошняе выклікана тым, што пры вялікай вільготнасці паветра Сонца на захадзе здаецца вялізным і стварaецца ўражанне, што яно заходзіць хутчэй звычайнага. Назіралі таксама за ўзаемасувязямі атмасферных з'яў, да ўвагі прымаўся колер неба. Калі пры ясным надвор'і неба пачынала бялець, хмурыцца і не выпадала раса, то гаварылі, што гэта да дрэннага надвор'я, да дажджу [28, л. 18; 251, с. 36, 46, 47; 312, с. 54]. Калі Сонца «аглядалася», г. зн. выходзіла з-за хмары пры заходзе, а таксама калі пры заходзе Сонца ва ўсходняй частцы неба назіралі хмару, – раніцай чакалі дажджу [29, л. 45; 354, s. 147, 148].

Непадрыхтаваны назіральнік не ведаў, што такое цыклон, але ён бачыў неаднойчы, што з'яўленне ярка-чырвонага Сонца, чырвонага золаку пры заходзе Сонца заўсёды прадказвае пагаршэнне надвор'я летам [28, л. 18; 29, л. 1, 6, 9, 12, 42; 322, с. 108]: «Калі пры заходзе сонца неба пачырванее, то будзе вельмі ветрана»; «Калі пасля заходу сонца пачырванеюць хмары, то будзе абложнае ліхое надвор'е» [251, с. 47]; «Як сонца заходзіць на чыстым небе – заўтра пагода, а калі перад заходам пакраснее, то гэта паказвае на вецер» [232, с. 291]. Сучасная навука тлумачыць гэтую з'яву наступным чынам. Прамяні Сонца, якія здаюцца ўдзень белымі, у сапраўднасці ўяўляюць сабой сумесь розных колераў. Фіялетавыя і сінія прамяні рассейваюцца часціцамі чыстага паветра, чырвоныя амаль без перашкодаў праходзяць праз яго тоўшчу. Калі ў паветры шмат вільгаці (што сведчыць аб набліжэнні цыклону), то афарбоўка значна пабольшваецца. Сонца і хмары здаюцца крывава-чырвонымі [195, с. 84].

Прадказвалі надвор'е па воблаках і хмарах, якія з'яўляліся ў пэўны час дня: «Калі рана на захадзе стаіць хмара, то будзе дождж» [322, с. 109]; па вясёлцы: «Калі весялуха воду бярэ (мутная), то будзе дождж, а калі весяліцца (празрыстая) – будзе пагода» [232,



Репозиторий БГАТУ

с. 291]; «Вясёлка раніцай паказвае, што будзе непагадзь, вясёлка пасля абеду гаворыць аб ясным надвор'і» [251, с. 45, 46]. Апошняя прыкмета патрабуе больш дэталёвага тлумачэння. Як вядома, вясёлка ўзнікае тады, калі на адным баку небасхілу ідзе дождж, а на процілеглым баку, вольным ад хмар, свеціць сонца. Дажджавыя ж воблакі на тэрыторыі Беларусі часцей за ўсё рухаюцца з захаду на ўсход, таму ранішняя вясёлка (у заходняй частцы неба) паказвае на набліжэнне дажджу, а вячэрняя (ва ўсходняй частцы неба) – на аддаленне дажджавых воблакаў.

Кароткатэрміновыя метэаралагічныя прыкметы беларусаў грунтаваліся на назіраннях за іншымі фізічнымі атмасфернымі з'явамі. Так, напрыклад, надвор'е вызначалі па кругах вакол Сонца ці Месяца: «Калі месяц абгародзіцца кругам, то зімою будзе падаць снег ці закруціць завіруха, а летам трэба чакаць непагоду»; «Калі сонца абгародзіцца кругам, то хутка настане непагадзь» [26, л. 81; 29, л. 5, 6, 9; 59, с. 39; 251, с. 46]; «Калі месяц абгародзіцца кругам, то на трэці дзень будзе вецер, снег або дождж» [232, с. 291]; «Калі поўны месяц знаходзіцца ў невялікім крузе, то на другі дзень будзе непагадзь» [29, л. 6]. Вядома, што кругі вакол Сонца і Месяца ўзнікаюць тады, калі промні сонца ці адбітыя промні ад месяца праходзяць праз найдрабнейшыя ледзяныя крышталікі, якія ўтрымліваюцца ў белых пёрыстых аблоках, што ўзнікаюць перад непагодай. Таму гэтае народнае прадказанне надвор'я амаль заўсёды слушнае.

Зоркі, якія заўжды прыцягвалі ўвагу людзей, таксама дазвалялі ім меркаваць аб зменах надвор'я. Ясны свет зорак прадказваў добрае надвор'е, цьмяны іх свет – непагадзь: «Як зоркі ў тумане – хмарна, калі яны яркія – на пагоду» [26, л. 81; 29, л. 6, 80]; «Калі зоркі блішчаць ярка, то будзе мароз ці ясная пагода, а калі яны мігаюць, то чакай непагадзь» [251, с. 46]; «Калі зоркі весела свецяць, то заўтра будзе пагода, а калі цьмяна, быццам надуўшыся, то будзе перамена ўначы» [232, с. 291]. Беларускі народ мог вызначаць надвор'е па «слупах» ці «крыжах» каля Сонца [59, с. 40]: «Калі зімою пасля заходу сонца стануць ясныя слупы, то будзе вялікі мароз», «Калі каля сонца з'явіцца бы крыж ці як бы два сонцы, то будзе мяцеліца ці вялікая навальніца з градам, калі гэта летам» [251, с. 46, 47]; «Калі з абодвух бакоў сонца паробяцца стаўпы, то будзе халодная сіверка»; «Калі слупы каля сонца, то ветрана» [29, л. 12]. Такія метэаралагічныя з'явы, як «крыжы» ці «слупы» адбываюцца тады, калі неба зацягнута высокімі пёрыстымі



аблокамі, якія складаюцца з дробных крышталікаў лёду. Звычайна яны маюць шасціграннюю форму, што дае ім магчымасць праламляць промні сонца. Гэтыя промні трапляюць у вочы, і тады назіральнік бачыць розныя галаадлюстраванні («крыжы», «слупы», двайныя ці трайныя сонцы). Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі ў разглядаемай праблеме не вылучаюцца па сутнасці, наяўныя адрозненні тычацца некаторых нязначных момантаў.

Беларусы верылі, што вялікі ўплыў на надвор'е аказваюць квадры Месяца: назіраючы за Месяцам, асабліва ў першай яго квадры, прагназавалі надвор'е не толькі на кароткі час, але і на ўвесь наступны месяц [322, с. 108]. У перыяд маладзіка (першая квадра) сяляне заўсёды чакалі атмасферных зменаў: ці сонечнага надвор'я пасля працяглых дажджоў, ці дажджу пасля сонца [15, спр. 59, л. 16; 29, л. 77, 85; 59, с. 35; 238, с. 45; 344, с. 63]; «Калі прыдзе Руша (маладзік. – *К. Ш.*), то паваруша» [24, л. 12]. Лічылі, што на маладзік абавязкова будзе ісці дождж [29, л. 18, 45, 60, 68, 73]: малады месяц павінен «аксціцца», г. зн. «абмыцца» дажджом [322, с. 110]. Гаварылі таксама, што надвор'е на маладзік не зменіцца на працягу цэлага тыдню [238, с. 45]. Сяляне Падняпроўскага рэгіёну лічылі, што на маладзік трэба чакаць непагадзь, а на «поўню» – яснае надвор'е [32, с. 111]. На ўсёй тэрыторыі Беларусі сачылі яшчэ за тым, у якім стане сярпок маладога месяца: сярпок уверх – на добрае надвор'е, сярпок уніз – на дождж [26, л. 81; 27, л. 22, 24; 29, л. 9]. Зімой такія палажэнні маладзіка прадказвалі адпаведна мароз і адлігу [29, л. 85]: «Калі маладзік зімою задраў рогі ўгору, то цэлы тыдзень будуць крэпкія марозы» [232, с. 291]. Вызначалі надвор'е і па кірунку ветру: «Калі вецер з захаду, то будзе непагадзь, а калі з усходу – добрае надвор'е»; «Вецер з поўначы прыносіць зімой мароз, а ўлетку холад; вецер з поўдню нясе цяпло» [251, с. 43; 322, с. 110]; «Як вецер паверне к заходу сонца, то будзе дождж, а калі к поўдню, то бывае дождж нядоўга»; «Калі вецер завернецца к усходу або к поўначы, то ўлетку – распагодзіцца, а зімою мароз пасільнее»; «Калі вецер круціць з усіх бакоў, то на трэці дзень чагось накруціць: снегу, дажджу або халяпы» [232, с. 291].

Набліжэнню навальніцы папярэднічалі духата, памяншэнне чутнасці: «Калі ўлетку так горача, што аж дыхаць няможна, то хутка будзе навальніца з градам» [251, с. 39]; «Калі поезд дрэнна чутны – нягода» [27, л. 24]. І сапраўды, чым большая духата ў паветры, тым больш верагодна, што будзе дождж, а хутчэй за ўсё навальніца, бо павелічэнне вільготнасці садзейнічае ўтварэнню



Репозиторий БГАТУ

воблакаў, якія маюць многа патэнцыяльных зарадаў. Патокі паветра ў гарачы дзень узносяцца далёка ўверх, і таму нярэдка гэтая навальніца суправаджаецца градам, бо пры віхравых узыходзячых плынях паветра кропелькі вады замярзаюць, а пры наступных пад'ёмах усё больш пакрываюцца лёдам і ператвараюцца ў град. Дрэнная чутнасць аддаленых гукаў сведчыць аб вялікай вільготнасці ніжніх слаёў паветра, а таму аб магчымасці навальніцы і ападкаў. Назіральнымі людзьмі былі адзначаны і іншыя праўдзівыя прыкметы набліжэння граду: «Перад тым, як павінен быць град, чутна, як уверсе гудзе»; «Перад градам хмары не плывуць ціха па небе, а таўкуцца, нібы гаршкі на мосце» [251, с. 38]. Сучасная навука растлумачыла прычыны гэтых з'яў. Воблакі пры навальніцы з градам «таўкуцца», бо ўзыходзячыя і зыходзячыя плыні паветра бесперапынна перамяшчаюць масу вады ўверх і ўніз. Гэта звычайна суправаджаецца гулам.

Вялікую колькасць кароткатэрміновых прагнозаў складаюць народныя прыкметы, заснаваныя на назіраннях людзей за паводзінамі і станам прадстаўнікоў жывёльнага свету, усё жыццё якіх знаходзіцца ў цеснай залежнасці ад змены метэаралагічных умоў. Жывёлы здольны ўспрымаць нават самыя нязначныя змяненні такіх фактараў знешняга асяроддзя, як тэмпература, вільготнасць, электрызаванасць паветра, атмасферны ціск, якія немагчыма зафіксаваць органамі пачуццяў чалавека. У працэсе працяглай адаптацыі ў іх выпрацаваліся разнастайныя ахоўныя рэакцыі на неспрыяльныя метэаралагічныя фактары, па якіх людзі маглі прадказваць іх наступленне [253, с. 31]. Сучасная метэаралогія канстатуе, што кароткатэрміновыя прагнозы, заснаваныя на зменах у паводзінах прадстаўнікоў жывёльнага свету, маюць вялікую долю верагоднасці з хібнасцю не больш за 4 % [276, с. 171].

Па дадзеных апытанняў вясковага насельніцтва Беларусі, значная колькасць прыкмет аб надвор'і грунтуецца на назіраннях за паводзінамі птушак. Гэта абумоўлена тым, што жыццё птушак праходзіць у асноўным у атмасферы і атмасферныя змены непасрэдна адбіваюцца на іх жыццядзейнасці. Акрамя таго, многія птушкі ў асноўным пражываюць у непасрэднай блізкасці ад чалавека і шырока распаўсюджаны. Кружэнне ластавак над зямлёю ці над самаю вадою паўсюдна прадказвала дождж [26, л. 83; 27, л. 24, 26; 28, л. 2, 19, 21, 34, 37; 29, л. 1, 5, 9, 19, 45, 73, 80, 84]. Назіралі і за паводзінамі іншых птушак: «Кнігаўка хвост у ваду мочыць, то будзе дождж» [26, л. 83];



«Калі сінічкі дабіваюцца да хаты і падчас залятаюць у сенцы, то спадзявайся мяцеліцы»; «Як вераб'і купаюцца ў пяску, то будзе дождж»; «Калі вераб'і хаваюцца пад стрэхамі, то будзе мяцеліца» [232, с. 295, 296]; «Калі воран лётае нізка і каркае, то пахаладае» [28, л. 2]. Крык варон прадказваў набліжэнне дажджу [27, л. 26; 28, л. 19, 21; 29, л. 1, 73, 84]. Акрамя таго, сяляне ведалі, што ў івалгі перад непагодай меладычны спеў змяняўся на нязвыклы, падобны да мяўкання кацяняці; перад дрэнным надвор'ем гракі чародамі кідаліся да зямлі [43, с. 431].

У сваіх прадказаннях надвор'я беларускія сяляне арыентаваліся на паводзіны амаль усіх прадстаўнікоў мясцовай фауны – рыб, земнаводных, паўзуноў і насякомых: «Перад дажджом рыба выскоквае з вады і не клюець» [29, л. 5, 80]; «Перад дажджом жабы скачуць па паверхні вады»; «Калі багата вужоў усюды снуецца, то будзе дождж» [232, с. 296]; «Камары мак таўкуць – на пагоду» [26, л. 43, 83; 27, л. 26; 28, л. 34; 29, л. 1, 84]; «Як вечарам павук чыніць павуціну, то заўтра абавязкова будзе пагода, а калі сядзіць недзе схаваўшыся, то дождж» [232, с. 296]; «Калі вечарам лятаюць ды гудуць чорныя жукі, то будзе непагадзь» [215, с. 28]; «Перад дажджом крэпка скачуць конікі» [29, л. 5]. Сяляне прыкмецілі, што перад дажджом мурашкі закрываюць свае хады [28, л. 21; 29, л. 73; 59, с. 39; 251, с. 45, 46, 94; 322, с. 109]; мацней нападаюць мухі, камары, авады, блохі [27, л. 24, 26; 28, л. 2, 18, 34; 29, л. 5, 42, 76, 80, 84; 232, с. 296; 322, с. 109].

Апошнія навуковыя даследаванні паказалі, што амаль усе гэтыя прыкметы цалкам праўдзівыя. Так, напрыклад, насякомыя пакрыты пушком і валаскамі, што прыцягваюць вільгаць пры павышэнні вільготнасці, таму перад дажджом яны вымушаны лётаць нізка над зямлёй ці над вадой, дзе іх і ловяць птушкі і рыбы, што імі харчуюцца. Сцішэнне крыкаў варон і жаб перад набліжэннем навальніцы [28, л. 21] таксама з'яўляецца іх своеасаблівай рэакцыяй на звязаныя з гэтым павышэнне вільготнасці паветра, назапашванне атмасфернай электрычнасці, падзенне атмасфернага ціску, паслабленне сонечнага святла [195, с. 86].

Ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі сяляне вызначалі надвор'е і па паводзінах хатніх жывёл і птушак: «Калі карова не дае малако і вельмі махае хвастом, то назаўтра будзе дождж» [29, л. 60]; «Як на дождж, то кароў вечарам не падоіш, такія яны злыя» [27, л. 4]; «Каровы ўцякаюць з лесу на дождж» [Там жа. Л. 24]; «Калі сабака есць траву, то будзе дождж, калі



Репозиторий БГАТУ

ляжыць усім брухам на зямлі, то будзе гарачыня ці моцныя маразы» [25, л. 18]. Лічылася, што кот, прадчуваючы маразы, імкнецца схавацца ў цёплае месца, часцей за ўсё ў печ [26, л. 85; 27, л. 19; 28, л. 12; 29, л. 84; 322, с. 109]. Калі куры вечарам доўга хадзілі па вуліцы і позна садзіліся на курасадню – на наступны дзень прагназаваўся дождж, у адваротным выпадку – сухое надвор'е [27, л. 24, 26; 28, л. 21; 29, л. 5, 9, 42, 60; 325, с. 88]. Чакалі таксама дажджу, калі заўважалі, што куры дзёўбалі траву [158, с. 98]. Пчаляры дакладна прадказвалі набліжэнне дажджу па паводзінах пчол: перад добрым надвор'ем яны працавалі з раніцы да позняга вечара, калі ж яны не пакідалі вулля і гулі, то хутка чакалі пагаршэння надвор'я. Калі з набліжэннем хмар пчолы не хаваліся ў вуллі, а працягвалі «работу» – дажджу не прагназавалася [26, л. 43, 83; 27, л. 26; 28, л. 12, 19; 29, л. 1, 5, 42, 60, 66, 73; 312, с. 54; 322, с. 109].

Разам з тым трэба адзначыць, што побач з рацыянальнымі прыкметамі існуе і шэраг прыкмет памылковых, заснаваных на выпадковых супадзеннях, якія не адлюстроўваюць сапраўдных сувязяў, існуючых у жывёльным свеце: «Калі кошка выпускае кіпці ды скрабе што-небудзь, то будзе вецер» [232, с. 294]; «Варона крычыць – к ветру; у які бок крычыць – адтуль вецер»; «Як галкі сядаюць у адзін бок, то адтуль вецер»; «Як свінні ссоўваюць посцил – то мяцеліца» [27, л. 24]; «Чапля ляціць на захад – дождж» [28, л. 34]; «Калі курыца лезе на плот, то будзе дождж» [29, л. 76]; «Калі вароны сядзяць высока на дрэвах – будзе мароз, калі ходзяць па зямлі – адліга» [26, л. 22]. Калі карова, вол ці бык закідалі хвост на спіну, то абавязкова чакалі дажджу [24, л. 12; 28, л. 37; 29, л. 1, 5, 9]. Многія прыкметы нараджаліся ў выніку дзейнасці асацыятыўна-вобразнага мышлення: «Калі паперадзе статку ідзе карова белай масці, то на наступны дзень можна чакаць выдатнага надвор'я, калі наперадзе бачаць чорную карову, то і надвор'е будзе змрочным» [158, с. 97]; «Калі з поля ўперадзе ідзе рыжая карова – пагода, чорная – дождж, рабая – дождж з пераменамі, белая – туман будзе»; «Калі курыца трэпле хвастом, то будзе мяцеліца»; «Калі певень запяе ў лішку – адліга, у цот – мароз»; «Калі варона ляціць на поўдзень і крычыць, дык будзе цёпла, калі на поўнач – студзёна» [237, с. 67].

Не безуважныя да зменаў надвор'я і расліны. Усе этапы развіцця любой расліны знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад метэаралагічных умоў – тэмпературы паветра, вільготнасці, сонечнага асвятлення, а таму нядзіўна, што прадстаўнікі мясцовай



флоры пастаянна і вельмі наглядна для любога, нават непадрыхтаванага назіральніка адлюстроўваюць уплыў гэтых умоў праз вонкавыя перамены, што адбываюцца з імі. Да таго ж, расліны могуць дэманстраваць на сабе, а значыць і прадказваць, такія змены фізічных умоў навакольнага асяроддзя, якія не адчуваюцца не толькі чалавекам, але і сучаснымі вымяральнымі прыборамі.

Большасць кароткатэрміновых прыкмет надвор'я, звязаных з назіраннямі за раслінным светам, тычыцца дажджу, і гэта цалкам зразумела, бо расліны вельмі прыкметна рэагуюць на сухасць ці вільготнасць паветра і глебы. Беларусам было вядома, што перад дажджом хваёвыя дрэвы крыху апускаюць галлё, некаторыя расліны (півоня, гарлачык белы) закрываць пялёсткі кветак, перад дрэнным надвор'ем канюшына зближае долькі сваіх лісцікаў і нахіляецца. Перад бурай ці навальніцай бываюць моцнымі прыродныя пахі (хвоі, лугавых траў і інш). Калі раніцай не раскрыліся дробныя белыя кветачкі макрыцы, сяляне чакалі дажджу; за некалькі гадзін або нават за суткі да дажджу на лістах конскага каштану, стрэлкалісту, вольхі, чаромхі, клёну прыкмячаліся дробныя кропелькі вільгаці (т. зв. «плач» раслін) [27, л. 22; 29, л. 5; 43, с. 431; 59, с. 39; 189, с. 67; 322, с. 109].

Шэраг беларускіх народных прыкмет аб надвор'і звязаны з самаадчуваннем людзей: перад дажджом абвастраліся галаўны боль, ламата або боль у касцях (асабліва на месцы былых пераломаў, раненняў): «Косці ломіць – будзе дождж» [29, л. 45, 68, 70]; «Паясніцу ломіць перад дажджом ці іншай ліхой пагодай»; «Паміж лапатак свярбіць на непагадзь»; «Грудзі баляць перад навальніцай улетку ці перад завеяй узімку»; «На дождж баляць мазалі, ломіць косці, баліць галава» [59, с. 40; 251, с. 154, 155; 322, с. 109; 358, s. 105]. Перад непагаддзю хворым людзям станавілася душна, іх хіліла на сон, часта з'яўляўся звон у вушах [43, с. 431]: «Калі дрэмлецца і пазяхаецца – будзе дождж» [232, с. 297]; «Найтрудней дыхаецца ў вецер і перад самым ветрам» [14, спр. 49, л. 22]. У большасці выпадкаў гэтыя прыкметы адпавядаюць рэчаіснасці, бо самаадчуванне хворых людзей сапраўды істотна пагаршаецца пры павелічэнні вільготнасці паветра і зменах атмасфернага ціску.

Надвор'е на блізкі час вызначалі і па шэрагу бытавых прыкмет: «Калі дрэнна гараць дровы ў печы, то будзе вялікая непагадзь»; «Калі з коміна дым роўненька ідзе ўгору, то будзе добрае надвор'е, а калі ён круціць уніз і сцелецца па зямлі, то будзе ліхая непагадзь»



Репозиторий БГАТУ

[251, с. 45, 160; 322, с. 109]; «Калі зімою лучына гарыць весела і вугалі закручваюцца ў трубку – на мароз, а калі ўлетку лучына прыскае – на дождж» [78, с. 345]; «Калі раса на вокнах, то будзе дождж» [29, л. 66]; «Калі соль вільгатнее, будзе дождж»; «Калі тытунь адсырэе, то будзе дождж»; «Калі на саланіне, павешанай сушыцца, з'яўляюцца кроплі расы, то будзе дождж» [27, л. 26; 29, л. 12; 232, с. 297, 298]. Дым пры павышанай вільготнасці прыземнага слою паветра асядае ўніз, бо найдрабнейшыя цвёрдыя часцінкі, з якіх ён складаецца, паглынаюць вадзяную пару. Перад наступленнем дажджу адбываецца насычэнне паветра вадзяной парай, што выклікае змяненне паверхняў розных прадметаў: упітваючы ці асаджаючы на сябе вільгаць з атмасферы, яны пачынаюць станавіцца сырэйшымі. Калі раніцай туман падымаўся ўгару – чакалася добрае надвор'е, калі ён расцілаўся па зямлі – дождж [29, л. 80]. Прагназавалі надвор'е і па адгалоску: калі голас быў гучным, разлятаўся далёка – прадказвалі добрае надвор'е, калі, наадварот, глухім – то непагадзь [26, л. 84; 158, с. 97; 232, с. 297]. Калі малако ў час даення моцна пенілася, чакалі дажджу, а калі скісала без прычыны – навальніцы [29, л. 47]. Як вядома, перад дажджом назіраецца падзенне атмасфернага ціску, і менавіта таму малако ў даёнцы можа пеніцца мацней звычайнага. Першыя навальнічныя разрады, што адбываліся высока над зямлёй, заставаліся незаўважанымі, але ўзнікшы пад іх уздзеяннем азон дасягаў зямной паверхні. Азон валодае вялікімі акісляючымі ўласцівасцямі, так што малако сапраўды магло скіснуць без бачных прычын. Як бачым, і гэтыя прыкметы правільна канстатавалі ўзаемасувязь розных прыродных з'яў.

Летам надвор'е прадказвалі яшчэ па вялікай ці малой расе на траве: калі пасля заходу сонца выпадала вялікая раса, гэта сведчыла аб добрым надвор'і, а калі расы ўначы не было, то ўдзень чакаўся дождж [26, л. 82; 27, л. 26; 28, л. 2, 34; 29, л. 1, 18, 42, 45, 70, 84; 59, с. 39; 251, с. 46; 348, s. 155]. Вядома, што ў ясную летнюю ноч звычайна адбываецца ахаладжэнне прыземнага паветра. Вільгаць, што ўтрымліваецца ў ім, асядае ў выглядзе расы на траву і лістоту. Калі ж вільготнасць паветра вялікая, то ахаладжэнне яго будзе нязначным і раса не з'яўляецца.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што беларускі народ, дзякуючы пастаянным назіранням за акаляючым яго светам, назапасіў значны вопыт ў вызначэнні надвор'я на непрацяглы час. Гэты комплекс ведаў быў адзіным, яго прынцыповыя элементы не



адрозніваліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Іх вылучаюць аб'ектыўнасць, прастата, завершанасць, магчымасць хуткай практычнай праверкі і зручнасць прымянення, улік значнай колькасці прыродных узаемасувязей. У большасці кароткатэрміновых метэаралагічных прыкмет беларусаў, правераных вопытам многіх пакаленняў, вельмі дакладна адлюстраваны прыродныя заканамернасці. Гэтыя прыкметы з'яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй народных ведаў аб акаляючай прыродзе, якая ўражвае сваім аб'ёмам і дакладнасцю назіранняў. Многія з народных прыкмет знаходзяць навуковае абгрунтаванне і тым самым узбагачаюць веды сучасных сіноптыкаў.

## 4.2. Спробы прадказання надвор'я на працяглыя прамежкі часу

Паводле народных пераканнаняў, метэаралагічныя прагнозы можна рабіць не толькі на бліжэйшы час, але і на цэлыя поры года. Калі для селяніна-земляроба вельмі істотным было веданне надвор'я на наступныя два-тры дні, то больш значным для яго станавілася прадказанне надвор'я на працяглы час.

Традыцыйна шмат увагі ўдзялялася назіранням за станам надвор'я, навакольнага асяроддзя ў пэўныя дні года. На падставе такіх назіранняў, што мелі комплексны характар і ахоплівалі метэаралагічныя і феналагічныя з'явы, складаўся прагноз надвор'я на працяглыя прамежкі часу. Не разумеючы сутнасці многіх з'яў прыроды, але пакутуючы ад вынікаў засухі, марозу, ліўняў, градабіцця, беларускі селянін лічыў, што ў асобныя дні адбываюцца цудадзейныя пераўтварэнні, здзяйсненні ў прыродзе, якія аказваюць уплыў на будучае надвор'е. Калі ж пазней надвор'е сапраўды станавілася спрыяючым, то такі факт запамінаўся надоўга.

Важнейшай вехай беларускага народнага календара былі Каляды. З імі звязана вялікая колькасць метэаралагічных прыкмет: «Якое надвор'е на Каляды да абеду, такое і будзе вясною»; «Калі на Каляды стаяць лужыны ці капае з капяжу, то будзе мокрая восень» [251, с. 39, 41, 142]; «Якая пагода ў першы дзень Каляд, такая і будзе летам» [28, л. 2; 29, л. 49]; «Калі на Каляды мароз, то лета будзе гарачае; калі ж ідзе дождж ці снег, то лета будзе мокрае» [24, л. 34];



Репозиторий БГАТУ

«На Каляды адліга – ранняя вясна, гарачае лета» [61, с. 94]. Добрае надвор’е на Каляды служыла прыкметай добрага надвор’я на працягу ўсяго года; у адваротным выпадку чакалі непастаяннага надвор’я, а разам з ім і неўраджаю [29, л. 6; 158, с. 165]. Адліга на Каляды сведчыла, што санны шлях прадоўжыцца да сярэдзіны сакавіка, вясна будзе ранняя, а лета багатае; калі на Каляды ішоў снег – вясна чакалася дрэнная; калі перад Калядамі адзначаліся мароз і завіруха, то перад Вялікаднем павінна было быць цёплае і ціхае надвор’е [78, с. 345].

Калядны перыяд (з 24 снежня па 6 студзеня ст. ст. уключна) лічыўся ў народзе часам павароту ад зімы да вясны, калі перамагалі добрыя духі, што неслі абуджэнне прыродзе. Ён надзяляўся многімі звышнатуральнымі ўласцівасцямі, у т. л. і магчымасцю ўплываць на надвор’е, таму зразумела, што ў гэты час беларусы звярталі ўвагу на ўсе змены ў акаляючай прыродзе [322, с. 110]. Вялікая колькасць знойдзеных намі ў этнаграфічных крыніцах і зафіксаваных падчас уласных палявых даследаванняў прыкмет суадносіць надвор’е на Каляды з надвор’ем у Пятроў дзень (29 чэрвеня ст. ст.): «На Каляды снег – на Пятра дождж; мароз на Каляды – пагода на Пятра» [25, л. 28]; «Якая пагода перад Калядамі, такая пагода і на Пятроўку» [28, л. 9; 29, л. 18]; «Да Ражства не ідзе снег, то да Пятра не будзе дажджу» [28, л. 21]; «Калі на Каляды ідзе снег, то на Пятра дождж; калі на Каляды мароз моцны, то на Пятра добрая сухая пагода» [29, л. 48, 82]; «Калі на Каляды добры дзень, то летам такі ж на Пятра» [Там жа. Л. 3]; «Калі на Каляды мароз, то на Пятра будзе смаліць» [Там жа. Л. 19]; «Якое надвор’е перад Калядамі, такое будзе і перад Пятром і Паўлам; якое надвор’е пасля Калядаў, такое будзе ў пачатку жніва» [138, с. 107]; «Яснае надвор’е перад Калядамі азначае спрыяльнае для сенакосу надвор’е каля Пятра» [213, с. 128].

Многія доўгатэрміновыя прыкметы аб надвор’і, выведзеныя на падставе назіранняў за яго станам у перыяд Калядаў, указваюць на дождж, град, навальніцу: «На Каляды дождж, то лета мокрае; як пячэць на Каляды мароз, то гарачыня ў пакос» [29, л. 68]; «Калі на Каляды мяцеліца, то ў час жніва будзе ліхое надвор’е і пагніе збожжа»; «Калі на Каляды дождж ці мокры снег, то будзе дажджлівае надвор’е ў час сенакосу» [251, с. 142]; «Калі трашчаць свечкі напярэдадні Каляд, лета будзе з частымі перунамі і маланкамі» [78, с. 346]. Справа ў тым, што ў гэты час на тэрыторыі Беларусі нярэдка адбываюцца кароткатэрміновыя вяртанні цяпла, мокрага снегу з дажджом (з-за цыклонаў з Атлантыкі ці



Міжземнамор’я). Людзі ж, лічыўшы, што падобнае выклікае падобнае, звязвалі надвор’е ў гэты дзень з надвор’ем у іншыя сезоны.

Значэнне вясновага цяпла для земляроба, а таксама разнастайныя мясцовыя ваганні надвор’я прадвызначылі тую стараннасць, з якой беларускі селянін імкнуўся прадказаць надыход пацяплення. Для гэтага назіралі за надвор’ем пачынаючы ўжо з Грамніц (2 лютага ст. ст.): «Калі Стрэчанне халоднае, то вясна халодная; як цёпла на Стрэчанне, то і вясна будзе цёплая» [26, л. 81; 28, л. 4; 29, л. 60, 70]; «Калі на Грамніцы певень п’е ваду пад страхой, то зіма хутка пройдзе; у адваротным выпадку маразы пратрымаюцца яшчэ 6 тыдняў; калі трэці дзень пасля Грамніцаў цёплы – халадоў болей не будзе» [354, s. 148]; «Калі на Грамніцы адліга, то будзе хуткая і добрая вясна» [219, с. 510]; «Калі на Грамніцы певень каля дома нап’ецца вадзіцы, то на Юр’я вол на полі ўжо пад’есць травіцы» [28, л. 4, 40; 29, л. 58; 69, с. 13; 158, с. 178; 270, с. 337]; «Калі певень на Грамніцы з кіпяжа не нап’ецца вады, то гаспадар набярэцца бяды» [29, л. 6]; «Калі на Грамніцы свечкі ў царкве трашчаць і моцна цякуць – дажджлівае і гразавое лета» [Там жа. Л. 77]. Моцныя снегапады ў перыяд Грамніц прадказвалі дажджы падчас свята Іллі [32, с. 111].

З вялікай увагай сачылі за станам надвор’я ў першы дзень вясны: калі ён выдаваўся цёплым, сонечным, то вясна і лета чакаліся цёплымі, з асабліва спрыяльным надвор’ем у перыяд сенакосу [158, с. 90; 219, с. 511; 270, с. 337]. Калі ж у гэты час назіраліся снег ці мяцеліца, то вясна чакалася снежнай і цяжкай [237, с. 67]. У некаторых мясцовасцях лічылі, што першыя дні першага месяцу вясны вызначаюць надвор’е ўсяго года: 1 сакавіка паказвае надвор’е вясны, 2 сакавіка – лета, 3 сакавіка – восені, 4 сакавіка – зімы [29, л. 58; 158, с. 89]. У многіх прыкметах устаноўлена залежнасць паміж характарам надвор’я на Саракі (9 сакавіка ст. ст.) і ўсёй вясной, і нават летам: «Калі на Саракі мароз, то да цяпла яшчэ сорак маразоў будзе [28, л. 4; 29, л. 58, 59, 72; 158, с. 99; 238, с. 65], а калі цёпла, то ранняя і цёплая вясна» [29, л. 60, 63]; «Калі на Саракі цяпло, то цяпло да чыстага чацвярга; якое надвор’е на чысты чацвер, такое будзе да Троіцы; якое надвор’е на Троіцу – такім яно будзе да Іллі» [Там жа. Л. 49]; «Калі Саракі засталі снег на хатах, то Благавешчанне застане яго на зямлі, а Юрый – у гарах» [158, с. 98], г. зн., што вясна будзе позняй. У некаторых мясцовасцях лічылася, што надвор’е на Саракі захаваецца на працягу сарака дзён [29, л. 27].



Репозиторий БГАТУ

Час Благавешчання разглядаўся сялянамі як сапраўдны пачатак вясны, калі яна ўжо перамагла зіму, але наперадзе маглі быць і халады, таму вясна, што наступіла да Благавешчання, абяцала яшчэ шмат маразоў і снегу: «Калі сані кінеш да Благавешчання, то столькі ж будзеш ездзіць на санях і пасля Благавешчання» [28, л. 6]. Сяляне верылі, што надвор'е на Благавешчанне павінна было паўтарыцца падчас велікодных святаў [232, с. 292]: «Якая пагода на Благавешчанне, такая і на першы дзень Вялікадня» [270, с. 336]; «На Благавешчанне холадна, то і на Вялікдзень будзе холадна» [29, л. 80]. Сухое і цёплае надвор'е на Благавешчанне прадказвала летнюю засуху і марозную восень [158, с. 102; 264, с. 114]. Значная колькасць доўгатэрміновых прагнозаў звязана з велікодным цыклам: «Калі на жыдоўскія святы холадна, то на наш Вялікдзень цёпла» [237, с. 67]; «Калі на другі дзень Вялікадня дажджы – то будзе добрае лета» [27, л. 27]; «Адкуль вее вецер на Вялікдзень, адтуль будзе дуць усё лета» [251, с. 41].

Кожны сезон года, кожны тып надвор'я меў свае прыкметы і пэўныя дні, назіраючы за якімі беларускія сяляне рабілі доўгатэрміновыя прагнозы: «Якое надвор'е на Троіцу, такім і будзе лета» [142, с. 340; 251, с. 42]; «Троіца цёплая – і восень цёплая» [29, л. 60]; «Як не будзе дажджу на Ушэсце, то не будзе яго 6 тыдняў; як на Ўшэсце пройдзе дождж, то будзе ісці 6 тыдняў» [270, с. 336]; «Як на Яна дождж – будзе ісці доўга» [14, спр. 37, л. 32]; «Калі 19 ліпеня (на св. Макрыны) дождж – то лета будзе мокрае» [219, с. 518]; «На Макрэню дождж, то будзе ўсю Спасаўку дождж» [270, с. 337].

У доўгатэрміновых каляндарных прыкметах зафіксаваны вельмі цікавыя шэрагі метэаралагічных узаемазалежнасцей: «Калі на Пятра дождж, то дзён колькі будзе дождж» [29, л. 57]; «Калі пагода добрая на Пятра, добрай не будзе пасля Пятра і наадварот» [28, л. 37]; «Як да Пятра нягода, то пасля Пятра – пагода» [29, л. 6, 12]; «На Іллю як дождж пойдзе, то будзе ісці сем дзён ці нават сем тыдняў» [Там жа. Л. 57]. Беларускія сяляне лічылі, што на Іллю абавязкова павінен прайсці дождж з навальніцай, калі ж гэтага не было, то ў бліжэйшыя дні чакалася вялікая гарачыня, а потым працяглая і марозная зіма [Там жа. Л. 43].

Няменшая ўвага надавалася стану надвор'я падчас святаў восеньскага цыклу: «Якое надвор'е на Пакровы, такой і будзе зіма: калі на Пакровы мароз, то зіма будзе цяжкая» [251, с. 42, 43]; «Калі на Пакроў увесь дзень цёплая пагода і вецер вее з поўдня, то зіма будзе лёгкая і сухая, а калі ідзе дождж, то будзе цёплая ды мокрая;



дождж з паўночным ветрам указвае на тое, што зіма будзе снежная, з частымі мяцеліцамі» [232, с. 293]; «Калі цёпла на Пакровы, то зіма цёплая» [28, л. 5; 29, л. 73, 84]; «Калі Пакровы цёплыя, ціхія, то і восень доўгая, цёплая – цяпло захаваецца да Новага года» [28, л. 1]; «Калі на Міхайлаў дзень (8 лістапада ст. ст.) прыцісне мароз, то на Міколу (6 снежня ст. ст.) адпусціць; калі перад восеньскім Юр'ем (26 лістапада ст. ст.) многа снегу, то на веснавога Юр'я (23 красавіка ст. ст.) будзе трава» [78, с. 345]; «Калі на Міколу зімняга няма зімы, то зіма не хутка ўстановіцца; калі ў гэты дзень дзьме моцны вецер, то ён пратрымаецца цэлы месяц» [213, с. 156]. Па накірунку ветру на Пакровы сяляне прадказвалі накірункі вятроў усёй будучай зімы. Па звестках інфарматара В. Іванова (Асіповіцкі р-н), раней нават дарожныя майстры ўлічвалі гэтую прыкмету, ставячы з адпаведнага боку прыстасаванні для абароны дарог ад снегу [29, л. 85].

Неабходна адзначыць, што ў каляндарных метэаралагічных прыкметах найбольш выяўляюцца рэгіянальныя адрозненні ў народных ведах беларусаў аб надвор'і, што звязана з прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (так, напрыклад, на поўдні Беларусі, на Палессі, на Благавешчанне ўжо ўсталёўвалася сапраўдная вясна, а ў Паазер'і яшчэ мог ляжаць снег). Прыкладна да 80-х гг. XX ст. рацыянальнасць доўгатэрміновых каляндарных прыкмет адназначна адмаўлялася. У 80–90-я гг. XX ст. назіраецца абуджэнне цікавасці да гэтай важнай часткі традыцыйных ведаў аб надвор'і: каляндарнымі прыкметамі, прымеркаванымі як да мясцовых зменаў надвор'я, так і да рэлігійных святаў, карыстаецца ўсё большая частка насельніцтва [27, л. 8–10, 18; 28, л. 2, 4, 7, 30, 34, 36; 29, л. 1, 5, 14, 68, 72]. Гэта звязана з тым, што назіранні за акаляючай прыродай, характарам надвор'я ў канкрэтнай мясцовасці, прымеркаваныя да таго ці іншага каляндарнага свята, лягчэй запаміналіся, што давала магчымасць з года ў год параўноўваць іх вынікі. Іншымі словамі, кожная каляндарная метэаралагічная прыкмета – гэта вынік шматгадовых назіранняў пэўнай з'явы прыроды ў дакладна вызначаны час. Калі адкінуць рэлігійныя напластаванні, то перад намі паўстаюць выведзеныя эмпірычным шляхам цыклічныя перыяды метэаралагічных зменаў, а таму да гэтых народных напрацовак нельга адносіцца цалкам скептычна [312, с. 54].



Репозиторий БГАТУ

Каляндарныя метэаралагічныя прыкметы былі пачаткам доўгатэрміновага прагназавання надвор'я (на месяц, сезон, год), ад некаляндарных яны адрозніваюцца толькі тым, што прадказваюць надвор'е наступнага перыяду па надвор'ю аднаго пэўнага дня. Каляндарныя метэаралагічныя прыкметы з'яўляюцца завершанай, арганізаванай у часе і ў прасторы сістэмай ведаў, што ахоплівае ўвесь прыродны комплекс; яны дапаўняюць сабой прыкметы некаляндарныя. У аснову гэтых прыкмет пакладзены назіранні, якія звязваюць паслядоўнасць ці адначасовасць працякання самых розных прыродных з'яў. Супастаўленне некаторых каляндарных прыкмет з дадзенымі шматгадовых метэаралагічных назіранняў сведчыць аб іх пазітыўнай каштоўнасці. Так, напрыклад, у сучаснай метэаралогіі і кліматалогіі знаходзяць пацверджанне прыкметы, якія адзначаюць штогадовае паніжэнне тэмпературы 19 студзеня (хрышчэнскія маразы), узмацненне навальнічнай актыўнасці ў пачатку жніўня (дзень св. Іллі), вераснёўскае пацяпленне (бабіна лета), а таксама прадказанні, звязаныя з днём Самсона (27 чэрвеня па ст. ст.) («Як на Самсона дождж, то будзе ісці сем тыдняў, а як дажджу няма – сем тыдняў не будзе дажджу») і Пакровамі («Як паўночны вецер на Пакровы, то будзе халодная зіма») [45, с. 83–86; 241, с. 188; 270, с. 338].

У традыцыйным светапоглядзе беларусаў важнае значэнне надавалася першым на працягу года з'явам надвор'я, асабліва снегу, грому, інею, першым замаразкам: «Пасля таго, як выпадзе першы сняжок, вялікі снег пакрые зямлю толькі праз месяц» [251, с. 39]; «Калі першы снег выпадзе рана, то вясна мокрая» [28, л. 2]; «Калі першы гром загрыміць на лёд, то будзе халодная вясна і навальнічнае лета, а калі на зялёнае голле – добрае лета» [78, с. 345]; «Калі першы гром пачуецца з поўначы, то лета будзе халоднае; з поўдня – цёплае» [195, с. 94]. За днямі, калі ўпершыню адзначаліся гэтыя метэаралагічныя з'явы, сачылі вельмі ўважліва: так, напрыклад, у Цэнтральнай Беларусі верылі, што «калі пакажацца вельмі рана іней, то будзе харошая пагодная восень»; на Палессі ўвесну рэкамендавалася садзіць капусту ў той дзень, калі ўвосень выпаў першы снег [36, с. 220]. Існуючыя рэгіянальныя адрозненні ў дадзеных прыкметах вызначаюцца перш за ўсё асаблівасцямі прыродна-кліматычных умоў і ў значна меншай ступені – мясцовымі культурнымі асаблівасцямі.

Пад увагу таксама браліся асаблівасці развіцця раслін, іх рэагаванне на змены метэаралагічных умоў, паводзіны звяроў,



птушак, насякомых, рыб. Прыкметы аб надвор'і на працяглыя прамежкі часу, звязаныя з назіраннямі за прадстаўнікамі мясцовай флоры і фауны, уяўляюць сабой своеасаблівую народную феналогію – галіну ведаў аб перыядычнасці з'яў у жыцці раслін і жывёл у іх узаемнай сувязі і ўзаемнай залежнасці ад фактараў знешняга асяроддзя, найперш метэаралагічных. Шэраг слушных прыкмет давала беларускім сялянам назіранне за дрэвамі: «Калі вясною першы гром прагрыміць на голы лес, то лета будзе дрэннае»; «Калі лес рана скіне лісце, то зіма ранняя і халодная» [94, с. 111; 325, с. 90]. Асаблівасці росту, цвіцення, выспявання пладоў розных раслін тлумачыліся сялянамі як прадказанне пэўных зрухаў у надвор'і, як прагноз асаблівасцей будучых пор года: «Вясною альха распускаецца раней бярозы, то мокрая вясна, а калі бяроза распускаецца раней – вясна сухая» [29, л. 12]; «Калі дуб зазелянее перад Міколаю, то будзе ранняя восень»; «Калі ўраджай рабіны – восень будзе мокрая» [14, спр. 37, л. 38]; «Калі рабіна надта ўродзіць, то будзе цяжкая зіма» [232, с. 296]; «Калі надта многа баравікоў улетку, то зіма будзе вельмі снежная» [78, с. 345]. Перад Пакровамі разламвалі некалькі яблычак на дубовай лістоце і лічылі ў іх «мух» і «чарвей»: калі мух было болей, то зіма чакалася марозная і маласнежная, у адваротным выпадку – цяплейшая з вялікімі снягамі [29, л. 5; 232, с. 296; 354, s. 148].

Надвор'е на працяглы час вызначалася і па паводзінах прадстаўнікоў мясцовай фауны. Даўно заўважана, што многія жывёлы і птушкі валодаюць вельмі адчувальнымі органамі, якія даюць ім магчымасць прадбачыць змены надвор'я і адпаведна змяняць свае паводзіны, прымаючы неабходныя меры перасцярогі. Так, напрыклад, халодная ці мяккая зіма прадказвалася па стану футра ў жывёлы, большай ці меншай яго гушчыні ці даўжыні. Лічылася, што жывёлы ў прадчуванні марознай зімы быццам бы адрошчваюць на сабе больш цёплае футра, каб лепей супрацьстаяць халадам [114, с. 48]. Аб сапраўднай прадбачлівасці тут, зразумела, не можа ісці і гаворкі, але паколькі надвор'е аднаго сезону года знаходзіцца ў пэўнай сувязі з надвор'ем папярэдняга сезону (такая сувязь звычайна выпадае з-пад увагі назіральніка), то пад уплывам гэтых не заўважаных чалавекам фактараў і адбываюцца тыя ці іншыя змены ў біялогіі жывёл, якія загадзя адаптуюць іх да неспрыяльных умоў навакольнага асяроддзя: «Калі ўвосень на зайцу багата сала, то зіма будзе цяжкая» [232, с. 294]. Акрамя гэтага, у этнаграфічнай літаратуры сустракаецца наступная прыкмета: «Калі



Репозиторий БГАТУ

каса (селязёнка) заколатага парсюка тонкім бокам звернута да галавы, зіма спачатку будзе лёгкай, а потым цяжкай; у супрацьлеглым выпадку – наадварот» [158, с. 161; 354, s. 149]. Прадказвалі надвор'е надыходзячай зімы і па памерах селязёнкі: апытаныя намі інфарматары Р. Духноўская, Ф. Грышкоў і Я. Козел (Слонімскі, Слуцкі, Докшыцкі р-ны) адзначалі, што вялікая селязёнка сведчыла аб суровай зіме, маленькая – аб мяккай; калі селязёнка была больш тоўстай у сярэдзіне, то халады чакаліся ў сярэдзіне зімы [28, л. 1; 29, л. 6, 22].

Беларускія сяляне лічылі, што дзікія качкі прадчуваюць мокрае лета і таму робяць свае гнёзды на больш высокіх месцах [27, л. 26; 28, л. 21]. Калі мышы на полі рабілі свае гнёзды высока над зямлёй, то лета і восень чакаліся мокрымі, а калі на зямлі, то сухімі [26, л. 83; 28, л. 19; 29, л. 9, 19]. Пад увагу браліся паводзіны і іншых жывёл, птушак, насякомых, рыб: «Калі вадзяныя пацукі робяць гнёзды на аеры – даждлівая восень»; «Калі вавёрка назапашвае арэхі, то будзе цяжкая і халодная зіма»; «Калі мурашкі робяць высокія мурашнікі, то лета будзе мокрае і восень ліхая, а зіма цяжкая» [27, л. 22; 29, л. 19; 251, с. 42, 94]; «Як краты вельмі рыюць норы, то цёплае лета» [28, л. 33]; «Калі ўвесь кастрычнік краты зямлю точаць, то зіма будзе важкая – вельмі марозная і снежная»; «Калі мухі стануць вялыя і больш іх падае ў страву, то скора настануць халады» [232, с. 294, 296]; «Калі восенню камары таўкуць мак, а краты працягваюць рыць зямлю – восень будзе доўгай і цёплай» [28, л. 1].

Многія традыцыйныя доўгатэрміновыя прагнозы, базуючыся на каляндарным цыкле, адначасова звяртаюцца і да феналагічных з'яў: «Калі ластаўкі з выраю прыляцяць паміж Юр'ем і Міколаю, то восень будзе ранняя, а калі пасля Міколы, то будзе позняя і доўгая»; «Калі зязюля перастане кукаваць перад святым Пятром, то восень не за гарамі, будзе халодная і кароткая; калі зязюля кукуе пасля святога Пятра, хай сабе і нядоўга, то восень надыдзе позна, будзе доўгая, пагодная і цёплая» [232, с. 295]; «Калі буслы адлятаюць за 15 тыдняў да Калядаў, то і прылёт іх будзе праз 15 тыдняў пасля Калядаў»; «Калі мянтуз на нерасце перад Піліпаўскім пастом (14 лістапада ст. ст.), то чакай ранняй вясны, калі ж перад восеньскім Юр'ем (26 лістапада ст. ст.) – то вясна позняя» [59, с. 37].

Значная колькасць доўгатэрміновых прагнозаў надвор'я абапіраецца выключна на феналагічныя назіранні, не звяртаючыся да календара. Уласныя назіранні характэрны для кожнай пары года, бо кожны сезон абумоўлены пэўным колам зменаў у навакольным



асяроддзі. Істотныя гадавыя ваганні наступлення вясновага пацяплення і восеньскага пахаладання, характэрныя для тэрыторыі Беларусі, абумовілі асаблівую ўвагу да феналагічных з'яў. З гэтай мэтай перш за ўсё назіралі за паводзінамі птушак: птушкі, асабліва пералётныя, найбольш цесна звязаны са зменамі ў навакольным асяроддзі, якім падпарадкавана ўся гаспадарчая дзейнасць беларускага селяніна. Пагэтаму паводзіны птушак з'яўляюцца адным з фактараў, якія арганізуюць саму структуру доўгатэрміновых метэаралагічных прагнозаў і ў пэўнай ступені фарміруюць іх у цэлым [99, с. 529, 530]. Невыпадкова птушкі так часта фігуруюць у розных прыкметах, павер'ях, прыказках, прымаўках, а на падставе назіранняў за іх жыццядзейнасцю – першым прылётам вясною, першым крыкам, шлюбным перыядам («птушыныя вяселлі»), пасадкай на яйкі, вывядзеннем птушанят, пачаткам і заканчэннем спеваў, адлётам восенню – пабудавана вялікая колькасць традыцыйных доўгатэрміновых прыкмет: «Дзікія гусі і іншыя птушкі рана ляцяць у вырай – хутка будзе зіма» [294, с. 245]; «Калі гусі ў вырай ляцяць высока, то зіма не хутка настане» [348, s. 184]; «Дзікія гусі ляцяць нізка – зіма блізка» [158, с. 161]. Калі пры гэтым гусі ляцелі ўначы, то сяляне рабілі выснову, што зіма будзе цяжкай, а першыя маразы пачнуцца літаральна праз некалькі дзён: гусі таму і ляцяць уначы, бо хочуць хутчэй пакінуць тыя мясціны, дзе іх можа застаць зіма. Прыкметай блізкай зімы выступалі таксама частыя і гучныя крыкі гусей пры палёце [Там жа].

На ўсёй тэрыторыі Беларусі вельмі распаўсюджаным было прадбачанне надвор'я па зіме: «Якая зіма – такое і лета: зіма марозная – лета гарачае» [27, л. 25; 28, л. 1, 21, 34; 29, л. 1, 85]; «Зіма ідзе па лету, а лета па зіме: калі стаіць роўная зіма, то будзе добрае лета»; «Як марозная зіма, то лета сухое; як зіма гнілая, то і лета дажджлівае: у адзін год былі адлігі ўсю зіму, то і лета было адлежнае» [27, л. 4, 5, 9; 32, с. 111; 251, с. 41, 42]. У аснове гэтых прыкмет ляжаць заўважаныя эмпірычным шляхам заканамернасці ў вобласці сонечна-зямных сувязей (сувязей паміж дзейнасцю Сонца і з'явамі ў атмасферы Зямлі), якія вызначаюцца сонечнай актыўнасцю і яе цыклічнасцю [45, с. 86]. Варта падкрэсліць, што гэтыя назіранні адпавядаюць рэчаіснасці, бо згодна апошнім навуковым дадзеным аб цыклічнасці перыядаў інтэнсіўнай сонечнай актыўнасці колькасць сонечных дзён улетку прыкладна супадае з колькасцю сонечных дзён папярэдняй зімы [322, с. 111].



Репозиторий БГАТУ

Нярэдка народныя прыкметы ўмоўна падзялялі год на дзве роўныя часткі: адна пачыналася з 1 студзеня, другая – з 1 ліпеня, пры гэтым лічылі, што надвор'е адпаведных дзён кожнай пары года павінна быць прыблізна аднолькавым. Заўважаючы асаблівасці надвор'я ў пэўны дзень першага паўгоддзя, меркавалі пра надвор'е ў адпаведны дзень другой паловы года. Так, напрыклад, снежны дзень 1 студзеня нібыта сведчыў аб тым, што 1 ліпеня будзе дажджлівым і непагодным [77, с. 5; 78, с. 345], а ясны марозны пачатак Калядаў абяцае цёплае, спакойнае Купалле: «Якая куцця – такі і Ян» [14, спр. 53, л. 33]. У такіх прагнозах мяцеліца ўзімку адпавядала навальніцы ўлетку, снег – дажджу, мароз – гарачаму надвор'ю і г. д. [28, л. 34; 29, л. 70]. Інфарматар А. Кавалёва (Чавускі р-н) адзначае: «У гэтую зіму перад Новым годам была бура, вось летам ураган і прайшоў: 600 гектараў у нашым калгасе злажыў» [29, л. 55]. Сухое марознае надвор'е ў канцы снежня – пачатку студзеня, па перакананнях сялян, указвала на тое, што ліпень будзе гарачым і сонечным [14, спр. 53, л. 33; 24, л. 34; 27, л. 25; 28, л. 25; 29, л. 49; 59, с. 40; 236, с. 61]. На падставе шматгадовых назіранняў былі вызначаны і іншыя ўзаемазалежнасці прыродных з'яў: «Калі зімою ў лесе вецер пагоніць галлё па снегу, так што белы снег стане брудным, то праз тры месяцы пасля таго павінна зрушыць зіму» [59, с. 37]; «Калі першы снег застане на дрэвах лістоту, то будучая вясна будзе халоднай»; «Колькі ў марцы вады, столькі ў апрэле травы» [237, с. 67]; «Якое надвор'е было ў час квітнення садоў, такое ж будзе і ў час жніва» [251, с. 32; 322, с. 111]; «Калі асенняе поле зацягнута павуціннем, то восень цёплая, недажджлівая» [29, л. 42].

Такім чынам, доўгатэрміновыя метэаралагічныя прыкметы можна падзяліць на каляндарныя (надвор'е таго ці іншага дня ці перыяду гадавога цыклу вызначалася на падставе фіксацыі яго стану ў канкрэтны час, найперш у перыяд значнага каляндарнага свята) і некаляндарныя, якія абапіраліся на неарганізаваныя ў часе назіранні за самымі рознымі з'явамі акаляючай прыроды. Доўгатэрміновыя народныя прадказанні надвор'я засноўваліся на шматвяковым сялянскім вопыце, назіральнасці, глыбокім веданні прыроды. Адначасова ў прадказаннях надвор'я мелі месца і прымхлівыя ўяўленні чалавека, што вынікалі з фантастычных тлумачэнняў узаемадзеяння прыродных фактараў, грунтаваліся на вобразна-сімвалічных асацыяцыях, выпадковых супадзеннях. Кліматычныя адрозненні гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў



Беларусі знайшлі сваё адлюстраванне толькі ў канкрэтным метэаралагічным значэнні шэрагу каляндарных дат. У той жа час структура, сутнасць, унутраны змест ведаў аб спосабах прадказання надвор'я на працяглыя прамежкі часу застаюцца амаль нязменнымі: сучасныя палявыя этнаграфічныя даследаванні пацвярджаюць існаванне прыкмет, зафіксаваных яшчэ ў XIX ст. – першай палове XX ст. [29, л. 2, 7–10, 14–16, 22, 81; 232, с. 291–298, 236, с. 305].

### 4.3. Вызначэнне ўплыву ўмоў надвор'я на будучы ўраджай

Адпаведна таму, як існавалі прыкметы аб надвор'і на працяглы час, на ўсёй тэрыторыі Беларусі былі шырока распаўсюджаны прадказанні якасці і колькасці будучага ўраджаю. Прырода са сваімі нечаканасцямі – маразамі, засухай, макрэчай, градабоем, туманамі, вятрамі, раннім ці запозненым надыходам цяпла або халадоў – вымушала селяніна быць уважлівым да рэальных зменаў у ёй і мець у запасе шматварыянтныя рашэнні той ці іншай гаспадарчай праблемы. Найбольш надзейным прадказальнікам будучага ўраджаю было надвор'е – селянін не меў магчымасці абараніць свае нівы ад стыхійных сіл прыроды, таму і спрабаваў прадбачыць ураджай па стану надвор'я: колькасці выпаўшых ападкаў, тэмпературы паветра і г. д. Народныя веды беларусаў аб спосабах прагназавання будучага ўраджаю адназначна звязваюць дабрабыт селяніна з асаблівасцямі ўмоў надвор'я, выдатна ілюструючы асноўную мэту яго назіранняў за акаляючай прыродай – забяспечыць поспех сваёй жыццядзейнасці, а таксама спецыфічную асаблівасць такіх назіранняў: часта прадказваецца не сам характар будучага надвор'я, а тое, як паўплываюць умовы надвор'я на тыя ці іншыя бакі гаспадарчага жыцця.

Вялікае значэнне для будучага ўраджаю мела колькасць снегу ўзімку: «Які зімою снег, такі летам ураджай. Калі зімой мала снегу, то летам будзе мала хлебу» [251, с. 94; 322, с. 111]; «Снегу многа – хлебу многа» [27, л. 27]. І сапраўды, глыбокі снег захоўвае азімыя пасевы ад вымярзання, а вясной забяспечвае іх каранёвую сістэму неабходнай вільгаццю. Вельмі неспрыяльнымі лічыліся частыя адлігі, бо жыта, асабліва на нізкіх месцах, вымакала, або на глебе магла ўтварыцца ледзяная скарынка. Беларускімі сялянамі быў заўважаны і ўплыў на ўраджай расы і тумаnoў: «Вялікая раса і цёплыя ночы абазначаюць, што будзе вялікі ўраджай на полі і на



Репозиторий БГАТУ

лузе»; «Калі зімой бывае туман, то наступным летам будзе вялікі ўраджай збожжа» [251, с. 35–36].

На ўраджай маглі ўздзейнічаць і іншыя прыродныя з'явы, нават іней: «Сёлета па зіме павінен быць ураджай, бо іней усю зіму трымаўся на дрэвах» [10, спр. 35, л. 42]; «Калі зімой іней на дрэвы падае лядовы – то будзе добры ўраджай, калі пушком – то слабы» [21, л. 15]; «Калі зімой сукі на дрэве ад інею і снегу гнуцца, то жыта будзе ўмалотнае і гнуцца» [294, с. 245]. Як вядома, іней (абледзяненне дрэваў) знішчальна дзейнічае на лічынкі насякомых, якія прыносяць саду вялікую шкоду. У Падняпроўі прыкмячалі, калі іней упершыню з'яўляўся на дрэвах: калі раней дня Міколы зімняга (6 снежня ст. ст.), то чакалі ранні ячмень, пазней 6 снежня – позні [219, с. 497–498]. У Паазер'і іней на Міколу сведчыў таксама аб добрым ураджаі льна [213, с. 156]. Вялікі іней на Каляды прадказваў багаты ўраджай і ў полі, і ў садзе [25, л. 28; 138, с. 107; 158, с. 180; 270, с. 337]: «Калі іней пакрывае ўсё ў дзень Божага нараджэння, то будзе багаты ўраджай» [232, с. 290]; «На Каляды шмат інею на дрэвах – добры ўраджай у садзе» [61, с. 94]. За колькі дзён да Калядаў з'явіўся першы іней, за столькі дзён да Івана Купалы раілі сеяць грэчку [238, с. 61]. Інфарматар Ф. Грышкоў (Слонімскі р-н) паведаміў нам, што «калі на Каляды на дзераве навісь, то вясна ранняя і можна сеяць ранні ячмень, калі на Новы год – то позняя, калі ж навісі няма – то зусім позняя вясна» [29, л. 5].

Характар будучага ўраджаю і поспехі ў гаспадарчых занятках прадказваў таксама стан надвор'я ў пэўныя дні года: «Добрае надвор'е на Варвару (4 снежня ст. ст.) – добры ўраджай льна» [213, с. 156]; «Як выпадзе снег да Міхайлы, то ўраджай харошы» [29, л. 1]; «Перад Калядамі сапляікі вялікія са стрэхаў звісаюць – то ячмень будзе ўраджайны» [Там жа. Л. 64]; «На Каляды мяцеліца – будуць добра раіцца пчолы» [138, с. 107; 158, с. 180]; «Калі на Каляды мяцеліца мяце, то летам няма куды будзе падзець раёў» [237, с. 67]; «Калі на Каляды добра бачны сцежкі на снезе – будзе добры ўраджай грэчкі» [61, с. 94; 102, с. 234].

Пасля каляднай вячэры (24 снежня ст. ст.) сяляне звярталі ўвагу на начное неба: вялікая колькасць зорак прадказвала добры ўраджай яравых і азімых хлябоў, асабліва таго зерня, большую колькасць якога знаходзілі на стале пад святочным абрусам [70, с. 181; 158, с. 164, 165; 294, с. 246], гароху, ягад, грыбоў, багаты прыплод хатняй жывёлы і птушкі [24, л. 34; 28, л. 15; 61, с. 94; 102, с. 234; 138, с. 107; 158, с. 164, 165, 180], спрыяльнае надвор'е



падчас сенакосу [70, с. 181; 294, с. 246]; неба, зацягнутае хмарамі (нязначная колькасць ці адсутнасць зорак), – дрэнны ўраджай і дрэннае надвор'е падчас сенакосу [70, с. 181; 294, с. 246; 325, с. 90]. Зорнае неба на Новы год і на галодную куццю (6 студзеня ст. ст.) таксама служыла прыкметай добрага ўраджаю, прыплоду хатняй жывёлы і птушкі, добрага раення пчол, ураджаю грыбоў, ягад, іншых прадуктаў збіральніцтва [29, л. 85; 70, с. 182; 158, с. 180; 219, с. 498; 325, с. 90]. У той жа час сяляне Падняпроўя лічылі, што «калі на Каляды (на ўсе тры) на небе няма зорак, то не будзе грыбоў, а ягады і арэхі будуць» [237, с. 67]. Па большай ці меншай колькасці зорак «на тры Каляды» сяляне Паазер'я імкнуліся вызначыць ураджай грыбоў, ягад і арэхаў улетку, пры гэтым першая Каляда быццам бы ўказвала на іх колькасць у пачатку лета, другая – у сярэдзіне, а трэцяя – у канцы лета. Такім жа чынам прадказвалі і раенне пчол [213, с. 124]. Аналагічная па сутнасці прыкмета зафіксавана на Усходнім Палессі: зорнае неба ў першую куццю прадказвала ўраджай на ранні ячмень, у другую – на сярэдні ячмень і проса, у трэцюю – на позні ячмень і грэчку [354, s. 225]. Паўсюдна на тэрыторыі Беларусі снег на Каляды (асабліва на другую – навагоднюю і трэцюю – хрышчэнскую) прадказваў дастатак ва ўсім: у хлебе, грыбах, добрым раенні пчол [29, л. 8; 213, с. 124; 236, с. 61; 296, с. 47]: «На багатую Каляду многа снегу – ячмень добры» [28, л. 34]; «Калі на Крашчэнне снег, то будзе добры ўраджай» [27, л. 24].

Сяляне Паазер'я верылі, што добрае надвор'е на Новы год сведчыла аб добрым ураджае ільну, а пры «пераменным» надвор'і, калі сонца свяціла зранку, добрым будзе ранні лён; калі ж сонца паказвалася пад вечар, то добрым чакалі позні лён [296, с. 48]. У Ваўкавыскім раёне (Панямонне) намі зафіксавана прыкмета аб тым, што калі перад Новым годам свеціць сонца, то лён будзе чыстым ад пустазелля [29, л. 79]. Аналагічныя прыкметы і гаданні аб надвор'і, ураджаі, прыплодзе жывёлы распаўсюджаны не толькі на Беларусі – яны вядомы многім індаеўрапейскім народам [132, с. 23, 27, 29, 33, 34, 47, 48].

Гаспадарчыя ўмовы надыходзячай вясны і ўсяго года імкнуліся вызначыць па стану надвор'я на Стрэчанне: «Калі ў дзень Стрэчання мяцеліца, то вымеце ўсё з засекаў» [28, л. 4]; «На Стрэчанне буран, то вясна дрэнная, вымеце ўвесь корм» [Там жа. Л. 2]; «Калі на Грамніцы капае з капяжу, то будзе ўраджай на гуркі» [251, с. 44]. На ўсёй тэрыторыі Беларусі было



Репозиторий БГАТУ

распаўсюджана меркаванне аб тым, што цёплае надвор'е ў лютым, а значыць, несвоечасовае абуджэнне прыроды, створаць неспрыяльныя ўмовы для будучага ўраджаю [28, л. 8, 24, 29; 29, л. 2, 7, 64, 65, 68, 79–81]. Вялікая ўвага надавалася стану надвор'я ў першы дзень вясны. Калі 1 сакавіка ішоў дождж, то прагназаваўся ўраджай на жыта; моцны мароз у гэты дзень быў прыкметай таго, што замаразкі памарозяць грэчку ў час цвіцення. Калі 1 сакавіка назіраўся туман, то чакалі ўраджаю на стручковыя расліны, калі мяцеліца і завіруха, то ў бягучым годзе мог пачацца моцны голад, які «вымеце» людзей [158, с. 90].

Каляндарныя прыкметы, звязаныя з вырошчваннем азімых і яравых культур, прыплодам жывёлы, ураджаем грыбоў, ягад, арэхаў дэманструюць разнастайнасць і стараннасць штодзённых назіранняў за надвор'ем, адлюстроўваюць разуменне сялянамі складанай залежнасці іх гаспадарчай дзейнасці ад умоў надвор'я: «На Благавешчанне дождж – будзе ўраджай на жыта» [158, с. 101, 102]; «Калі на Вялікадня ясная, хаця і халодная пагода, то сады будуць у наступнае лета з пладамі» [296, с. 48]; «Як на Усеношну ясны зоры, то будуць грыбы» [270, с. 336]; «Калі на Юрыя (вясновага. – *К. Ш.*) дождж падае, то каровы будуць прыносіць поўнае вымя малака» [348, s. 156]; «Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня. Калі на Юр'я мароз, то будзе добры авёс» [264, с. 123]. Снег на Юрыя вясновага падаваў сялянам надзею, што летам іх палі пабялеюць ад грэчкі [78, с. 345]. Калі на Юр'еў дзень выпадала вялікая раса, то ў гэтым годзе чакаўся вялікі ўраджай жыта, аўса і грэчкі [29, л. 1; 158, с. 119; 264, с. 348]. У Івацэвіцкім раёне намі зафіксавана падобная прыкмета: «Калі на Юрыя харошыя росы, то будуць добрыя просы; калі няма расы, то не будзе і прасы» [29, л. 76].

Многія доўгатэрміновыя прыкметы не маюць патрэбы ў каментарыях: «Як вясною стаіць сухавеіца, то ў садах усё прападзе»; «Цёплы апрэль ды мокры май – будзе жыта нібы гай» [251, с. 47, 94]; «Калі ўвесну снег ляжа на талую зямлю, то азіміна прападзе» [27, л. 5]; «Калі ў маі няма дажджу – ураджаю не будзе»; «Май халодны – год пладародны» [Там жа. Л. 24]. Параўнальна меншая колькасць прыкмет звязана з летнім і восеньскім каляндарнымі цыкламі, і гэта цалкам зразумела, бо сяляне ведалі, што колькасць і якасць ураджаю найперш залежаць ад метэаралагічных умоў зімы і вясны: «Калі гразь у Пятроўку, то будзе добры ўраджай на збожжа, але пагніе бульба» [28, л. 17; 296,



с. 48]; «Калі на Іллю ідзе дождж, то будзе ядранае жыта, але прападуць арэхі» [219, с. 518; 236, с. 273]; «Калі на восеньскага Юр'я мароз, то і на гары вырасце авёс; дождж на Пакровы – добра пчолы раіцца будуць» [78, с. 345].

Аб ураджаі ці неўраджаі меркавалі па паводзінах бусла (лічылася, што калі ён выкідваў з гнязда яйка, гэта прадказвала ўраджайны год, а калі бусляня – голад [29, л. 6, 7; 70, с. 188; 158, с. 102; 237, с. 68; 350, s. 434]), па колькасці вавёрак: «Калі ў лесе з'явіцца шмат вавёрак, то будзе ўраджайны год» [52, с. 10]. Бусел, як «мудрая» птушка, быццам бы мог прадчуваць набліжэнне голаду і, выкідваючы лішні рот, загадзя пазбаўляў яго ад пакут, папярэджваючы такім чынам і людзей; колькасць жа вавёрак павялічвалася тады, калі год чакаўся ўраджайным на ягады, арэхі і іншыя плады, якімі яны харчуюцца. Лічылі таксама, што калі буслы прыляцяць раней, чым звычайна, то будзе ўраджай на лён. Калі лавілася шмат рыбы, то чакалі галоднага года: «Калі рыбна, то і галадна» [59, с. 38]. Абяцанне будучага ўраджаю селяніну хацелася бачыць і ў паводзінах іншых прастаўнікоў жывёльнага свету: «Чым вышэй лётаюць увесну першыя матылі, тым вышэй вырасце ў наступнае лета лён»; «Калі першая ластаўка лётае высока, то лён будзе высокі, а як нізка, то будзе нізкі» [52, с. 12]. Прыкмячалі таксама, калі вясною ў першы раз запела ў лесе зязюля: калі лес у гэты час яшчэ не меў лістоты – год чакаўся галодным, цяжкім для людзей [158, с. 98; 350, s. 434]. Калі голас зязюлі чулі пасля дня Івана Купалы, то чакалі дрэннага ўраджаю [26, л. 23]. Калі дзікія гусі і жураўлі ўвесну прыляталі па аднаму, то і на жыта чакаўся добры ўраджай: снапы будуць такімі цяжкімі, што іх прыйдзецца насіць да возу па аднаму; а калі іх назіралі па два, па тры, то і снапы жыта прыйшлося б насіць так [158, с. 99]. Пчаляры імкнуліся прадказаць будучы ўраджай па паводзінах пчол: калі пчала не вылятала з вулля да Благавешчання, то чакалі ўраджайнага лета, у адваротным выпадку – дрэннага, беднага [59, с. 38; 158, с. 101]. Па перакананнях сялян, пчала не павінна вылятаць з вулля раней Благавешчання, інакш пасля яна вымушана будзе прабыць у ім такі прамежак часу, на які яна сваім з'яўленнем апярэдзіла дзень гэтага свята [26, л. 83; 27, л. 25 – Карэліцкі р-н; 158, с. 101]. Аналагічная па сутнасці прыкмета зафіксавана (мною. – *К.Ш.*) ў Цэнтральнай Беларусі: «Калі жаваранак да Благавешчання выляціць у поле, то столькі ж дзён яму прыйдзецца пасядзець пасля Благавешчання»



Репозиторий БГАТУ

[28, л. 6]. Як бачым, рэгіянальныя варыяцыі ўнутранага зместу дадзеных прыкмет вельмі нязначныя.

Зразумела, не ўсе народныя прыкметы былі дакладнымі, многія з іх заснаваны на выпадковых супадзеннях (так, напрыклад, чысты здаровы корань першага знойдзенага грыба быў прыкметай на ўраджай, у адваротным выпадку – на голад [158, с. 98]), але само іх існаванне гаворыць аб шырокім распаўсюджанні назіранняў за навакольным светам, імкненні раскрыць і растлумачыць аб'ектыўныя законы яго існавання [301, с. 159]. Зафіксавана яшчэ шмат прыкмет, сутнасць і ступень праўдзівасці якіх цяжка вызначыць з вялікай доляй дакладнасці: «Калі зімою часта бывае галалёд, то будзе вялікі ўраджай»; «Калі зімою на ельніку вялікая навісь, то будзе вялікі ўраджай, але і паморак на людзей і жывёлу»; «Калі першымі з'явяцца белыя матылі, то будзе малочны год, а калі жоўтыя, то мядовы»; «Калі ў дуба на лісту шмат яблычак, то пчолы наносяць шмат мёду» [158, с. 98; 251, с. 40, 56, 57; 322, с. 111; 350, s. 434; 354, s. 148].

Аднак на ўраджай уплывалі многія з'явы, сутнасць якіх людзі не маглі растлумачыць. Таму з'яўляліся цалкам памылковыя прыкметы: «Як загрыміць першы гром у жыце – ураджайны год. Як там, дзе папар – голад» [27, л. 5]. Калі першы гром чулі з поўдня, то чакалі ўраджайны год, а калі з поўначы, то галодны [232, с. 288]. Лічылася, што поўдзень – гэта цяпло, ураджай, а поўнач – холад і голад [293, с. 100]. Ва Усходнім Палессі верылі, што калі першы гром загрыміць, калі на дрэвах ужо ёсць лістота, то будзе добры ўраджай [354, s. 148]. Калі першы гром адзначаўся «на голы лес», то чакаліся халодная вясна, дрэнны ўраджай і нават голад [26, л. 81; 27, л. 24–27; 28, л. 34; 29, л. 1, 81]. Для росту шматгадовых раслін асабліва спрыяльным лічылі высакосны год, і ў той жа час ён быццам бы быў вельмі дрэнным для росту аднагадовых раслін і жывёл [213, с. 111]. Вылучаючыся сваёй працягласцю, высакосны год ужо гэтым прыцягваў да сябе ўвагу, прымушаючы чакаць чаго-небудзь незвычайнага, найперш дрэннага.

Матэрыялы дадзенага раздзелу сведчаць аб тым, што беларускія сяляне разумелі залежнасць вынікаў сваёй дзейнасці ад характару надвор'я: зыходзячы з працяглых назіранняў за яго станам, за самымі нязначнымі зменамі ў акаляючай прыродзе, у жывёльным і раслінным свеце, яны даволі паспяхова прадказвалі колькасць і якасць будучага ўраджаю, вынікі іншых гаспадарчых заняткаў. На тэрыторыі Беларусі, ва ўмовах аб'ектыўнай складанасці



прагназавання надвор'я на працяглыя прамежкі часу, народныя прыкметы аб будучым ураджаі адрозніваюцца як шырынёй назіранняў, так і сінкрэтычным спалучэннем эмпірычных ведаў з рэлігійна-магічнымі ўяўленнямі і вераваннямі. У іх знайшлі сваё адлюстраванне прыродна-кліматычныя ўмовы розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Разам з тым, комплекс традыцыйных ведаў беларусаў аб спосабах прагназавання будучага ўраджаю вызначаецца не лакальнымі рысамі, а прынцыповай агульнасцю на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У другой палове XX – пачатку XXI ст. узмацняецца трансфармацыя гэтай часткі народных ведаў аб надвор'і: у іх структуры ўзрастае роля рацыянальных ведаў (з элементамі навуковага асэнсавання чалавекам узаемазалежнасцей у акаляючай прыродзе).

Такім чынам, народныя веды аб спосабах вызначэння надвор'я і прагназавання будучага ўраджаю з'яўляюцца завершанай, арганізаванай у часе і ў прасторы, сістэмай, што ахоплівае ўвесь прыродны комплекс. Дзякуючы пастаянным назіранням за самымі нязначнымі зменамі ў акаляючай прыродзе, беларускія сяляне прыкмецілі сувязі паміж рознымі яе з'явамі і вызначылі ў іх пэўныя заканамернасці. Большасць традыцыйных метэаралагічных прадказанняў заснавана на аб'ектыўнай прычынна-выніковай узаемазалежнасці прыродных з'яў. У той жа час назіранні беларусаў за прыродай не абмяжоўваліся простай канстатацыяй фактаў, людзі таксама спрабавалі паўплываць на акаляючы свет, таму ў некаторых прадказаннях надвор'я сувязь прычыны і следства парушаецца: імкнучыся растлумачыць незразумелыя і загадкавыя з'явы прыроды, яны грунтуюцца як на эмпірычных дадзеных, так і на рэлігійных вераваннях, фантастычных уяўленнях аб прыродзе, вобразна-сімвалічных асацыяцыях, якія своеасабліва спалучаюцца ў адзінае цэлае. Гэты комплекс традыцыйных ведаў аб надвор'і быў адзіным, яго прынцыповыя элементы не адрозніваліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Істотныя рэгіянальныя адрозненні выяўляюцца толькі ў каляндарных метэаралагічных прыкметах, што звязана з прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. З усяго комплексу традыцыйных ведаў аб надвор'і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. найбольшае распаўсюджанне і прымяненне знаходзяць народныя веды аб спосабах яго вызначэння на кароткія прамежкі часу, заснаваныя на мясцовых прыкметах надвор'я, на назіраннях за



Репозиторий БГАТУ

прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага свету, а таксама доўгатэрміновыя каляндарныя метэаралагічныя прыкметы.

Асаблівай увагі патрабуюць прыкметы, што ўзніклі ў выніку працяглых назіранняў за раслінным і жывёльным светам. Значная частка ўсіх метэаралагічных прагнозаў грунтуецца на асаблівасцях вегетацыі раслін. Гэта, перш за ўсё, шырока распаўсюджаныя расліны, што пастаянна знаходзяцца ў сферы жыццядзейнасці чалавека. Сярод іх пераважаюць шматгадовыя расліны, галоўным чынам дрэвы (асіна, бяроза, вольха, вяз, вярба, граб, дуб, елка, каліна, клён, крушына, ліпа, рабіна, сасна, чаромха, ясень), якія вымушаны прыстасоўвацца да сезонных зменаў надвор'я. Дадзеныя этнаграфічнай літаратуры XIX – першай паловы XX ст., палявыя матэрыялы, сабраныя аўтарам, якія датычацца да другой паловы XX – пачатку XXI ст., сведчаць аб тым, што аб'ектам увагі сялян былі як хатнія (карова, курыца, певень, кошка, сабака), так і дзікія жывёлы, птушкі, насякомыя, рыбы. Прагнозы надвор'я будаваліся на падставе назіранняў за паводзінамі птушак: ластаўкі, бусла, цецерука, чаплі, зязюлі, дзікай качкі, жараванка, салаўя, жорава, куліка, перапёлкі, сініцы, сарокі, вароны, галкі, вераб'я, грака. Для прадказання атмасферных зменаў сачылі за рознымі насякомымі (пчоламі, камарамі, мухамі, павукамі, мурашкамі, жукамі), прыслухоўваліся да квакання жаб, звярталі ўвагу, як ловіцца рыба (акуні, вугры, ляшчы, ліні, плоткі, самы, шчупакі, язі), як паводзяць сябе змеі, вужы, дажджавыя чэрві, краты, мышы, вожыкі, зайцы, вавёркі, ваўкі, дзікія кабаны, ласі. Як бачым, традыцыйныя веды беларусаў аб надвор'і ў XIX ст. – пачатку XXI ст. маюць зоны перакрыжавання з ведамі аб раслінным і жывёльным свеце, што дазваляе вызначаць народныя экалагічныя веды як цэласную сістэму, у якой складана ўзаемазвязаны ўсе яе элементы. Выяўленыя эмпірычным шляхам заканамерныя сувязі расліннага і жывёльнага свету з умовамі надвор'я маюць і практычную карысць, асабліва ў сельскай гаспадарцы, дзе вынікі працы больш за ўсё залежаць ад надвор'я.



## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Аснову традыцыйных экалагічных ведаў беларусаў XIX – пачатку XXI ст. складаюць у рознай ступені сістэматызаваныя вынікі назіранняў за з'явамі акаляючай прыроды, якія ажыццяўляліся з дапамогай метадаў, што даступны прадстаўнікам традыцыйнай культуры, не валодаючым спецыяльным навуковым інструментарыем. Асаблівасці бачання свету такімі назіральнікамі, з аднаго боку, і складанасць назіраемых працэсаў – з другога, адлюстраваліся на ўсім масіве традыцыйных ведаў беларусаў аб прыродзе, абумовіўшы іх сінкрэтычнасць: складанае перапляценне назіранняў за пэўнымі з'явамі і своеасаблівая інтэрпрэтацыя гэтых назіранняў. Народныя экалагічныя веды беларусаў характарызуюцца адзінствам трох кампанентаў: уяўленняў аб уласцівасцях навакольнага свету, навыкаў і непасрэдна дзеянняў. Два апошнія кампаненты ствараюць практычную інструментальную аснову народных ведаў аб прыродзе. Светапоглядныя ўяўленні складаюць адносна самастойную тэарэтычную структурную адзінку народных экалагічных ведаў, якая таксама ўваходзіць у сістэму міфалагічна-рэлігійных поглядаў беларусаў і актыўна праяўляецца ў працэсе культурнай трансмісіі. Гістарычнае развіццё практыкі памнажала элементы рацыянальнага ў светапоглядзе селяніна, аднак нельга забываць аб тым, што ён бачыў свет і ўсе назіраемыя ў ім з'явы такімі, якімі яны ўяўляліся яго пачуццёваму ўспрыманню. Крыніцы, існасць, унутраныя заканамернасці многіх з'яў прыроды заставаліся непазнанымі, а вынікі эмпірычных назіранняў у шэрагу выпадкаў пакрываліся містычнай абалонкай. З гэтай прычыны рацыянальныя веды нярэдка спалучаліся са шматлікімі вераваннямі, магічнымі, анімістычнымі ўяўленнямі, і яны існавалі як адзінае цэлае: элементы рацыянальных і нерацыянальных ведаў адносіліся да адных і тых жа аб'ектаў ці з'яў, акрамя таго, элементы рацыянальных ведаў уключаліся ў паданні і міфы.

Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX ст. – пачатку XXI ст. уяўляюць сабой развітую сістэму, якая характарызуецца ўсебаковасцю, комплекснасцю, завершанасцю; узровень гэтых ведаў адпавядае традыцыйнаму тыпу вядзення гаспадарчай дзейнасці, сацыяльнаму і культурнаму ўзроўню развіцця грамадства. Сфера экалагічных ведаў не з'яўляецца адасобленай і замкнёнай і часткова накладаецца на сумежныя з ёй сферы,



Репозиторий БГАТУ

уключаючы ў сабе структурныя кампаненты з іншых абласцей традыцыйных ведаў, якія знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі і цесным узаемадзеянні з прыродным асяроддзем. Даследаванне фактычнага этнаграфічнага матэрыялу не выявіла прынцыповых адрозненняў у традыцыйных экалагічных ведах на этнічнай тэрыторыі беларусаў. Па сваёй структуры, зместу, практычнай значнасці яны не саступаюць аналагічным сістэмам ведаў у народаў, што знаходзіліся ў аднолькавых з беларусамі прыродных умовах. Існуючыя адрозненні тлумачацца перш за ўсё асаблівасцямі прыродна-кліматычных умоў і ў меншай ступені – рэгіянальнай культурнай спецыфікай і этнічнымі запазычаннямі.

Навуковы аналіз сістэмы народных экалагічных ведаў дазваляе глыбей зразумець асаблівасці як пазнавальнага працэсу (суадносіны ў ім рацыянальна-лагічнага і вобразна-сімвалічнага пачаткаў), так і практычнай адаптыўнай дзейнасці ў традыцыйнай культуры беларусаў XIX – пачатку XXI ст. Шматгадовыя назіранні дапамаглі беларусам назапасіць веды аб вегетатыўных перыядах прарастання, цвіцення і выспявання сельскагаспадарчых культур, аб уласцівасцях многіх відаў дзікарослых раслін і дрэваў, аб паводзінах прадстаўнікоў жывёльнага свету, іх рэакцыях на змены ўмоў надвор’я. Гэтыя веды перш за ўсё вызначалі эфектыўнае функцыянаванне сельскай гаспадаркі: у земляробстве на іх падставе ажыццяўляліся адбор і культывіраванне адпавядаючых прыродна-кліматычным умовам раслін, грунтаваліся рацыянальныя агратэхнічныя прыёмы, аптымальныя тэрміны правядзення ўсіх неабходных палявых работ; народныя веды ў галіне жывёлагадоўлі ўключаюць у сябе рацыянальныя заатэхнічныя прыёмы і ветэрынарныя сродкі. Экалагічныя веды таксама шырока выкарыстоўваліся ў іншых сферах гаспадарчай дзейнасці і штодзённага жыцця: пры вызначэнні надвор’я як на кароткія, так і на больш працяглыя прамежкі часу, у прадказаннях колькасці і якасці будучага ўраджаю, пры нарыхтоўцы лясных рэсурсаў, у народнай медыцыне.

Нягледзячы на тое, што прыродна-кліматычныя ўмовы, лад жыцця і спосабы правядзення палявых работ кардынальным чынам змяніліся, асабліва на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст., рацыянальныя традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў можна выкарыстоўваць і ў сучаснай сельскагаспадарчай вытворчасці, у фермерскіх і прыватных падсобных гаспадарках, бо ўвабраныя ў іх вынікі шматгадовых назіранняў за з’явамі навакольнага свету, за



працэсамі і вынікамі чалавечай дзейнасці ў пэўным экалагічным асяроддзі правільна суадносяцца з сістэмай узаемасувязей і ўзаемазалежнасцей у акаляючай прыродзе. Вялікае прыкладное значэнне для сельскай гаспадаркі маюць уяўленні беларусаў аб пэўных рытмах, цыклічнасці ў прыродзе, аб узаемаабумоўленасці шматлікіх прыродных з’яў, якія вызначаюць спрыяльныя ці няспрыяльныя ўмовы для развіцця культурных раслін.

Прыродны свет займаў важнае месца і ў светапоглядных уяўленнях і традыцыйнай сістэме каштоўнасцей беларускага этнасу, што сведчыла пра ўсведамленне ім гарманічнасці светабудовы і месца чалавека ў Сусвеце. Традыцыйныя экалагічныя веды выступалі ў якасці аднаго са сродкаў культурнай (пазабіялагічнай) адаптацыі беларускага этнасу да асяроддзя свайго існавання, а таму на іх развіццё аказалі вялікі ўплыў прыродныя ўмовы тэрыторыі Беларусі (вялікая колькасць лясоў, значная забалочанасць тэрыторыі, а таксама малая ўрадлівасць глеб). Беларусы прыстасоўваліся да гэтых умоў, выкарыстоўваючы і ўдасканальваючы традыцыйныя экалагічныя веды, на падставе якіх была створана арыгінальная сістэма жыццезабеспячэння. Беларускім этнасам, які доўгі час пражываў на адной і той жа тэрыторыі, быў назапашаны значны станоўчы вопыт прыродакарыстання. Разнастайныя спосабы эксплуатацыі прыроды давалі магчымасць канчаткова не знішчаць той ці іншы від рэсурсаў, а размяркоўваць нагрузку на прыроду больш ці менш раўнамерна паміж рознымі відамі яе багаццяў шляхам вядзення комплекснай гаспадаркі, у першую чаргу земляробства. Гэтыя спосабы выпрацоўваліся і апрабіраваліся на працягу многіх стагоддзяў, таму беларускі этнас здолеў найбольш аптымальна адаптавацца да навакольнага асяроддзя і, захоўваючы традыцыі прыродакарыстання, не парушаў прыроднай раўнавагі.

Традыцыйныя веды беларусаў аб мясцовай флоры і фаўне, якія зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, маюць ярка акрэслены экафільны характар: у іх адсутнічае абгрунтаванне драпежніцкіх адносінаў да расліннага і жывёльнага свету, выяўляюцца павага да прыроды, яе прыгажосці, імкненне захоўваць і рацыянальна выкарыстоўваць прыродныя багацці. Блізкасць беларускіх сялян да прыроды, яе абагаўленне, прынцыпы роднасці, якія распаўсюджваліся на знешні свет, нараджалі ўпэўненасць, што лёс чалавека і грамадства ў цэлым шмат у чым залежыць ад станоўчых ці адмоўных адносінаў да яго духаў



Репозиторий БГАТУ

прыроды. Таму існавалі дакладна распрацаваныя, жорстка рэгламентаваныя і кантралюемыя нормы зносінаў з акаляючай прыродай, да парушальнікаў якіх прымяняліся самыя жорсткія меры ўздзеяння. Найбольш масавае ўжыванне традыцыйных формаў узаемаадносінаў з жывой прыродай прыйшлося на XIX ст. – першую палову XX ст. На працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. сфера іх распаўсюджання і функцыянавання паступова абмежавалася вузкімі сацыяльна-дэмаграфічнымі рамкамі (дэмаграфічная група вясковых жыхароў, старэйшых за 60 гадоў). Іх меркаванні аб рацыянальным выкарыстанні рэсурсаў расліннага і жывёльнага свету часцей за ўсё пасіўна ўлічваюцца ці не ўлічваюцца наогул іншымі сацыяльнымі і дэмаграфічнымі групамі.

Экалагічная значнасць традыцыйных ведаў беларусаў аб прыродзе заключаецца ў тым, што яны валодаюць бясспрэчным выхаваўчым патэнцыялам, асабліва на сучасным этапе, калі ігнараванне і парушэнне выпрацаваных на працягу стагоддзяў асноўных законаў прыродакарыстання прывяло да глабальных экалагічных праблем на планеце Зямля. Актуалізацыя ў масавай свядомасці традыцыйных формаў узаемаадносінаў з навакольным асяроддзем садзейнічае адмове ад глыбока ўкаранелых установак на панаванне грамадства над прыродай і неабмежаванае выкарыстанне яе рэсурсаў, асэнсаванню таго факта, што жорсткае супрацьстаянне чалавека і прыроды здольна згубіць усю планету; спрыяе ўсталяванню гармоніі з прыродай, станаўленню агульнай экалагічнай культуры асобы, фарміраванню экалагічна дасведчанага спецыяліста, адказнага за магчымыя наступствы сваёй прафесійнай дзейнасці.



## ЛІТАРАТУРА

1. Аверкиева Ю. П. История теоретической мысли в американской этнографии. – М. : Наука, 1979.

2. Агапкина Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. – М. : Индрик, 2002.

3. Агринский К. Ф. Значение народных примет о погоде для практической метеорологии и сельского хозяйства // Сельский хозяин. – 1896. – № 11.

4. Азим-заде Э. Г. Из славянской народной метеорологии // Balcano–Balto–Slavica. Симпозиум по структуре текста. Предварительные материалы и тезисы / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; редкол.: В. В. Иванов, Т. В. Цивьян. – М., 1979.

5. Азимов Э.Г. Из полесской народной метеорологии. Слепой дождь // Полесский этнолингвистический сборник ; под ред. Н. И. Толстого. – М., 1983.

6. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 1. – Спр. 18. Бабруйская этнаграфічная экспедыцыя 1949 г. Запісы М. Я. Грынблата.

7. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 2. – Спр. 2. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1950 г. Запісы Л. А. Малчанавай.

8. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 2. – Спр. 18–20. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1950 г. Запісы М. Я. Грынблата.

9. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 2. – Спр. 25. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1951 г. Запісы Л. А. Малчанавай.

10. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 2. – Спр. 35, 37. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1951 г. Запісы М. Я. Грынблата.

11. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 2. – Спр. 44. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1952 г. Запісы Л. А. Малчанавай.

12. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 16. Палеская этнаграфічная экспедыцыя 1953 г. Запісы М. Я. Грынблата.

13. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 19–22, 31–35. Гродзенска-Полацкая этнаграфічная экспедыцыя 1954 г. Запісы Л. А. Малчанавай.

14. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 36–44, 49–54, 54а, 57. Гродзенска-Полацкая этнаграфічная экспедыцыя 1954 г. Запісы М. Я. Грынблата.



Репозиторий БГАТУ

15. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 59–61, 63, 65–67. Віцебска-Магілёўская этнаграфічная экспедыцыя 1955 г. Запісы М. Я. Грынблата.
16. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 68, 70–74, 80. Віцебска-Магілёўская этнаграфічная экспедыцыя 1955 г. Запісы Л. А. Малчанавай.
17. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 105–106, 109, 115. Віцебска-Магілёўская этнаграфічная экспедыцыя 1955 г. Запісы В. Ф. Бяркова.
18. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 136. Мінска-Гомельская этнаграфічная экспедыцыя 1956 г. Запісы Л. А. Малчанавай.
19. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 169–181. Мінска-Гомельская этнаграфічная экспедыцыя 1956 г. Запісы М. Я. Грынблата.
20. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 3. – Спр. 182. Мінска-Гомельская этнаграфічная экспедыцыя 1956 г. Запісы Л. І. Мінько.
21. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 6. – Спр. 4. Этнаграфічная экспедыцыя 1961 г. (Гомельская вобласць).
22. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 6. – Спр. 6. Этнаграфічная экспедыцыя 1961 г. (Віцебская вобласць).
23. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 6. – Спр. 31, 31а, 31б, 31в, 32–33. Этнаграфічная экспедыцыя 1960 г. (Мінская вобласць).
24. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 11. – Спр. 1. Гомельская этнаграфічная экспедыцыя 1965 г. Запісы Л. І. Мінько.
25. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 12. – Спр. 24. Этнаграфічная экспедыцыя 1976 г. (Мінская вобласць). Запісы Л. І. Мінько.
26. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 12. – Спр. 25. Магілёўская этнаграфічная экспедыцыя 1976 г. Запісы Л. І. Мінько.
27. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 14. – Спр. 102. Матэрыялы па традыцыйных экалагічных ведах беларусаў, сабраныя К. А. Шумскім. 2002–2003 гг.
28. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 14. – Спр. 134. Матэрыялы па традыцыйных экалагічных ведах беларусаў, сабраныя К. А. Шумскім. 2004 г.
29. АІМЭФ. – Фонд 6. – Воп. 14. – Спр. 135. Матэрыялы па традыцыйных экалагічных ведах беларусаў, сабраныя К. А. Шумскім. 2005–2006 гг.



30. Алексеев В. П. Антропогеоценозы – сущность, типология, динамика // Природа. – 1975. – № 7.
31. Алексеев В. П. Становление человечества – М. : Политиздат, 1984.
32. Аникиевич К. Т. Сенненский уезд Могилевской губернии. – Могилев : Могилев. губ. стат. ком., 1907.
33. Анимелле Н. А. Быт белорусских крестьян // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. 2.
34. Анисимов А. Ф. Исторические особенности первобытного мышления. Л. : Наука, 1971.
35. Анічэнка У. В. Народныя прыкметы. – Мінск : БелЭн, 1992.
36. Антропаў М. П. Народная метэаралогія // Беларускі фальклор: энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2.
37. Артановский С. Н. Историческое единство человечества и взаимное влияние культур. – Л. : Просвещение, 1967.
38. Арутюнов С. А. Адаптивное значение культурного полиморфизма // Этнографическое обозрение. – 1993. – № 4.
39. Арутюнов С. А. Народы и культуры: развитие и взаимодействие. – М. : Наука, 1989.
40. Астапенко П. Д. Вопросы о погоде. – Л. : Гидрометеоиздат, 1982.
41. Астапенко, П. Д. Некоторые вопросы биометеорологии. О влиянии условий погоды на человека и животных. – Л. : Гидрометеоиздат, 1966.
42. Афанасьев А. Н. Происхождение мифа: статьи по фольклору, этнографии и мифологии. – М. : Индрик, 1996.
43. Афнагель І. Я. Мясцовыя прыкметы надвор'я // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984. – Т. 3.
44. Байбурин А. К. Жилище в обрядах и представлениях восточных славян. – Л. : Наука, 1983.
45. Балашев Л. А. Народная метеорология // Наука и жизнь. – 1975. – № 9.
46. Баршчэўскі У. Ф. З гісторыі фальлёктэнізму // Інстытут беларускай культуры. Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Працы катэдры этнографіі. – 1928. – Т. 1. – Сш. 1.
47. Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / С. І. Санько [і інш.] ; пад рэд. С. І. Санько. – Мінск : Беларусь, 2004.



Репозиторий БГАТУ

48. Беларуская фалькларыстыка: збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Г. А. Пятроўская [і інш.] ; пад агульн. рэд. Г. А. Пятроўскай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989.
49. Беларускі фальклор: энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005–2006. – Т. 1 : А капэла – Куцця / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 2005.
50. Беларускі фальклор: энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005–2006. – Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур» / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 2006.
51. Беларускія народныя казкі: зборнік / Склад.: Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986.
52. Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад-к У. А. Васілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–1999. – Кн. 1 : Зямля стаіць пасярод свету / У. А. Васілевіч. – 1996.
53. Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад-к У. А. Васілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–1999. – Кн. 2 : Жыцця адвечны лад / У. А. Васілевіч. – 1998.
54. Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад-к У. А. Васілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–1999. – Кн. 3 : Зямная дарога ў вырай / У. А. Васілевіч. – 1999.
55. Беларусы : у 8 т. / рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 1995–2007. – Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык. – 1999.
56. Белик А. А. Культурология: антропологические теории культур. – М. : Изд. центр РГГУ, 2000.
57. Белик А. А. Психологическая антропология: история и теория. – М. : Б. и, 1993.
58. Белорусы / В. Н. Белявина [и др.] ; под ред. В. К. Бондарчика, Р. А. Григорьевой, М. Ф. Пилипенко. – М. : Наука, 1998.
59. Берман И. А. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда // Записки Император. рус. географ. об-ва. – 1873. – Т. V.
60. Берман И. А. Порядок народного времяисчисления и праздничные обычаи в Северо-Западной Руси. – Вильна : Тип. губ. управления, 1869.



61. Бессонов П. А. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. – М. : Б. и, 1871.
62. Боас Ф. Ум первобытного человека. – М. : Госиздат, 1926.
63. Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этнографический очерк. – Гродно : Губерн. тип, 1895.
64. Болбас В. С. Этычная педагогіка беларусаў. – Мінск : Беларуская навука, 2004.
65. Борейко В. Е. Лесной фольклор. Древа жизни и священные рощи. – К. : Киевский эколого-культурный центр, 2003.
66. Борейко В. Е. Экологические традиции, поверья, религиозные воззрения славянских и других народов. – 3-е изд. – К. : Киевский эколого-культурный центр, 2003.
67. Борейко В. Е. Экологические традиции, поверья, религиозные воззрения славянских и других народов: птицы. – 3-е изд. – К. : Киевский эколого-культурный центр, 2004.
68. Браім І. М. Рыбалоўства ў Беларусі: гісторыка-этнаграфічны нарыс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976.
69. Брен Я. И. Особенности религиозного быта крестьян Бельского уезда Гродненской губернии. – Вильно : Тип. губ. правления, 1887.
70. Булгаковский Д. Г. Пинчуки: этнографический сборник. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь // Записки Император. рус. географ. об-ва. – 1890. – Т. 12. – Вып. 3.
71. Бурцев В. И. Несколько слов о народных средствах // Белорусская ветеринария. – 1927. – № 1–2.
72. Бывалькевич А. А. Иван Купала (в д. Углах Слуцкого уезда Минской губернии) // Этнографическое обозрение. – 1891. – № 4.
73. Вайсберг Дж. Погода на Земле: метеорология. – Л. : Гидрометеоиздат, 1980.
74. Валенцова М. М. Астрономия. Метеорология. Время // Восточнославянский этнолингвистический сборник. Исследования и материалы / О. В. Белова [и др.] ; под ред. А. А. Плотниковой. – М., 2001.
75. Валодзіна Т. В. Прыкметы і павер'і // Беларусы: вусная паэтычная творчасць / Г. А. Барташэвіч [і інш.] ; рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш. – Мінск, 2004.



Репозиторий БГАТУ

76. Валодзіна Т. В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. – Мінск : Тэхналогія, 1999.
77. Васілевіч У. А. Беларускі народны каляндар. – Мінск : Ураджай, 1993.
78. Васілевіч У. А. Народная метэаралогія // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 1989.
79. Васілевіч У. А. Народная метэаралогія // Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск, 2002.
80. Васілевіч У. А. Прыкметы і павер'і // Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / пад рэд. К. П. Кабашнікава, А. С. Ліса, А. С. Фядосіка. – Мінск, 2000.
81. Вежбицкая А. Язык. Культура. Познание. – М. : Русское слово, 1996.
82. Величковский Б. М. Современная когнитивная психология. – М. : Изд-во МГУ, 1982.
83. Вернадский В. И. Размышления натуралиста. Научная мысль как планетное явление. – М. : Наука, 1977.
84. Власов В. Г. Русский народный календарь // Советская этнография. – 1985. – № 4.
85. Войнич А. Одна ласточка весны не делает… Как животные и растения реагируют на изменение погоды. – М. : Мир, 1985.
86. Воробьев В. И. Синоптическая метеорология. – Л. : Гидрометеоиздат, 1991.
87. Вуглік І. Р. Міфалогія беларусаў : навуч.-метад. дапаможнік. – Мінск, 2005.
88. Гаммерман А. Ф. Растения-целители. – М. : Наука, 1963.
89. Гельмольд. Славянская хроника. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1963.
90. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. / рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1997–2002. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанка [і інш.]. – 1997.
91. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. / рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1997–2002. – Т. 2 : Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.]. – 2002.



92. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мінск : Тэхналогія, 1995.
93. Государственная программа возрождения и развития села на 2005 – 2010 годы. – Минск : Беларусь, 2005.
94. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.] ; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
95. Гринченко Б. Д. Этнографические материалы, собранные в Черниговской и соседних с ней губерниях. – Чернигов : Тип. губернского земства, 1895.
96. Громов Г. Г. Методика этнографических экспедиций. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1966.
97. Грынблат М. Я. Матэрыялы да вывучэння пастушаства і жывёлагадоўлі Тураўшчыны // Наш край. – 1928. – № 8–9.
98. Гуленко М. А. Среди болот и лесов. Краткий рассказ о Белоруссии и белорусах. – М. : Тип. т-ва И.Д. Сытина, 1898.
99. Гура А. В. Символика животных в славянской народной традиции. – М. : Индрик, 1997.
100. Демидович П. П. Из области верований и сказаний белорусов // Этнографическое обозрение. – 1896. – № 2–3.
101. Дзень за днём: прыкметы надвор'я, а таксама народны каляндар–месяцаслоў / Склад.: А. А. Русецкі. – Мінск : Юнацтва, 2000.
102. Дмитриев М. А Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. – Вильня : Печатня Сыркина, 1869.
103. Добровольский В. Н. Нечистая сила в народных верованиях // Живая старина. – 1908. – Вып. 1.
104. Добровольский В. Н. Смоленский областной словарь. – Смоленск : Тип. П. А. Силина, 1914.
105. Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник : в 4 ч. – СПб. : Тип. Е. Евдокимова, 1891–1903. – Ч. 1. – 1891.
106. Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник : в 4 ч. – СПб. : Тип. Е. Евдокимова, 1891–1903. – Ч. 2. – 1893.
107. Добровольский В. Н. Суеверия относительно волков // Этнографическое обозрение. – 1901. – № 4.



Репозиторий БГАТУ

Калі поезд харашо чутны – нягода.

Варона крычыць – к ветру (у які бок крычыць – адтуль вецер).

Як галкі сядаюць у адзін бок, то адтуль вецер.

Ластаўкі высока лятаюць –пагода.

Калі на Крашчэнне снег – то будзе добры ўраджай.

Як свінні ссоваюць посціл – то мяцеліца.

Луна. Рожкі ўніз – нягода. Рожкі ўверх – цяпло (асобенна як у цёплы бок луна стаіць – на поўдні).

Многа камароў – на дождж.

Каровы уцікают з лесу – на дождж.

Слепні сільна кусают – на дождж.

Коровы «газуют» от оводов – на дождж.

Если в мае не выпадет дождь, урожая не будет.

Май халодны – год пладародны.

Як загрэміць і няма нічога (травы, зелені) – голад.

Зіма снежная (у снежні), то лета мокрае (такое і лета).

Лето жаркае – зіма халодная.

Больш апрадзялялі лета па зіме. Якая пагода на Раждзяство, такая і будзе летам.

Як пчолы выйдуць да Благавешчання, то после Благавешчання будзе холадна.

Да Міколы не сей грэчкі і не стрыжы авечкі ніколі.

Казаў авёс так: ты мяне сей у гразь, то будзеш князь.

Жито сей пораньше – до Успенья.

Жыта кажа: кінь мяне ў залу, але ў пару.

**Ступакова Праскофья Мікалаеўна, 1916 г. н.; в. Леўкі, Аршанскі р-н, Віцебская вобл. 22 ліпеня 2003 г.**

Хадзілі на Купалле на сваё поле, простыней абкрываліся, цягалі вяроўкі ці вобраці, каб каровы давалі больш малака.



Репозиторий БГАТУ

Калі сеялі, то ў палаценца ўвяжуць тое, што даюць на Пасху (проскурку) і з гэтай проскуркай сеюць.

Калі гаспадар садзіў картошку, то нічога не давалі са свайго двара – «уражай ён забіраець».

Але як зародзіць ці не зародзіць, то нічога не паможа. У мяне вымерзла жыта, так нічога не памагло.

Раней сеялі ў той дзень, на каторы іней быў большы – то ўраджай будзе харошы.

У нас калі скаціну першы раз выганялі, то клалі замок у варотах. Выганялі скаціну вярбою. Першы раз на сваё жыта.

Як марозы будуць, то змарозіць жыта.

Сонца заходзіць у хмару – то хмарнае надвор'е.

Сонца заходзіць ясна зімою, то будзе мароз.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж.

**Грак Хрысціна Міхайлаўна, 1919 г. н.; в. Загор'е, Лепельскі р-н, Віцебская вобл. 23 ліпеня 2003 г.**

На Крашчэнне гадалі. Сена лажылі на стол і цягалі былінкі (чый лепшы лён будзе).

Хазяін бярэ ўсякага насення патроху і ставіць на куце, а потым сее яго, а хлопцы расстаўляюць рубашкі і сабіраюць (у каго больш). У гэты дзень хазяін свяціў хлеў. На Крашчэнне свяцілі ваду на рацэ. Гэтую ваду давалі патрошку скаціне і свенцілі будынкі.

Каб лепш узрасціць капусту, то клалі шалупінне ад свянцонага яйца і камень (камянёк) у анучцы (белая анучка) і клалі радам з капустай. Як садзілі бульбу ці сеялі лён, то нічога не рабілі.

Калі сонца ў хмару – дождж.

Калі карова красная ўперадзе ідзе з поля, то быць дажджу.

У нас адзін год чэрві напалі, тады хадзілі па палях з іконай. Лён, бульба звальваліся, а калі бацюшка прайшоў з іконай, то чэрві зніклі. Пырскаў вадою на той бок і на той (цераз дарогу).

**Кордава Агафья Андрэеўна, 1926 г. н.; в. Багданава, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. 29 ліпеня 2003 г.**

Калі садзілі капусту, то клалі камень, каб качаны былі крэпкія, і крапіву – каб чэрві не заходзілі.

Калі саджалі капусту, то расаду каля галавы круцілі, каб капуста была такая. Яшчэ палілі лапці і вуглі лажылі, дзе капуста, каб чэрві капусту не елі.



Калі растуць агуркі, то калі пустацвет, то мужчына павінен быў абегчы тры разы грады без штаноў.

Кот хаваецца ў цёплае месца – то на мароз. А будзе мароз, а кот вылезе і ляжа на пол, то скора пацяплее.

Коні таксама вельмі разумныя. Мой бацька прадаў каня цыгану, то праз многа гадоў ехаў, то конь заржаў.

**Баран Ленгіна Мікалаеўна, 1920 г. н., Баран Браніслаў Антонавіч, 1913 г. н.; в. Слабодка, Браслаўскі р-н, Віцебская вобл. 2 жніўня 2003 г.**

На Грамніцы павінны бык ці курыца напіцца. «Хлеба палавіна, а пожуру (корму) трацiна». Усе старыкі прагаварвалі так.

Звеставанне – 25 сакавіка. Не рабілі. І птушка гнязда не ўе. Даўней не часаліся нават дзеўкі. Дзеўка касы не пляце, а птушка гнязда не ўе. Не шчупалі курыцы. Як пашчупае яе на звеставанне (курыцу), то цыплёнак будзе калека.

Сёмуха. Прыносілі бярозкі ў хату, пад хату. З бярозкі вешалі вянкі каровам на рогі. Увечары каровы ідуць з вянкамі. Пастухам даюць за гэта сыр, яйкі, грошы.

Як аблокі вялікія – то добрая бульба, як умяншаецца месяц – то ў карэнне пойдзе.

Памідоры, агуркі трэба сеяць да паўнаты. Я прызнаў з бульбай – праўдзіць. Як людзі сеялі, і я сеяў. Мужыкі-старыкі ой глядзелі на пару. Гляне на звёзды: сей тое і тое.

Як капусту саджалі да Іллі за сем нядзель – то добрая будзе.

Як на куццю няма буры, то на Яна не будзе.

Мокрая восень – бо на Спаса дождж.

**Падгайскі Станіслаў Адамавіч, 1918 г. н.; Падгайская Ядвіга Станіславаўна, 1921 г. н.; в. Слабодка, Браслаўскі р-н, Віцебская вобл. 4 жніўня 2003 г.**

Лета па зіме. Калі зімой снег, то летам дождж. Як мароз – то пагода.

Ласточкі нізка – на дождж.

Камары кусаюцца – на дождж.

Як цёпла летам будзе, то рыба гуляе, як халодна, то не баўтанецца.

Муравейнік высокі – мокрае лета і восень.

Крот, як не ўмёрзшая зямля, то паточваюць многа, а як на мароз, то так не точаць.



Репозиторий БГАТУ

Як сонца ясна-ясна, то мароз.

Калі кот лезе ў печ – то на мароз. На вотцепель – вон ідзець. У хату не ціснецца так.

Сала як на пагоду – то сухое, як на дождж – то мокрае.

Дым: еслі сцелецца, то на дождж, калі ўверх – то на пагоду. Соль адсыравае на сырую пагоду.

Як пагода – то вылятаюць пчолы.

Калі мышы высока робяць гнёзды, то восень мокрая.

Вадзяныя крысы робяць гнёзды на аеры – даждлівая восень.

Вішня не расцветаець на непагоду, як сонца, то расцветаець.

Як дождж, то півоня закрываецца.

Воблакі. Як чырвоныя воблакі – то на вецер, на мароз.

Месяц рожкамі ўгору – пагода. Месяц рожкамі ўніз – нягода.

Як у хмару сонца заходзіць, то назаўтра дождж.

Як вялікае сонца – то на пагоду.

Вясёлка – на дождж. Яна набірае ваду.

Кругі каля Месяца – можа, на пагоду.

Як зімой мігаюць зоркі – на мароз. Як ярка свецяць – на пагоду. Тусклыя звёзды – на сырую пагоду.

**Касяк Стэфаніда Іванаўна, 1921 г. н., Касяк Любоў Мікалаеўна, 1939 г. н.; в. Іжа, Вілейскі р-н, Мінская вобл. 18 жніўня 2003 г.**

На Каляды па звёздам гадалі, ці цяляты будуць. Як хмарна, то не будуць добрыя цяляты.

На Каляды, каб скаціна добра гадавалася, возьмеш гароху ці бобу і як сыпнеш гарохам ці бобам на скаціну.

Як ластаўкі нізка лятаюць – дождж.

Гусі галовы пахаваюць – на холад.

Камары мак таўкуць – к цяплу.

Калі чырвонае неба і воблакі – на мароз.

Калі сонца заходзіць у хмару – дождж.

Як няма расы – на дождж.

Як авадні нападаюць моцна на скаціну – на дождж.

Першы снег – гэта яшчэ зазімак, а зіма пазней.

Калі пад Новы і на Новы год – дождж, то на Пятра і на Пятроўку –непагадзь, дождж. Зіма марозная – лета сухое.

На куццю многа звёздаў – то многа цялят.

Як першы гром на голае дрэва – дрэнны ўраджай, як на зялёнае – то добры ўраджай.



**Каленик Ольга Нестеровна, 1912 г. р.; д. Дмитровичи, Каменецкий р-н, Брестская обл. 28 августа 2003 г.**

Солнышко за хмары – дождь.

Сорока сокоча – на дождь.

Солнце як бы вялое – на дождж.

Як на сале роса – то на дождж.

Як карова нясе ў зубах пашу – на дождж.

Калі хмара перасякае солнца перед захадам – на дождж.

Буйная раса – пагода. Нет расы – на дождж.

Если пойдет мелкий дождь и куры сидят на цепке, то дождж будет затяжной.

Ласточки летают низко, вороны сильно каркают – перед дождем.

Зеленая лягушка квакает на дереве – дождж.

Если подходишь к колодцу, а там вьется очень много комаров, то на дождж.

Комары мак талкуць – на пагоду.

Перед дажджом пчелы не летят далеко. Перед близким дождем они совсем не вылетают.

Утка несла яичко на поле, а не на болоте. Она предчувствовала мокрый год.

Когда гремит на голый лес – голое дерево – то голодный год. Когда есть уже листок – кукушке глаз закрыть, и гром, то будет хороший урожайный год.

Снегу много – хлеба много.

Когда на второй день пасхи дожди – то будет доброе лето.

Борис запалит, а Ганна зальет. На Ганну постоянно дожди, а на Бориса – грозы.

Средство для привораживания. Убивают летучую мышь (а лучше живую), несут в муравейник и оставляют там (обязательно в новом горшке), только пробивают в нем дырочки. Муравьи объедят кожана, оставят только косточки. Косточки – вилочки и крючок забирают.

**Духноўская Роза Паўлаўна, 1928 г. н.; в. Сорагі, Слуцкі р-н, Мінская вобл. 14 жніўня 2004 г.**

З кожнай куцці здымалі пенку і блін, якім была накрыта куцця. Усё гэта разам з зёрнамі канаплі, грэчкі акраплялі крашчэнскай вадой і давалі каню, каровам, авечкам.



Репозиторий БГАТУ

Картошку стараліся садзіць, калі аблокі па небе ходзяць (бульба будзе вялікая).

Сеяць стараліся ў такі дзень, калі былі паводкі, ці ў які дзень быў іней больш на дрэвах (запісвалі дзень).

Нельга сеяць агуркі, калі сады цвітуць, будуць пустацветы.

Навоз трэба падсыпаць, каб зямля была цёплая.

Калі на масленіцу дарога будзе гладкая, то будзе добрае валакно ў льна.

Якая зіма – такое і лета. Па зіме і лета.

Калі колюць кабана, то глядзяць селязёнку. Калі селязёнка вялікая, то суровая зіма. Маленькая селязёнка – добрая зіма. Калі адна палавіна селязёнкі тоўстая, больш тоўстая, то палавіна зімы будзе суровая. Калі ж больш тоўстая ў сярэдзіне – то ў сярэдзіне зімы холад.

Камары восенню мак таўкуць – доўгая і цёплая восень.

Калі восенню крот рые зямлю, то восень цёплая і доўгая.

Калі Пакровы цёплыя, ціхія, то і восень доўгая, цёплая – да Новага года цяпло.

На Стрэчанне буран, то вясна дрэнная, вымяце ўвесь корм.

Калі на Пакровы ці на Стрэчанне дзень цёплы, то восень (а на Стрэчанне – вясна) цёплая.

Калі капусту ссякаюць, то лепш гэта рабіць на сходзе месяца (лепш захоўваецца). Тое ж самае, калі колюць кабана.

Перад дажджом мошкі дужа шпіляюць карову ці людзей.

Калі ластачкі нізка лятаюць над зямлёю – то на дождж.

Калі воран лятае нізка і каркае – то пахаладае.

Раса вялікая – на пагоду. Ластаўкі высока лятаюць на пагоду.

Калі першы снег выпадзе рана, то вясна мокрая.

Якая пагода ў першы дзень Каляд, то такая будзе і летам.

Замаўляюць ад укуса змяі. Калі ўкусіць змяя скаціну, то да ўсходу сонца трэба даць хлеба нагаворнага, то ўсё пройдзе.

Асабліва лёгка сурочыць усё маладое (дзіцёнка, цялёнка, парася, ягня).

Каб добрыя агуркі выраслі, то іх павінен садзіць мужчына без штаноў.

Бульбу садзіць лепш, калі воблачнае неба (воблакі вялікія на небе).

Каб лён быў доўгі, валакністы, то засяваць яго павінна дзяўчына з распусціўшыміся косамі.



**Дварэцкі Ілья Філіпавіч, 1920 г. н.; в. Грэск, Слуцкі р-н, Мінская вобл. 14 жніўня 2004 г.**

У час вячэрування на Каляду з сена зубамі выцягвалі сяніну – глядзелі, ці доўгі будзе лён.

Раніцай вып'юць трошкі крашчэнскай вады і акропяць скаціну (каласкамі жыта) святой вадой.

Калі певень на Стрэчанне нап'ецца вадзіцы, то вол на Юр'я наесца травіцы.

Калі ў дзень Стрэчання мяцеліца, то вымеце ўсё з засекаў.

Як цёпла на Стрэчанне, то і вясна будзе цёплая.

Як на Соракі мароз, то яшчэ сорак замаразкаў будзе.

Як першы раз выязджаў на поле, то браў хлеб, соль. Калі першы раз выходзіў сеяць жыта, то яго змешвалі з асвянцоным жытам. Верыў я гэтаму і не верыў.

Вярбою выганялі скаціну ў поле. У парозе (у нашай сям'і) нічога не клалі.

Сёмуха. Ставілі бярозкі насупраць парога, галінкі ў хаце і пад столлю, за вокнамі. Май (зелень) потым спальвалі.

Купалле. У дзвярах хлява лажылі крапіву.

Калі цёпла на Пакровы, то зіма цёплая.

**Шыла Ніна Андрэеўна, 1927 г. н.; в. Касцяшы, Любанскі р-н, Мінская вобл. 14 жніўня 2004 г.**

Соракі. Пяклі жаваранкі з цеста. Давалі па 2 авечкам, каб каціліся па двойні. Вочы рабілі з канапель, а крылля і дзюбачку – з цеста.

Калі сані кінеш да Благавешчання, то столькі ж будзеш ездзіць на санях і пасля Благавешчання.

Калі жаваранак да Благавешчання выляціць, то столькі ж дзён пасядзіць пасля Благавешчання.

Асвечаную вярбу выкарыстоўвалі, калі першы раз выганялі кароў у поле.

На Юр'я выганялі скаціну ў поле. Кожны да ўсходу сонца ўторкне вербачку, асвянцоную ў вербную нядзелю, на сваю палоску.

Кароўку на Юр'еўскую расу выганялі да ўсходу сонца, каб з юр'еўскай расою паскубла.

Да Ушэсця нельга было гарадзіць плот, бо дождж загародзіш – будзе засуха.



Репозиторий БГАТУ

Праз тры дні пасля Вялікадня можна было выходзіць рабіць на полі.

Верылі, што ведзьмы маглі адбіраць малако. Некаторыя баяліся выводзіць сваіх кароў у поле на Юр'я, на Купалле. Гэтаму я нічаму не веру. Чараўніцаю нярэдка называлі добрую гаспадыню, у якой было многа малака (якабы яна ў яго – гультая – адабрала малако). З-за гэтага былі сваркі.

У нас многія вераць у розныя прышаворы. Напрыклад, расказывалі, што быццам бы ў чысты чацвер прыходзіла чараўніца з даёнкай і цадзілкай, і ў яе гэтую цадзілку маглі ўбачыць.

Гаварылі, што адзін гаспадар прыбіваў падлогу на Раждзяство. Калі ж цялілася яго карова, то не маглі дастаць цяля (цягнулі вагою). А па-мойму, карову позна запусцілі, добра кармілі, дык цялёнак і разросся.

Некаторыя гаварылі, што самі бачылі, як на Юр'я ведзьма цягнула па расе вяроўку, з якой цякло малако.

Накануне Купалля ад ведзьмы перад варотамі, над варотамі і па бакам варот вешалі чартапалох.

Ад ведзьмы вакол дзвярэй ставілі бароны (зубамі ўверх), утыкалі нажы, сярпы ўбівалі ў сцену.

Калі ж пасыпаць скрыжаванне вуліцы ці дарогі смеццем, то ў самой ведзьмы будуць чэрві ў малацэ.

**Каваленя Адам Ціханавіч, 1925 г. н.; в. Восава, Салігорскі р-н, Мінская вобл. 15 жніўня 2004 г.**

Падвешвалі яловы дубчык на крышу: уверх – пагода, уніз – дождж.

Зажынаць стараліся ў суботу.

Калі першы раз ішлі сеяць, то да лубкі прывязвалі просфірку.

Калі забіць жабу, то пойдзе дождж – дзеці забівалі.

Калі першы дзень Каляд, то нікуды не хадзілі, а то авечкі не будуць заходзіць дамоў. Нічога не пазычалі ў дзень Каляд.

Каб куры несліся, то ў першы дзень Пасхі пяклі яешню.

Калі садзілі картошку, то нічога не пазычалі, каб не звялася бульба.

**Хаміцэвіч Таццяна Навумаўна, 1920 г. н.; в. Рог, Салігорскі р-н, Мінская вобл. 15 жніўня 2004 г.**

Сена ляжала на куце і пад абрусам ад Каляд да Крашчэння, а потым яго аддавалі авечкам.



На Новы год гадалі аб будучай пагодзе, будучым ураджаі. Для гэтага назіралі за пагодай перад Новым годам. Якая пагода перад Новым годам, такая пагода і на Пятроўку.

На Новы год з сена выцягнеш доўгую сяніну – будзе добры лён.

Лета ідзе па зіме, зіма ідзе па лету.

Крашчэнне. Раніцай хазяін ішоў і мяцёлачкай жыта крапіў хату і ў хляве, дзе стаяць каровы, коні, авечкі.

Саракі. Варылі варэнікі. Спячэ грэцкага пірага і робіць пальцам дзіркі. Садзіць у цеста палец і прыгаварвае: «Гэта жыта, гэта ячмень, гэта грэчка». Каторая дзірка заплыве, як пірог пячэцца, то лепшае збожжа.

Перад Іванам рвуць крапіву, кладуць каля хлява, каб кароў не даіла ведзьма. Да Івана каровы добра давалі малака, а пасля Івана не ўсе. Крапіву клалі ў дзвярах хлява, як пераходзіць. Ад ведзьмы вакол хлява абсыпалі макам або мурашкамі. Мураўямі перасыпалі і вуліцу.

Каб гарбузы былі большыя, то лепш садзіць, калі аблачкоў багата.

Каб капуста расла, то паміж раду паложыш камень ці возьмеш за галаву. Каб такія качаны былі, як мая галава ці камень.

Каб лён рос доўгі, валакністы, то распускалі дзеўкі косы, калі сеялі лён.

**Хаміцэвіч Васіль Гаўрылавіч, 1923 г. н.; в. Рог, Салігорскі р-н, Мінская вобл. 15 жніўня 2004 г.**

Ластаўкі нізка – на дождж.

Красна сонца – дождж. Вокна папацеюць – дождж.

Маладзік угору – пагода сільна (зімой – мароз).

Маладзік уніз – нягода (снег – зімой, летам – дождж).

Як першы раз ідзе араць, то бярэ булачку і проскурку. Усё гэта паложыць у палатняную сумку і поперак загона пераарэ. Потым пачынае ўсё араць.

Да Благавешчання не пахалі. Нават расады не сеялі. Хто загародзіць, то выкінуць. Кол уб'е – абернуць, а то дождж не пойдзе.

Выганялі вярбою. Калі выганялі першы раз кароў у поле, то каля парога клалі ў сумку яечка і проскурку, ніты. Усё гэта пакладзе ў дзвярах хлева. Ніты – каб ваўку зубы завязаць, – не будзе разяўляць рот. Клалі яшчэ ў дзвярах замкнуты замок. Праз агонь не праганялі кароў.



Репозиторий БГАТУ

Юрый. Як сонца ўзыйдзе, то кожны на сваё жыта пускаў карову.

Перад Сёмухай вешалі на дварэ і ў хаце клёны.

2-ая Прачыстая. Называлі яе яшчэ святок. Да святка сей з платка, а после святка сей з сяўка (гушчэй трэба было сеяць).

Пчолы не вылятаюць перад дажджом.

Як кот лезе ў печ, то мароз.

**Ільюшчыц Праскоўя Іванаўна, 1926 г. н., Ільюшчыц Іосіф Іванавіч, 1926 г. н.; в. Рог, Салігорскі р-н, Мінская вобл. 15 жніўня 2004 г.**

Утрам выпусціў куры, а яны капошацца, чысцяцца – дождж.

Утрам раса – пагода.

Каб дождж – мак сыпалі.

Маладзік рог уверх – пагодлівы, халодны (зімой); уніз – дождж, снег.

Алешына раньшэ бярозы – мокрае лета; бяроза раней – сухое.

Краснае сонца – зімой мароз, летам – перамена пагоды.

Сеялі авёс, за ім ячмень, пшаніцу.

На Каляды гадалі. Цягнулі з-пад настольніцы сена – ці доўгі лён.

Спленне 15 аўгуста. Жыта свяцілі пучком, ячмень – пучком, авёс – пучком. Як сее жыта, авёс ці ячмень, то засявалі гэтым збожжам.

Багач – ужэ жыта памалацілі, багатыя ўсе.

**Гурына Алена Кандрацьеўна, 1922 г. н., Лукашэвіч Лідзія Фёдараўна, 1926 г. н.; в. Рубяжэвічы, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 25 верасня 2004 г.**

Куццю як ясі, то цягалі сена – які лён.

Як многа зорак, то многа грыбоў.

Кажуць, на Благавешчанне бусел прылятае.

На Благавешчанне і птушка гнязда не ўе.

На Сёмуху пастух завязвае карове вянок.

На Вялікдзень, як першы раз выганяюць кароў, то кладуць яйцо сырое, пераступіць карова, а потым даюць дзядам. Акроплівалі святою вадою – саломкай (каласкамі) крыж-накрыж адзін раз.

Бывае малока ў каровы цягнецца, то загаварваюць, змываюць вымя вадою тры разы, і карове правіцца.



Бывае кроў у каровы, то надоіць малака і паставіць на шуле, каб птушка пераляцела праз яго – адрабіла, затым што гэта бывае, калі яна праляціць пад каровай.

Сёмуха. Пастухі ўбіралі каровы, гаспадар даваў ім грошы і закускі. Бацька прынясе зялёныя бярозкі, паставіць у хаце, каля парога, каля парога чатыры, а ля дзвярэй дзве.

Вешалі май, а як высахне, то ў печы спаліць. Некаторыя клалі высахшы май у гумне.

Спяшаліся да Іллі ячмень звезці ў гумно.

Пакуль Барыс (24 ліпеня) Ганне (26 ліпеня) на хлеб памеле (грыміць), то трэба ўбраць ячмень.

Спас – 6 аўгуста. Зелле, траву свянцілі. Як уракуць дзіця ці карову, то акурваюць імі.

Жыта на Зельную (15 аўгуста) свенцяць. Жытам тым засяваюць. Зерне нясуць у торбачцы.

Багач – кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку. Вялікае свята. Чалавек сее, багаты становіцца.

Галавасек – не можна галоўкі капусты ссякаць, ні варыць капусту.

**Пракаповіч Люба Адольфаўна, 1925 г. н.; в. Акінчыцы, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 25 верасня 2004 г.**

На Шчадра стол засцілалі абрусам, назаўтра глядзелі пад сенам, зярняты шукалі, які будзе ўраджай. Сена аддавалі каровам і авечкам. Несвянцоны конь, то каню не давалі.

Стукаюць у хаце ў сцяну і гавораць: «Мароз, мароз, ідзі есці куццю, ні парасят, ні ягнятак не маразі».

Вечары святыя – нічога не робяць: не прадуць, не вяжуць, не шыюць, бо цялятаў, ягнятаў зашыюць. Днем усё можна было рабіць.

Як выганяюць кароў у поле, вадою папырскаеш накрыж тры разы, вербачкай сцёбаеш. Перад парогам нічога не лажылі. Гэтую вербачку ў хляве пад стрэху ўторкнеш. Спасенне ад бяды. Вынясеш на гару як ссохнецца (пад лаціну падторкнеш). Не спальвалі.

На Юр'я абходзяць поле з вербачкай і яйцом. Яйцо дзядам аддаюць. Ніву папырскае з аднаго вугла.

Юра. Кароў выганялі некаторыя на расу. Старыкі з вярбою абходзілі свае нівы, уторквалі па адной галінцы на ніве.

Перад Троіцай каля дома май прывозілі. Бярозкі ставілі каля дзвярэй, каля варот, у хаце торкалі, пад бэлькі, каля коек ставілі. На



Репозиторий БГАТУ

куце галінкамі ўкрашалі. На падлогу аір кідалі на Троіцу. На падлозе і панадворку аір кідалі.

Купала. Раньшэ дзяды клалі ў дзвярах чартапалох, крапіву-жгучку.

Папараць-кветка – я чула гэта. У аднаго згубілася карова. У лапаць увалілася цвяціна, то ён усё знаў. Але разуўся і стаў зноў дурным.

Сеяць трэба пад поўнае.

Бацька сеяў ячмень, баба прыйшла і сказала, што сягоння не можна сеяць, а вырас ячмень дай бог.

Бульбу – неба чыстае – не садзяць. Аблочак многа – сеялі. Некаторыя і так сеялі.

Капуста – камень не клалі. Агуркі садзілі – камень паложаць.

Каб лён доўгі быў – сяніны цягнулі на бедную куццю і на крашчэнскую.

Раніцай устанеш – сонца ўзышло і надта ярка свяціла, зараз пачынае хмурэць, і дождж пайшоў.

Воблакі чырвоныя – на дождж.

Кусаюцца камары – на дождж.

Пчолы шпарка ідуць у вулей – на дождж. Пчолы не лятуць з вулею – на дождж.

Як вароны крычаць – на дождж.

Ластачка каля зямлі верціцца – на дождж.

Высока мышы робяць гнёзды – мокрае лета.

**Нічыпаровіч Віктар Антонавіч, 1929 г. н.; в. Свірынава, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 26 верасня 2004 г.**

Свяцілі вярбу, сахранялі ў хляве. Як выганяюць першы раз скаціну, то выганяюць вярбой. Возле каровы вісела, як выганяць каровы, то і выкінуць.

Як першы раз выганяюць у поле, то прама возле парога хлява клалі яйцо. Дзяржалі для гэтага дня крашанае яйцо.

Як сеялі жыта, то тое жыта, якое свяцілі на Спаса, – асвянцоныя каласкі, а то і зерне з гэтых каласкоў. Кусочак хлеба і соль – каля баразны.

Троіца. Бярозу, кляніну павесяць. Як за тры дні высахне, то добрая пагода.

Як садзілі капусту, то побач ставілі гаршок ці вядро.



Да Благавешчання стараліся рассаду пасадзіць, а на Благавешчанне сеяць. Раней да Благавешчання не можна ўбіць калка.

Агуркі стараліся сеяць на Івана Доўгага.

Картошку ва ўторак – лепш.

Навоз стараліся вывезці на шчодрыка (хоць адзін воз, каб шчодрылася).

Як першы раз загрыміць, то беглі да рэчкі і ўлазілі ў ваду да пояса (каб лён доўгі быў).

Куры апушацца, садзяцца на сядала – дождж, вароны крычаць – дождж.

Як уціхнуць лягушкі, птушкі – граза.

Як мураўі закрываюць ходы – то дождж.

Ластаўкі нізка над зямлёю лятаюць, то перад дажджом.

У нас уткі ў гэтым годзе рабілі гнёзды на высокіх месцах – чуялі мокрае лета.

Мураўі лезуць (жужалкі і мурашкі) угору – дождж.

До Раждзяства не ідзе снег, то да Пятра не будзе дажджу.

Якое лета – такая і зіма.

**Дашкевіч Станіслава Браніславаўна, 1928 г. н.; в. Свірынава, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 26 верасня 2004 г.**

Садзіць трэба на маладзік – усё будзе расці.

На маладзіку дождж – то дождж месяц.

Перад Крашчэннем вараць гарох – як будзе многа гароху, так і многа авечак.

На Юр'я нейкі звер душыў усю скаціну, а Юры таго звера штыхом прыдушыў. На Юр'я маці бярэ хлеба ў абрус і ходзіць кругом свайго поля. Ведзьмы хадзілі на расу качацца, каб іхняя карова многа малака давала, лезлі голыя ў ваду. На Юр'я выганялі скаціну ў поле. Лажылі пад гной яічка і замок. Выганялі свянцонай вярбой.

Купалле. У нас збіралі зелле і кідалі гэтае зелле перад варотамі, каб ведзьма не хадзіла ў хлеў.

Скот пасвілі да ўсіх святых.

Калі ішлі сеяць, то кленчыць і 3 разы перахрысціцца жытам; сеялі 3 разы крыж-накрыж па полю.



Репозиторий БГАТУ

**Галяшевич Александр Сергеевич, 1926 г. р.; д. Семенчицы, Столбцовский р-н, Минская обл. 26 сентября 2004 г.**

Крещенская вода стоит в бутылочке, як хворы, як первый раз скот выгоняют в поле. Перед выходом коров в поле кладут перед порогом мотуз ниток, замок, яйцо.

В церкви святили вербу: «Будь здоров, не умирай». Вербою выгоняли коров.

Выгоняли скот на Юрьеву росу, до восхода солнца. Хозяин с хлебом обходил нивку, затем собирались группою около своего поля и выпивали. Скот выгоняли обязательно в этот день: «Юрьева роса – дороже овса».

На Купалу затыкали в ушаки сараев, на порог крапиву.

Овес говорил: «Сей меня в грязь, то я буду князь».

Капусту садили, то брали себя за голову.

Когда выезжали первый раз лен сеять, то клали в лен (семена) железо, чтобы крепкий лен был, и яечко, чтобы лен головастый был.

От урока – скоту навязывали красную ниточку.

В засуху ловили лягушку и бросали в колодец.

Падеж скота. Бабы собирались и ткали 2-метровый ручник (за одну ночь нужно было выткать, спрясть тоже), расстилали и перегоняли через него скот до восхода солнца.

**Мураўская Марыя Міхайлаўна, 1931 г. н.; в. Вялікае Сяло, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. 9 кастрычніка 2004 г.**

Надвор'е. Снежань – чэрвень, январ – іюль, люты – аўгуст.

Які будзе дзень Усе святыя (1 лістапада), такі будзе першы май. Праўдзіцца.

Лета мокрае, і восень будзе мокрая. Але я не пішу. Мой бацька пісаў раней аб пагодзе. Як косіць хто, то яго пытаюцца.

Каляды. Цягнем з сена травінку, глядзім, які будзе ўраджай.

На вербніцу свяцілі вярбу; як карову выганяць, то вярбою запасвалі: «Ідзі здарова на пашу».

Купалле. У суботу (калі прыпадае на суботу) сабіраюць зелле. Сабіралі жанчыны ў полі. Свянцонае зелле давалі, калі карова не дае малака. Клалі крапіву на варотах і ў вушаках хлявоў – крапівужыгучку, дробненькую.

На Успенне некаторыя свенцяць жыта, пшаніцу. Як толькі едуць сеяць, то ўсыплюць у мяшок і сеюць.



Калі садзілі капусту, то расаду ставілі на голаў, каб былі галоўкі, як галава, вялікія.

Яшчэ як капусту садзяць, кладуць камень, каб капуста была круглая. Вада – каб вусені тапіліся.

**Дзям'янчык Іван Іванавіч, 1930 г. н.; в. Вертнікі, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. 9 кастрычніка 2004 г.**

Тры куцці. Першая і трэцяя стаялі на сене, а багатая – у кажусе. Назаўтра сена раздавалі каровам, авечкам. Глядзелі, як ляжыць карова, куды галавой: на захад – то вечарам цяліцца будзе, на поўдзень – у поўдзень, на поўнач – апоўначы ацеліцца.

Каб куры не елі капусты, то трэба было на першы дзень Каляд і на першы дзень Вялікадня не варыць капусту.

Звеставанне – нават птушка гнязда не ўе.

Вярбою выганялі першы раз кароў у поле. Потым прынясуць і за абраз садзяць, у печ кідалі, а на смецце нельга было выкідаць.

Юрый. Кожны выходзіць на сваё поле і трошкі заворвае. На поле выганялі скаціну (трошкі на жыта).

Вясной былі два Юр'і: 11 красавіка – новы і 23 – стары, то паміж імі нельга было забіваць калка ў зямлю.

Як першы раз ідзе сеяць, то бярэ хлеб і соль свянцоныя. Гэты хлеб закладываў гаспадар у пояс. Калі прыязджае з поля дамоў, то развязвае і кладзе ў ямку – у пячурачку ў печы. А праз год спаліць. А то бывае соль рассоліць у вадзе і пасвянцае хату, хлеў, гумно.

Каласкі свянцілі на 1-ю прачыстую (15 жніўня), а калі жыта сеюць, тады іх выціраюць, змешваюць з жытам у мяшку і сеюць.

**Брачкоўская Юзэфа Францаўна, 1924 г. н.; в. Андрыеўшчына, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. 10 кастрычніка 2004 г.**

Каб лепш расла бульба, то першую баразну картошкі накладваў мужчына.

Канчалі дажынаць, то пакідалі 4 каласкі, украшалі, праполвалі, палівалі вадою, украшалі цвятамі. Потым, як злажывалі збожжа, то каласкі клалі ў жыта, каб мышы не вяліся.

Калі выганялі карову першы раз у поле, то перахрысцімся, памолімся, вярбою хлясталі. У варотах лажылі замок і пару яец. Замок ад ваўка – замкнецца ўсё на ўсё лета. Яйца – каб каровы былі не сляпыя і былі круглыя, поўныя. Але як што мае быць, то і будзе. І воўк нападзе і загрызе. Усяго бывала.



Репозиторий БГАТУ

Калі кроўю карова доіцца, то малако прапусціць праз абручальнае кальцо.

Калі карову купляюць і прыводзяць, то даюць хлеб. А каб не ўцякала, то хлеб абносілі тры разы вакол коміна і давалі карове хлеб.

Калі сеялі агурцы, то расплятаі валасы. Качаліся, каб агурцы раслі.

Калі хто заходзіць у дом ці ў сарай, дзе маладое свінцо, ягнё, тры разы плюнуць і сказаць: «Соль табе ў вочы».

**Біруля Леакадзія Іванаўна, 1932 г. н.; в. Андрыеўшчына, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. 10 кастрычніка 2004 г.**

Да Благавешчання не чапалі зямлю (і калка не можна забіць).

Юрыя святкавалі не столькі з-за людзей, як для ската.

На Купальскага Івана абходзяць сваё поле. Вырвець 3 каласкі і абыходзіць 3 разы поле, каб вераб'і не клявалі жыта.

Троіца – прастольнае свята. У царкве – клён. Каля дамоў таксама. На пол плашнік – аер. Бабы ложаць яго на капусту. Кажуць, чарвей-вусянёў не будзе.

Зелень майская як высахне, то хаваюць і прыкладаюць ад нарываў.

Як першы раз у поле ідзе, то бярэ хрэсцік, спечаны ў сераду на 4-ай нядзелі Вялікага поста. Бралі яшчэ хлеб і соль. Святы соль і хлеб з'ядаў сам чалавек. Пачыналі сеяць зернем, асвянцоным у цэркві.

Як садзяць бульбу, то ў баразну кідаюць лушпіны ад пасхальных яец.

Як гарбузы садзяць, то лепш, калі хмаркі на небе.

Як сеюць бульбу, жыта, то не можна нічога пазычаць.

Як карова целіцца ці свіння паросіцца, то 3 дні нічога не пазычаюць.

Лепш зажынаць у аўторак і пятніцу.

**Матусевіч Станіслава Антонаўна, 1921 г. н.; в. Гарбузы, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. 31 кастрычніка 2004 г.**

Як сонца заходзіць за хмару – дождж.

Чапля ляціць на захад – дождж.

Але як уварвецца суша, то і чапля ляціць на захад, а сушыць і сушыць. Усё як бог дасць.

Як жоўтыя воблакі – бы ва мгле – дождж.



Як ноччу няма расы – то дождж.

Перад дажджом куры трапешчуць хвастом і на платах сядзяць.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж.

Камары перад дажджом больш кусаюцца.

Камары стаўбом уюцца – на пагоду.

Як краты вельмі рыюць норы, то цёплае лета.

Як зімой снегу доўга не бывае, то лето сухое.

Зіма – па леце, а лето – па зіме.

Як загрыміць на голы лес, то для ўраджаю нядобра.

На багатую Каляду (Новы год) многа снегу – ячмень добры.

Як хвароба вялікая ці суша, да ўсходу сонца спрадуць і выткуць палатно, потым занясуць у цэркву і павесяць.

**Манік Ніна Сцяпанаўна, 1925 г. н.; в. Задвор'е, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 31 кастрычніка 2004 г.**

Колісь мы рвалі да жніва васількі, звівалі з іх вянок. Вянок вілі і з папараці. Адну дзяўчыну прыбяром. Вядзем яе і спяваем: «Павяду русалку да бору, сама вярнуся дадому». Тая русалка за намі, паймае, то ласкоча. Гэта рабілі на Купальскага Івана (за дзень да Купалля). Потым вянок разрываюць і кідаюць матцы на капусту, каб была ў маткі добрая капуста.

Расы не было – на дождж.

Сонца ў хмару – дождж. Сонца ясна – харошая пагода.

Калі месяц «абдуваецца» – то плахая пагода.

Зіма па лету, а лета – па зіме.

На Пакроў вецер з юга – цеплая зіма, а вясна халодная. Северны вецер – то зіма марозная, бурлівая.

Калі мышы на лугу патачылі норы на вярху стагоў сена, то вада бальшая будзе прыбываць.

Каровы на спіну хвасты закінуць – будзе дождж.

**Шыдлоўская Марыя Іванаўна, 1928 г. н.; в. Сцяцкі, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 31 кастрычніка 2004 г.**

Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то вясна ранняя.

Перад святам Троіцы двор і ў хаце ўпрыгожвалі галінкамі клёну.

Адзначалі Міколу зімняга: «Варвара заворыць, а Мікола – загвоздзіць». «Да Міколы няма зімы ніколі». А вясною казалі: «Да Міколы няма вясны ніколі».



Репозиторий БГАТУ

Кароўку лячылі зеллем, давалі ваду. Як зараз кароўку апушыць, то даем масла – автол: «Дай сто грам і разгоніць».

У нас шаптуны лячылі і скаціну.

У нас быў пан, то сабраў касіць 12 чалавек, а стары гнаў скаціну і гаворыць: «Пане, будзе дужа дождж ісці». Пан пытае, адкуль ён гэта знае, а ён сказаў: «Мой бык як пакрыецца хвастом, то будзе дождж». Гэтак і было. Цэлы тыдзень ішоў дождж. Пан тады казаў: «Быкова дупа знае венц (больш) за календара».

Калі пагода добрая да Пятра, добрай не будзе пасля Пятра і наадварот. Пасля Пятра пагоду ўжо трудна ўгадаць.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж.

Прымаўка: «Волік – саколік, а падла – здароўе наша». Падла – каровы, скаціна.

Раней мы гадавалі многа авечак. Зараз не гадуем. Няма пашы. Авечак няма. На нашым хутары было 20–30 авечак. Цяпер трава далёка і плахая, няма чаго там і касіць.

**Кухарчык Паўліна Сяргееўна, 1924 г. н.; в. Сцяцкі, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. 31 кастрычніка 2004 г.**

Сонца ў хмару – дождж; ярка (пад зіму) – мароз.

Маладзік абмыўся – цэлы тыдзень дождж.

Да Міколы няма зімы ніколі.

На Пакровы холад – зіма халодная; вецер паўночны – холад, з поўдня – цяпло.

На першую куццю многа зорак – ураджай вялікі, трэба заранее сеяць ячмень.

Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то вол вясною наесца травіцы.

З Благавешчання – на полі.

Убіралі на Троіцу зеленню хату. Клён па сценам, пад балькамі, а на падлозе плешнік ці татарнік (аер). Высахшыя галінкі выкідалі.

**Маляўка Іван Дзмітрыевіч, 1925 г. н.; в. Добры Бор, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 8 мая 2005 г.**

Як сонца хараша заходзіць, то будзе пагода.

Як чырвонае сонца, то вецер – нікога не пытай.

Вечарам воблакі чырвоныя – на дождж.

Калі ўночы не будзе расы – то раніцай дождж.

Як вялікая раса – на пагоду.

Як краты моцна точаць – то на дождж.



Як карова хваста на спіну кладзе – дождж.

Вароны крычаць перад дажджом.

Ластаўкі крычаць – вецер.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж. Як на пагоду, то сядзяць многа на дроце – садзяцца на дрот ад сталба да сталба.

Камары ступу таўкуць – на пагоду.

Пчолы з вулля не вылятаюць – на дождж.

Калі на Юр'я добрая раса – будзе добры ўраджай.

Як загрыміць на голы лес – гразавое лета, малы ўраджай.

Як выпадзе снег да Міхайлы, то будзе ўраджай харошы.

Калі на Каляды выцягнеш з сена кароценькую травінку – то слабы ўраджай.

Як зіма мокрая, то і лета мокрае.

Як зіма марозная, то лета гарачае.

Бывае зіма перакідліва, то і лета такое.

Калі прадаюць скаціну, то з повадам, каб вялася. Гэты павадок перад дзвярыма завязаць, каб скаціна не вярнулася дамоў.

Сёмуха. За вокнамі ставілі клён, бярозу. На падлогу – татарнік ці плешнік (аер). Высахне – выкінуць.

Каля вёскі ёсць Мядзведжая гара. На ёй – святы камень. Са святога камня грошы ніколі не прападаюць. Сюды прынеслі авечку і – авечка вылячылася (перад вайной).

**Рэкум Вера Андрэеўна, 1922 г. н.; в. Мяжэвічы, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. 8 мая 2005 г.**

Дзед застаў, у нас нажы ставілі прама ў куцці, каб ячмень быў вялікі.

Калі на Каляды добры дзень, то летам такі ж на Пятра.

Як ваду пасвянчалі, то крапілі сена каляднае (разбаўлялі сваёй вадой) і давалі авечкам, каровам, коням. Курам давалі куццю. На Крашчэнскую каляду мяшалі ўсе, што ёсць куцці (з усіх трох), сеялі па будынку, гумну, сараю, а потым што астанецца – курам.

Ад Каляды да Крашчэння трэба было карміць куры ў абручы (каб куры не разыходзіліся). Так карміlі дзве нядзелі.

Пасля Благавешчання расаду капусты сеяць. Не расчэсваюць нават валасы. Птушка гнязда ў гэты дзень не ўе.

Заўсёды костку свянцоную ад велікоднага стала насілі на поле, яе там закопвалі.



Репозиторий БГАТУ

На Юр'я выганялі кароў у поле на расу. Качалі яйца па расе. Пад парогам клалі пояс тканы, яйцо, каб кароўка плодна была, падкову.

Ян (6–7 ліпеня). Заранее ўстаюць, зловяць жабу, укінуць у сыроватку і кажужь: «Глядзіце, ведзьма». Перад дзвярамі ўтыкалі сярпы вострыя, іголкі.

15 жніўня – Успленя. Свяцілі жыта, авёс. Потым абціралі і, калі ішлі сеяць, гэта зерне змешвалі з астатнім і сеялі. Капусты да гэтага ніхто не варыў. Галоўку капусты свяцілі ў цэркві.

Калі ішоў араць першы раз, то апранаў чыстае бяллё, рубашку.

Клалі камні каля капусты.

Садзіць бульбу – калі ёсць груды на небе. Калі не ўрадзіць картофель – то не ад гэтага.

Калі лён сеялі, не давалі несці семяна лёну мужчынам, а толькі жанчыны.

**Грышкоў Фама Мікалаевіч, 1927 г. н.; в. Юхнавічы, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. 8 мая 2005 г.**

Прыехалі вучоныя, асталіся начаваць на дворы. Дзядзька кажа: ідзіце ў гумно, бо будзе дождж. Мае валы на спіну хвасты пазакідалі – то верная прыкмета на дождж. Так і здарылася.

Куры на дождж садзяцца пазней. На пагоду – садзяцца раней.

Калі на Новы год на дзераве навісь, то вясна позняя, а калі на Каляды, то больш ранняя, і можна сеяць ранні ячмень. Калі ж навесі няма, то зусім позняя вясна.

Мяккая зіма, калі на дубовых лісцях у яблычках – чарвяк, а калі там муха, то зіма марозная. Я гэта сам праверыў, і гэта падцвярджаецца.

Рыба перад дажджом танцуе.

Ластаўкі лятаюць ніжэй і хутчэй – на дождж.

На пагоду – сядзяць ластаўкі на дроце шарэнгай.

Конікі перад дажджом скачуць крэпка.

Камары перад дажджом больш шумяць, кусаюцца.

Пчолы перад дажджом дальняга курса не бяруць.

Некаторыя кветкі на дождж сабіраюцца, а на сонца адкрываюцца.

Пагоду прадсказвалі яшчэ і па Луне. Луна тусклая – на непагоду. На пагоду – светлая.

Калі вакол Луны тусклыя кругі – то на дождж. Светлыя кругі – на пагоду.



Сонца свеціць і заходзіць чыста – на пагоду.

Калі сонца краснае, а лучы як бы адлучаюцца – то на дождж.

На закаце заходзіць за хмару – на дождж.

Калі сонца вялікае – то на непагоду.

Зімой ярка гараць зоркі – на мароз. Тускла свецяць – нянасце якое-небудзь.

Я яшчэ магу прадсказаць пагоду па свіной селязёнцы. Селязёнка роўная – зіма нармальная. У адным канцы таўсцей, то трэба глядзець з якога канца. Калі селязёнка ў пачатку таўсцейшая, то ў пачатку зімы больш мароз, пад канец – у канцы зімы будзе вялікі мароз. Гэта супадае. Я правяраў.

Апрэдзялялі пагоду яшчэ па фазах Луны. З маладзіком мала звязана на дождж. У нас прадстаўленне было, што на поўна – пагода, а тут дождж і дождж. Прайшла першая квадра, а дождж лупіў.

Пасля Раждзяства была пагода, то, можа, на ўборку будзе пагода.

Стрэчанне. Калі певень з капяжа не нап'ецца вады, то гаспадар набярэцца бяды.

У нас гавораць, што як да Пятра нягода, то пасля Пятра – пагода.

У сухі год, неўраджайны, бусел выкідае з гнязда буслянё ці яйца.

Калі каня ахваціць – то пускалі кроў. У вену іголачкай – і памагала.

Калі карову апушыць, то цуглямі закілзаюць і палку ў рот, і ганялі яе. Пазней залівалі ў рот керасін. Зараз іголкай прабівае бок і выпускае газы.

Карова не жвакуе, нястраўнасць, то давалі ёй расол з агуркоў, соду, гарэлку.

Выме успухне – масаж спіртам. Як карова падавіцца, то праталківалі, а як не праталківаецца, то пад нож – няма ратунку.

Лячылі скаціну яшчэ шэптамі розныя знахары, ведзьмакі.

**Касцюкевіч Соф'я Андрэеўна, 1934 г. н.; в. Абруб, Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл. 9 мая 2005 г.**

На Вялікдзень, у вельку суботу свенцяць бульбу і асвянцоную перад Юр'ем стараюцца яе пасадзіць.

Вярбою выганялі кароў, а потым яе спальвалі.

Троіца. У цэркві служба. Двары і хаты ўпрыгожвалі бярозкамі, галінкамі клёну. Май, як высахне, спальвалі. Некаторыя затыкалі ў хляве, у гумне – дзе малоцяць.



Репозиторий БГАТУ

Аб пагодзе гадаюць на Іллю.

На куццю перад калядамі снег – то будзе грыбоў.

Зубкі месяца ўверх – будзе пагода.

Заходзіць сонца ў туман – даждлівая пагода.

Як сонца заходзіць ды краснае – на дождж, вецер.

Кругі ля сонца – непагадзь.

Мыш гнецць вышэй гняздо – паводка, мокрая восень.

Чмялі глыбока ў зямлі – засуха.

Птушкі нізка лятаюць – дождж. Як сядзяць на правадах, то, мо, таксама на дождж.

Бык пакладзе хвост на спіну – дождж.

Карова кашляе – на дождж.

Курыца хвастом круціць – на дождж (у іншых месцах – наадварот).

Курыца рана садзіцца на седала – на пагоду.

Калі карову апушыць, то разразалі вуха, пускалі кроў, ганялі яе. Унутр нічога не улівалі. Як запор – то кару крушыны ў выглядзе адвару. Як панос (ідзе часта на двор) – укроп, дубовую кару ў выглядзе адвару.

Адварам дубовай, альховай кары прамывалі жывёлам раны.

**Мізюкевіч Іосіф Іосіфавіч, 1928 г. н.; в. Абруб, Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл. 9 мая 2005 г.**

Палоць – як поле сухое, як сырое – немагчыма.

Спачатку сеялі авёс, за ім жыта (на восень), затым ячмень, картошка.

Конскі навоз – лепшы, цёплы; за ім (па якасці) кароўі ці авечы; кідалі і курыны.

У каго больш гною – той і лепшы ўраджай.

Як якія глаза, бываюць такія людзі – карова целіцца, паглядзіць на яе і сглазіць.

Крываўка ў кароў, то крываўнік.

Калі запор – то семя льняное. Панос – то карове давалі адвар кары дуба, кары грушы.

Каня ахваціць, пускалі кроў. Як вену праб'е, то глядзіць, калі кроў бярэцца за пазногаць, закрывае.

Як карову апушыць – ганялі яе, пазней прабівалі бок і спускалі паветра.



**Шкледа Сяргей Іванавіч, 1931 г. н.; в. Ваські, Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл. 9 мая 2005 г.**

Кура хвастом мяце – дождж.

Вароны шыкуюць у сярэдзіну галля – опань якая-небудзь, снег, слата, дождж.

Раней мы садзілі самасад – то як сухі табак (лісця) змакрэе, то чакай дажджу у хуткім часе.

Калі сталбы каля сонца, то ветрана. Сонца краснае – дождж.

Калі сонца заходзіць і лучы на поўдзень – то на пагоду, а як на поўнач – нягода.

Месяц апушаны – на нягоду.

Свінка нацягала сабе берлажок – то пойдзе дождж.

Вясною альха рана распускаецца – то сырая вясна, а калі бяроза распускаецца раней – то сухая.

Як да Пятра дождж, то пасля Пятра – пагода.

Ілля. Прышоў Ілля – нарабіў гнілля. Прышоў Ілля, пытае, ці скора ралля.

Калі вялікая вада, то мураўі на траве гнездо робяць, вылазяць.

Лягушка кум-кум-кум – то пагода. А скрылася і не каркне – холад будзе.

Ластачкі курсіруюць над зямлёю – на дождж.

На дождж вераб'і купаюцца ў пяску.

Перад дажджом – сухая трава. На пагоду – бальшая раса.

Зоркі свецяць ясна – мароз, туманна – снег, мяцель.

На дождж у мяне круціць ногу, на пагоду – лягчэй (рэўматызм).

Троіца. Святкавалі 3 дні. Пад вокнамі і ў хаце: клён, бярозы. Галінкі клёну пад балькі, за ікону. На падлогу – аер. Пазней усё гэта выкідалі.

Галавешку ад купальскага вогнішча неслі на капусту, каб качаны былі вялікія.

**Манцэвіч Марыя Міхайлаўна, 1929 г. н.; г. п. Бяроза, Брэсцкая вобл. 10 мая 2005 г.**

У пачатку сакавіка глядзелі, якая пагода ў першыя дні.

1 сакавіка: якая пагода, такая і вясна; 2 сакавіка: якая пагода – такое і лета; 3 сакавіка – такая і восень; 4 сакавіка – такая і зіма.

Перад Благавешчаннем сеялі расаду, а больш нічога не рабілі. Птушка і тая гнязда не ўе.

Троіца. Ставілі бярозкі ў двары, у хаце пасыпалі аірам.

На Іллю дажджы. Ілля – дзе восень, там і я.



Репозиторий БГАТУ

На Барыса чаго хочаш напарыся (пад'еш). На Барыса то гром, то дождж залівае.

Калі на Пакровы вецер з цёплага боку – то зіма цёплая, а калі з поўначы, з усходу – халодная.

Міколу і Юрыя восенню амаль не адзначалі. «Юры масціць, а Мікола гваздзіць, а Ганна едзе, як панна».

Варвара – 4 снежня. Прыйшла Варвара – кусок ночы уварвала, дня прытачыла.

Кароў лячылі канапляным семем, давалі гарэлку горкую.

Карову лячылі зеллем і варылі крываўнік, давалі ўнутр семя з лёну. Як уздуцце – прабіваюць бока.

**Макар Екацярына Якаўлеўна, 1904 г. н.; в. Гошчава, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 10 мая 2005 г.**

На Вадохрышча свяцілі хлявы, дамы і там, дзе свінні стаялі.

Вербніца. Вярбу свяцілі, ёй выганялі кароўку ў поле.

Сёмуха – 3 дні. Упрыгожвалі хату бярозкаю, аірам, у цэркві сыпалі.

Спленне – вялікае свята – жыта свяцілі і тым жытам засявалі.

Кароўку лячылі адварам льнянога семя. Гарэлкі ўвальюць. Апушыць карову – то ганялі яе праз 9 меж.

Як захварэе карова, то шапталі. Як уздуецца – то да шаптуна: і паманіць, і пашчупае і папраўляецца.

У нас быў адзін чалавек, як карова натрэ бокі, то прыдзе пагамоніць і, глядзіш, і пройдзе.

Як уздуцце ў каровы – то націралі ноздры соллю.

**Чарняўская Ніна Сямёнаўна, 1940 г. н.; в. Вардамічы, Вілейскі р-н, Мінская вобл. 12 чэрвеня 2005 г.**

Стоўп на Сонцы – вецер.

Павуціна сцелецца па зямлі – на пагоду.

Рожкі месяца ўверх – на пагоду, уніз – нягода.

На куццю снегу многа – грыбоў многа.

Маладзік у дождж нарадзіцца, так і будуць дажджы. Бывае, зменьваецца на паўналунне.

Калі капусту садзілі, то свякроў брала крапіўку і прыгаворвала: «Усе мошкі, чэрві, садзіцеся на крапіўку».

Каб вадзіліся агуркі, то гаварылі: «Хто будзе пытаць, каб было што прадаваць».



Першы раз ідзе ў поле, то бярэ святую рож, прасвірку (прывязвае да сявалкі), прыходзіць, перахрысціцца і кідае зерне.

Калі першы раз выганялі кароў у поле, то вярбой і ядлоўцам гналі карову, а потым кожны – на сваю ніву.

Карове давалі салому, то малака не давала. Карове трэба хлебушка. Нікакога сглазу нет.

**Воронкевич Елена Константиновна, 1931 г. р.; д. Поня, Вилейский р-н, Минская обл. 12 июня 2005 г.**

Приметы урожая – смотрят по небу. Як дождь на Петра, то картошка будет гнить.

Первый раз выгоняли скотину в поле вербою.

Юрия – 23 апреля ст. ст. Ходили до восхода солнца со священником на озимое поле. Некоторые ходили к своему житу до восхода солнца, но ничего не брали. До восхода солнца выгоняли коров на росу.

Когда первый раз выгоняли коров в поле, то клали яйцо, замок, мясо, хлеба святого, все заворачивали в скатерть. Корову бьют святой вербою и выгоняют в поле.

Троица. Украшали дома зеленью.

Первый раз когда шли сеять, то брали освященное в церкви зерно – жито. Хозяин старался посеять, чтобы никто не пришел. Есть это и сейчас.

Як цветут огурцы, але няма огурцов, пасталы кладуть и сивенькие «котики» – «катки».

**Аксючыц Леаніла Міхайлаўна, 1930 г. н.; в. Поня, Вілейскі р-н, Мінская вобл. 12 чэрвеня 2005 г.**

У кароў некаторыя аднімалі малако. У тых, у каго дзелалі, то палучаліся чэрві ў малацэ.

Калі выганялі скаціну на Юр'я, то ў варотах клалі замок, каб карова не баялася ўрокаў; яйца клалі, потым аддавалі нябогаму. Выганялі скот свянцонай вярбінкай.

Купала. Адзін раз я прыйшла, сядзіць каля каровы жаба, я біла дугою, не забіла; вуж таксама п'е малако. Касу ўтыкалі ці лажылі на вароты, назаўтра ляжыць каса ў дварэ. Калі ўбачыш, то вочы трэба выкалаць. Клалі перад Іванам свечку, дык перакусіла свечку. Хто браў малако з каровы (у сяле ведзьма), дык яна стане на гной і скажа: «Каб тваё малако гноем смярдзела».



Репозиторий БГАТУ

Калі кароўка мочыцца кроўю: «Мянёк далёк, а мярцвяк глыбок, Як мярцвяку з маньком за адным сталом не гуляць, не піць, не ткаць, Так маёй кароўцы кроўю не сцаць».

Ад гада (вужа). «Вуж – добры муж; залатая галава, чэсная барада; Не кусай мае скаціны; Будзеш кусаці, буду табе яд замаўляці».

Калі ўперадзе рабая карова і нясе траву ў роце, то будзе дождж.

Як маладзік настае, то ён павінен абмыцца.

Як расы няма, то дождж будзе.

Якая пагода на Каляды, такая і перад Пятром. Калі на Каляды мароз, то на Пятра будзе смаліць.

Калі гнёзды мышыныя на зямлі, то паводкі не будзе. А калі ў кустах, то будзе паводка.

Муравейнік малы – зіма лёгкая.

Як ластаўкі прыпадаюць да зямлі – то дождж.

Як першы сняжок, то бярэ ў стакан, як сухі год – то поўстакана вады, а як мачлівы год – то поўны стакан вады.

**Чучман Лилия Петровна, 1936 г. р.; д. Южное Гнездилово, Докшицкий р-н, Витебская обл. 12 июня 2005 г.**

В первый выгон в поле обходили скот с вербой. В пороге клали вербу и яйцо (чтобы скот был круглый), хлеб, замок. Скот перегоняли через косу, серп. Якобы на скотину после этого не нападали уроки.

Когда сажали капусту, то брали просфорку и клали в рассаду.

На Купалье в сарай (под дверью) вешали острые косы. Затыкали ушаки дверей крапивою, папоротью. Ставили телят под коровы, чтобы ведьма не подлезла. Вожыка убьют и думают, что ведьму убили.

Спас. Светят яблоки, жито, и этим житом засевали.

**Литвинчик Григорий Дмитриевич, 1922 г. р.; д. Северное Гнездилово, Докшицкий р-н, Витебская обл. 12 июня 2005 г.**

Купала. Говорят, что в эту ночь ходили ведьмы. Они портили скотину. От них, чтобы защитить скотину, всаживали в дверь сарая крапиву.

Первый раз в поле выгоняли вербою. В воротах клали замок и перегоняли скот.

На Троицу вешали венки на рога коровам.



Когда хозяин первый раз шел в поле сеять, то клал хлеб, соль и молился. В поле перекрестит семена и начинает сеять. К севалке привязывал просфорку и с ней сеял.

У нас за год пало 9 штук скотины. Пришел один чудак и сказал: «Поставь бутылку водки, я скажу, что сделать, чтобы не было падежа». Выпил и сказал: «Не имей ничего, как я, тогда и не будет падежа».

**Козел Ягор Іванавіч, 1924 г. н.; в. Камайск, Докшыцкі р-н, Віцебская вобл. 12 чэрвеня 2005 г.**

Сонца краснае і ярка заходзіць – на вялікую пагоду.

Сонца заходзіць у хмару – дождж.

Зараз прыкметы пагоды змяніліся. Вялікая раса амаль не бывае, як бывае – то вецер. Як ціханька – то расы няма.

Птушкі лятаюць нізка – дождж.

Рыба перад дажджом падскоквае ўверх, больш мошак.

Мураўі хаваюцца перад дажджом.

Пчолы перад дажджом вельмі кусаюцца.

Як на Еўдокі вялікі снег, то многа грыбоў. Хто празднуе Еўдокі, то будуць голыя бокі.

Калі на першую куццю многа зорак, то многа першага маладняка; на навагоднюю куццю многа зорак – сярэдняга маладняка многа; на апошнюю – то паследні маладняк будзе плодным.

Зіма марозная – лета гарачае.

Як заб'юць кабана, то глядзяць касу (селязёнку). Як спачатку тоўстая каса, то зіма ў пачатку марозная, а калі сярэдзіна селязёнкі тоўстая, то пасярод зімы будуць маразы.

Капусту садзілі – камень лажылі, каб цвёрдае, тугое качанне было.

Агуркі. Калі на Юр'еў дзень сеяць агуркі, ці ў гэты дзень нядзелі, то будзе многа агуркоў. Тое ж самае, калі пасеяць агуркі на саракавы дзень пасля Пасхі. Як пустацвет, то найдзі лапаць і кінь у агуркі. Пустацвет яшчэ рассыпалі па дарозе, дзе жывёла ходзіць.

**Капура Вольга Сціпанаўна, 1930 г. н.; в. Пясочная, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 5 ліпеня 2005 г.**

Да Благавешчання не гародзяць заборы, не капаюць зямлю; кажуць: «Не чапайце зямлю да Благавешчання, бо суша будзе».

21 апрэля, 7 мая – садзілі бульбу.



Репозиторий БГАТУ

29 верасня – Уздвіжанне – не можна ісці ў лес: змеі. Змеі заходзяць у гнёзды, вельмі злыя, кусаюцца.

Перад дажджом ногі, рукі ломіць. Цяпер ужо ўсё змянілася.

Пагоду раней яшчэ апрадзялялі па пчолам.

Если береза и альха разам распускаюцца, то не будзе засухи. Сейчас у нас средний год: ольха и береза вместе распустилися. Второй укос будзе лепшы, чым первый.

Ласточкі нізка лятаюць – дождж. Цяпер усе можна ў календары вычытаць. Ластачак мала, толькі дзе склад. Раней не разбуралі ластачкіны гнёзда. Цяпер усё нішчым, нічога не жалеем.

**Гучок Ніна Аляксандраўна, 1932 г. н.; в. Пясочная, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 5 ліпеня 2005 г.**

Як раса вялікая ды доўга дзержыцца, то на пагоду. Як няма расы, то на дождж.

Вароны каркаюць рана – перад дажджом. Як нізка лятаюць вароны, то нягода.

Як карова паложыць на спіну хвост, то дождж.

Як камары мак таўкуць, то будзе цёпла.

Як звёзды падаюць, то нягода.

Як у пачатку Піліпаўкі снягі, мяцеліца – то ў пачатку лета мокра. Калі на першы дзень Піліпаўкі мокра – то вясна мокрая. Пасярэдзіне піліпаўкі мокра – то сярэдзіна лета мокрая.

Як снег вялікі – то добры ўраджай. Зіма гола – лета гола.

Як загрыміць на голы лес, то неўраджай.

Як на першы дзень Каляд мокра, то лета мокра. Як на першы дзень Каляд марозна, то лета пагодліва.

У мяне былі нават запісаны нешчаслівыя чысла па месяцам. У тыя дні не можна было кароў выганяць, засяваць, збірацца ў дарогу.

Нешчаслівыя чыслы:

Январь: 1, 11, 12, 13, 18, 26. Февраль: 8, 11, 12. Март: 12, 17, 31. Апрель: 1, 3, 8, 12, 13. Май: 8, 11, 30. Июнь: 1, 6, 7. Июль: 1, 11, 17. Август: 1, 3, 16. Сентябрь: 12, 15, 18. Октябрь: 11, 15. Ноябрь: 11, 12, 17. Декабрь: 7, 15, 17.

Людзі прыдзержываліся чысел, калі іх зналі. Нічога яно, мусіць, не праўдзіць.

Так гавораць, што капусту трэба садзіць на трэцяй і на пятай нядзелі пасля Вялікадня, але не на парнай. А мая нявестка пасадзіла на другой нядзелі, то яшчэ якая капуста была.

Калі садзілі капусту, то клалі камень; калі ж агуркі – то паленца.



У маладзік не сеялі. Сеяць можна было, але пачынаць сеяць не можна. Пачынаць сеяць не можна было і на гнілец (калі месяц пачынае меншаць).

Маладзік – можа, і дожджык пойдзе.

Картошку не садзілі ў панядзелак.

На Каляды пасля вячэры глядзяць на неба. Як звёзды на першую куццю, то ячмень будзе харошы.

Троіца. У нас бралі клён і ўтыкалі яго вакол багоў, ля калодзежаў, у шулах, у хаце пад столлю, у хляве.

**Садоўская Марыя Аляксандраўна, 1925 г. н.; в. Сімакава, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 7 ліпеня 2005 г.**

Сонца ў хмару заходзіць – на дождж.

Сонца вельмі яркае – на дождж. Сонца яркае зімою – на мароз.

Гарыць зара – на дождж.

Радуга ясная – на дождж.

Вялікая раса – на пагоду. Няма расы – на дождж.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж.

Галкі, вароны крычаць – на дождж.

Рыба перад дажджом мятаецца паверх вады, хапае машкару.

Селязень на адной назе стаіць – на холад.

Перад дажджом вельмі машкара лятае.

Пчолы далёка ляцяць – пагода. Пчолы не вылятаюць – нягода.

Пятухі пяюць сярод дня па ўсёй дзярэўне – на перамену пагоды: на дождж, на мароз.

Гром грыміць на голы лес – неўраджай.

Кукушка на голы лес кукуе – неўраджай.

Калі на Каляды ідзе снег – многа ягад.

Як ясная пагода, то звезды падаюць больш.

Перад Калядамі моцны снег – перад Пятром дождж.

Пачынаюць з Піліпаўкі і па нядзелям апрадзяляюць, якое будзе лета. Былі старыкі, якія апрадзялялі па зіме кожны дзень лета.

Як сеюць грэчку, то глядзяць на неба. Як добрыя хмары, то сеюць.

Як чыстае неба, то не садзі агурцы.

На святой пасхальнай нядзелі не можна гарадзіць, а то загародзіш дождж.

Пчолы кідаюцца – быстра лётаюць – на дождж.

Каб лён быў чыстым, то сам чалавек, калі сее, павінен быць чыстым.



Репозиторий БГАТУ

Як капусту садзяць, то на граду садзяць крапівіну, каб чэрві не заводзіліся, і камень, каб галоўкі качаноў раслі вялікія.

Калі садзілі агуркі, то лепш, калі на небе многа аблокаў.

**Арахоўскі Адам Іванавіч, 1929 г. н.; в. Сімакава, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 7 ліпеня 2005 г.**

На Новы год на стале рассцілалі сноп, які да гэтага стаяў ад Каляд у куце; накрывалі яго абрусам і малацілі па ім кулакамі (уся сям'я). Потым глядзелі, які будзе ўраджай – чаго больш намалоціш. Пры гэтым нярэдка звалі і Мароз: «Мароз, Мароз, ідзі куццю есці».

Да Благавешчання нічога не гарадзілі. Хто плот загародзіць, то парубаюць, бо дождж не будзе ісці.

Пагоду прыкмячалі па зіме. Якая зіма – такое і лета.

Вот скора будзе дождж – мучыць рэўматызм.

Ластачак у нас зараз няма. Патравілі хіміяй.

**Вільчыцкая Таццяна Антонаўна, 1937 г. н.; в. Аюцавічы, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 8 ліпеня 2005 г.**

Благавешчанне – усім празднікам празднік, і птушка гнязда не ўе. На Благавешчанне можна было і разгаўляцца, але ў нас гэта не рабілі. Да Благавешчання не можна было чапаць зямлю – дажджу не будзе.

Троіца. Ліпу, клён, бярозу ставілі пад вокнамі. Высахшы май клалі ў гумно, дзе складалі жыта.

Да Іллі сена сохне і пад кустом, а пасля Іллі не сохне і на кусце.

На маладзік – дождж.

Як сонца ў хмару – дождж.

Калі Пакровы цёплыя – то зіма цёплая.

Стрэчанне цёплае – вясна цёплая. На Стрэчанне певень ужо можа напіцца з капяжа – вясна тады цёплая.

На Яўдошкі цёпла – то лета будзе цёплае.

**Харута Соня Данілаўна, 1918 г. н.; в. Аюцавічы, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. 8 ліпеня 2005 г.**

Як сонца пабяжыць хуценька – то на дождж (раніцай).

Заходзіць у хмару – на дождж.

Як сонца вельмі чырвонае – на вецер.

Як вялікая раса – на пагоду. Няма расы – на дождж.

Як карова кладзе хвост на крыж – на дождж.

Ластаўкі нізка лятаюць – на дождж.



Як муха на Благавешчанне поўзае – то вясна сухая, а лета мокрае.

Калі камар на Благавешчанне поўзае – то вясна мокрая, а лета сухое.

Зіма па лету. Лета сухое – зіма марозная.

Лета па зіме. Зіма марозная – лета сухое. Лета мокрае – зіма мокрая.

Калі маладзік рог апусціць – нягода. Калі рог уверх – харошая пагода.

На маладзік не заўсёды дождж.

Калі зязюлька кукуе, жабы крэхчуць, ды дзеці качаюцца – на дождж.

Рыба добра ловіцца – на дождж.

Як цвіце вярхушка вераса (пачынае цвісці з вярхушкі) – то ранняе жыта добрае. Калі пачынае цвісці з сярэдзіны, то сярэдняе жыта добрае. Калі цвіце знізу, то позняе жыта добрае.

Калі гром грыміць на голы лес – то дрэнны ўраджай.

У які дзень нядзелі выпаў першы снег, у такі дзень трэба бульбу садзіць – то вельмі добрая будзе.

Як капусту сеялі, то пасыпалі сялітрай ці попелам.

Як бусел скіне буслянё – дрэнны год. А калі яйцо – харошы.

Легенда аб буслу. Бусел – той жа чалавек. Бог пазбіраў ужэй, гадаў і сказаў: «На, занясі, кінь у ваду». Бусел развязаў мяшок і пусціў. Так Бог паслаў яго сабіраць усё гэта. Так і сёння сабірае.

**Космач Сцяпан Сяргеевіч, 1928 г. н.; в. Рэпічы, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 13 ліпеня 2005 г.**

Калі сонца за дыск зямлі, а не за хмару – пагода.

Дым – калі роўненька ўверх – пагода, калі сцелецца па зямлі – пагоды можа не быць.

Пажылыя людзі – ломіць косці. Дзед Унукаў – спіна баліць страшэнна – надвор'е зменіцца.

Па раслінах – рэдкія людзі ведалі – кветка сярод дня згортваецца.

Многа камароў – дождж.

Калі ластаўкі ля зямлі – дождж.

Раней у большасці сялян куры жылі ў хатах. Калі куры неспакойныя – на дождж.

Калі нанач певень спявае – пагода, калі галосіць каля абеду – дождж.



Репозиторий БГАТУ

Калі штосьці ў гаспадарцы – карова ацялілася, ажарабілася кабыла і г. д. – нікому нічога не пазычаць (асабліва ў той дзень, калі гэта адбылося) – будзе дрэнна ў гаспадарцы.

Ад прыроды ёсць людзі, ад якіх ідзе дрэнная энергетыка. Быў сусед, калі што ацялілася, больш за суткі ён не заходзіў у хлеў – бо ўсе прападзе. Ён гэта ведаў і не заходзіў нават да сваёй каровы.

Быў дзед Паясок, колькі ў яго не куплялі цялят – 3–4 дні цяля пажыве і ўсё – ніколі нядзелю не пражывала. Ці ён знаў, што ён такі, ці не знаў – я не ведаю. Калі паглядзіць – жывёле не паздаровіцца, як кажуць, «з вачэй».

Ад расстройства жалудка – піжма, альховыя шышкі, палын, прыкладна пароўну – літр ці паўтары давалі жывёле.

Калі карову спушыць – завязвалі палку ў рот, каб рот адкрыты, мясілі бакі, каб выходзіў воздух.

Калі жалудак у кароў астанаўліваўся – сырыя яйкі ў рот – не менш дзесятка. Цяпер – 3 літры піва.

У Савічах на ўсю вёску жыў Ясь Гурыцкі – калоў свіней на ўсю вёску толькі ён.

Было некалькі чалавек, якіх прасілі да кароў.

Троіца (Сёмуха) – у вароты прыносілі дзве бярозкі (па вуглах), раскідвалі аір.

У той дзень, калі Вздвіжанне, 27 сентября – ніколі не калолі, не рэзалі. Мой сын закалоў кабана – каўбасы не сохлі, смаку не было. У гэты дзень непажадана ісці ў лес: змеі збіраюцца на свае гульбішчы – пакусаюць.

На першы дзень Каляд мароз і сонца – май і чэрвень цёплыя.

Садзі гуркі на Пахом, то будуць мяхом.

Рэдзьку садзяць пасля таго, як адцвітуць яблыкі (сады).

**Івахненка Юлія Фёдараўна, 1924 г. н.; в. Ме́лехавічы, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 14 ліпеня 2005 г.**

На Калядную куццю глядзелі, ці багата зор – будуць арэхі і грыбы.

Сена ляжала на покуці ўсе тры куцці. Гэтае сена пасля свята клалі пад наседку, каб куры добра вадзіліся.

Калі на Стрэчанне з капежа нап'ецца певень, а на Яўдохі (1 сакавіка) – вол, то вясна ранняя.

У гэтым годзе са стрэх звісалі доўгія сасулькі, то і вясна доўгая.

Калі на Сораки мароз – то яшчэ 40 маразоў будзе. У гэты дзень трэба было сабраць 40 трэсак (да ўсходу сонца), то сабярэш 40



уціных яец. У нас было многа ўтак. Сабіралі і яйца вераб'еў ды варылі (дзеці). Цяпер гэта не робяць. Цяпер і птушак стала менш. Усё патравілі гэтай хіміяй. Нават ластачак мала.

Троіца – вялікае свята. У суботу перад хатай і ў хаце ставілі клён, ліпу, бярозу. Упрыгожвалі вароты, хлеў, хату. Высахшы май потым уторквалі ў хляве, пад страхою. Як будзе навальніца, то не ўдарыць гром.

Пятрок – апошні летні святок – спусціў лісток.

**Кавальчук Анна Дзямідаўна, 1935 г. н.; в. Мелехавічы, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 14 ліпеня 2005 г.**

Калі сонца заходзіць у хмару – дождж.

Калі сонца краснае – на вецер. Як заходзіць у хмару, то іншы раз таксама на вецер.

Калі заходзіць блекла – то хмарна.

Калі раса – пагода, а калі не на пагоду, не кожны раз адзінакава.

Перад дажджом – мошка сталбом.

Пчолы перад дажджом садзяцца. У пагоду пчолы больш кусаюцца.

Удод хухукае – дождж.

Варона каркае – на дождж.

Рыба кідаецца ў вадзе – нягода.

Перад дажджом коні пастануць і галовамі ківаюць.

Якое лета, такая будзе зіма. Мачлівае лета, то так будзе зімою.

Гром грыміць на голы лес – не будзе ўраджай. Фруктаў не будзе. Вішань даўно няма. Усё прапала. Але гэта калі праўдзіць, а калі не.

Якая пагода на першы дзень Каляд, то такая летам.

Калі жывёла мокрая па начам – то ў хляве вешалі сароку. Часцей за ўсё гэта была ласка. У каня спляце грыву. У кароў ласка вызывала кроў – калі пярэйдзе пад кароваю.

Кашу з гаршка (на Новы год) збіралі ды кідалі курам, каб яны добра несліся.

**Банэчка Соф'я Міхайлаўна, 1928 г. н.; в. Крошын, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 16 ліпеня 2005 г.**

На Новы год сена з-пад абруса раздавалі каровам і авечкам.

Гадалі па сену аб будучым лёне – як доўгая былінка, то будзе доўгі лён.



Репозиторий БГАТУ

Як выганялі кароў у поле, то свянцілі скаціну і дарогу, па каторай скаціна ідзе; выганялі вярбою.

Масленіца. Каталіся на кані са званкамі. Тройкі, званкі, музыка, дзяцей садзілі, стараліся вывернуць баб у снег, то будзе лён радзіць.

Звеставанне – у той дзень птушка гнязда не віла.

На Сёмуху праваслаўныя адзявалі каровам вянкі. Бярэзінкамі, ліпамі ўпрыгожвалі ў хаце.

На поле як першы раз мужык ехаў, то браў свянцоную воду, крапіў каня, сам выпіў і потым крапіў на полі. Браў свянцоную пшаніцу ці жыта свянцонае з каласкоў і сеяў.

Калі капусту садзілі, то ўспаміналі, у якія дні выпаў первый снег (сераду, чацвер), то ў той дзень і садзілі.

Наш сусед – едзем мы садзіць картошку, а сёння 3-я нядзеля месяца – ён не едзе, а мы пасадзілі, і добрая картошка.

Як сусед вязе жаць, а пераходзяць з пустым вядром, то ён каня паставіць і ў хату. Бывае цэлы дзень з яго пацяшаліся.

Як картоплю канчаюць капаць, то вянок з картапляніка вешаюць на шыю.

**Хрущев Петр Владимирович, 1930 г. р.; д. Техтин, Белыничский р-н, Могилевская обл. 12 августа 2005 г.**

Заходит солнце бледно, вроде, плачет – погоды не будет. А если спокойно заходит – то погода.

Если солнце при заходе красное – не будет погоды.

Если осеннее поле затянуто паутиной – то осень теплая, недождливая.

Если утром солнце встает красное, нагло посмотрит на земной шар, а потом скроется – то плохая погода.

На холод петух одну ногу поднимает, а на другой стоит.

Если завтра дождь, то куры поздно не садятся на куросадню. А если рано садятся, то хорошая погода.

Нет росы – суховей пасмурный. Обильная роса – погода.

Я перевозил стог сена в октябре. Жарко, много насекомых. Назавтра снег, вьюга. Чуть доехал до своего сена.

Мелкие комары (много) – более дождливая погода.

Пчелы перед хорошей погодой летают дальше («нормальный ход») – длинные полеты с утра до вечера. Перед дождем хоронятся в улей.

Блин, которым накрывали ячменную кашу, отдавали скоту. Считали, что и скот должен праздновать.



Юрий. Выгоняли скот на росу, каждый на свою рожь. Колдовство: рано на Юрья цедилкой поводит, то отнимется молоко у коров. Когда выгоняли скот в поле в первый раз, то у порога ложили косы, серпы, не знаю для чего.

Перед началом праздника Троицы украшали зеленью (дубом, кленом) под потолками. Потом эту зелень выбрасывали. У нас считали, что если зелень будет быстро сохнуть, то быстро будет сохнуть сено.

Купала. В эту ночь сторожили сараи. Убивали даже серую лягушку, считая, что она может являться ведьмой (т. е. ведьма под видом лягушки).

Пришел Илья – принес гнилья. После Ильи всегда дождь. На Илью нельзя работать – убьет гром.

2-ая Прочистая – Рождение Пресвятой Богородицы 8 сентября. До 2-ой Прочистой должна была быть посеяна рожь.

Осенью был еще Калиновик. После него копали картофель (в конце сентября).

Когда первый раз шел в поле, то севенку застилал белой салфеткой. Брал немного освященных семян и смешивал их с остальной рожью. Первый раз, когда выходил пахать, ничего не брал.

**Воронин Николай Захарович, 1927 г. р.; д. Житнев, Чериковский р-н, Могилевская обл. 12 августа 2005 г.**

Крещенскую воду несли домой и святили хоромы, худобу. Хоромы – где скот стоит.

На Благовещенье пекли маленькие булочки, несли святить в церковь. Когда выгоняли корову первый раз в поле, то клали их в торбачку и давали пастухам.

Если первый раз ехали в поле, то тоже брали их с собою.

Если ехали первый раз сеять, то брали с собой крестик. Его пекли за три недели до Пасхи, в среду – середный.

У нас на Юрья выгоняли скотину в поле, чтоб не была дурною.

Купалле. Крапиву сажали в ушаки дверей в хлевах, да маком обсыпали вокруг хлева.

**Казакевич Екатерина Митрофановна, 1933 г. р.; д. Юдовка, Чериковский р-н, Могилевская обл. 12 августа 2005 г.**

Кости ломит – будет дождь.

Если молодик настает, то дождь. Сегодня молодик, но дождя нет.

Ласточки стелятся по дороге – дождь.



Репозиторий БГАТУ

Роса большая – дождя нет.

Если солнце в тучу, то будет дождь. Если в хмару заходит солнце и оглянется, то будет дождь.

Кали хмара и вясёлка набирают воду, то будет дождь. Радуга больше всего вечером.

На Юрия посвящали рожь и скот перегоняли через рожь с росой (до восхода солнца).

Когда выгоняли скот в поле, то чаровники собирали росу с жита, чтобы вредить скоту.

Первый раз выгоняли скот в поле освященной вербой или окропляли святой водой.

**Гаспадарова Ніна Акімаўна, 1939 г. н., Чапеліна Любоў Ільінічна, 1945 г. н.; в. Наркі, Чэрыкаўскі р-н, Магілёўская вобл. 12 жніўня 2005 г.**

Крыніца Браскун – лекавая. На гэтай вадзе нагаворвалі і каровам – хто знаў.

Ігліца пасыпалася – буры цераз месяц ці два (прымячаў мой дзед).

Малако ў час даення дужа пеніцца – будзе дождж.

Малако скісне без прычыны – будзе навальніца.

Засуха. Калі засуха вялікая, то дзеці забівалі жабу. Забіць і пахараніць жабу – і памагала. Дзеці крычалі «у-у-у», нібы яе хароняць.

**Кондратова Степанида Гапеевна, 1925 г. р.; д. Язёры, Чериковский р-н, Могилевская обл. 12 августа 2005 г.**

Вербная нядзеля. Вербу освящали. Выгоняли ею скот в поле. Раньше клали в воротах замки замкнутые, чтобы звери не нападали.

На Юрия выгоняли скот в поле на жыта до восхода солнца – на чыё попала.

Троица. Коленью украшали дома – липой, кленом; явар кидаюць долу.

Прачыстая – жыта освящали. Першы раз, когда шел крестьянин в поле, он брал проскурку, освященное жито, перекрестится и сеет.

Старики прыметы делали, что в Каляды будет, то и на Петра будет. Снег после Каляд – дождь после Петра.



**Мядзведзеў Аляксей Васільевіч, 1932 г. н., Мядзведзеў Міхаіл Васільевіч, 1941 г. н.; в. Язёры, Чэрыкаўскі р-н, Магілёўская вобл. 12 жніўня 2005 г.**

Если на Сороки тепло, то тепло до чистого четверга, а если нет, то плохая погода до чистого четверга.

На чистый четверг хорошая погода, то хорошая погода до Вознесения. Какая погода на чистый четверг, то будет такая погода до Вознесения (6 недель после Пасхи).

От Вознесения до Ильи – какая на Вознесение, такая до Ильи погода.

Одну вербочку носили в жито. Первый раз выгоняли скотину в поле этой вербиной.

У моего деда заболела уже десятая корова, то ему посоветовали уловить живого зайца и закопать под воротами.

Якая пагода на Каляды, то такая ж будзе летам. У январы мароз, вецер, то летам жара. Выпадае іной раз.

Калі сонца заходзіць чыста, ясна, то пагода. Калі ў цёмную хмару – то дождж.

Калі першы раз карову выганялі, то некаторыя клалі яйцо.

Купалле. Калі лягушка ідзе к агню, то калаці яе, гэта змяя ідзе піць малако.

Перад Іванам перад варотамі клалі крапіву, у вушаках утырквалі вострыя прадметы.

**Нестеров Иосиф Леонович, 1925 г. р.; д. Мирогощь, Чериковский р-н, Могилевская обл. 13 августа 2005 г.**

Пятница – навоз можно возить, а сеять, пахать нельзя.

Когда выходил сеять, то прицепливалась проскурка, освященная в церкви.

Кутью и святую воду дают на Коляды натощак скоту.

Вербу на кут поставят, як скот гнать, то гонят этими прутиками. У нас на полосу жита вербу не носили.

Гоняли на Юрьеву росу по житу скот (до восхода солнца). На Юрья скот не освящали.

На Миколу як жито освящают, то освящают коней и дворы.

Крестьянин первый раз выходил сеять, то клал на борозну яйцо, хлеб. А потом этот хлеб и яйцо отдавали нищему. Это уже законно.



Репозиторий БГАТУ

**Іванчанка Іван Сямёнавіч, 1927 г. н.; в. Васькавічы, Слаўгарадскі р-н, Магілёўская вобл. 14 жніўня 2005 г.**

Усе тры куцці (астаткі) і тры бліны аддавалі каровам, коням, авечкам (давалі ўсё гэта на Крашчэнне). Сена, на якім стаяла куцця, аддавалі каровам і авечкам пасля кожнай куцці.

У нас вярба заўсёды была пад абразамі, у чырвоным вуглу, а калі першы раз выганяць кароў у поле, то ўторквалі яе пад страху. Кароў білі гэтай вярбою, калі выганялі, яшчэ клалі пад парог ніты – ад звера (запутваць яго) і замкнуты замок, каб ваўкам пасці замкнула. На расу выганялі кароў на Юрыя – хоць крышку па жыту прагоняць, нават чужым.

Калі першы раз выганялі кароў у поле, то не снавалі кросны і не пазычалі агню – цяпла з дому.

Калі садзілі бульбу першы дзень ці сеялі зярно ў поле, то нічога не пазычалі, тое ж самае, калі вывозілі гной.

Калі капусту садзілі, то клалі камень, наверх гаршок: «Госпадзі, радзі на ўсіх долю».

Масленіцу святкавалі некалькі дзён: у чацвер – кароўскае свята. Каровам і авечкам давалі аладкі – «ладкі». У пятніцу – свіное свята. Халоднае са свініны варылі.

Хрэсцік выпякалі з ржаной мукі прэснага (неквашанага) цеста ў сераду на 4-ай нядзелі Вялікага посту. У дзень выезда на поле сеяць, усё гэта прывязвалі ў хустачцы да лубкі.

Троіца. Святкуюць тры дні. Убіралі хату і двор ліпай, клёнам, калінай, чаромухай (на дварэ – забор, у хаце – каля ікон, пад столлю, на падлогу), яварам – дома і ў цэркві.

Сёння Іван, а назаўтра пойдзе даіць карову, то надоіць крыві ці гною. Адна жанчына раніцай увайшла ў хлеў да каровы. Аж кот сасе яе карову. Яна ўзяла капаніцу, ды як дасць па лапе, то чуць не адсекла лапу. І зараз тая жанчына цягае лапу. Зараз ёй ужо пад 70 гадоў.

Каб не зайшла ведзьма, то вакол хлява абсыпалі макам. Ведзьмы хадзілі і на Юрыя, малако ў кароў адбіралі, расу сабіралі. На Юрыя бачылі, як голая жанчына цягала скацерць па полю. Калі пагналіся за ёю, то яна як убегла ў сяло, так і расстаяла.

На Івана нават травы маглі гаварыць паміж сабою.

Ежэлі на Пятра дождж, то дзён колькі будзе дождж.

На Іллю як дождж пойдзе, то будзе ісці сем нядзель ці сем дзён.



**Юрачко Аляксандр Якаўлевіч, 1928 г. н.; г. п. Свір, Мядзельскі р-н Мінская вобл. 28 жніўня 2005 г.**

Пагоду апрадзялялі на 1-е, 2-е і 3-е марта – вясна, лета і восень. Калі снег, то дождж летам. Спраўджваецца.

На Грамніцы пятух нап'ецца вадзіцы, на Юр'я вол пад'есць травіцы.

Хрышчэнне. У хаце на саміх дзвярах мелам рысавалі жыта, лён, ячмень, каб вялікі ўраджай быў.

Саракі. Як пагода будзе, то добра, як мароз, то 40 дзён марозаў.

Першы раз выганялі, то скраплівалі тры разы вадою і вярбою выганяе, а вербачку ў хлеў у куток павесіць. Унутры хлява клалі яйцо, каб круглая карова была.

Сёмуха. Бярозкамі ўпрыгожвалі. Высахне, то спаляць.

Ілля. Рабілі на полі. Адзін на Іллю прывёз жыта, то меў, а ў другіх заліў дождж і ўсё парасло.

**Жур Надзея Аляксандраўна, 1922 г. н.; в. Дайнава, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. 2 кастрычніка 2005 г.**

Стрэчанне – калі будзе мароз, кура не нап'ецца вады, то вясна халодная.

Саракі цёплыя – вясна харошая.

Тройца цёплая – восень пракрасная.

На Пакровы цёпла – восень цёплая, зіма снежная.

Маладзік настане – дождж пойдзе. Калі трэба дождж – то чакай маладзіка.

Калі карова не даець малако і вельмі махае хвастом, то назаўтра будзе дождж.

Куры на вуліцы – дождж будзе.

Пчолы калі з лесу ляцяць у вулей, то пойдзе дождж.

Калі ўтрам сухая трава – дождж будзе.

Калі выганялі першы раз каровы ў поле, то зломяць вярбу і асвяшчаюць, а калі каровы выганялі, то сцябалі вярбою.

На Міколу вясновага праваслаўныя картоплю садзяць.

Першы раз у поле. Бярэ ўсё, коніка паставіць, адаб'е паклончыкі: «Госпадзі, зарадзі мне, вераб'ям і людзям, і ўсяму свету». А свечачку, просфарку хлеба заворвае.

Карова абдуецца, бяры розачку: «Абдула, абдула, прыйшоў к Вам акула, нада розачку браць і абдулу выганяць».

Калі кароўка мокрая, гэта яе нехта паганяе.



Репозиторий БГАТУ

**Валчок Анна Сергеевна, 1924 г. р.; д. Гудовичи, Червенский р-н, Минская обл. 2 октября 2005 г.**

Когда первый раз выгоняли корову, то кропили святою водою, со свечою обходили корову. В воротах хлеб, соль, яичко, замок, сякеру, пастуха не одаривали. Каждый шел со скотом хозяин.

Вербница. Освещали вербу. Запасвали вербою.

Троица. Обычай был такой: рвали зелле – аир.

Купалле. Крапиву затыкают в двери. Чародейки выходили, распускали косы, выходили голыми.

**Гурневіч Марыя Матвееўна, 1925 г. н.; в. Вішнева, Валожынскі р-н, Мінская вобл. 9 кастрычніка 2005 г.**

10 марта – 40 мучанікаў – калі мароз, то яшчэ 40 дзён марозу, а калі цёпла, то ранняя вясна.

Калі кароў выганяюць у поле, то выганяюць вярбою. Каля парога нічога не лажылі.

На Звеставанне, каб куры не несліся ў чужых гнёздах, то маці бярэ пук саломы з хаты са страхі і пацярык гаворыць, і паложыць у гэтае гняздо, дзе куры нясліся. І цяпер так раблю. І праўдзіць.

У нас гавораць, калі на Казіміра (4 марта) курыца вады нап'ецца, то на Юр'я вол наесца.

Троіца. Прыносілі бярозы, ліпу, клён. У хаце і на двары паставяць. Зараз толькі ў хаце.

**Уланоўская Паўліна Іванаўна, 1926 г. н.; в. Ліпнішкі, Іўеўскі р-н, Гродзенская вобл. 9 кастрычніка 2005 г.**

Як ідзе сеяць, то перакрэсціць сябе і зямлю пералжагнае. Я і цяпер пражагнаюся: «Божанька, радзі бульбу вельку, каб мелі што есці ўсе людзі». Сеяць – калі цёпла.

Кружовыя дні – то не сеюць. Як пойдзе жаць, то збожжа пакружаванае будзе.

Бацька глядзіць на аблака, хмарачка надышла – не сее, а сын хватае сявеньку і сее. Дзе сын пасеяў, то нічога няма.

Як першы раз выганялі кароў, вербай б'юць кароў, б'юць тры разы. Крыж-накрыж пасвянцяць вадою святою.

Калі карова пераступіла ці цэдзіць малако, то кладуць іголку – каб вылячылася ад урокаў. Соль свянцоную на шыю карове.

Месяц абгародзіцца краснай каймой – злая пагода, ці на змену пагоды.

1 марта – вясна, 2 марта – лета, 3 марта – восень.



Сонца заходзіць краснае – пагода ці мароз.

Гнілая пагода на Пакровы – зіма гнілая.

Перад Калядамі сапляк вялікія з стрэхаў звісаюць – то ячмень будзе ўраджайны.

**Исаченко Татьяна Ивановна, 1924 г. р.; д. Прусино, Кричевский р-н, Могилевская обл. 30 апреля 2006 г.**

Дома вербу ставили под иконами и ей выгоняли скотину в поле.

В поле первый раз выходит, то берет пасхальное: булки, шелуху от яйца, косточки, соль. Закапывали в борозду.

На Юрья выгоняли скот (коров) в поле до восхода солнца, на Юрьевскую росу. Если уловят мужчину, то разорвут калошину, у девки – юбку. Священной вербой били по корове. В воротах клали яйцо, замок.

Деревню сохой не опахивали. Коли скот болел, то заговаривали от суроц, от звиху, ветеринаров не возили. Ветеринаров было мало. На шею телки вешали соль четверговую и хлеб, матуз со штанов. Которые бабки лечили, то у нее всегда есть соль. Когда корову уракли, то бабка давала воду, хозяйка обмывала вымя этой водой 3 дня до восхода и после захода солнца.

Май стоял неделю. Клали его потом под сено. Явар сохраняли как лечение для скота.

Когда роса на окнах, то будет дождь.

Перед дождем пчелы собираются в улей, очень злые.

Когда засуха, лягушку убивали, чтобы вызвать дождь.

**Шавырына Екацярына Ніканаўна, 1927 г. н.; в. Зімніцы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. 1 мая 2006 г.**

Соракі. Сорак клёцак сушылі – 40 маразоў і адкідалі пасля кожнага марозу клёцку. Агуркі садзілі пасля 40 маразоў.

На Юр'я выганялі скаціну ў поле вярбой. Некалі хадзілі з іконай вакол скаціны, са свечкай і жытам абсыпалі. У варотах клалі замкнуты замок, яйцо.

Прачыстая – свяцілі жыта ў царкве. Потым гэтае жыта сеялі на полі.

На Каляды дождж, то лета мокрае, як пячэць на Каляды мароз, то гарачыня ў пакос.

Маладзік на дождж. Цяпер не праўдзіць.

На дождж косці ломіць.

Бралі свячу, абракаліся, каб жывёла не хварэла.



Репозиторий БГАТУ

**Паршикова Зинаида Яковлевна, 1930 г. р.; д. Волынеж, Костюковичский р-н, Могилевская обл. 1 мая 2006 г.**

Крещенской водой обрызгивали хлев, когда овцы, коровы телились.

Освящали вербу, и когда первый раз выгоняли скот в поле, то выгоняли этой вербой, а на Юрья торкали эту вербу у жита (10–12 прутиков).

На Юрья на росу коров выгоняли до восхода, на жито.

Первый выход в поле. Хозяин брал окраец хлеба и соль на поле. Когда настанет 3-я квадра месяца, не выезжали в поле. Старались выехать в поле под полню.

У нас баба посадила гусей на 3-ю квадру, то все гуси подохли. Я сама посадила курицу, то яйца которые протухли, а которые болтуны были – 3-я квадра. На 3-ю квадру не садили ничего в городе, гряд не делали. В молодик 3 дня ничего не делают; когда виден серпок месяца уже делать можно.

Капусту садили под полню.

Огурцы – когда хрущев много. Воду ставили – от курей. Крапиву ложили около огурцов.

Если бульбу садят, то хорошо, если облаки.

На Троицу – в субботу ходят в лес, несут яворь, калину, малину. Ее заторквают в хате. На Духа освящают траву всякую, ее кладут за икону, кто в хату – от грозы. Кладут ее иногда в погреб, под сено, – чтобы мыши не ели. Эту траву уже не освящали.

На Ивана Купалу собирают траву шаптухи. Они ее иногда освящают на Петра.

У нас на Купалу одна лягушку сякла, дык лягушка долго ползла. Скоро у девки заболела рука и она умерла. Девка, девка была. Усяго ёй было 19 лет.

Стречанне – если цеплае, то цеплае лета. Определяли лето еще по Ушесцю.

Петухи поют – сменится погода.

Если ненастье будет, то кости болят.

Некоторые определяли погоду по росе.

Когда зимою морозы большие, то улетку жара.

Если метель зимою, то холодная весна.



**Гедразь Людміла Антонаўна, 1922 г. н.; в. Дубатоўка, Смаргонскі р-н, Гродзенская вобл. 6 жніўня 2006 г.**

Прыдзеш дамоў і асвеціш вугал хрышчэнскай вадой, карова ацеліцца, то вымя вымыеш.

Масленічны тыдзень. Бабы збіраліся, за пояс затыкае пасмачку лёну (каб радзіў) і ідуць, выпіваюць, пятніцу пахмяляліся.

Сёмуха. Прывозяць бярозы, украшаюць вуліцы, у хаце. Як высахне, то спальвалі, некаторыя клалі пад жыта. Пастухі завівалі вянкі каровам. Вянок сама карова сарве, а то павесіш на які-небудзь гвоздь у хляве.

Вечарам перад Янам крапіву клалі пад парогі, у хляве раскідалі, пад клямку, каб ведзьма малака не адбірала.

14 верасня Узвіжанне святкавалі. Ідзем па грыбы, канчаем капаць бульбу. Хадзіла па грыбы і не бачыла, каб змеі двігалісь. Я, бывала, нарочна хадзіла глядзець і не бачыла.

Хто пасвенціць жыта, свянцонае жыта змяшае з другім, перахрысціць загон і сее. Як прыходзілася, то сеялі, на месяц не глядзелі.

Пагоду апрадзялялі. Зараз усё спорцілася: і пагода, і людзі. Няма цяпла, памеркла сонца, пахаладнеў вецер.

**Якімовіч Іван Пятровіч, 1924 г. н.; в. Горталь, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл. 26 жніўня 2006 г.**

Вярбою выганялі першы раз скаціну ў поле. Быў звычай выганяць скаціну на Юр'еўскую расу. Калі харошыя росы, то будуць добрыя просы. А калі няма расы, то не будзе і прасы.

Калі карова позна ацялілася, то трэба цялё на Юр'я адсадзіць, жарабя таксама. Добра будзе расці, бо жывотных празднік. Некаторая нават матка адсажывала сваіх дзяцей на Юрыя. Забудзецца і будзе дужым.

Калі першы раз выходзіў у поле жыта сеяць, то пасвечанае жыта перамешвалі з нясвечаным.

Купала. Каб ведзьма не выдаіла малако, то ў вушаках клалі крапіву – жыжку. Яна будзе ісці з дайніцай і папячэ рукі. У маёй каровы прапала малако, то я сказаў, у второй празднік стану з сякерай і засяку. Шукалі папараць-кветку. Знаць будзеш, як жывотныя размаўляюць.

Спленне. Прыйшло спленне, пытае, ці гатова насенне.

Прачыстая – Гаспейка. «На Гаспейка жыта сей гусценька». Гэта ўжо позні пасеў жыта. Пасля Гаспейка не сей жыта.



Репозиторий БГАТУ

Як курыца лезе на плот, то будзе дождж.

Еслі машкара лезе ўвечары, то заўтра будзе дождж. Я ўжо ведаю гэта. А так её нету.

На грамніцы еслі певень нап'ецца вадзіцы, то скора вясна. Пайду ў царкву, свечы трашчаць і моцна цякуць – даждлівае і гразавое лета. У гэтым годзе я сказаў, што лета будзе мокрае і даждлівае (па свечах на Грамніцы).

Як поўны месяц ідзе да маладзіка, то пагода. На маладзік пагода мяняецца. У гэтым годзе пагода да круглага месяца хараша была, а як умяншаецца месяц, то пагода горшаецца.

**Мізэра Ірына Міхайлаўна, 1929 г. н.; в. Падароск, Ваўкавыскі р-н, Гродзенская вобл. 26 жніўня 2006 г.**

Благавешчанне. У полі не рабілі. Птушка гнязда не ўе.

Юрый. Каля жыта ходзяць. Костку з пасхальнага стала – дзе асот расце, засадзіць костку.

Кароў вярбою выганялі на Юр'еўскую расу.

Як першы раз кароў выганялі, вярбою гналі, акрапялялі святою вадою. Калі выганялі ў поле жывёлу, то праганялі праз ніт («Як ніт нізіўся, каб так зверу нізіўся скот»); заслонку («Як заслонка печы пільнуе, каб скот так двара пільнаваў») – сказаць трэба тры разы. Яйцо клалі таксама.

Жыта як сеяў, то браў просфарку ад пасхальнага стала. Свянцоным жытам высяваў крэст.

Троіца. Украшалі бярозкамі ў хаце, каля хаты. Аер – высыпалі дарогі. Як высахне, то выкідвалі.

Зельная – 15 аўгуста. Асвяшчалі цвяты, зелле, жыта. Гэтым жытам засявалі.

Заўтра пагода – сонца не за хмару заходзіць.

**Дуброўскі Іосіф Антонавіч, 1925 г. н.; в. Мсцібава, Ваўкавыскі р-н, Гродзенская вобл. 27 жніўня 2006 г.**

На куццю выцягвалі сена, глядзелі, ці вялікі лён. Перад Новым годам гадалі, як сонца свеціць: як свеціць добра сонца на Новы год, то чысты будзе лён.

Звеставанне. Птушка гнязда не ўе.

На Юрыя хадзілі каля жыта. Бяруць свянцоную костку і затыкаюць костку ў край нівы (на граніцы). На Юр'еўскую расу на раніцу першы раз выганялі скаціну.



Як выганяюць кароў, авец, то вербачкай выганяюць. Пад парог, дзе стаялі авечкі, клалі яйцо. Дзе стаяла карова, клалі замкнуты замок у навоз.

Як авечкі выганяюць, то кладуць яйцо, а потым гэтае яйцо аддаюць жабраку.

Троіца. Зеленню ўпрыгожвалі каля хаты (бярозку, клён, аір). Каля касцёла пакідаюць многа зелені, каля алтара. Зелень потым клалі ў стадолу і жыта, каб мышы не заводзіліся.

На Яна цвіце папараць-кветка. Адзін чалавек пасвіў валы, абуты быў у лапаць, прышоў дахаты, усё ведаў, што хто думае. А потым разуўся і зноў стаў дурным.

15 аўгуста – Зельная – зелле свяцілі, збожжа, першым засявалі. Усё на зельную свецяць – яблыкі, жыта, моркву, буракі.

**Лях Сцяпан Рыгоравіч, 1928 г. н.; в. Мінеўшчына, Ваўкавыскі р-н, Гродзенская вобл. 27 жніўня 2006 г.**

Сеяў асвянцоным на Зельную жытам.

Першы дзень як карову выганялі, то клалі замок і яйцо, як авечку, то клалі «нічальніцу», каб авечкі трымаліся адна другой.

Сёмуха. Бярозкамі кругом абсадзяць дом, наставяць букеты. У цэркві ўсё ўбяруць бярозкамі.

Купалле. Па вуглам і дзвярах хлява ўтыкалі крапіву, зелле, камнем прыкладалі дзверы. Каля дзвярэй клалі што-небудзь вострае.

Калі дым на зямлю – дождж, а калі ўверх – то на пагоду.

Як каля сонца кругі, то на мароз.

Як яркія звезды, то на пагоду, ці мароз. Як тусклыя, то на нягоду.

Па зіме ўгадвалі ўраджай. Калі снег упадзе на неталую зямлю, то плахое жыта будзе.

Як сонца чыста заходзіць – пагода.

Як туман ідзе ўверх – то пагода, як па зямлі – то дождж.

Цяпер пагода перавярнулася. Даўней выясніцца цяпло, а цяпер усё дождж і дождж. Снегу больш было.

Як нізка шмат мухаў – ластаўкі лётаюць – то дождж.

Камары кусаюцца – то дождж. На пагоду яны спакайнейшыя.

Рыба выскоквае з вады перад дажджом.

Калі вецер з запада, то цёплая зіма (з огнедышащих гор). Як з севера, то халодная зіма.



Репозиторий БГАТУ

Калі на Каляды ідзе снег, то на Пятра дождж. Калі на Каляды мароз моцны, то на Пятра добрая сухая пагода.

Якое Звеставанне – такое з мёртвых устанне. На Благавешчанне холадна, то і на Вялікдзень будзе холадна.

Як загрыміць, калі голае дзерава, то вясна халодная.

**Иванов Василий Дмитриевич, 1931 г. р.; д. Вязьё, Осиповичский р-н, Могилевская обл. 10 сентября 2006 г.**

Нельзя убивать аиста и разрушать его гнездо. Если разрушить гнездо аиста, то он принесет головешку с огнем.

Ужи не вредные. Мог уж только высосать корову. Когда он сосет, то она мычит.

Если солнце на заходе багровое – непогода.

Солнце заходит «у хмару» – к смене погоды.

Солнце желтое – к погоде.

Красные облака – нягода.

Большая роса (даже днем длится) – к погоде.

Сухая трава – дождь.

Если роса длится после полудня – то дождь.

Собака качается – нягода.

Перед морозом кот лезет в печь.

Перед дождем ласточки летают низко.

Куры перед дождем купаются в песке и удирают во двор.

Вороны кричат – перед дождем.

Комары кусают перед дождем. Мак толкут – к погоде.

Если на Покровы тепло, то зима теплая.

Откуда дует ветер на Покровы, то оттуда дуют ветры зимою. Дорожные мастера заранее ставят с той стороны щиты защиты.

Если на Коляду (первую, вторую и третью) на небе много зорак, то урожай хороший.

Сейчас мало звезд. Луна померкла. Меньше светит. Звезд одна третья часть только осталась.

Лето определяли по зиме. Зима морозная – лето горячее. Зимой мороз – летом жара. 40 лет тому назад была очень морозная зима. Так летом яблоки попеклись от жары.

Молодик появился, а рожок у него крутенький – мороз. Если рожок прямой – то пасмурно, оттепель.

Обычно на молодик ожидали дождя.



Репозиторий БГАТУ

*Навуковае выданне*

**Шумскі** Канстанцін Анатольевіч

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ У XIX ст. – ПАЧАТКУ XX ст.

Манаграфія

Адказны за выпуск *Я. А. Грэбень*
Рэдактар *Т. У. Каркоцкая*
Камп'ютарная вёрстка *Т. У. Каркоцкай*

Падпісана ў друк 19.10.2011 г. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 8,73. Тыраж 100 паас. Заказ 907.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт».
ЛВ № 02330/0552984 от 14.04.2010.
ЛП № 02330/0552743 от 02.02.2010.
Пр-т Незалежнасці, 99-2, 220023, Мінск.